# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## № 2(56) 2008

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**


## Змест


***Галоўны рэдактар***

**П.Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В.В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)

Л.М. Давыдзенка

А.В. Данільчанка

А.П. Жытко

М.М. Забаўскі

Л.М. Каранеўская (*адк. сакратар*)

І.В. Катляроў

П.В. Кікель

Г.А. Космач

Н.І. Кунгурава

А.М. Люты

У.А. Мельнік

А.І. Смолік

С.В. Снапкоўская

А.С. Цернавы

В.В. Шынкароў


### *Гісторыя*


*Крывічаніна К.А.* Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у сферы міжнародных навуковых зносін (1991–2000 гг.): станаўленне і развіццё.... 3

*Цыбулька К.М.* Вывучэнне гісторыі антычнасці ў сістэме асветы і адукацыі Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. ..................................... 6

*Будзянкова Т.С.* Метадалагічныя аспекты айчынных гістарыяграфічных даследаванняў (1991–2005 гг.) ..................................... 10

*Сарока А.Г.* Падрыхтоўка бібліятэчных работнікаў у Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст. ..................................... 12

*Цымбал А.Г.* Юрыдычна-арганізацыйныя ўмовы дзейнасці Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) ..................................... 15

*Белановіч А.М.* Катэгорыя «остарбайтар» – «усходні рабочы» у нацысцкай іерархіі замежных рабочых у германскім рэйху (1941–1945) ... 20

*Вараб'ёў А.А.* Выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход у Мінскай губерні..................................... 23

*Пілецкі В.А.* Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы аб спецыфіцы сацыяльна-эканамічнага становішча насельніцтва Беларусі ў VI–VIII стст. і ў IX – сярэдзіне XIII ст. ..................................... 26

*Шымак А.К.* Усходняя Еўропа і дыпламатыя Рымскай курыі (канец XV – пачатак XVI ст.) ..................................... 30

*Космач П.Г.* Рэлігія і прыняцце першай папраўкі да Канстытуцыі ЗША (па матэрыялах першага федэральнага Кангрэса)..................................... 34

*Салькоў А.П.* СССР і югаслаўска-італьянскія тэрытарыяльныя супярэчнасці ў раёне Істрыі–Трыеста (красавік 1941 – май 1945 гг.) ....... 37


### *Філасофія*


*Кікель П.В., Абалевіч І.В.* Метадалагічныя праблемы фарміравання светапогляду ..................................... 42

*Таркан І.І.* Канцэпцыі дыялога культур як сацыяльнага ідэала ў сучаснай філасофскай думцы ..................................... 47

*Успенскі К.А.* Эстэтычныя аспекты філасофіі Хазрата Інайят Хана... 50

*Кузняцова М.А.* Канцэпцыя «заходнізму» ў працах А.А. Зіноўева...... 53

*Адаева Н.У.* Сацыяльна-філасофскі аналіз канцэпцыі «настаўнік» М.М. Майсеева..................................... 57


### *Паліталогія*


*Сіткевіч С.В.* Фарміраванне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі – тэндэнцыі, праблемы, перспектывы..................................... 61

*Скок Н.У.* Змястоўныя элементы палітычнай культуры..................................... 64

*Казырэнка Н.П.* Палітычная культура: сучасныя канцэпцыі і праблемы даследавання ..................................... 68

*Канапацкі М.Б.* Сілавы фактар у палітычным развіцці сучаснай Турцыі ..................................... 70

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.unibel.by

Пасведчанне № 2288
ад 08.02.05.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 14.06.08
Фармат 60×84 1/8.
Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*.
Друк Riso.
Ум. друк. арк. 12,79.
Ул.-выд. арк. 13,72.
Тыраж 100 экз.
Заказ 252.

*Выдавец*
*і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
Ліцэнзія № 02330/0133496
ад 01.04.04.
Ліцэнзія № 02330/0131508
ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.
*e-mail*: izdat@bspu.unibel.by

*За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары*

*Рэдактар*
Л. М. Каранеўская

*Тэхнічнае рэдагаванне*
І. І. Галіцкага

*Камп'ютэрная вёрстка*
І. І. Галіцкага

© Весці БДПУ, 2008. № 2. Серыя 2

### *Сацыялогія*

*Стаховіч Т.В.* Сацыяльна-духоўны аспект творчасці кампазітара Галіны Гарэлавай ........ 73

### *Эканоміка*

*Давыдзенка Л.М., Давыдзенка Т.Дз.* Фарміраванне інтэлектуальнага капіталу ў арганізацыях будучыні ........ 77
*Кравец Л.М.* Метадалагічныя падыходы да ацэнкі мэтазгоднасці стварэння інтэграваных структур ........ 81
*Бароўка М.У.* Метадалогія ацэнкі дыверсіфікацыі экспартных патокаў Рэспублікі Беларусь у краіны Еўрасаюза ........ 85
*Перапёлкін В.А.* Змяненні сукупнага попыту як прычына структурных зрухаў у эканоміках Беларусі і Расіі ........ 89

### *Культуралогія*

*Антановіч К.У.* Канцэпцыя Свабоды і адказнасці у працэсе сацыялізацыі моладзі ........ 93
*Рудніцкая Я.Ф.* «Адкрыццё народа» ў тэорыі культуры ........ 94
*Здановіч Н.І.* Гарадское свята ў традыцыйнай культуры Беларусі ..... 95
*Аўсянская С.Я.* Роля беларускага мастацкага слова ў фарміраванні культуры міжасобасных зносін ........ 98
*Малашчанка Ю.І.* Семантыка вогненнай сімволікі ў школьным курсе «Айчынная і сусветная мастацкая культура» ........ 99
*Курыленка Г.М.* Спавядальная рэфлексія ў культуры ........ 100
*Чарняўская Ю.В.* Прырода і сутнасць этнічнасці: да падыходу мяккага канструктывізму ........ 103

**Рэфераты** ........ 107

# ГІСТОРЫЯ

УДК [947.6:001] «1991/2000»

***К.А. Крывічаніна,***
*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У СФЕРЫ МІЖНАРОДНЫХ НАВУКОВЫХ ЗНОСІН (1991–2000 гг.): СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ

Атрыманне Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту выклікала вялікія пераўтварэнні, што закранулі ўсе бакі жыцця беларускага грамадства. У няпросты і адказны для краіны час закладваліся асновы, фарміраваліся галоўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сацыяльнай, эканамічнай, рэлігійнай, культурнай і іншых сферах дзейнасці. З мэтай стварэння неабходных прававых умоў яе рэалізацыі, разгарнуўся інтэнсіўны заканатворчы працэс. Ён не абмінуў і навуку, для далейшага развіцця якой важным было стварэнне сучаснай нарматыўна-прававой базы.

Акрамя таго, фарміраванне адпаведнага заканадаўства павінна было спрыяць вырашэнню шматлікіх праблем, з якімі ў пачатку 1990-х гг. сутыкнулася беларуская навука. Асноўнымі з іх з’яўляліся фізічны і маральны знос матэрыяльна-тэхнічнай базы, падзенне прэстыжу навуковай дзейнасці, скарачэнне фінансавання даследаванняў, старэнне навуковых кадраў. Гэтыя цяжкасці ўзніклі яшчэ ў савецкія часы, аднак рэзка абвастрыліся ва ўмовах палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісаў першых постсавецкіх гадоў.

Розныя аспекты навукова-тэхнічнай палітыкі дзяржавы атрымалі сваё заканадаўчае афармленне, сярод іх – фінансаванне навуковых прац, арганізацыя інавацыйнай дзейнасці, распрацоўка праграм фундаментальных і прыкладных даследаванняў, стварэнне і функцыяніраванне часовых навуковых калектываў і г. д. У вышэйпазначаным шэрагу – арганізацыя міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. І гэта не выпадкова, бо ўстанаўленне і пашырэнне навуковых кантактаў лічылася адным з прыярытэтных кірункаў развіцця нацыянальнай навукі, якая (з набыццём дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі) атрымала новыя магчымасці і перспектывы для выхаду на міжнародную арэну ў якасці раўнапраўнага суб’екта навуковай кааперацыі.

Што тычыцца асвятлення абранай тэмы сучаснай гістарыяграфіяй, то трэба адзначыць адсутнасць спецыяльных даследаванняў. Некаторыя пытанні фарміравання заканадаўства Рэспублікі Беларусь у навукова-тэхнічнай сферы разглядаліся вучонымі і спецыялістамі на старонках перыядычнага друку [1; 3]. Аднак міжнародны аспект ці цалкам заставаўся па-за ўвагай аўтараў, ці падаваўся фрагментарна. Таму актуальнасць даследавання праблемы з’яўляецца відавочнай.

Сярод дзяржаўных функцый у сферы міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва адно з галоўных месц належыць фарміраванню нарматыўна-прававой базы міжнароднай кааперацыі. У артыкуле аўтар спрабуе асвятліць працэс фарміравання дзяржаўнай палітыкі Беларусі ў гэтай галіне, пры гэтым канцэнтруе ўвагу на тых заканадаўчых актах, што сталі фундаментальнымі ў навуковай сферы і заклалі галоўныя прынцыпы развіцця ўзаемавыгадных сувязей рэспублікі з сусветным навуковым супольніцтвам. Для вырашэння пастаўленай задачы выкарыстаны матэрыялы архіва Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, дакументы электроннай базы даных па заканадаўчых актах Рэспублікі Беларусь, матэрыялы перыядычнага друку, Інтэрнет-рэсурсы і інш.

Найбольш шырокае развіццё атрымала арганізацыя ўзаемавыгадных навуковых сувязей ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 1993 г. «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі», нарматыўна-прававым акце ў навукова-тэхнічнай сферы [4]. Сярод галоўных прынцыпаў дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі пазначалася яе адкрытасць, якая прадугледжвала развіццё ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі, стварэнне ўмоў для прыцягнення замежнага капіталу, што накіроўваўся на развіццё навукі і тэхнікі, асваенне навейшых тэхналогій і новых відаў прадукцыі. У Законе прапісваўся ўдзел рэспублікі ў міждзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах і праектах, іх фінансаванне, магчымасць удзелу замежных вучоных у навукова-тэхнічнай экспертызе. Акрамя таго, пытанню рэгулявання навуковых стасункаў прысвячаўся асобны артыкул, дзе канстатавалася, што органы дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь падтрымліваюць і садзейнічаюць развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, грамадскіх навуковых і навукова-тэхнічных аб’яднанняў, асобных вучоных і спецыялістаў, а таксама ствараюць неабходныя права-

выя і эканамічныя ўмовы для ўстанаўлення імі раўнапраўных адносін з замежнымі і міжнароднымі суб'ектамі, якія ажыццяўляюць навукова-тэхнічную дзейнасць [4].

У Законе былі акрэслены наступныя формы навуковых сувязей: 1) выкананне сумесных навуковых даследаванняў, тэхнічных і тэхналагічных распрацовак, навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў на аснове міжнародных дагавораў, дамоў і кантрактаў; 2) правядзенне сумесных даследаванняў і распрацовак у міжнародных калектывах спецыялістаў, міжнародных інстытутах, на сумесных прадпрыемствах і ў арганізацыях; 3) ажыццяўленне ўзаемнага абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй, стварэнне і выкарыстанне аб'яднаных міждзяржаўных інфармацыйных фондаў і банкаў даных; 4) правядзенне міжнародных кангрэсаў, канферэнцый, сімпозіумаў і іншых навуковых нарад; 5) узаемны абмен навуковымі, навукова-педагагічнымі і навукова-тэхнічнымі кадрамі, аспірантамі, а таксама сумесная падрыхтоўка спецыялістаў; 6) ажыццяўленне іншых форм міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва [4].

У лістападзе 1997 г. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь была падпісана новая рэдакцыя Закона. Галоўныя змены тычыліся паўнамоцтваў органаў дзяржаўнай улады, па якіх фарміраванне навукова-тэхнічнай палітыкі ажыццяўлялася Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з удзелам урада Рэспублікі Беларусь. Некаторае дапаўненне атрымаў прынцып адкрытасці, які быў дапоўнены словамі, «якая не прыносіць шкоды нацыянальнай бяспецы, абараназдольнасці і жыццёва-важным інтарэсам Рэспублікі Беларусь» [5]. Што да артыкула «Дзяржаўнае рэгуляванне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва», то яго асноўныя палажэнні засталіся ранейшымі.

Далейшае развіццё пытанне навуковай кааперацыі атрымала ў Законе «Аб навуковай дзейнасці» ад 21 кастрычніка 1996 г. [6]. Як пазначалася ва ўступнай частцы, асноўнай задачай прынятага дакумента стала стварэнне спрыяльных умоў для ажыццяўлення навуковых даследаванняў і ўзмацненне дзяржаўнай падтрымкі навукі як неабходнай умовы эканамічнага і сацыяльнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Што тычыцца прынцыпаў дзяржаўнага рэгулявання міжнародных ўзаемадачыненняў, то тут вызначальным стаў кантроль вынікаў навуковых даследаванняў, выкананых па міжнародных праграмах, а таксама па заказах або пры фінансавай падтрымцы замежных арганізацый і фондаў.

Сваё адлюстраванне атрымалі такія аспекты навуковай дзейнасці, як магчымасць падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў замежных цэнтрах; прызнанне вучоных ступеней, прысуджаных у іншых дзяржавах; удзел міжнародных і замежных навуковых арганізацый у рабоце саветаў па абароне дысертацый. Сярод іншых былі акрэслены правы навуковых работнікаў на ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі міжнародных навуковых праграм і праектаў, заключэнне кантрактаў з міжнароднымі арганізацыямі, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі для работы як за мяжой, так і на тэрыторыі Беларусі, удзел у міжнародных канферэнцыях, сімпозіумах, нарадах і семінарах [6]. У снежні 1997 г. у разглядаемы Закон былі ўнесены невялікія змяненні, якія не закраналі асноў дадзенага нарматыўна-прававога дакумента, і пакінулі вышэйпералічаныя палажэнні ў папярэдняй рэдакцыі [7].

Законы Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі» і «Аб навуковай дзейнасці» сталі тымі заканадаўчымі актамі, што закладвалі фундамент прававога рэгулявання міжнародных навуковых сувязей Беларусі. Прапісаныя ў іх нормы былі абавязковымі для акадэмічнай і галіновай навукі, вышэйшых навучальных устаноў і інш. Акрамя таго, на працягу вывучаемага перыяду прымаліся нарматыўныя дакументы, якія рэгламентавалі міжнародную дзейнасць асобных арганізацый. У першую чаргу гэта тычыцца Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Яшчэ ў 1990 г. была прынята Пастанова Вярхоўнага Савета БССР «Аб статусе Акадэміі навук Беларускай ССР» [8]. Абмеркаванне Вярхоўным Саветам статусу Акадэміі навук і прыняцце адпаведнай Пастановы сведчаць аб прызнанні яе асаблівай ролі сярод навуковых арганізацый рэспублікі і аб увазе вышэйшага дзяржаўнага органа да становішча рэспубліканскай навукі ўвогуле. Свае меркаванні наконт дадзенага заканадаўчага акта выказалі на старонках перыядычнага друку кіраўнікі ўстаноў Акадэміі і іншыя вядучыя навукоўцы [9–12]. Усе яны зыходзілі з таго, што зацвярджэнне праекта з'яўлялася важным крокам у развіцці як акадэмічнай, так і цалкам рэспубліканскай навукі, які даваў больш магчымасцей для самастойнага вызначэння прынцыповых момантаў дзейнасці Акадэміі.

Дзяржава ставіла перад Акадэміяй пэўныя задачы. Сярод іх – арганізацыя шырокага міжнароднага супрацоўніцтва. Па новым статусе Акадэмія навук выступала ў якасці рэспубліканскай самакіравальнай арганізацыі, дзейнасць якой рэгламентавалася заканадаўствам БССР, Статутам Акадэміі. Акрамя таго, пазначалася, што «асобныя пытанні дзейнасці АН БССР могуць рэгулявацца яе міжнароднымі дамовамі і заканадаўствам Саюза ССР, калі яны не супярэчаць заканадаўству Беларускай ССР» [8].

На сесіі Вярхоўнага Савета 19 снежня 1990 г., дзе была разгледжана і прынята вышэйпазначаная Пастанова, на просьбу аднаго з дэпутатаў растлумачыць, аб якіх «асобных пытаннях» ідзе размова, тагачасны Прэзідэнт Акадэміі навук акадэмік У.П. Платонаў адказаў: «Справа ў тым, што Акадэмія навук Беларусі зараз больш актыўна выходзіць на міжнародную арэну, яна

вымушана час ад часу заключаць дамовы з рознымі навуковымі цэнтрамі і фірмамі замежных краін... Гэтыя дамовы павінны быць збалансаванымі, гэта значыць, яны павінны ўлічваць заканадаўства і міжнароднае, і нашай рэспублікі, і саюзнае. Не ўсё можа быць агаворана, улічана ў рэспубліканскім заканадаўстве… Аднак гэта можа быць невялікая колькасць рашэнняў, але яны могуць быць, калі іх трэба прымаць хутка...» [9, с. 3]. Са сказанага зразумела, што пэўных прынцыпаў, якія б рэгламентавалі прыняцце падобных рашэнняў выпрацавана не было. Не былі сфармуляваны крытэрыі адбору, схема рэалізацыі дадзенага палажэння. Усё гэта, з аднаго боку, выклікала юрыдычныя цяжкасці пры афармленні некаторых кантрактаў і пагадненняў, але, з іншага – пашырыла магчымасці Акадэміі самастойна вырашаць некаторыя пытанні развіцця міжнародных сувязей.

У 1998 г. у выніку прыняцця Закона «Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», асновай распрацоўкі якога стаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 1997 г. «Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», адбылася змена заканадаўчага статусу НАН Беларусі, яе месца ў структуры навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны [13–14]. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі быў распрацаваны і ў 1998 г. зацверджаны чарговы Статут Акадэміі [15].

Па новым Законе, НАН Беларусі атрымала статус вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі. Сярод асноўных кірункаў яе дзейнасці пазначаўся «ўдзел у арганізацыі міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва; аналіз, абагульненне і садзейнічанне практычнаму выкарыстанню дасягненняў сусветнай навукі» [14, с. 8]. Такім чынам, Акадэмія навук з арганізатара міжнароднага навуковага супрацоўніцтва ператваралася ў аднаго з удзельнікаў па яго рэалізацыі. Каб зразумець прычыны наваўвядзенняў, трэба ўзгадаць тыя змены, што адбыліся ў навукова-тэхнічнай сферы краіны за папярэднія гады. У 1994 г. пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь быў утвораны Камітэт па навуцы і тэхналогіях, адной з галоўных задач якога была пазначана арганізацыя міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва [16]. Па Палажэнні, прынятым Саветам Міністраў у 1997 г., Камітэт атрымліваў статус дзяржаўнага і адказваў за рэгуляванне і кіраўніцтва ў галіне навукі, тэхналогій і інфарматызацыі. Менавіта перад Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях (ДКНТ) была пастаўлена задача «правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва» [17, с. 1–2]. Такім чынам дзяржава імкнулася адрэгуляваць сваю палітыку ў дадзеным кірунку і ўскласці на ДКНТ функцыі яе каардынатара.

З вышэйадзначанага вынікае, што развіццё замежных сувязей галіновай і універсітэцкай навукі рэгулявалася Законамі «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі» і «Аб навуковай дзейнасці». Аднак асобных нарматыўных актаў прынята не было. Адносна развіцця навукі ў ВНУ варта ўзгадаць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» (1991), дзе прапісвалася права навучальных устаноў і ўстаноў сістэмы адукацыі наладжваць прамыя кантакты з міжнароднымі і замежнымі ўстановамі і арганізацыямі адукацыі, праводзіць стажыроўкі з мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню выкладчыкаў, ствараць сумесныя навучальныя ўстановы [18]. Акрамя таго, міжнародная дзейнасць прапісвалася ў іх статутах [19].

Створаная нарматыўна-прававая база не толькі ў агульным адлюстроўвала палітыку дзяржавы, але і вызначала перспектывы развіцця міжнародных навуковых сувязей. На канец 1998 г. Беларусь заключыла дамовы аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій з 23 краінамі свету. Сярод падпісаных дагавораў 10 – у галіне навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, 7 – у галіне гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, 9 – у сферы адукацыі, навукі, культуры і інш. [17, с. 8]. Айчынныя навукоўцы актыўна удзельнічалі ў праграмах «Капернікус», ІНТАС, ТАСІС, праектах у галіне канверсіі, падтрыманых Міжнародным навукова-тэхнічным цэнтрам і г. д. Пятнаццаць вышэйшых навучальных устаноў Беларусі ў 1997 г. мелі стасункі на аснове 139 дагавораў з вядучымі замежнымі універсітэтамі і фірмамі [20, с. 161]. Для падтрымкі прафесійных кантактаў асобных вучоных, выкладчыкаў універсітэтаў і невялікіх даследчых калектываў з замежнымі калегамі, навуковымі цэнтрамі, фондамі быў заснаваны Кансультацыйны цэнтр міжнароднага навуковага супрацоўніцтва. У другой палове 1990-х гг. толькі НАН Беларусі штогод камандзіравала за мяжу больш за 800 сваіх супрацоўнікаў і прымала каля 260 навукоўцаў і спецыялістаў [21, с. 197; 22, с. 186; 23, с. 155; 24, с. 193].

Такім чынам, у працэсе фарміравання навукова-тэхнічнага заканадаўства можна вылучыць два этапы: першы (1990–1996 гг.) – закладванне яго асноў, другі (з 1997 г.) – далейшае развіццё, якое характарызавалася ўзмацненнем дзяржаўнага кантролю навуковай дзейнасці, у тым ліку і міжнароднай. З прыняццем адпаведных паправак і стварэннем спецыяльных устаноў (Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях) улады імкнуліся адрэгуляваць дадзеную сферу. Менавіта ў разгледжаных вышэй прававых нормах увасобіліся мэты і задачы дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у гэтай галіне. Нацыянальнае заканадаўства ў сферы навукі стала базай, на якой грунтавалася сістэма шматлікіх міжнародных дагавораў і пагадненняў, што былі заключаны як беларускім урадам, так і асобнымі ведамствамі і ўстановамі рэспублікі з замеж-

ными і міжнароднымі навуковымі арганізацыямі. Усё гэта ў сукупнасці стварала неабходнае нарматыўна-прававое поле, якое было асновай міжнароднай навукова-тэхнічнай палітыкі Беларусі як аднаго з суб'ектаў і саўдзельнікаў працэсу сусветнай навуковай кааперацыі.

Літаратура і крыніцы

1. *Данилевич, В.* Правовое поле науки / В. Данилевич // Веды. – 1998. – 29 мая. – С. 3.
2. *Карелина, В.А., Меркулов, В.С.* Некоторые аспекты международного научно-технического сотрудничества / В.А. Карелина, В.С. Меркулов // Вузовская наука, промышленность, международное сотрудничество: материалы 2-й Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 14–16 окт. 1998 г.: в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т; под ред. В.Н. Попка. – Минск, 1998. – Ч. 1. – С. 149–153.
3. *Байков, В.* Вузовская наука: реальность и перспективы / В. Бойков // Веды. – 1998. – 5 снеж. – С. 3.
4. Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі: Закон Рэспублікі Беларусь, 19 студз. 1993 г., № 2105-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – № 7. – С. 20–33.
5. О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об основах государственной научно-технической политики»: Закон Республики Беларусь, 12 ноября 1997 г., № 83-З // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Республики Беларусь. – Минск, 2006.
6. Аб навуковай дзейнасці: Закон Рэспублікі Беларусь, 21 кастр. 1996 г., № 708-XIII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1996. – № 34. – С. 16–33.
7. О внесении изменений в Закон Республики Беларусь «О научной деятельности»: Закон Республики Беларусь, 31 дек. 1997 г., № 118-З // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Республики Беларусь. – Минск, 2006.
8. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР «О статусе Академии наук Белорусской ССР» // Навіны Беларускай акадэміі. – 1991. – 4 студз. – С. 4.
9. Академия. Путь к обновлению // Навіны Беларускай акадэміі. – 1991. – 4 студз. – С. 1–4.
10. Экспресс-интервью // Навіны Беларускай акадэміі. – 1991. – 4 студз. – С. 1–4.
11. Переходим на самоуправление? // Навіны Беларускай акадэміі. – 1991. – 25 студз. – С. 1–3.
12. Развивать и углублять фундаментальные исследования (Вступительное слово президента АН БССР академика В.П. Платонова на годичном Общем собрании Академии наук БССР 6 марта 1991 года) // Навіны Беларускай акадэміі. – 1991. – 22 сак. – С. 1–3.
13. О Национальной академии наук Беларуси: Указ Президента Республики Беларусь, 15 мая 1997 г., № 281: в ред. Указа Президента Республики Беларусь от 15.12.2000 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Республики Беларусь. – Минск, 2006.
14. Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: Закон Рэспублікі Беларусь, 5 мая 1998 г., № 159-З // Ведамасці Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. – 1998. – № 21. – С. 5–19.
15. Устав Национальной академии наук Беларуси // Веды. – 1998. – 4 снеж. – С. 3–8.
16. Вопросы Комитета по науке и технологиям при Совете Министров Республики Беларусь: Постановление Совета Министров Республики Беларусь, 30 июня 1994 г., № 479 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006.
17. Сведения о работе ГКНТ за 1998 год // Архіў Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. – Воп. 1. – Спр. 297. – Л. – 1–9.
18. Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь, 29 кастр. 1991 г., № 1202-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1991. – № 33 (35). – С. 3–23.
19. Об утверждении Устава Белорусского государственного университета: Указ Президента Республики Беларусь, 16 июня 1999 г., № 334 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Республики Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: <http://www.pravo.by/webnpa/text_txt.asp?RN=P39900334>. – Дата доступа: 26.06.2007.
20. Доклад о состоянии и перспективах развития науки в Республике Беларусь по итогам 1997 года // Архіў Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. – Воп. 1. – Спр. 297. – Л. – 143–162.
21. Справаздача аб дзейнасці Акадэміі навук Беларусі ў 1996 годзе / Акадэмія навук Беларусі. – Мінск, 1997. – 239 с.
22. Справаздача аб дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 1997 годзе / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск, 1998. – 219 с.
23. Справаздача аб дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 1998 годзе / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск, 1999. – 218 с.
24. Справаздача аб дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 1999 годзе / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск, 2000. – 265 с.

Summary

*In this article the author tries to show the forming of legislative base of the international science-technical cooperation of Belarus which took place in the 90th of 20th century. Attention is concentrated on those legislative statements which became fundamental in the scientific sphere and created the basic principles of mutually beneficial relations' development of the republic with the world scientific association. Intensive legislative activity which was developed in independent Belarus also affected the science.*

---

*УДК 931:37 (091)(476)*

***К.М. Цыбулька,***
*аспірант кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ*

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ АНТЫЧНАСЦІ Ў СІСТЭМЕ АСВЕТЫ І АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Вывучэнне гісторыі антычнага свету, старажытных моў у вучэбных установах Паўночна-Заходняга краю ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. тлумачыцца адносінамі міністэрства народнай асветы да паняцця адукацыі.

У 1850 г. Беларуская вучэбная акруга была перайменавана ў Віленскую і усё прапановы, якія тычыліся пераўтварэнняў сістэмы адукацыі, падпадалі пад юрысдыкцыю апекуна дадзенай акругі. Змены ў адукацыйнай сістэме Беларусі

выклікалі пэўныя зрухі ў метадах выкладання і вывучэнні гісторыі, гісторыі антычнасці ў прыватнасці. Яе роля ў адукацыйнай сістэме залежала ад статусу вучэбнай установы: гімназіі, прагімназіі, настаўніцкай семінарыі, гарадской вучэльні і ад ускладаемай на іх адукацыйнай функцыі, што вызначала ступень запатрабаванасці і характар выкладання гісторыі антычнасці.

Рэальнай базай для фарміравання ўстойлівых ведаў па гісторыі антычнасці бясспрэчна служылі гімназіі і прагімназіі класічнага тыпу. Яны вызначаліся высокім узроўнем выкладання, патрабаваннямі і наяўнасцю такіх прадметаў, як старажытныя мовы (лацінская і старажытнагрэчаская).

Уважлівае стаўленне да гісторыі антычнасці было прыўнесена і езуіцкімі вучэбнымі ўстановамі. Паводле вучэбнага плана, у Полацкім калегіуме, а затым і акадэміі (1812 г.), якая праіснавала да 1820 г., антычная гісторыя, літаратура і асабліва старажытныя мовы – старажытнагрэчаская і лацінская – складалі аснову выкладаемых курсаў [1, с. 18–21].

Такім чынам, да сярэдзіны XIX ст. гімназіі не былі адзінымі навучальнымі ўстановамі, дзе выкладаліся класічныя прадметы: старажытная мова, літаратура, гісторыя і г. д.

Па статуце гімназій і прагімназій ад 19 лістапада 1864 г., у Беларусі яны былі падзеленыя на класічныя і рэальныя. У аснову дзялення быў пакладзены прынцып адрознення ў наборы выкладаемых прадметаў.

«Вучэбны курс класічных гімназій складаюць наступныя прадметы: 1) Закон Божы, 2) руская мова з царкоўнаславянскай і славеснасцю, 3 і 4) лацінская і грэчаская мовы, 5) матэматыка, 6 і 7) фізіка і касмагонія, 8) гісторыя, 9) геаграфія, 10) натуральная гісторыя, 11 і 12) нямецкая і французская мовы, 13) маляванне і красленне. Заўвага: выкладанне лацінскай мовы ўводзіцца неадкладна ва ўсіх класічных гімназіях, а грэчаскай – паступова, па меры падрыхтоўкі настаўнікаў гэтай мовы» [2, с. 577]. Скончыўшыя класічную гімназію студэнты маглі працягнуць сваю адукацыю ва універсітэтах.

У рэальных гімназіях акцэнт рабіўся на дакладныя навукі, былі выключаныя з выкладання лацінская і грэчаская мовы. Дадзеная вучэбная ўстанова не давала магчымасць паступлення ва універсітэт. Прагімназіі – гэта 4 ніжэйшыя класы гімназій.

Класічныя гімназіі таксама не былі аднатыпнымі вучэбнымі ўстановамі. Яны дзяліліся на гімназіі з дзвюма старажытнымі мовамі і больш высокім коштам і адной – лацінскай, з ніжэйшым коштам за навучанне.

На падставе статута ад 5 верасня 1864 г., у Віленскай вучэбнай акрузе было пераўтворана 12 гімназій і 3 прагімназіі. Да яе ў 1864 г. былі далучаны Віцебская і Магілёўская гімназіі. Гарадзенская, Віцебская і Магілёўская гімназіі былі пераўтвораныя ў класічныя з выкладаннем дзвюх старажытных моў, Віцебская і Магілёўская – у класічную гімназію з адной лацінскай мовай. Пінская гімназія стала рэальнай, а Слуцкая – класічнай са старажытнагрэчаскай і лацінскай мовамі [3, с. 15].

У 1868 г. у Беларусі было васемнаццаць сярэдніх навучальных устаноў: шэсць мужчынскіх і чатыры жаночыя гімназіі, дзве прагімназіі, чатыры духоўныя семінарыі, кадэцкі корпус у Полацку і земляробчая вучэльня. Пераўтварэнні гімназічнай адукацыі ў Расійскай імперыі ў 1869 г. закранула Віленскую вучэбную акругу. Па адным з пунктаў у новай рэформе прапісвалася, што па кожным накірунку распрацоўваецца план, «абавязковы для ўсіх гімназій і прагімназій» [4, с. 517]. У 1871 г., паводле дадаткаў у статуце гімназій і прагімназій, рэальныя гімназіі і прагімназіі былі перatвораныя ў рэальныя вучэльні. Гімназіі сталі адзінымі цэнтрамі атрымання класічнай адукацыі. У іх быў усталяваны васьмігадовы тэрмін навучання [5, с. 81].

Да пачатку XX ст. у Беларусі існавала 14 дзяржаўных і 5 прыватных мужчынскіх гімназій, 17 дзяржаўных і 23 прыватныя жаночыя гімназіі.

Класічныя гімназіі сталі цэнтрамі падрыхтоўкі выдатных гісторыкаў антыказнаўцаў. Падставай гэтаму паслужыла вывучэнне не толькі гісторыі антычнасці, але і старажытных моў, якія дазваляюць больш дэталёва займацца даследаваннем гісторыі Старажытных Грэцыі і Рыма. Паводле пратакола 1-га пасяджэння камісіі па пытанні аб перакладзе са старажытных моў на айчынную ад 18 лютага 1887 г., паказвалася, што «исторические писатели должны предпочитаться поэтам между прочим в видах увеличения запаса исторических сведений учеников» [6, с. 8]. Відавочна, што вывучэнне старажытнагрэчаскай і лацінскай моў вялося ў цеснай сувязі з гісторыяй антычнасці, на прыкладзе твораў аўтараў адзначанага перыяду [6, с. 58]. Такім чынам, вынікам працы камісіі стала не толькі азначэнне тэрмінаў, умоў перакладу, але і дакладнае ўказанне на тое, працы якіх аўтараў варта выкарыстоўваць пры вывучэнні старажытных моў, з указаннем на класы [6, с. 60].

На чытанне старажытных аўтараў адводзілася ў сярэднім 2–3 урокі ў тыдзень. У 1878 навучальным годзе на вывучэнне «Іліяды» ў 7 класе Гарадзенскай гімназіі адводзілася 3 урокі ў першым паўгоддзі. У другім паўгоддзі планавалася: Платон – 3 урокі і Гамер – 2 урокі. У 8 класе вучэбнымі планамі прадугледжвалася на вывучэнне Сафокла – 2 урокі, Дэмасфена – 4 урокі ў тыдзень [7, с. 340]. Падобныя заняткі ў значнай ступені спрыялі вывучэнню палітычнай і культурнай гісторыі антычнай цывілізацыі.

Вывучэнне гісторыі антычнасці ў класічных гімназіях на тэрыторыі Беларусі адводзіў-

ся ўвесь вучэбны год, што пацвярджаецца журналам 4 класа Віцебскай мужчынскай гімназіі І.Р. Неруша за 1912 г. Вывучэнне гісторыі Старажытнай Грэцыі ўяўляла сабой разгляд рэлігіі, міфаў, філасофскіх поглядаў грэкаў, агульныя тэмы развіцця афінскай дзяржавы з найбольш знакамітымі гістарычнымі дзеячамі: Салона, Пісістрата, Піліпа і Аляксандра Македонскага, вайсковыя падзеі: Грэка-Персідскія войны, Пелапанеская вайна, Паход Аляксандра Македонскага ў Персію. Дэталёва разглядалася гісторыя Грэцыі пры Аляксандры Македонскім: «Аляксандр Македонскі і яго паход у Персію» (4 урокі), «Дзейнасць Аляксандра Македонскага», «Лёс Манархіі Аляксандра Македонскага» [8, л. 59–100]. Аднак гісторыя Старажытнага Рыма прадстаўлена пераважна дзейнасцю імператараў, іх барацьбой («Барацьба Сулы і Марыя»), законамі («Законы 12 Табліц, Законы Ліцынія і Секцыя») і рэформамі («Рэформы Ю. Цэзара, эпоха рэформ і абсалютызму»). Вялікая ўвага надавалася ваеннай гісторыі Рыма [8, л. 59–100]. Відавочна, што гісторыя Рыма ўяўляла ў плане дзяржаўнай улады імперыі большую цікавасць для вывучэння ў гімназіях. Расійскай імперыі на чале з імператарам быў бліжэй Рым, а не дэмакратычная Грэцыя. З іншага боку, выкладанне гісторыі вялося ў мужчынскай гімназіі, дзе ваенная гісторыя магла ўяўляць большую цікавасць для выхаванцаў.

Пра значэнне гісторыі і старажытных моў у сістэме выкладання ў гімназіях сведчыць і факт наяўнасці іспытаў па адзначаных прадметах, пры пераходзе з аднаго класа ў іншы.

У мужчынскіх гімназіях ( і прагімназіях), «пайменаваных у п. 4 Найвысокага наказу 20-га ліпеня 1902 г.» вусныя іспыты праходзілі: «У 4 класе – па лацінскай мове, гісторыі, нямецкай мове. У 6 класе – па Законе Божым, рускай, лацінскай, нямецкай мовах, фізіцы. У 8 класе – па гісторыі і французскай мове». У мужчынскіх гімназіях, «пайменаваных у п. 3 Найвысокага наказу 20-га ліпеня 1902 г.»; у 4 класе – па лацінскай мове, гісторыі і геаграфіі; у 6 класе – па Законе Божым, рускай мове, фізіцы, лацінскай мове, грэчаскай; у 7 класе – па гісторыі і адной з новых моў. У мужчынскіх гімназіях, «пайменаваных у п. 2 Найвысокага наказу 20-га ліпеня 1902 г.»; у 3 класе – па рускай мове, лацінскай мове і геаграфіі; у 4 класе – па грэчаскай мове, гісторыі, геаграфіі і адной з новых моў» [9, л. 9].

Відавочна, што гісторыя і старажытныя мовы ўяўлялі сабой не толькі асноўныя прадметы, але і з'яўлялася індыкатарамі па азначэнні здольнасцей вучняў на наступны працяг вучобы ў гімназіі.

Вывучэнне гісторыі антычнасці ў беларускіх гімназіях знаходзілася на досыць высокім узроўні, пра што сведчыць наяўнасць у бібліятэках гімназій фундаментальных прац па гісторыі антычных цывілізацый. Творы М.С. Куторгі «История Афинской республики от убиения Иппарха до смерти Мельтиада» 1848 г. знаходзілася ў бібліятэцы Слуцкай гімназіі. Яго праца «Новая книга о Перикле» (1880) – у Мсціслаўскай, твор Бузескула «История афинской демократии» (СПб., 1909 г.) папоўніла бібліятэчны фонд Полацкай мужчынскай гімназіі.

Пры даследаванні каталога фундаментальнай бібліятэкі Віцебскай і Полацкай мужчынскіх гімназій выявілася, што гісторыі антычных дзяржаў у гімназіях класічнага тыпу надавалася значная ўвага. Усе кнігі, прысвечаныя гісторыі антычных цывілізацый, умоўна падзелены на кнігі мастацкага характару, навуковыя даследаванні розных бакоў жыцця старажытнага свету і творы старажытных аўтараў. Да кніг мастацкага характару адносяцца творы, у якіх адлюстравана дзейнасць старажытных герояў, міфічныя бакі жыцця старажытных грэкаў і рымлян (В. Сиповский. История древней Греции в рассказах и картинках. СПб., 1903 г.; История греческих героев, рассказанная Нибуром своему сыну. М., 1904; Рассказы из греческой мифологии; Рассказы из Римской империи. М., 1904) [10, л. 105].

З ліку твораў старажытных аўтараў найбольшую цікавасць уяўлялі творы Гамера «Іліяда», паэма ў 24 песнях; Зборнік старажытных класікаў: Сафокл, Арыстафан; «Адысея» Гамера (у 3-х кнігах); «Гістарычная хрэстаматыя» Пакроўскага [11]. У Полацкай гімназіі знаходзіліся творы Лівія Ціта; выданні Манштэйна, Гарацыя [12].

Знаёмства з гістарычнай спадчынай Грэцыі і Рыма вялося не толькі на ўроках гісторыі і старажытных моў. Усебакова вывучаліся гісторыя і творы мастацтва старажытных майстроў. Ні адзін кабінет малявання гімназіі не абыходзіўся без скульптур і статуй грэчаскіх і рымскіх багоў, герояў, гістарычных дзеячаў. Гэта давала магчымасць знаёмства не толькі з класічнай манерай працы старажытных мастакоў і скульптараў, але і фарміравала ўяўленні навучэнцаў аб антычнай гісторыі мастацтваў, міфаў і рэлігіі. Паводле дамовы дырэктара Полацкай гімназіі ад 18 кастрычніка 1916 г., кабінет малявання папоўнілі злепкі постацей Венеры Мілоскай, Гермеса, Апалона Бельвадэрскага, Сафокла, Дыскабола. Бюсты Рома ў касцы, Дыяны, Аляксандра Македонскага, Марка Аўрэлія, Гамера і іншых [13, л. 45].

Відавочны той факт, што класічныя гімназіі сталі асноўнымі цэнтрамі ўсебаковага вывучэння антычнай гісторыі. Так, у гімназіі мелі права працаваць выкладчыкі, якія скончылі універсітэт. Указам ад 1860 г. было зацверджана пастанова аб педагагічных курсах у Санкт-Пецярбургскім, Маскоўскім, Кіеўскім, Харкаўскім і Казанскім універсітэтах.

24 лютага 1863 г. выйшла пастанова міністэрства народнай асветы аб назначэнні стыпендый для падрыхтоўкі настаўнікаў гімназій і прагім-

назій у Заходніх губернях. У Маскоўскім, Казанскім і Харкаўскім універсітэтах засноўвалася да 60 стыпендый на гісторыка-філалагічным, фізіка-матэматычным факультэтах, для падрыхтоўкі настаўнікаў гімназій і прагімназій [2, с. 457]. Дзякуючы заснаваным стыпендыям некаторыя выхадцы з беларускіх зямель атрымалі магчымасць працягваць сваю адукацыю ў галіне антычнай гісторыі.

Падрыхтоўка педагогаў для гімназій, здольных выкладаць гісторыю антычных цывілізацый і старажытныя мовы, праводзілася на курсах пры універсітэтах па наступных спецыяльнасцях: лацінская і грэчаская мовы, усеагульная і руская гісторыя, палітычная геаграфія [5, з. 60].

Вывучэнне гісторыі антычнасці вялося і ў іншых тыпах адукацыйных устаноў. Пра гэта сведчыць той факт, што паводле каталога вучэбных выданняў па гісторыі і геаграфіі І.П. Максімава на 1916–1917 навучальны год, карты па гісторыі Старажытнай Грэцыі і Рыма былі ўхваленыя навуковым камітэтам міністэрства народнай асветы і «дапушчаны да ўжывання ў сярэднія гарадскія ўстановы і гарадскія вучэльні» [ 13, л. 4].

Гісторыя антычнасці не ўваходзіла ў лік абавязковых прадметаў у пачатковай школе. Падрыхтоўка настаўнікаў для пачатковых школ ажыццяўлялася ў настаўніцкай семінарыі, якая была адкрыта ў 1864 г. у Маладзечне. Гісторыя антычнасці вывучалася ў агульных рысах, дакладней, уваходзіла ў склад «Кароткай усеагульнай гісторыі». Прычына такога выкладання ў настаўніцкай семінарыі абгрунтоўвалася тым, што настаўнікі, якія яе закончаць, будуць працаваць у пачатковых вучэбных установах для нешляхецкага саслоўя. Пасля іх заканчэння дзеці не змогуць паступіць у гімназію і працягнуць адукацыю ва універсітэце. Такім чынам, наяўнасць у іх ведаў па старажытных мовах з'яўлялася неабавязковай, а па гісторыі неабходна падрабязнае веданне рускай гісторыі і кароткае – ўсеагульнай. Студэнты настаўніцкай семінарыі вывучалі тыя прадметы, якія ў будучым яны павінны былі выкладаць сваім вучням.

У настаўніцкіх інстытутах гісторыя антычнасці ўваходзіла ў склад абавязковых прадметаў, пра што сведчыць вытрымка са справаздачы за 1878 г. па кіраванні Віленскім настаўніцкім інстытутам. Гісторыя антычнасці выкладалася ў першым класе інстытута. Для праверкі і замацаванні ведаў, атрыманых студэнтамі, уводзіліся пісьмовыя практыкаванні. Так, па антычнай гісторыі былі прапанаваныя да напісання наступныя тэмы: «Міжземнае мора ў гістарычным стаўленні», «Аб прычынах і выніках барацьбы грэкаў з персамі» [14, с. 11]. Такім чынам, навучэнцы інстытута павінны былі не проста валодаць атрыманымі ведамі па гісторыі, але і ўмець рабіць самастойныя высновы і ў пісьмовым выглядзе выказваць свае меркаванні.

Вывучэнне гісторыі антычнасці, распачатае з падставы Полацкага калегіума, працягвалася практычна ва ўсіх навучальных установах Беларусі. Найбольш грунтоўнае вывучэнне антычных цывілізацый праходзіла ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. у гімназіях класічнага тыпу і суправаджалася ўважлівым стаўленнем да старажытных моў. Пры гэтым ёсць усе падставы меркаваць, што гісторыя антычнасці выкладалася і ў іншых навучальных установах, што пацвярджаецца архіўнымі дакументамі.

### *Літаратура і крыніцы*


1. *Сапунов, А.П.* Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А.П. Сапунов. – Полоцк: Издатель Л.Ф. Данько, 1997. – 29 с.
2. Сборник постановлений по Министерству Народного Просвещения. Т-3. Царствование императора Александра II. (1855–1864) СПб.: Типография императорской академии наук, 1871.
3. *Пастухова З.А.* Среднее образование в дореволюционной Белоруссии / З.А. Пастухова. – Минск: Из-во Мин-ва образования БССР, 1963. – 85 с.
4. Исторический обзор деятельности Министерства народного просвещения. 1802–1902 / сост. С.В. Рождественский. СПб.: Изд. Мин-ва нар. просв., – 1902.
5. *Мазуркевич В.П.* Народное образование на территории Белоруссии в XVI – XX вв. (до октября 1917 г.) // Исторический очерк / В.П. Мазуркевич. – Минск: БНТУ, 2004. – 130 с.
6. Протоколы комиссии, назначенной попечителем Виленского учебного округа для обсуждения вопросов о подъёме успехов учеников гимназий и прогимназий Виленского учебного округа по русскому языку и о введении письменных переводов с древних языков на русский. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1887.
7. Извлечение из отчёта по управлению Гродненской гимназии за 1878 год. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1879.
8. Циркуляр по Виленскому учебному округу – 1879. – № 11–12.
9. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Фонд 2623. – Оп. 1 – Д. 30. Журнал 4 класса Витебской мужской гимназии И.Р. Неруша за 1912 уч. год.
10. НИАБ. – Фонд 2623. – Оп. 1. – Д. 9. Дело Витебской частной гимназии И.Р. Неруша за 1908 г.
11. НИАБ – Фонд 2608. – Оп. 1. – Д. 17. Дело Полоцкой мужской гимназии. Выписки библиотечных книг и учебных пособий за 1916 год.
12. НИАБ. – Фонд 2623. – Оп. 1. – Д. 6. Каталог книг фундаментальной библиотеки гимназии. Витебская мужская гимназия И.Р. Неруша.
13. НИАБ. – Фонд 2608 – Оп. 1. – Д. 3. Полоцкая мужская гимназия. Выписка из библиотечных книг и учебных пособий за 1916 г.
14. НИАБ. – Фонд 2608 – Оп. 1. – Д. 55. Полоцкая мужская гимназия г. Полоцк Витебской губернии. Педагогический совет. Дело о выписке библиотечных книг и учебных пособий (1 января 1916 года – 23 декабря 1916 года).
15. Из отчета по управлению Виленским Учительским институтом с состоящим при нем городским двухклассным училищем // Циркуляр по Виленскому учебному округу. – 1879 – № 1.


### *Summary*


*The ancient history is the essential part of the classic education. The gymnasiums in Belarus in the middle of XIX$^{th}$ till the beginning of XX$^{th}$ century were the main educational establishments to provide essential learning of the ancient history. The reason was not only in teaching the history of ancient Greece and Rome but the ancient languages as well, such as Latina and Greek. Reading the works created by ancient philosophers, poets, writers provided students with the possibility to understand the different aspects of the ancient history. But only the Gymnasiums of classic type examined the ancient history more detailed.*

*УДК 930 «1991/2005»*

***Т.С. Будзянкова,***
*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ АЙЧЫННЫХ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ (1991–2005 гг.)

Актуальнасць гістарыяграфічных даследаванняў у наш час абумоўлена шэрагам фактараў. Па-першае, неабходнасцю высвятлення стану і перспектыў распрацоўкі найбольш важных праблем як айчыннай, так і замежнай гісторыі. Па-другое, яны маюць каштоўнасць як даследаванні па гісторыі гістарычнай навукі, што садзейнічаюць знаёмству з навуковай творчасцю раней невядомых даследчыкаў і школ. У шырокім сэнсе тэрмін «гістарыяграфія» выкарыстоўваюць як сінонім гістарычнай навукі, аднак такое азначэнне сёння ўжываецца рэдка. У іншых выпадках гістарыяграфіяй называюць або гісторыю гістарычнай навукі, або сукупнасць гістарычных даследаванняў, аб'яднаных агульнымі рысамі. Найбольш разгорнутае апісанне прадмета гістарыяграфіі прапанаваў расійскі гісторык Л.Я. Файн [1, с. 23]. Ю.У. Несцяровіч лічыць, што тэрмінам «гістарыяграфія» аптымальна абазначаць выключна спецыяльную гістарычную дысцыпліну [2, с. 153].

У высновах даследавання, праведзенага Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пазначана, што сярод разнастайных праблем гістарычнай навукі прыярытэтнымі на 2006–2010 гг. з'яўляюцца ў першую чаргу «развіццё і ўдасканаленне метадалогіі гістарычнай навукі, дакладнае фармуляванне яе асноўных прынцыпаў» [3, с. 65]. Між тым відавочна, што спецыяльна-гістарыяграфічнае і канкрэтна-гістарычнае даследаванне – гэта не адно і тое ж. І калі адносіны навуковай грамадскасці да метадалагічных праблем гістарычнай навукі на працягу 1991–2005 гг. былі даволі зацікаўленымі, то інакш выглядалі справы з распрацоўкай метадалагічных аспектаў гістарыяграфіі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны. Нават падчас навуковых канферэнцый, што мелі ў сваёй назве тэрмін «гістарыяграфія», амаль не абмяркоўваліся праблемы яе метадалогіі [4]. У пэўнай ступені яны закраналіся ў асобных навуковых зборніках [5]. Прац, прысвечаных тэарэтыка-метадалагічным асновам гістарыяграфічных даследаванняў, у айчыннай навуцы фактычна няма. Апошнім па часе выданнем з'яўляецца навучальны дапаможнік А.І. Зевелева [6].

Мэта дадзенага артыкула – аналіз метадалагічных асноў дысертацыйных прац гістарыяграфічнай праблематыкі, што былі абаронены ў Рэспубліцы Беларусь з 1991 да 2005 г. па спецыяльнасці 07.00.09 (гістарыяграфія, крыніцы і метады гістарычнага даследавання). Па нашых падліках, было падрыхтавана 20 такіх прац (у тым ліку 4 доктарскіх). У якасці крыніц былі выкарыстаны адпаведныя аўтарэфераты дысертацый. Прымяненне гісторыка-параўнальнага метаду дазволіла ажыццявіць тыпалогію даследаванняў паводле іх прадмета.

***Метадалагічныя асновы дысертацыйных прац.*** Навуковую канцэпцыю гістарыяграфічнага вывучэння культуры Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. пабудаваў Г.А. Кахаmake Каханоўскі [7]. Ён разглядаў гэты працэс праз прызму дзейнасці разнастайных навуковых арганізацый таго часу як цэласнае і бесперапыннае станаўленне навуковых ведаў па археалогіі, гістарычным краязнаўстве і фалькларыстыцы. Гісторык абмежаваўся пералікам прозвішчаў навукоўцаў, творчы вопыт якіх ён выкарыстаў, аднак не вызначыў метадалагічную аснову ўласнага даследавання. Праца выканана на аснове шырокага кола разнастайных крыніц: археалагічных, гістарычных, фальклорыстычных, этнаграфічных, мастацтвазнаўчых, краязнаўчых, музеязнаўчых, архіўных і інш. [7, с. 7].

Наватарскі падыход да вывучэння беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі прадстаўлены ў доктарскай дысертацыі Дз.У. Карава. Мэтай гэтага даследавання з'яўлялася вывучэнне гісторыка-культурнай глебы і механізмаў, што фарміравалі гістарычную памяць беларусаў у кантэксце развіцця найбольш роднасных па гістарычным лёсе славянскіх культур [8, с. 10]. Навуковец прапанаваў уласную тыпалогію гістарыяграфічных крыніц па праблеме, падзяліўшы іх на: 1) перыядычны друк, 2) мемуары (і блізкія да іх дзённікі), 3) дакументы справаводства, 4) фонды прыватна-сямейнага паходжання, 5) «уласна гістарычныя» крыніцы (працы гісторыкаў, навуковых устаноў і інш.). Даследчык падкрэсліў звязанасць крыніцы з асобай яе аўтара і неабходнасць расшыфроўкі структур мыслення, пачуццяў, светаўспрымання стваральніка крыніцы і таго сацыяльна-культурнага асяроддзя, у якое ён быў «уключаны». Дасягненню такой мэты, па меркаванні Дз.У. Карава, спрыяе прыцягненне тэхналогій сацыяльнай гістарычнай псіхалогіі [8, с. 13–14]. Пры вывучэнні біяграфіі гісторыка рэкамендавана не абмяжоўвацца разглядам толькі грамадска-палітычнай і навуковай «сфер» яго жыцця, але і паказаць індывідуальную псіхалогію даследчыка [8, с. 20].

Агульнай рысай кандыдацкіх дысертацый П.С. Кручака, А.У. Курылы, М.І. Мацюшэўскай, А.М. Мялешкі з'яўлялася імкненне асвятліць

навуковую і грамадскую дзейнасць, біяграфіі асобных гісторыкаў і вызначыць месца і ролю апошніх як у гістарычнай навуцы пэўнага перыяду і рэгіёну, так і ў распрацоўцы канкрэтных праблем. Рэканструкцыя прадмета даследавання праводзілася з выкарыстаннем разнастайных крыніц, тыпалогія якіх амаль заўсёды супадала з распрацаванай Дз.У. Каравым. Між тым некаторыя дысертанты імкнуліся праявіць ініцыятыву ў вызначэнні шэрагу метадалагічных праблем. М.І. Мацюшэўская ўказала на дыскусійнасць у навуцы метаду вывучэння прац гісторыкаў мінулага і, з апорай на канцэпцыю гуманітарных ведаў М.М. Бахціна, прапанавала ўласнае бачанне праблемы [9, с. 9]. У разглядаемай працы адзначана гістарыяграфічная нераспрацаванасць праблемы універсітэцкіх школ расійскіх гісторыкаў і праведзены агляд навуказнаўчых падыходаў да гэтай з'явы [9, с. 15–16]. А.У. Курыла пазнаёміў айчынных даследчыкаў з прынцыпамі гісторыі гістарычнай навукі. Гэты кірунак сучаснай гістарыяграфіі стаў вядомы ў Францыі ў 70-я гг. XX ст. Ён арыентаваны не столькі на вывучэнне інтэлектуальнага прагрэсу гістарычнай навукі, колькі на разгляд сацыялагічнай асновы яе функцыяніравання. Асноўнае месца сярод метадаў дадзенай дысертацыі займаў прынцып кантэкстуалізацыі, які мяркуе вывучэнне тэкстаў у цеснай сувязі з даследаваннем інтэлектуальнага і гістарычнага кантэксту іх напісання. А.У. Курыла прапанаваў схему аналізу, якая дазволіла ўдакладніць і развіць уласныя высновы адносна сутнасці і ідэалагічнага значэння поглядаў навукоўцаў мінулага [10, с. 6].

Новай рысай айчынных гістарыяграфічных даследаванняў можна лічыць з'яўленне прац, прысвечаных вывучэнню асобных плыней ці школ у гістарычнай навуцы, аб'ектыўны аналіз якіх у савецкі час было немагчыма зрабіць. Гэта – кандыдацкія працы А.В. Кур'яновіча, А.У. Літвінскага, Дз.С. Самахвалава, В.М. Шутавай, доктарская праца В.І. Мянькоўскага. Каштоўнасць іх для метадалогіі гістарыяграфіі заключалася перш за ўсё ў рэальным адмаўленні ад прынцыпу партыйнасці, які азначаў «класавую непрымірымасць да буржуазнай гістарыяграфіі, антымарксісцкіх, антыленінскіх ідэй, поглядаў, да іх творцаў і класавых натхняльнікаў» [6, с. 67]. А.У. Літвінскі вызначыў час і прычыны ўзнікнення заходнерусізму як гістарыяграфічнай з'явы. Для гэтага былі выкарыстаны, акрамя навукова-гістарычных прац, перыядычны друк, мемуары і дзённікі, разнастайная дакументацыя, прыватна-сямейныя фонды [11, с. 7]. В.І. Мянькоўскі прапанаваў мадэль вывучэння нацыянальнай і рэгіянальнай гістарыяграфіі як цэласнай сістэмы. Навуковец распрацаваў паняцце «гістарыяграфічны комплекс», які ўключае арганізацыйны, тэматычны і метадалагічны кампаненты. Генезіс такога комплексу разгледжаны як працэс [12, с. 4].

Найбольшую групу даследаванняў склалі працы, прысвечаныя гісторыі вывучэння пэўнай навуковай праблемы. Да іх мы аднеслі кандыдацкія дысертацыі А.А. Буглака, Н.У. Казлоўскай, І.Р. Кулевіч, Л.Ю. Малыхінай, Э.В. Русь, А.А. Савіча, С.А. Сіткевіча, доктарскую дысертацыю Э.Р. Іофэ. Апошні звярнуў увагу на праблему перыядызацыі савецкай гістарычнай навукі, падкрэсліў эфектыўнасць прымянення храналагічнага, праблемнага і храналагічна-тэматычнага метадаў у выкладанні матэрыялу. У якасці гістарыяграфічных крыніц навуковец выкарыстаў таксама архіўныя матэрыялы. Вышэйадзначаныя апублікаваныя крыніцы: манаграфіі, кнігі, брашуры, артыкулы, зборнікі дакументаў і крыніцазнаўчыя агляды, кандыдацкія і доктарскія дысертацыі і іх аўтарэфераты, матэрыялы дыскусій і сімпозіумаў, рэцэнзіі і даведачная літаратура – у нейкай ступені праграмныя, паколькі яны характэрны для ўсіх прац гэтай групы [13, с. 26–27]. Указаны спіс некалькі пашырыўся ў кандыдацкіх працах, абароненых у 2001–2005 гг.: у ім з'явілася мемуарная і вучэбная літаратура. Л.Ю. Малыхіна назвала апошнюю адносна новай і спецыфічнай, але надзвычай важнай, таму аналізу крыніц такога тыпу прысвяціла асобную главу дысертацыі [14, с. 7]. Э.В. Русь прааналізавала гістарычную думку ФРГ і ГДР, прысвечаную асэнсаванню германскага пытання ў другой палове XX ст., гэта значыць, аб'ект яе даследаваня супадае па часе існавання з уласным аб'ектам. Таму навукоўца палічыла неабходным аднесці да гістарыяграфічных крыніц працы сацыёлагаў і палітолагаў, а пры іх аналізе прымяніць міждысцыплінарную інтэгратыўную метадалогію, якая дае магчымасць у найбольш поўнай ступені спалучаць элементы гісторыка-апісальнага і сацыялагічнага метадаў [15, с. 7–8].

Разам з тым неабходна звярнуць увагу на шэраг момантаў, звязаных з недакладным ужываннем дысертантамі метадалагічнай тэрміналогіі. Напрыклад, Г.А. Каханоўскі ўказвае на выкарыстанне «праблемна-храналагічнага *метаду* даследавання» [7, с. 5], а Э.Р. Іофэ – «храналагічна-тэматычнага *прынцыпу* даследавання» [13, с. 26]. У некаторых працах ужываецца «параўнальна-гістарычны», у іншых – «гісторыка-параўнальны» метад. У дысертацыі Л.Ю. Малыхінай супадаюць прадмет і крыніцы даследавання [14, с. 2, 7].

***Высновы.*** Прааналізаваныя дысертацыйныя даследаванні могуць быць падзелены на чатыры групы, прысвечаныя вывучэнню: 1) арганізацыйнай структуры нацыянальнай гістарычнай навукі канца XVIII – пачатку XX ст.; 2) жыццю і дзейнасці асобных гісторыкаў; 3) канкрэтных плыней і накірункаў як айчыннай, так і замежнай гістарычнай навукі; 4) гісторыі распрацоўкі пэўных навуковых праблем.

Пераважная большасць дысертантаў падкрэслівае сваю згоду з кумулятыўнай мадэллю

развіцця навукі і карыстаецца традыцыйнымі спецыяльна-гістарычнымі метадамі. Апошняе звязана як з іх універсальнасцю, так і з адсутнасцю даследаванняў, прысвечаных тэарэтыка-метадалагічным асновам гістарыяграфіі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны. Для прац другой паловы 1990 – пачатку 2000-х гг. характэрна даволі частае ўжыванне спецыяльных тэрмінаў: «гістарыяграфічная сітуацыя», «гістарыяграфічная традыцыя», «гістарыяграфічная з'ява», што сведчыць аб павышэнні навуковага статусу гістарыяграфіі.

На наш погляд, для паспяховага супрацоўніцтва і павышэння статусу айчыннай гістарычнай навукі на міжнародным узроўні наспела неабходнасць распрацоўкі тэарэтыка-метадалагічных асноў гістарыяграфіі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны. Гэта датычыцца як удакладнення тэрміналогіі, так і знаёмства з вопытам замежных даследчыкаў.

Літаратура і крыніцы

1. *Файн, Л.Е.* Материалы к изучению историографии отечественной истории в советский период (1917–1991 гг.) / Л.Е. Файн – М.: Тип ГПИБ, 2005. – 185 с.
2. *Несцяровіч, Ю.У.* Тэарэтычныя праблемы метадалогіі гісторыі, гістарыяграфіі, навуказнаўства і этналогіі / Ю.У. Несцяровіч. – Мінск: БелНДІДАС, 2004. – 161 с.
3. Историческая наука в Беларуси (1991–2000 гг.): современные проблемы и кадры: научный отчет / Ю.Н. Бохан [и др.]; науч. рук. Г.В. Корзенко. – Минск: Бел. наука, 2005. – 82 с.
4. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 6–7 кастр. 1999 г. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Дэполіс, 2000. – 345 с.
5. *Шутова, О.М.* Историография и интеллектуальная история: домены под подозрением / О.М. Шутова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал.: С.М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш]. – Мінск: БДУ, 2005. – С. 36–41 і інш.
6. *Зевелев, А.И.* Историографическое исследование: методологические аспекты: учеб. пособие для студ. вузов, обучающихся по спец. «История» / А.И. Зевелев. – М.: Высш. шк., 1987. – 160 с.
7. *Кохановский, Г.А.* Историография изучения культуры Беларуси в конце XVIII – начале XX вв. (Становление научных знаний по археологии, историческому краеведению и фольклористике): автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.09 / Г.А. Кохановский; Ин-т истории АН Беларуси. – Минск, 1992. – 85 с.
8. *Карев, Д.В.* Белорусская историография в конце XVIII – начале XX в.: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.09 / Д.В. Карев; Ин-т истории АН Беларуси. – Минск, 1995. – 50 с.
9. *Матюшевская, М.И.* Методология исторического исследования в трудах В.О.Ключевского: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / М.И. Матюшевская; БГУ. – Минск, 1997. – 26 с.
10. *Курило, А.В.* Концепция Великой Французской революции Франсуа Фюре и ее идейно-политическое значение: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / А.В. Курило; БГУ. – Минск, 2002. – 17 с.
11. *Литвинский, А.В.* Западноруссизм в российской историографии второй половины XIX – начала XX века: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / А.В. Литвинский; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2004. – 20 с.
12. *Меньковский, В.И.* Власть и советское общество 1930-х годов в англо-американской историографии: автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.09 / В.И. Меньковский; БГУ. – Минск, 2002. – 35 с.
13. *Иоффе, Э.Г.* Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX века: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.09 / Э.Г. Иоффе; Ин-т истории АН Беларуси. – Минск, 1993. – 49 с.
14. *Малыхіна, Л.Ю.* Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР: аўтарэф. дыс … канд. гіст. навук: 07.00.09 / Л.Ю. Малыхіна; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2003. – 29 с.
15. *Русь, Э.В.* Германский вопрос во второй половине XX века в исторической мысли ФРГ и ГДР: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / Э.В. Русь; БГУ. – Минск, 2005. – 20 с.

Summary

*The autor analyses the methodological base of the dissertatations which have been dedicated to historiographical problems and defended in 1991–2005 in Belarus.*

---

*УДК 37(091) «19»:023*

***А.Г. Сарока,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ РАБОТНІКАЎ У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 20-х гг. XX ст.

З усталяваннем савецкай улады пачала праводзіцца палітыка павышэння агульнакультурнага і адукацынага ўзроўню насельніцтва. Адным з метадаў вырашэння гэтага пытання было адкрыццё шырокай сеткі бібліятэк. У адпаведнасці з матэрыяльнымі магчымасцямі сетка бібліятэк у Савецкай Беларусі была абмеркавана і прынята на Першай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў, якая адбылася ў снежні 1921 г. [1, с. 46]. Змяненне ў гэтай галіне на працягу 20-х гг. XX ст. выглядала так [2, с. 45]:

| *1921/22* | *1922/23* | *1923/24* | *1924/25* | *1925/26* | *1926/27* | *1927/28* | *1928/29* | *1929/30* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 445 | 394 | 404 | 376 | 349 | 270 | 276 | 631 | 640 |

Адсюль вынікае, што да сярэдзіны 20-х гг. колькасць бібліятэк паменшылася. Звязана гэта з рэалізацыяй Галоўпалітасветам БССР плана адзінства сеткі культурна-асветніцкіх устаноў. Згодна з ім быў прызнаны нежыццяздольным вопыт існавання самастойных валасных бібліятэк.

Таму яны былі аб'яднаны з народнымі дамамі і хатамі-чытальнямі. Самастойныя бібліятэкі заставаліся толькі ў вялікіх акруговых і раённых гарадах [3, л. 76]. Толькі з 1928 г. назіраецца рост бібліятэчнага будаўніцтва.

Акрамя самастойных бібліятэк адкрываліся, хаця і не вельмі разнастайныя і багатыя па кніжным фондзе, бібліятэкі пры хатах-чытальнях, народных дамах, клубах.

Галоўнай праблемай для іх дзейнасці стаў недахоп і неадпаведнасць кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў. З пачатку 20-х гг. ХХ ст. кіраўніцтва краіны і камуністычнай партыі праз свае органы (Народы камісарыят асветы і Галоўны палітыка-асветны камітэт рэспублікі) праводзяць шэраг мерапрыемстваў па вырашэнні пытання прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў. У мэтах падрыхтоўкі кваліфікаваных працаўнікоў пры цэнтральных бібліятэках былі створаны ў 1921 г. практыкумы для ўжо працуючага персаналу і практыкантаў. Таму супрацоўнікі бібліятэк вызваляліся прыкладна на адзін раз у тыдзень на 3 гадзіны для таго, каб прымаць удзел у іх працы [1, с. 45] . У 1921 г. у Віцебску палітасветам быў праведзены 9-тыднёвы практыкум па бібліятэчнай справе [4, с. 35] . А ў маі 1922 г. на другой нарадзе бібліятэчных работнікаў была прынята рэзалюцыя аб арганізацыі пастаяннага бібліятэчнага практыкуму пры Дзяржаўнай універсітэтскай бібліятэцы [5, с. 54] .

Нямалаважнае значэнне ў фарміраванні кадраў бібліятэчных работнікаў мелі розныя курсы. Так, вясной 1921 г. кароткатэрміновыя бібліятэчныя курсы былі арганізаваны ў Бабруйскай акрузе. Варта адзначыць, што накіроўваліся на гэтыя курсы пераважна чырвонаармейцы [6, с. 3], якія складалі ў пачатку 20-х гг. асноўную крыніцу папаўнення кадраў культурна-асветніцкіх устаноў. Скарыстаўшы вопыт падрыхтоўкі кадраў у РСФСР, Галоўпалітасвет БССР правёў у 1921 г. шасцімесячныя курсы для бібліятэкараў па двух прадметных цыклах: агульнаадукацыйным і прафесійным (бібліятэчная справа, клубная работа, ліквідацыя непісьменнасці) [4, с. 36–37].

З 1924 г. курсавой падрыхтоўцы бібліятэчных працаўнікоў надавалася большая ўвага. Гэта праца была ўскладзена на ГПА і культаддзел ЦСПСБ [7, л. 122; 8, л. 5]. Да сярэдзіны 20-х гг. быў устаноўлены штат культурна-асветніцкіх устаноў БССР. Цэнтральныя, акруговыя, раённыя бібліятэкі мелі па 1 загадчыку бібліятэкі, 1 загадчыку чытальні, 3 бібліятэкары (у раённых – 2 бібліятэкары). Акрамя гэтага пасада бібліятэкара была прадугледжана ў народных дамах, клубах, а загадчыкі хат-чытален самі павінны былі выконваць функцыі бібліятэчных работнікаў [3, л. 343–346]. Менавіта таму бібліятэчныя пытанні разглядаліся на курсах па перападрыхтоўцы загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў, дзе летам 1924 г. асобна выкладаўся прадмет «Бібліятэчная справа» [9, л. 77].

У снежні 1924 г. 7-дзённыя курсы-з'езды для хатнікаў, клубных работнікаў і бібліятэкараў былі праведзены пры агітпропе полацкага акркома КП(б)Б. Яны мелі задачу азнаёміць культасветнікаў з характарам і методыкай культурна-асветніцкай работы. У справаздачы зазначалася, што пасля правядзення курсаў «палепшылася бібліятэчная работа: уладкавалася тэхніка бібліятэчнай справы, павялічылася актыўнасць бібліятэкі. Вынікам работы курсаў з'явілася павышэнне ўзроўню кадраў працаўнікоў» [10, л. 269]. Аднак відавочна, што гэтыя вывады перабольшаны і кароткі тэрмін іх правядзення не мог значна палепшыць кадравую сітуацыю.

У 1925 г. курсы для працаўнікоў культурна-асветніцкіх устаноў былі праведзены ў Мінску, Віцебску і Магілёве. Бібліятэчнай справе і на гэты раз было адведзена значнае месца. Аднак на мінскіх курсах выкладчык тэхнікі бібліятэчнай працы К. Гурвіч быў вымушаны працаваць ва ўмовах адсутнасці метадычнай літаратуры, нізкага ўзроўню развіцця курсантаў. Таму ім быў выбраны пераважна практычны метад выкладання. За 24 гадзіны заняткаў слухачы пазнаёміліся з гісторыяй кнігі і бібліятэк, прынцыпамі класіфікацыі кніг, практычна прапрацавалі пытанні складвання бібліятэчных каталогаў. Выкладчык ацаніў засваенне матэрыялу курсантамі на «здавальняюча» [11, с. 80–83].

Бібліятэчная справа разглядалася і ў наступныя гады на летніх курсах па перападрыхтоўцы загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў [11, л. 134].

У пачатку сакавіка 1925 г. у Мінску была склікана агульнагарадская бібліятэчная канферэнцыя, на парадку дня якой стаялі пытанні: «Роля бібліятэкі ў грамадска-палітычным жыцці», «Бібліятэка ў СССР», «Становішча бібліятэчнай справы ў Мінску» [8, л. 278].

У верасні 1925 г. клубнай камісіяй пры Мінскім акркоме КП(б)Б былі арганізаваны курсы-канферэнцыя бібліятэчных работнікаў працягласцю 3 тыдні. На іх разглядалася шырокае кола пытанняў: роля бібліятэкі ў рабочым клубе, рэвалюцыйныя кампаніі і святы, работа з чытачом, работа ў чытальні, праца з перадвіжкай, даведачная праца бібліятэкі, работа бібліятэчных гурткоў, тэхніка бібліятэчнай працы, класіфікацыя кніг [8, л. 321].

Праблему нізкай кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў спрабавалі вырашыць 6-тыднёвыя Усебеларускія курсы перападрыхтоўкі бібліятэкараў на 30 чалавек, якія адбыліся ў 1926/27 навучальным годзе [12, л. 151].

Арганізатарамі перападрыхтоўкі бібліятэкараў сталі і прафсаюзы рэспублікі. Аднак гэта праца пачала наладжвацца толькі пасля VI Усебеларускага з'езда прафсаюзаў у лістападзе

1927 г. У справаздачы было адзначана, што бібліятэкары па-ранейшаму не валодаюць нават прасцейшымі прыёмамі бібліятэчнай тэхнікі. За 1925–1927 гг. ЦСПСБ правёў толькі 1 семінар у Мінску і той не зусім паспяхова [1, с. 129]. Таму ў наступныя гады была актывізавана праца ў кірунку паляпшэння ўзроўню прафесійнасці кадраў бібліятэкараў. Адным з новых метадаў стала правядзенне культаддзелам ЦСПСБ завочных курсаў для бібліятэчных работнікаў. На месцах склікаліся кансультацыі, дзе былі падабраны неабходныя дапаможнікі, а бібліятэкары аб'ядноўваліся ў калектывы для перапрацоўкі заданняў. У найбольш буйных цэнтрах былі арганізаваны тэматычныя гурткі па вывучэнні асобных пытанняў бібліятэчнай работы [1, с. 138].

Асаблівую ўвагу прафсаюзныя арганізацыі звярталі на факты пасылкі на бібліятэчную працу работнікаў, якія не мелі адпаведнай кваліфікацыі. Таму ў пастанове прэзідыума ЦСПСБ за красавік 1929 г. было прынята рашэнне аб увядзенні экспертных іспытаў для бібліятэкараў, якія знаходзіліся на ўліку на біржах працы [1, с. 139]. Тым самым быў скарыстаны вопыт расійскіх калег, якія дасягнулі пэўных поспехаў у гэтай справе [13].

Несумненную ролю ў падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы адыгралі бібліятэчныя аб'яднанні, якія пачалі ствараца пры акруговых бібліятэках у пачатку 20-х гадоў. Першае сярод іх было створана ў Віцебску ў 1922 г. [14, с. 58]. А з сярэдзіны 20-х гг. такія аб'яднанні арганізуюцца паўсюдна. Найбольш прадуктыўна працавалі віцебскае аб'яднанне пад кіраўніцтвам загадчыцы цэнтральнай гарадской бібліятэкі Н. Баранавай, полацкае аб'яднанне (кіраўнік І.М. Фрунін), мінскае аб'яднанне, арганізаванае дырэктарам Дзяржаўнай бібліятэкі БССР І.Б. Сіманоўскім і загадчыкам цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А.С. Пушкіна М.Р. Маліноўскім [14, с. 59]. «Палажэнне аб бібліятэчных аб'яднаннях» ад 16 жніўня 1926 г., прынятае Народным камісарыятам асветы, замацавала практыку стварэння такой формы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў [4, с. 41]. Асабліва карысным ў працы гэтых аб'яднанняў быў абмен практычным вопытам, сумесны пошук новых форм работы з чытачом.

З гэтай жа мэтай у некаторых гарадах ствараліся гурткі бібліятэчных работнікаў. У 1927 г., напрыклад, у гуртку пры Магілёўскай акруговай бібліятэцы абмяркоўваліся пытанні перасовачнай работы, методыкі правядзення чытак і гутарак, метады працы з газетамі і часопісамі, арганізацыя навуковай працы бібліятэкі і г. д. Пазней (пасля адкрыцця гарнізоннай бібліятэкі) на аснове гэтага гуртка было створана бібліятэчнае аб'яднанне [15, с. 120].

20-я гг. ХХ ст. сталі адметнымі і тым, што былі закладзены асновы падрыхтоўкі культурна-асветніцкіх работнікаў, у тым ліку і бібліятэкараў, праз спецыяльныя навучальныя ўстановы – саўпартшколы І і ІІ ступені. За 2 гады вучобы навучэнцы атрымоўвалі шырокае кола агульнаадукацыйных, агульнапалітычных, а таксама спецыяльных ведаў. На вывучэнне культасветніцкай працы, напрыклад, у Магілёўскай саўпартшколе І ступені адводзілася ў 1926/27 навучальным годзе 35% гадзін прадметаў спецыяльнага цыкла [16, л. 147–149].

Новым этапам у развіцці сістэмы падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў стала ўтварэнне ў Магілёўскай саўпартшколе клубна-бібліятэчнага аддзялення. У 1928 г. школа была рэарганізавана ў прафесійны тэхнікум па падрыхтоўцы культурна-асветніцкіх кадраў [17, л. 35].

Тым не менш па-ранейшаму колькасць бібліятэкараў у рэспубліцы была недастатковай. У справаздачы агітацыйна-прапагандысцкага аддзела мінскага акруговага камітэта КП(б)Б за 1925 г. было адзначана, што «хатнікі, загадчыкі народных дамоў, бібліятэкары ў большасці падбіраюцца не дастаткова ўважліва. Яны перагружаны савецкай і іншай працай, бессістэмна адрываюцца ад непасрэднай работы і часам проста выкарыстоўваюцца для вядзення іншай работы (у жаночых аддзелах, камітэтах узаемадапамогі і г. д.)» [8, л. 281]. Такая сітуацыя захоўвалася на ўсёй тэрыторыі Беларусі да канца дзесяцігоддзя.

Павышэнню кваліфікацыі садзейнічала і арганізацыя метадычнай дапамогі бібліятэкарам. Для гэтага ствараліся бібліятэчныя секцыі пры акруговых аддзелах народнай адукацыі і клубных аб'яднаннях. Так, Галоўпалітасветам БССР такая бібліятэчная секцыя была створана пры мінскім клубным аб'яднанні ў снежні 1923 г. У сваёй дзейнасці яна не абмяжоўвалася толькі клубнымі бібліятэкарамі, да ўдзелу ў працы секцыі прыцягвалі і раённых бібліятэкараў. Тут разглядаліся пытанні працы з чытачамі, з газетамі, часопісамі, кнігамі, праводзіліся заняткі па афармленні бібліятэк плакатамі, лозунгамі, абмяркоўвалася новая літаратура [18, л. 59]. Пры акруговых бібліятэках ствараліся метадычныя кабінеты і куткі бібліятэкара, дзе была сабрана метадычная літаратура, кваліфікаваныя работнікі давалі вусныя і пісьмовыя кансультацыі [14, с. 60].

Дапамогу ў павышэнні метадычнай падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў аказвалі часопісы «Красный библиотекарь», «Коммунистическое просвещение», «Асвета». У іх асвятляліся розныя пытанні, што тычыліся тэхнікі вядзення бібліятэчнай справы, абмяркоўваліся праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі бібліятэкараў, прынцыпы правядзеня экспертызы на адпаведнасць кадраў свайму назначэнню, падаваліся матэрыялы з месц.

Такім чынам, стварэнне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі бібліятэкараў было аб'ектыў-

най неабходнасцю, звязанай у першую чаргу з недастатковай колькасцю і неадпаведнасцю кваліфікацыі работнікаў. Палітасветы, аддзелы народнай адукацыі, прафсаюзныя арганізацыі праводзілі розныя па працягласці і змястоўнасці мерапрыемствы для ліквідацыі гэтых праблем. Аднак цалкам вырашыць праблему не ўдалося з-за бессістэмнасці працы, частым прызначэннем работнікаў на партыйныя і камсамольскія пасады.

Літаратура і крыніцы

1. Библиотечное дело в БССР: документы и материалы. 1918–1941. / Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина [и др.]; ред. Е. А. Фокина. – Минск: Вышэйш. шк., 1978. – 272 с.
2. Культурное строительство БССР. – Минск: Изд.: УНХУ, 1940.
3. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 19. Протоколы, списки, переписка с Наркомпросом и другие материалы агитпропотдела.
4. *Колоско, Н.М.* Подготовка библиотечных кадров в Белоруссии в 1917–1924 гг. / Н.М. Колоско // Вопросы библиотековедения и библиографии; под ред. Н.Т. Толкачева. – Вып. 1. – Минск: Нар. асвета, 1972. – 79 с.
5. Из текущей жизни в Народном Комиссариате Просвещения // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1922. – № 5–6. – С. 50–55.
6. НАРБ. – Фонд 42. – Оп. 1. – Д. 47. Переписка с отделами искусств Наркомпроса БССР и уездполитпросветами об организации клубов и по вопросам культурно-просветительной работы.
7. НАРБ. – Фонд 4 п. – Оп. 7. – Д. 11. Материалы о культурно-просветительной работе в деревне (тезисы).
8. НАРБ. – Фонд 4 п. – Оп. 1. – Д. 32. Протоколы, отчеты, планы и доклады коллегии АПО Угоркома КП(б)Б.
9. НАРБ. – Фонд 42. – Оп. 1. – Д. 929. Материалы о работе Минского окрполитпросвета (протоколы, планы, отчеты, доклады, сведения, переписка).
10. НАРБ. – Фонд 4 п. – Оп. 7. – Д. 37. Протоколы, отчеты, сведения, списки и другие материалы Коллегии агитационно-пропагандистского отдела Полоцкого уездного комитета.
11. *Гурвич, К.* К вопросу о преподавании техники библиотечного дела на курсах избачей / К. Гурвич // Коммунистическое просвещение. – 1925. – № 5. – С. 80–83.
12. НАРБ. – Фонд 4 п. – Оп. 7. – Д. 79. Протоколы, отчеты, планы и другие материалы народного комиссариата просвещения.
13. *Дубровина, Н.* Об экспертизе при подборе работников ( к постановке вопроса о профессионализме политпросветработников) / Н. Дубровина // Коммунистическое просвещение. – 1929. – № 3. – с. 34–37.
14. *Емец, И. П.* Роль библиотек Белорусской ССР в социалистическом строительстве (1926–1937): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / И.П. Емец. – Минск, 1981. – 240 с.
15. *Сафонаў, А.* Што зроблена Магілёўскай акруговай бібліятэкай імя К. Маркса / А. Сафонаў // Асвета. – 1927. – № 2. – С. 118–120.
16. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 50. Протоколы заседания коллегии агитпропа ЦК и комиссии при агитационно-пропогандистском отделе окружных комитетов КП(б)Б.
17. НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 7. – Д. 156. Материалы о политпросветработе, о белорусской художественной литературе и другие научные вопросы.
18. НАРБ. – Фонд 42. – Оп. 1 – Д. 1031. Материалы о работе библиотек, изб-читален, народных домов и других культурно-просветительных учреждений БССР (постановления, протоколы, положения, циркуляры, инструкции, планы, штаты, переписки).

Summary

*The article is dedicated to the research of preparing and rising of qualification of librarians in 20-th years of XX century. Author takes the problem of some kinds of work with library workers, difficulties and contradictions in that process.*

---

*УДК 271.2 «1921/1939»:947.6*

***А.Г. Цымбал,***
*аспірант кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

# ЮРЫДЫЧНА-АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ЎМОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Вывучэнне гісторыі Праваслаўнай Царквы ўяўляе вялікую навуковую і практычную значнасць для рэгулявання дзяржаўна-рэлігійных адносін у Рэспубліцы Беларусь. У айчыннай гістарыяграфіі адсутнічаюць працы, прысвечаныя прававому і арганізацыйнаму становішчу Праваслаўнай Царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Адзначаная праблематыка закранаецца А.М. Загідуліным [17], аднак Царква ў яго не выступае ў якасці самастойнага аб'екта даследавання і разглядаецца з пункту гледжання нацыянальнай палітыкі польскіх улад. Гісторыя Праваслаўнай Царквы прыцягвала ўвагу і польскіх гісторыкаў. Патрэбна адзначыць працы М. Папежынскай-Турэк [2; 8], А. Міраловіча [10; 14], К. Красоўскага [3], якія маюць абагульняльны характар, але не паглыбляюцца ў спецыфіку заходнебеларускіх зямель у складзе II Рэчы Паспалітай.

Згодна з Рыжскай мірнай дамовай ад 18 сакавіка 1921 г., заходнія землі Беларусі і Украіны былі інкарпараваныя ў склад Польскай дзяржавы. Канфесіянальны склад насельніцтва Польшчы (адпаведна статыстычным даным за 1921 г.) быў прадстаўлены наступным чынам: 63,8% насельніцтва належала да каталіцкага веравызнання, 11,2% грэка-каталіцкага, 10,5% праваслаўнага, 3,7% евангелічнага, 10,5% вызнавала іудаізм і 0,3% іншыя веравызнанні. У Палескім ваяводстве праваслаўнае насельніцтва складала 79,2%, Навагрудскім – 51,1%, Беластоцкім – 15,1% і Віленскай акрузе – 26,9% [1, с. 158].

Праваслаўе спавядалі прадстаўнікі наступных нацыянальнасцей: 1,5 млн украінцаў, 900 тыс. беларусаў, 700 тыс. так званых «тутэйшых», 600 тыс. палякаў і 125 тыс. рускіх [3, с. 106]. Праваслаўныя ў Навагрудскім, Беластоцкім, Віленскім і Палескім ваяводствах былі пераважна

беларускай нацыянальнасці. Найбольшая колькасць праваслаўных пражывала ў вёсцы. Так, з агульнай лічбы – 3762500 праваслаўных вернікаў, 3571600 чалавек былі вяскоўцамі, а 190900 – гараджанамі [4, с. 7].

Пры аднаўленні дзяржаўнасці ўрад Рэчы Паспалітай сутыкнуўся з праблемай распрацоўкі канцэпцыі ўзаемаадносін з Праваслаўнай Царквой і вырашэння пытанняў яе прававога і матэрыяльнага становішча. У сувязі з гэтым перад уладамі стаяла задача юрыдычна, ідэалагічна, арганізацыйна, тэрытарыяльна і матэрыяльна прыстасаваць Праваслаўную Царкву да ўмоў польскай дзяржаўнасці.

Рэлігійная палітыка ў адносінах да Праваслаўнай Царквы належала да кампетэнцыі Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы (МРВ і ПА), Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), Міністэрства вайсковых спраў (МВС) і Міністэрства замежных спраў (МЗС). Дарадчымі органамі былі спарадычна скліканыя міжміністэрскія канферэнцыі, на якіх выпрацоўваліся метады дзейнасці. Бягучымі справамі займалася МРВ і ПА, дакладней – V Дэпартамент веравызнанняў [5, с. 76]. Канфесіянальная палітыка на землях Заходняй Беларусі мела першаснае значэнне, аб чым сведчыць той факт, што ў ваяводскіх упраўленнях справамі Праваслаўнай Царквы займаўся Аддзел грамадскай бяспекі, а на ўзроўні старостваў – Аддзел бяспекі [6, с. 83–88]. Акрамя таго, па лініі МВС на землях Заходняй Беларусі ў структуры Камандавання карпусоў акруг існавалі самастойныя інфармацыйныя аддзелы, якія займаліся зборам інфармацыі, у тым ліку і аб нацыянальна-канфесіянальнай сітуацыі ў рэгіёне. На падставе іх справаздач у вайсковых кругах распрацоўваліся планы па асіміляцыі ўсходніх зямель ІІ Рэчы Паспалітай [6, с. 149–152]. Менавіта МВС адыгрывала галоўную ролю ў паланізацыі Праваслаўнай Царквы ў другой палове 1930-х гг.

Першапачаткова патрэбна было вызначыць прававы статус Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Пэўныя абавязкі па абароне правоў нацыянальных і канфесіянальных меншасцей на ўрад былі накладзены артыкуламі Версалькага трактата 1919 г., які польскія ўлады падпісалі і павінны былі выконваць. Імі прадугледжвалася прадстаўленне ўсім жыхарам краіны, без розніцы веравызнання і нацыянальнасці, права свабоды рэлігійнага жыцця і роўнасць грамадзянскіх правоў. Сейм польскай рэспублікі ратыфікаваў трактат у 1920 г. [7, с. 43] Абавязкі польскага ўрада знайшлі адлюстраванне ў Канстытуцыі 17 сакавіка 1921 г. Артыкулы пятага раздзела «Агульныя правы і грамадзянскія абавязкі» з 113 па 116 датычыліся веравызнанняў. Па артыкуле 113, кожнай рэлігійнай арганізацыі, прызнанай дзяржавай, гарантавалася права арганізацыі набажэнстваў, самакіравання адносна ўнутраных спраў Царквы, а таксама права юрыдычнай асобы. 114-м артыкулам прадугледжвалася роўнасць усіх рэлігійных аб'яднанняў, аднак Рымска-каталіцкаму касцёлу надавалася першаснае становішча сярод усіх веравызнанняў [7, с. 44]. Наступны артыкул прызнаваў магчымасць рэлігійных арганізацый кіравацца ўласнымі законамі пры ўмове, што дзяржава не адмовіла ў іх прызнанні з прычыны супярэчнасці заканадаўству. Адносіны дзяржавы да прызнаных цэркваў і веравызнанняў павінны былі вырашацца заканадаўчым шляхам. Артыкул 116 датычыўся рэлігійных саюзаў, якія не былі прызнаны дзяржавай. Улады павінны былі іх прызнаць пры ўмове, што іх арганізацыя, рэлігійная практыка і навучанне не будуць супярэчыць заканадаўству і грамадскаму парадку. Гэта не патрабавала выдання закона і магло быць здзейснена распараджэннем міністра. Праваслаўная Царква была прылічана да рэлігійных арганізацый, прызнаных дзяржавай, якія, аднак, не мелі ўнармаванага прававога становішча [8, с. 139]. Канстытуцыя 23 красавіка 1935 г. не ўнесла істотных змяненняў у адносінах да канфесіянальных пытанняў, была захавана нават ранейшая паартыкульная нумарацыя.

Статусу Праваслаўнай Царквы ў Польшчы датычыліся і палажэнні Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г. Акрамя забеспячэння роўных правоў нацыянальным і канфесіянальным меншасцям, бакі дамовіліся не ўмешвацца ў справы Царквы і рэлігійных арганізацый, якія знаходзіліся на тэрыторыі іншай дзяржавы. Такім чынам, польскія ўлады атрымалі права кантролю над Царквой і падставу для набыцця ёй аўтакефаліі[1] [10, с. 87].

Менавіта арганізацыя Праваслаўнай Царквы ў Польшчы на падставе аўтакефаліі і выключэнне яе з юрысдыкцыі Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ) стала прыярытэтнай справай для польскага ўрада.

Асновы для ўсталявання аўтакефаліі заклаў архіепіскап Георгій (Ярашэўскі). Аднак ён здолеў дабіцца ад патрыярха Ціхана толькі экзархату[2] для Праваслаўнай Царквы ў Польшчы [8, с. 69]. У адказ на гэта ўлады 30 студзеня 1922 г. выдалі «Часовыя правілы аб адносінах ўрада да Праваслаўнай Царквы ў Польшчы» [14], якія ўтрымлівалі прававыя нормы для дзейнасці дзяржаўнай адміністрацыі адносна Праваслаўнай Царквы да часу выдання закона, як гэта прадугледжвала Канстытуцыя [8, с. 75]. На падставе гэтага дакумента ўлады атрымалі магчымасць кантролю над арганізацыйнымі і кадравымі справамі Царквы. Зацвярджаўся сінадальна-кансісторскі лад, які выключаў уплыў свецкіх

---

[1] Аўтакефалія – самакіраванне, адміністратыўная незалежнасць Праваслаўнай Царквы.

[2] Экзархат – тэрытарыяльна-адміністратыўная адзінка, патрыяршае намесніцтва на тэрыторыі адной правінцыі, якая знаходзіцца за межамі тэрыторыі патрыярхату.

фактараў на Царкву, што палегчыла кіраванне Царквой і больш звязвала яе з дзяржавай. Аднак у «Часовых правілах…» не закраналіся такія істотныя для Царквы пытанні, як статус юрыдычнай асобы, царкоўнай уласнасці, колькасці парафій, датацыі духавенству, што адкладвала іх вырашэнне на неакрэслены час. Ступень свабоды царкоўнага жыцця на практыцы залежаў ад прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі, пачынаючы ад старасты і заканчваючы міністрам РВ і ПА [10, с. 94].

Рэалізацыя ўрадавых планаў у справе аўтакефаліі стала магчымай пасля арышту ў Маскве патрыярха Ціхана органамі ДПУ. Да царкоўнай улады ў Савецкім Саюзе прыйшлі прадстаўнікі «Жывой Царквы», якія ўтварылі Царкоўны Камітэт і былі гатовыя супрацоўнічаць з бальшавікамі [10, с. 98]. Спрэчкі вакол аўтакефаліі ў самой Праваслаўнай Царкве ў Польшчы давялі да забойства 8 лютага 1923 г. архіепіскапа Георгія архімандрытам Смарагдам (Латышэнка). Яго наступнік – архіепіскап Дыянісій (Валядынскі) пад ціскам улад спрабаваў атрымаць незалежнасць ад РПЦ. Па прычыне адсутнасці кантактаў з патрыярхам Ціханам, царкоўныя ўлады звярнуліся да экуменічнага патрыярха ў Канстанцінопалі з просьбай зацвердзіць на чале Праваслаўнай Царквы ў Польшчы архіепіскапа Дыянісія. Канстанцінопальскі патрыярх Мялецій IV задаволіў яе актам ад 13 сакавіка 1923 г. Такім чынам, Царква ў Польшчы адміністрацыйна падпарадкавалася канстанцінопальскаму патрыярху. Аб гэтым паведамілі патрыярху Ціхану, калі ён быў выпушчаны на свабоду, і прасілі яго прызнаць аўтакефалію Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Маскоўскі патрыярх адказаў адмоўна, падкрэсліваючы некананічнасць абвяшчэння аўтакефаліі. Тады было вырашана разарваць кантакты з Масквой і актывізаваць перамовы з Канстанцінопалем. 11 лістапада 1924 г. Патрыяршы Сінод падпісаў пастанову аб наданні блаславлення ўзнікшай аўтакефаліі Царквы ў Польшчы, а 13 лістапада 1924 г. патрыярх Рыгор VII падпісаў адпаведны Тамос [12, с. 88]. Урачыстае абвяшчэнне аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы адбылося 17 верасня 1925 г. ужо пасля смерці патрыярха Ціхана. За непадтрымку ўвядзення аўтакефаліі і непрыняцце «Часовых правілаў…» былі пазбаўлены сваіх кафедраў епіскапы бельскі – Сергій, беластоцкі – Уладзімір, віленскі – Еляферый, палескі – Панцеляймон [10, с. 92–98].

Усталяванне аўтакефальнага ладу Царквы было несумненным поспехам улад, аднак гэта не азначала аўтаматычнага прывязвання праваслаўнага духавенства да інтарэсаў польскай дзяржаўнасці. Клір захоўваў свой пераважна рускі характар і цешыў надзею вяртання царызму. Яшчэ ў 1921 г. МУС выдала цыркуляр «Аб польскім грамадзянстве, праве прыстанішча і прынцыпах часовага знаходжання на тэрыторыі Польшчы», якім абмяжоўваўся наплыў расійскага духавенства. Права знаходжання і грамадзянства мелі асобы, якія перад вайной пражывалі на польскіх тэрыторыях і выказвалі сваю лаяльнасць да дзяржаўных улад. Права часовага знаходжання атрымалі толькі асобы, якім вяртанне ў Савецкую Расію магло мець сур'ёзныя наступствы, а іх прысутнасць на тэрыторыі Польшчы не пагражала дзяржаўнай бяспецы. Паводле справаздачы МРВ і ПА ў 1923 г. з беластоцкага ваяводства з 16 святароў быў высланы адзін, а Упраўленне ў Вільні меркавала высылаць з дзяржавы ўсіх духоўных асоб, якія прыбылі ў Польшчу нелегальна [10, с. 90].

Улады імкнуліся прыстасаваць тэрытарыяльную структуру Царквы да межаў дзяржавы і яе адміністрацыйнага падзелу. У 1922 г. адбылася тэрытарыяльная рэарганізацыя Царквы і было створана пяць епархій: Варшаўска-Холмская, Валынская, Палеска-Пінская, Гродзенска-Навагрудская і Віленска-Лідская.

Падчас працы па абвяшчэнні аўтакефаліі царкоўныя ўлады дамагаліся ўрэгулявання юрыдычнага палажэння Царквы шляхам выдання закона. Аднак прэм'ер У. Грабскі лічыў, што вырашэнне справы Праваслаўнай Царквы трэба адкласці да заключэння канкардата з Ватыканам, каб гэты дакумент не ўскладняў перамоў з Апостальскай Сталіцай. Пасля падпісання канкардата 28 сакавіка 1925 г. міністр РВ і ПА інфармаваў, што ў найбліжэйшыя дні будуць апрацаваны галоўныя тэзісы праекта закона аб юрыдычным палажэнні Праваслаўнай Царквы. У сваю чаргу, 13 красавіка 1925 г. царкоўныя ўлады падрыхтавалі і прапанавалі «Асноўны статут унутранага кананічнага ладу Св. Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы». Сінод епіскапаў прыняў яго на пасяджэннях 13 красавіка і 5 чэрвеня 1925 г., а публічна абвясціў 1 ліпеня 1926 г. [8, с. 108–111].

Дакумент утрымліваў 44 артыкулы. Прадугледжвалася ўтварэнне Мітрапаліцкай Рады, якая павінна была складацца з духоўных і свецкіх асоб, каб забяспечыць падтрымку грамадскасці і ўзмацніць пазіцыю ў адносінах з урадам. Статут быў сфармуляваны вельмі агульна і не ўтрымліваў канкрэтных аспектаў жыццядзейнасці царквы, як, напрыклад, навучанне рэлігіі. Падкрэсліваўся аўтакефальны лад Царквы [14, с. 539].

Падчас пасяджэнняў Сінода 26 лістапада – 3 снежня 1925 г. іерархі Царквы зноў звярнуліся да ўрада з мемарыялам, у якім дамагаліся ўнармавання адносін дзяржавы з Праваслаўнай Царквой. У прадстаўленым парламенту праекце закона Сінод прапанаваў нармалізаваць юрыдычнае становішча Царквы, урэгуляваць бюджэтныя справы, вярнуць Царкве яе ўласнасць, вызначыць колькасць і размяшчэнне праваслаў-

ных прыходаў, абмежаваць адміністрацыйнае самаўпраўства і зацвердзіць статут брацтваў. 9 сакавіка 1926 г. царкоўныя ўлады прапанавалі свой праект закона. Міністэрства РВ і ПА ўвогуле не звярнула на яго ўвагу [8, с. 158].

Падставай для перамоў стаў прыняты прэм'ерам У. Грабскім праект МВР і ПА. Пасля яго адстаўкі перамовы прадоўжыў кабінет А. Скшыньскага. Узгоднены праект быў падпісаны 14 красавіка 1926 г. Аднак пасля дзяржаўнага перавароту ў маі праца над законам была перарвана. 25 мая мітрапаліт заявіў, што гэты праект не адпавядае інтарэсам Царквы і прапанаваў аднавіць перамовы. 10 ліпеня 1926 г. адбылася сустрэча мітрапаліта Дыянісія з Ю. Пілсудскім, якая таксама не прынесла вынікаў. Падставай далейшых перамоў мог быць толькі праект ад 14 красавіка, дапоўнены новымі артыкуламі, на якія мітрапаліт не даў згоды [8, с. 161]. Такім чынам перамовы пачаліся з самага пачатку.

У 1927 г. Сінодам Праваслаўнай Царквы былі ўведзены змены ў царкоўнай структуры, якія дапасоўвалі яе да адміністрацыйнага падзелу дзяржавы. Палеска-Пінская епархія павінна была займаць паветы Палескага ваяводства. На чале стаяў архіепіскап Аляксандр. У склад епархіі ўваходзілі 26 благачынняў, 320 прыходаў, 1 манастыр і 357 духоўных асоб. Віленская епархія займала Віленскае ваяводства і тры паветы Навагрудскага ваяводства (Валожынскі, Лідскі і Стаўбцоўскі). Узначальваў яе архіепіскап Феадосій. Яна налічвала 18 благачынняў, 163 прыходы, 3 манастыры і 203 святары. Гродзенская епархія павінна была складацца з тэрыторыі Беластоцкага ваяводства і чатырох паветаў Навагрудскага ваяводства (Навагрудскага, Баранавіцкага, Слонімскага і Нясвіжскага). Кіраваў ёй архіепіскап Аляксей. У яе склад уваходзілі 18 благачынняў, 147 прыходаў, 3 манастыры і 235 святароў [10, с. 113].

Пытанне аб стане Праваслаўнай Царквы ў Польшчы стала актуальным у 1929 г., калі каталіцкае духавенства зноў распачало кампанію рэвіндыкацыі[1]. Кіраўніцтва Праваслаўнай Царквы, усвядоміўшы пагрозу яе існавання і ва ўмовах адсутнасці надзеі на паразуменне з урадам, прымае рашэнне аб скліканні Сабора. Пасля з'яўлення інфармацыі аб Саборы ў друку міністр РВ і ПА С. Чэрвінскі ў лісце да мітрапаліта Дыянісія ад 21 снежня 1929 г. забараніў правядзенне выбараў удзельнікаў Сабора, рэкамендуючы адначасова ваяводам не даваць дазвол на правядзенне парафіяльных сходаў. Звярталася ўвага на тое, што для правядзення Сабора патрэбна было атрымаць згоду МРВ і ПА. Канфлікт быў уладжаны 10 студзеня 1930 г. пасля візіту мітрапаліта да прэзідэнта І. Масціцкага. У выніку кампрамісу, што быў зойдзены паміж Сінодам і ўрадам, стваралася камісія, якая складалася з прадстаўнікоў Царквы і ўрада. 30 мая 1930 г. прэзідэнтам быў выдадзены рэскрыпт, які дазваляў скліканне Сабора з перадсаборным сходам, што павінен быў папярэднічаць Сабору [13, с. 58–59].

Адразу выявіліся разыходжанні ў поглядах на Сабор паміж урадам і Царквой. Міністэрства РВ і ПА настойвала на выключэнні з праграмы, Сабора шэрага істотных пытанняў для Праваслаўнай Царквы: прававое становішча Царквы, пытанні ўласнасці, судовых іскаў Каталіцкага Касцёла па справах рэвіндыкацыі, закладання новых парафій. Такім чынам, да склікання Сабора справа не дайшла, бо ўлады не хацелі дапусціць яго дзейнасці ва ўмовах, калі не мелі ўласнай канцэпцыі адносна праваслаўя. Урад асцерагаўся магчымасці выкарыстання Сабора духавенствам у якасці сродку барацьбы з уладамі і Каталіцкім Касцёлам, а таксама імкнення беларускіх і ўкраінскіх колаў да надання Царкве нацыянальнага характару. Быў і станоўчы вынік, бо зацвердзілася ідэя саборнасці, што павінен быў улічваць урад. Акрамя таго, у грамадстве пашыралася перакананне, што ўлады не жадаюць дапушчэння свецкіх асоб да вырашэння царкоўных спраў, абмяжоўваюць правы нацыянальных меншасцей і прыцiскаюць праваслаўе.

3 снежня 1936 г. урадам быў прадстаўлены праект закона аб адносінах дзяржавы да Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Паразуменне з праваслаўным епіскапатам было дасягнута 8 красавіка 1937 г. Канчатковая рэдакцыя з'явілася ў студзені 1938 г., калі была закончана праца над законам аб землях, якія раней належалі Уніяцкай Царкве. У гэты час сейм прыняў праект закона, унесенага ўрадам, аб наданні прэзідэнту паўнамоцтваў выдання дэкрэта аб адносінах дзяржавы да Праваслаўнай Царквы. Такім чынам, было вырашана абмінуць парламенцкі шлях, бо ўлады асцерагаліся, што праект урада выкліча крытыку ў сейме, асабліва сярод дэлегатаў нацыянальных меншасцей.

7 лістапада 1938 г. Сінод азнаёміўся з праектам дэкрэта прэзідэнта і прызнаў, што ён цалкам адпавядаў статусу Царквы і яе інтарэсам. Адначасова ўраду быў прадстаўлены праект унутранага статута Праваслаўнай Царквы, а 19 лістапада быў апублікаваны «Дэкрэт Прэзідэнта Рэчы Паспалітай ад 18 лістапада 1938 г. аб адносінах Дзяржавы да Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы» [18]. 10 снежня 1938 г. распараджэннем Рады міністраў быў зацверджаны «Унутраны Статут Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы», а 23 чэрвеня 1939 г. зацверджаны закон аб юрыдычным стане маёмасці Царквы, за якой прызнавалася пра-

[1] Рэвіндыкацыя – акцыя па вяртанні храмаў, капліц, кляштароў і зямельных уладанняў, што раней належалі Каталіцкаму Касцёлу і Уніяцкай Царкве і былі адабраны ў часы існавання Расійскай імперыі.

ва ўласнасці на маёмасць па стане на 19 лістапада 1938 г. [10, с. 121].

Дэкрэт ад 18 лістапада 1938 г. складаўся з 85 артыкулаў і 112 пунктаў. У ім зацвярджаўся аўтакефальны лад Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Найвышэйшым органам Царквы быў Генеральны Сабор, які павінен быў складацца з епіскапаў, духоўных і свецкіх асоб. Толькі Сабор мог змяніць лад Царквы з сінадальна-кансісторскага на саборны. Склікацца ён мог толькі ў выключных выпадках мітрапалітам на падставе спецыяльнага звароту прэзідэнта. Разглядаў справы, якія выходзілі за кампетэнцыю епархіяльных епіскапаў, Сабор епіскапаў як орган царкоўнай улады. Ён павінен збірацца штогод. Выканаўчы орган Сабора епіскапаў – Сінод, які складаўся з мітрапаліта, вайсковага епіскапа і двух епархіяльных епіскапаў, якія выбіраліся на два гады.

Асаблівая ўвага надавалася кадравым справам. Для заняцця царкоўнай пасады неабходна было мець польскае грамадзянства, вышэйшую багаслоўскую адукацыю. Усе прызначэнні і пераводы адбываліся са згоды міністра РВ і ПА. У дэкрэце таксама былі абумоўлены пытанні фарміравання кансісторый, стварэння брацтваў, багаслоўскай адукацыі, арганізацыі манастыроў, царкоўнай выдавецкай дзейнасці, справы царкоўнай уласнасці і інш. [14, с. 550–552].

У 1937–1938 гг. адбыліся апошнія змены ў епіскапаце. 27 лютага 1937 г. Сінод прызначыў епіскапа Саву на Гродзенска-Навагрудскую кафедру. Пад ціскам дзяржаўных улад епіскапамі сталі два вайсковыя капеланы ў званні палкоўніка, якія лічылі сябе палякамі: 27 лістапада 1938 г. Цімафей (Шрэтэр), а 29 лістапада 1938 г. Мацвей (Сямашка) [15, с. 104]. Апошні быў прызначаны вікарыем у Віленскую епархію з тытулам епіскапа браслаўскага.

Прааналізаваўшы юрыдычна-арганізацыйныя ўмовы дзейнасці Праваслаўнай Царквы, можна адзначыць, што ад пачатку існавання адроджанай польскай дзяржавы ўрад сутыкнуўся з праблемай распрацоўкі канфесіянальнай палітыкі адносна Праваслаўнай Царквы. Першапачаткова было вырашана адмежаваць Царкву ад усякіх уплываў з-за мяжы. Гэта было зроблена шляхам абвяшчэння аўтакефаліі. Юрыдычнае становішча Царквы ў Польскай дзяржаве да 1938 г. не было вызначана належным заканадаўчым актам, яе свабода і незалежнасць забяспечваліся толькі ў самым агульным выглядзе дэкларатыўнымі палажэннямі польскай Канстытуцыі. «Часовыя правілы…» узмацнілі залежнасць Царквы ад улады. Толькі ў 1938 г. быў выдадзены прэзідэнцкі дэкрэт, які вызначыў прававы статус Царквы ў Польшчы. З канчатковым усталяваннем дзяржаўных межаў Польшчы адбылася рэарганізацыя тэрытарыяльнай структуры Праваслаўнай Царквы, якая была дастасавана да адміністрацыйнага падзелу дзяржавы.

### Літаратура і крыніцы


1. Historia Polski w liczbach. Ludnosc i terytorium. – Warszawa, 1993. – 205 s.
2. *Papierzynska – Turek, M.* Organizacja Kosciola prawoslawnego w latach 1918 – 1939 / M. Papierzynska – Turek // Kosciol prawoslawny w Polsce dawnej i dzis / pod. red. L. Adamczuka i A. Mironowicza. – Warszawa, 1993. – S. 59 – 65.
3. *Krasowski, K.* Zwiazki wyznaniowe w II Rzeczypospolitej. Studium historyczno – prawne / K. Krasowski. – Warszawa – Poznan, PWN, 1998. – 354 s.
4. Wiadomosci Metropolii Prawoslawnej w Polsce. – 1939. – № 3 (11). – S. 7.
5. *Kalina, M.* Polonizacja Cerkwi prawoslawnej w wojewodztwie bialostockim (1918–1939) / M. Kalina // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. – 1995. – №2(4). – S. 74 – 105.
6. *Sleszynski, W.* Bezpieczenstwo wewnetrzne w polityce panstwa polskiego na ziemiach polnocno – wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Sleszynski. – Warszawa, 2007. – 400 s.
7. *Zelezniakowicz, S.* Z historii Polskiego Kosciola Prawoslawnego w okresie miedzywojennym (1919–1939) / S. Zelezniakowicz // Wiadomosci Polskiego Autokefalicznego Kosciola Prawoslawnego. – 1981. – № 4. – S. 42–52.
8. *Papierzynska – Turek, M.* Medzy tradycja a rzeczywistoscia. Panstwo wobec prawoslawia 1918 – 1939 / M. Papierzynska – Turek. – Warszawa: Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, 1989. – 484 s.
9. *Langrod, S.J.* O autokefalii prawoslawnej w Polsce. Studium z zakresu polskiej polityki administracji wyznaniowej / S.J. Langrod.– Warszawa, 1932. – 170 s.
10. *Mironowicz, A.* Kosciol prawoslawny na ziemiach polskich w XIX i XX wieku / A. Mironowicz – Bialystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Bialymstoku, 2005. – 379 s.
11. *Цыпин, В.* История Русской Церкви 1917 – 1997 / В. Цыпин. – М.: Издательство Спасо-Преображенского Валаамского Монастыря, 1997. – Кн. 9. – 831 с.
12. *Friszke, A.* Koscioly wschodnie w Drugiej Rzeczypospolitej / A. Friszke // Wiez. – 1988. – № 7–8. – S. 75 – 99.
13. *Kirylowicz S.* Z dziejow prawoslawia w II Rzeczypospolitej Polskiej. Niektore problemy na tle polityki wyznaniowej panstwa 1918 – 1939 / S. Kirylowicz. – Warszawa, 1985.
14. *Mironowicz, A.* Kosciol prawoslawny w Polsce / A. Mironowicz. – Bialystok, 2006. – 917 s.
15. Monitor Polski. – 1922. – № 38. – Poz. 20.
16. *Мірановіч, Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 243 с.
17. *Загідулін, А.М.* Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.): аўтарэф. дыс… канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.М. Загідулін; ГрГУ, ІГ НАН. – Мінск, 2005. – 20 с.
18. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1938. – № 88. – Poz. 597.


### Summary


*The article is devoted to study of legal and organizational conditions of activity of an Orthodox church in the Western Belarus (1921–1939). Establishment of autocephaly of the church in Poland, formation of legislative bases of mutual relations of church and the state, and also registration territorially-organizational structure of church are considered. It is marked, that the autocephaly has been proclaimed under pressure of authorities, and legal status of church has not been legislatively defined till 1938. With an establishment of frontiers of Poland there was a reorganization of territorial structure of church which has been appropriated under administrative division of the state.*

*УДК 943.086*

***А.М. Белановіч,***
*аспірант кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

# КАТЭГОРЫЯ «ОСТАРБАЙТАР» – «УСХОДНІ РАБОЧЫ» У НАЦЫСЦКАЙ ІЕРАРХІІ ЗАМЕЖНЫХ РАБОЧЫХ У ГЕРМАНСКІМ РЭЙХУ (1941–1945)

Пытанні нацысцкай палітыкі і практыкі германскіх акупацыйных улад у дачыненні да вярбоўкі, выгнання і выкарыстання працы беларускага насельніцтва ў Германскім рэйху савецкая гістарыяграфія, у тым ліку і айчынная гістарычная навука таго перыяду, пакідала за межамі сваіх даследаванняў.

Ранейшы статус табу гэта тэма губляе толькі ў постсавецкай гістарыяграфіі Беларусі. Значным прарывам у айчыннай навуцы было выданне зборнікаў дакументаў «Беларускія остарбайтары» ў другой палове 90-х гг., падрыхтаваных сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў НА РБ [1]. Але навуковую канцэпцыю тэмы замацавала гісторыка-аналітычнае даследаванне «Беларускія остарбайтары», выдадзенае аўтарскім калектывам у складзе Г. Кнацько, У. Адамушка, Н. Бандарэнка, У. Селяменева толькі ў 2001 г. [2]. На падставе сабраных дакументаў аўтары прасачылі эвалюцыю метадаў выгнання і выкарыстання працы ўсходніх рабочых, ролю калабарацыяніскіх арганізацый у вярбоўцы насельніцтва, умовы жыцця і працы ў Германскім рэйху і этапы рэпатрыяцыі остарбайтараў. У найноўшай працы, падрыхтаванай сумесна айчыннымі і замежнымі гісторыкамі «“Ostarbeiter”–“Остарбайтар”. Прымусовыя работы беларускага насельніцтва ў Аўстрыі» паказаны этапы вярбоўкі насельніцтва на працу ў Германію і вынікі пасляваеннай рэпатрыяцыі [3].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца даследаванне катэгорыі «ўсходні рабочы» ў нацысцкай іерархіі замежных рабочых, аналіз ўмоў утрымання і вольнага часу остарбайтараў у Германскім рэйху, нацысцкая палітыка ў дачыненні да народжаных у рэйху беларускіх немаўлят на падставе архіўных матэрыялаў Бундэсархіва г. Берліна, гарадскіх архіваў гарадоў Гамбург і Глюкштадт. З дапамогай інтэрв'ю з былымі остарбайтарамі аналізуюцца формы салідарнасці і ўзаемадапамогі ў асяроддзі замежных рабочых.

Сярод замежных грамадзянскіх рабочых у Германскім рэйху падчас Другой сусветнай вайны работнікі, выгнаныя з акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза, складалі самую шматлікую і безабаронную ў прававым аспекце групу. Па стане на канец верасня 1944 г. у рэйху знаходзілася 2 млн 461тыс. 163 савецкіх грамадзян [4, с. 25]. Па даных СНК БССР аб колькасці насельніцтва, выгнанага з Беларусі ў перыяд акупацыі, і якое вярнулася на радзіму, па стане на 30 лістапада 1945 г., прымусова было выгнана 399 374 чал., з іх жанчын – 237 947, мужчын – 161 427 [1, с. 381]. Згодна з нацысцкай расавай тэорыяй, прадстаўнікі ўсходнеславянскіх народаў (беларусы, украінцы і рускія) лічыліся прадстаўнікамі «ніжэйшай расы» і ўваходзілі ў катэгорыю «Ostarbeiter»–«усходні рабочы», што абумоўлівала ўмовы працы і ўтрымання ў Германскім рэйху.

Адзначым, што нацысцкая іерархія замежных рабочых і дыскрымінацыя ўсходніх рабочых, на першы погляд, па нацыянальных прыкметах на практыцы брала за аснову не расу, а месца пражывання. Згодна з праграмай генеральнага ўпаўнаважанага па працавыкарыстанні Ф.Заўкеля, выдадзенай да дня нараджэння фюрэра ў 1942 г., пад катэгорыю «остарбайтары» трапляла «рабочая сіла, якая не належыць да германскай народнасці і паходзіць з рэйхскамісарыята «Украіна», генеральнай акругі «Беларусія» ці сумежных з Латвіяй і Эстоніяй раёнаў, пасля заняцця германскім вермахтам падлягае адпраўленаю ў рэйх» [5]. Вырашальным было тое, з якой тэрыторыі выгнаны прымусовы работнік. Так, згодна з прадпісаннямі па харчаванні остарбайтараў і ваеннапалонных, адзначаецца: «да остарбайтараў належаць работнікі з тэрыторый, што раней належалі Савецкаму Саюзу, таксама ўкраінцы, але не літоўцы, латышы і эстонцы, бо яны атрымліваюць харчовы рацыён, прадугледжаны для нямецкіх рабочых. Рабочыя з дыскрыта Лемберг і акругі Беласток, згодна з дырэктывай ад 6.10.1942 г., атрымліваюць рацыён ваеннапалонных і остарбайтараў, але, згодна з папраўкай ад 2.02.1943 г., не ўваходзяць у катэгорыю остарбайтар,… што датычыцца дадатковых харчоў, то яны іх не атрымліваюць не з прычыны таго, што яны остарбайтары, а па прычыне, што яны палякі» [6]. Такім чынам, беларус ці ўкраінец, выгнаны з акругі Беласток, падпадаў пад катэгорыю «польскі работнік».

Нягледзячы на тое што палякі і остарбайтары займалі ніжэйшую прыступку ў іерархіі замежных рабочых, прадпісанні ў дачыненні да ўсходніх рабочых былі адметны сваёй асаблівай жорсткасцю. Так, пры спробе ўцёкаў остарбайтара ахове было дазволена страляць без папярэджвання, а затым паведамляць у гестапа. Калі для остарбайтараў дадатковы рацыён з яблыкаў, арэхаў, салодкага быў цалкам выключаны, то палякі ў абмежаванай колькасці, але часам маглі яго атрымаць.

Свабоднае перамяшчэнне остарбайтарам забаранялася. На прадпрыемстве і ў вольны час усходнія работнікі павінны былі знаходзіцца пад аховай. На іх распаўсюджвалася дзейнасць камендацкай гадзіны: з 1 красавіка па 30 верасня з 21-й да 5-й гадзіны раніцы, а з 1 кастрычніка па 31 сакавіка з 22 да 4 гадзіны остарбайтары павінны былі знаходзіцца ў лагерных бараках ці па месцы пражывання. Выкарыстанне транспартных сродкаў остарбайтарамі забаранялася, выключэннем магла быць толькі неабходнасць выкарыстання транспарту для выканання працоўных абавязкаў. Наведванне мерапрыемстваў культурнага, царкоўнага, забаўляльнага характару ці мерапрыемстваў, падрыхтаваных для нямецкага насельніцтва ці замежных рабочых іншых нацыянальнасцей таксама падпадала пад забарону. «Для остарбайтараў у сельскай гаспадарцы харчаванне павінна быць асобна ад гаспадароў, падчас працоўнай паўзы остарбайтары павінны быць ізаляваны ад іншых работнікаў. Любое дружалюбнае абыходжанне з остарбайтарамі з боку немцаў ці работнікаў іншых нацыянальнасцей забаронена. За непадпарадкаванне прадпісанням уводзіўся штраф у памеры 150 рэйхсмарак. У выпадку не выплаты – турэмнае пакаранне да трох тыдняў» [7].

Апазнавальны знак у выглядзе чатырохкутніка на блакітным фоне з белым надпісам «Ост» павінен быў не толькі маркіраваць рабочых з Усходу, адлюстроўваць зневажальнае да іх стаўленне, але і перасцерагаць нямецкіх рабочых ад непажаданых кантактаў з усходнімі рабочымі.

Аднак на практыцы, не зважаючы на нацысцкія прадпісанні і жорсткае пакаранне за іх невыкананне, рабочыя іншых нацыянальнасцей ці нават нямецкае грамадзянскае насельніцтва часам праяўляла спачуванне і салідарнасць да прымусовых работнікаў з Савецкага Саюза. Нона Цеплакова, яе маці і малодшая сястра былі выгнаны з аднавяскоўцамі в. Забярэзь Гродзненскай вобласці ў красавіку 1943 г. Нона працавала ў свае 12 гадоў за станком на шкляной фабрыцы Ніхайм, а па выхадных ездзіла да нямецкай сям'і на праполку буракоў. Пра сваю работу ў нямецкіх гаспадароў яна ўзгадвае станоўча, адзначае, што была магчымасць падсілкавацца, памыцца ў лазні і ўбачыць жыццё за межамі лагера. «У лагеры былі работнікі розных нацыянальнасцей – італьянцы, французы, палякі, украінцы – размешчаныя асобна. Мы насілі нашыўку «Ост»: О, С, Т – «остерегайся советского товарища», жартавалі мы паміж сабой. Французаў добра кармілі, ім Чырвоны Крыж пасылкі дасылаў. Найгорш было рускім. Нават палякам было прасцей, паколькі яны харчаваліся з іншага катла. Сталовыя былі розныя, кухня адна, толькі вось катлы розныя. Тры разы кармілі: бручка, кальрабі, штыльмус, шпінат. А хлеба 150 г у дзень» [8].

Раіса Буланава працавала на металургічным заводзе фірмы «Рохлінг» на шліфавальных станках пад наглядам старога майстра-немца. Ва успамінах яна ўзгадвае пра тое, што немец тайна пакідаў ёй кожны дзень кавалак хлеба. «Мы жылі на тэрыторыі завода і нас нікуды не адпускалі. Кожны нямецкі рабочы меў картачку, на якой на прахадной адзначаў колькі гадзін адпрацаваў. У пачатку мы гэта не рабілі, бо працавалі без аплаты. Але праз паўгода нам таксама выдалі картачкі і пачалі даваць зарплату, якой хапала на пяць ці шэсць бутэлек "Кока-колы". А ваеннапалонныя з іншых краін хадзілі вольна з працы і на працу, атрымоўвалі пасылкі з вяндлінай, пячэннем і шакаладам. Баракі былі размешчаны радамі: першы жаночы, затым французы, італьянцы. І яны ціхенька перадавалі нам ці плітку шакаладу ці яшчэ што. Пад канец вайны, калі остарбайтарам дазволілі на выхадных выходзіць за межы лагера, майстар ўзяў мяне і некалькі дзяўчат (пад сваю адказнасць) ў сям'ю. Мы збіралі ягады, палівалі агарод, палолі. Вечарам гатавалі з гаспадыняй ежу і ўсе разам садзіліся за стол вячэраць» [10].

Згодна ж з нацысцкімі дырэктывамі, магчымыя грамадскія, сяброўскія стасункі паміж остарбайтарамі і нямецкім насельніцтвам, а тым больш сексуальныя адносіны бачылася «жорсткім парушэннем здаровага народнага пачуцця». Для остарбайтара гэта азначала смяротнае пакаранне, для нямецкай жанчыны – адпраўка ў канцэнтрацыйны лагер [10, с. 29]. Сітуацыя, у якой бацькам дзіцяці быў немец, а матуля остарбайтарка, вырашалася згодна з палітыкай анямечвання.

Першапачаткова цяжарных і незамужніх усходніх работніц вызвалялі ад прымусовай працы ў Германскім рэйху і адпраўлялі на радзіму [11]. У канцы 1942 г. сітуацыя змянілася. Упаўнаважаны па выкарыстанні працоўнай сілы Ф. Заўкель пасля ўзгаднення з рэйхсфюрэрам СС Г. Гімлерам прыняў часовую (да канца сакавіка наступнага года) пастанову «Аб абыходжанні з цяжарнымі замежнымі работніцамі» [12, с. 160]. Згодна з дадзенай пастановай, «ад вяртання на радзіму цяжарных, але працаздольных остарбайтарак прынцыпова адмовіцца, цяжарныя жанчыны іншых нацыянальнасцей у выключных выпадках, са згоды кіраўніка прадпрыемства, могуць вяртацца на радзіму». Вырашальным у прыняцці гэтай пастановы з'явіліся патрэбы ваеннай эканомікі і недахоп працоўных рук на нямецкіх прадпрыемствах. У такой сітуацыі нацысцкае кіраўніцтва палічыла мэтазгодным карыстацца працоўным патэнцыялам нават цяжарных жанчын. У сакавіку 1943 г. дзейнасць прадпісання была працягнута «на перыяд ваенных дзеянняў» [13, с. 171].

У дачыненні да работніц з усходніх тэрыторый, якія не надзяляліся нават прымітыўнымі

працоўнымі правамі, прадугледжваліся асобныя прадпісанні. Іх мэтай з'яўлялася прыцягненне цяжарных работніц да працы на працягу як мага большага тэрміну падчас цяжарнасці і настолькі ж хутка (як гэта магчыма) вяртаць на патрэбы нямецкай прамысловасці і гаспадаркі. Прадпісанні прадугледжвалі забеспячэнне працай нават пры размяшчэнні жанчын у радзільнях да родаў і пасля. Жанчыны ўмоўна вызваляліся ад працы на тэрмін да 2-х тыдняў перад нараджэннем дзіцяці і на 6 тыдняў пасля родаў [14]. У нараджэнні дзяцей «расаванебяспечных» усходніх работніц нацысцкаму кіраўніцтву бачылася вялікая пагроза чысціні арыйскай расы. Нацысцкія дырэктывы ставілі пад увагу ідэалагічную важнасць пабудовы асобных радзільных дамоў для остарбайтарак і прадухілення размяшчэння парадзіх ці дзяцей остарбайтарак ва ўстановах, прадугледжаных для немцаў.

З боку нацысцкага кіраўніцтва адзначалася надзвычайная важнасць своечасовага выяўлення цяжарнасці остарбайтаркі і правядзення расавай праверкі. Дзеці остарбайтарак, народжаныя ад остарбайтараў, адпраўляліся ў спецыяльныя ўстановы па даглядзе за дзецьмі ўсходніх рабочых. Дзеці остарбайтарак, народжаныя ад немцаў ці блізкіх да арыйскага народаў, такіх як датчане, нідэрландцы, нарвежцы, шведы, разглядалі як годных для анямечвання. Для прызнання дзіцяці вартым для анямечвання прадугледжвалася складаная расавая праверка бацькоў. Гэта працэдура ўваходзіла ў кампетэнцыю кіраўніка паліцыі і службаў СС. Калі вынік быў станоўчы, немаўля забіралі ад матулі. Дзіця, годнае для анямечвання, утрымлівалася і выхоўвалася ва ўстановах для дзяцей «чыстай расы»: «дзяцей замежніц, носьбітаў часткова нямецкай крыві і блізкай да нямецкай крыві павінны разглядацца як каштоўныя, не павінны адсылацца ва ўстановы па даглядзе за дзецьмі замежніц, а павінны захоўвацца для Германіі і выхоўвацца як нямецкія дзеці» [15]. Там дзеці «чыстай расы» знаходзіліся да атрымання дазволу на ўдачарэнне ці ўсынаўленне нямецкімі сем'ямі. Пра паходжанне дзяцей нямецкім сем'ям не паведамлялі.

Такім чынам, уваходзячы ў катэгорыю «остарбайтар» і займаючы ніжэйшую прыступку ў расава-ідэалагічнай іерархіі замежных рабочых, беларускія прымусовыя работнікі падпадалі пад шматлікія абмежаванні і дыскрымінацыю. У цяжкіх умовах працы і пражывання яны былі вымушаны працаваць на патрэбы ваеннай эканомікі Германскага рэйха: на вялікіх фабрыках, малых прадпрыемствах, у сельскай і хатняй гаспадарках. Харчаванне, утрыманне, вольны час, стаўленне да остарбайтараў і нават цяжарнасць і мацярынства – усё было рэгламентавана згодна з расава-ідэалагічнымі ўяўленнямі нацысцкага кіраўніцтва да рабочых з акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Усебаковае даследаванне гісторыі беларускіх остарбайтараў, аналіз нацысцкай іерархіі замежных рабочых дае магчымасць асэнсаваць злачынную палітыку нацысцкага кіраўніцтва ў дачыненні да выкарыстання працы беларускага насельніцтва ў Германскім рэйху ў перыяд Другой сусветнай вайны.

*Літаратура і крыніцы*


1. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): документы и материалы. В 2 кн. Кн.1(1941–1942) / сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НА РБ, 1997. – 304 с.; Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): документы и материалы. В 2 кн. Кн. 2 (1943–1944) / сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НА РБ, 1997. – 472 с.
2. Белорусские остарбайтеры: ист.- аналит. исслед. / под ред. Г. Кнатько. – Минск: НА РБ, 2001. – 336 с.
3. «Ostarbeiter»- «Остарбайтер». Принудительный труд белорусского населения в Австрии: документы и материалы.– Грац; Минск, 2003. – 332 с.
4. Табл. «нямецкія і замежныя грамадзянскія рабочыя на працавыкарыстанні ў рэйху» Niethammer, Lutz. Von der Zwangsarbeit im Dritten Reich zur Stiftung „Erinnerung, Verantwortung und Zukunft» // «gemeinsame Verantwortung und moralische Pflicht» Abschlussbericht zu den Auszahlungsprogrammen der Stiftung «Erinnerung, Verantwortung und Zukunft». – Gottingen, 2007.
5. BA, R3901/20161 Reichsarbeitsministerium. Merkblatt Nr.1 fur Betriebsfuhrer den Einsatz von Ostarbeitern. A. Allgemeine Grundsatze fur die Behandlung der Ostarbeiter.
6. StaHH, 377-10 Behorde fur Ernahrung und Landwirtschaft I A b VIII 4 d. A n das Landes -und Haupternahrungsamt Hamburg z.Hd.v. Herrn Abteilungsleiter Goldhagen am 15. Marz 1944.
7. Staatsarchiv Gluckstadt, Stadtverwaltung Nr.2061: Amtsblatt der Regierung in Schleswig. Ausgegeben in Schleswig, am 17.Juli 1943. Polizeiverordnung uber die Lebensfuhrung der zivilen Arbeitskrafte aus dem altsowjetrussischen Gebiet (Ostarbeiter) vom 10. Juli 1943.
8. Прыватны архіў аўтара. Інтэрв'ю з Нонай Цеплаковай. Вілейка, 2005 г., жн.
9. Прыватны архіў аўтара. Інтэрв'ю з Раісай Буланавай. Навагрудак. 2005 г., жн.
10. Merkblatt uber die Behandlung der eingesetzten auslandischen Arbeitskrafte. Das Geheimnis der Versohnung hei t Erinnerung. Zwangsarbeiter und Kriegsgefangene im «Dritten Reich». Eine Ausstellung der Korber-Stiftung – Hamburg, 1986.
11. BA, NS19/940 Personlicher Stab Reichsfuhrer SS. Behandlung schwangerer auslandischer Arbeitskrafte. – Berlin, 20. Marz 1943.
12. Schafer, A. Zwangsarbeiter –und NS – Rassenpolitik: russische und polnische Arbeitskrafte in Wurttemberg 1939–1945. Kohlhammer, 2000.
13. Reichsverband der Landkrankenkassen, Berlin-Friedenau, am 20.Februar 1943, betrifft: Ruckfuhrung schwangerer auslandischer Arbeitskrafte. Rustungsproduktion und Zwangsarbeit in Volkswagenwerk 1939–1945: e. Dokumentation / Klaus-Jorg Siegfried.1987.
14. BA, NS19/940 Personlicher Stab Reichsfuhrer SS. Behandlung schwangerer auslandischer Arbeitskrafte. – Berlin, 20. Marz 1943.
15. BA, R 3901/20467. betrifft: Behandlung schwangerer aus. Arbeiterinnen sowie nichteinsatzfahigen Auslander und der Auslanderkinder. Schnellbrief, am 24. Oktober 1944.



*Summary*

*More than 380 000 Belarusians were forced to work in Germany from 1941 to 1945, as part of Nazi forced labor program. They were called Ostarbeiter and were the most disfranchised group of forced foreign labor during the World War II. On base of a number of Nazi's docu-*

*ments the category of Ostarbeiter is analyzed. Special attention is given to Nazi's prescriptions of Ostarbeiters thein leaving and working conditions. The article deals with the problem of instructions in maternity hospitals for «Ostarbeiterinnen» and to the children were was born in Germany at that time.*

*УДК 947.6*

***А.А. Вараб'ёў,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры ўсходнеславянскай і расійскай гісторыі МГУ*

## ВЫБАРЫ ВА УСЕРАСІЙСКІ УСТАНОЎЧЫ СХОД У МІНСКАЙ ГУБЕРНІ

Выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход – адна з цэнтральных палітычных падзей пачатку XX ст. як на тэрыторыі ўсёй тагачаснай Расіі, так і ў беларускіх губернях. Варта адзначыць, што гэта праблема, нягледзячы на дастаткова высокую ступень яе вывучанасці гісторыкамі як у савецкі, так і постсавецкі час, яшчэ доўга будзе прыцягваць да сябе ўвагу.

Сярод даследчыкаў, на наш погляд, трэба вылучыць Л.М. Спірына [1], А.М. Знаменскага [2], М.С. Сташкевіча [3], А.А. Урбановіча [4], Л.Р. Пратасава [5]. У іх працах ёсць шмат інфармацыі, якая адносіцца да выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход. Да такой можна аднесці тэрміны правядзення выбараў, пералік кандыдацкіх выбарчых спісаў, звесткі аб выніковых паказчыках па кожным з кандыдацкіх спісаў і інш. Аднак і ў іх працах няма поўнай карціны выбараў. У дадзенай публікацыі размова пойдзе аб малазакранутых або зусім распрацаваных даследчыкамі аспектах вышэйназванай праблемы. На аснове новых, нядаўна знойдзеных архіўных матэрыялаў і матэрыялаў перыядычнага друку 1917 г. паспрабуем унесці як мага больш удакладненняў у тую карціну выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход, якая склалася ў выніку работы тых гісторыкаў, якія займаліся вывучэннем дадзенай праблемы раней.

Выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход на ўсёй тэрыторыі Расіі павінны былі праходзіць 12–14 лістапада 1917 г. У выбарах у Мінскай губерні планавалі прыняць удзел трынаццаць выбарчых спісаў: № 1 – аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі (яўрэйскія сацыялісты і сацыялісты-сіяністы); № 2 – яўрэйскага нацыянальнага выбарчага камітэта; № 3 – Усерасійскага саюза зямельных уласнікаў; № 4 – Калінкавіцкага Савета сялянскіх дэпутатаў; № 5 – Бунда і партыі меншавікоў; № 6 – партыі кадэтаў; № 7 – меншавісцкай арганізацыі «Адзінства»; № 8 – польскага выбарчага камітэта; № 9 – бальшавіцкай партыі; № 10 – яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі «Паалей-Цыён»; № 11 – Рускай дэмакратычнай партыі; № 12 – блока партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і неакупіраванай часткі Віленскай губерняў; № 13 – БСГ (Беларускай сацыялістычнай грамады) [1, с. 291].

Аднак рэальна ў выбарах удзельнічалі не трынаццаць, а адзінаццаць выбарчых спісаў, таму што Мінская акружная выбарчая камісія, па прычыне парушэнняў працэдуры падачы кандыдацкіх спісаў, выключыла з вышэйназваных спісы № 4 і № 7. Акрамя таго, яшчэ раней быў выключаны, па той жа прычыне, выбарчы спіс Столінскай рады [6, л. 2–9].

Выбары ва Устаноўчы сход у Мінскай губерні праходзілі 26–28 лістапада 1917 г. [1, с. 291]. Тэрмін іх правядзення быў перанесены на больш позні з-за ўзброенага захопу ўлады ў Расіі бальшавіцкай партыяй і канфлікту ў Мінску паміж бальшавіцкім ВРК і камітэтам выратавання рэвалюцыі, які складаўся з прадстаўнікоў апазіцыйных бальшавікам партый, і завяршыўся перамогай ВРК толькі 2 лістапада. Для правядзення выбараў была ўтворана Мінская выбарчая акруга, у якую ўвайшлі Мінская і неакупіраваная немцамі частка Віленскай губерняў. Варта адзначыць, што нямецкія войскі ў ходзе Першай сусветнай вайны акупіравалі ў Мінскай губерні амаль поўнасцю Навагрудскі павет, большую частку Пінскага павета і невялікую частку Слуцкага, а астатнія шэсць паветаў (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мінскі, Мазырскі і Рэчыцкі) не былі закрануты акупацыяй. З сямі паветаў Віленскай губерні чатыры (Віленскі, Лідскі, Свянцянскі і Трокскі) былі акупіраваны цалкам, а тры (Ашмянскі, Вілейскі і Дзісненскі) – часткова. Неакупіраваная немцамі частка Віленскай губерні ўвайшла ў Мінскую выбарчую акругу. Па законе аб выбарах блокавыя пагадненні павінны былі заключацца да іх пачатку. На тэрыторыі Мінскай губерні блокавае пагадненне было заключана паміж Бундам і партыяй меншавікоў, партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў) і губернскім Саветам сялянскіх дэпутатаў. Варта адзначыць, што быў утвораны яшчэ адзін блок: бальшавіцкай партыі з сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), а таксама ППС-левіцай і сацыял-дэмакратыяй Латвіі [7]. Такім чынам, бальшавікі заключылі афіцыйныя блокавыя пагадненні з трыма партыямі (дзвюма польскімі і адной латышскай), чаго гісторыкі, якія раней даследавалі праблему выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход, не абмяркоўвалі.

У сумесны з бальшавікамі выбарчы спіс ад СДКПіЛ увайшлі члены яе ЦК: Ляшчынскі, Бабінскі і Гжэльшчак [8]. Прадстаўнікі ППС-левіцы і сацыял-дэмакратыі Латвіі у сумесны выбарчы спіс не трапілі.

Акрамя дадзеных змен у карціну выбараў у Мінскай губерні неабходна ўнесці яшчэ некалькі істотных дэталей. Па-першае, бальшавікі выкарысталі ў сваіх мэтах раскол Бунда і тая частка, якая адкалолася (пазней яна называлася «Камбунд»), заклікала галасаваць на выбарах сваіх паплечнікаў за бальшавіцкі спіс № 9 [9, с. 509]. Па-другое, бальшавікі ўнеслі раскол у склад сялянства Мінскай і неакупіраванай часткі Віленскай губерняў. Раней з'ездам сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў было прынята рашэнне галасаваць на выбарах ва Устаноўчы сход за партыю эсэраў. Бальшавікі, якія захапілі ўладу і абвясцілі дэкрэт аб зямлі, склікалі напярэдадні выбараў альтэрнатыўны сялянскі з'езд, на якім прабальшавіцкі настроеныя сяляне прынялі аднадушнае рашэнне галасаваць на выбарах за бальшавіцкую партыю, аб чым паведаміла газета мінскіх бальшавікоў «Звязда» [10, л. 406]. Па-трэцяе, бальшавікі выкарысталі ў сваіх мэтах і раскол у эсэраўскай партыі, бо атрымалі падтрымку левых эсэраў, аб чым красамоўна сведчыла выбранне ў прэзідыум сялянскага з'езда Мінскай і Віленскай губерняў пяці бальшавікоў і аднаго левага эсэра [10, л. 406]. Не менш, а нават больш карысці партыі бальшавікоў прынесла прыняцце імі дэкрэта аб міры. З гэтай прычыны на іх бок перайшла амаль уся расійская армія. Прапаганда неадкладнага заключэння міру прынесла бальшавікам велізарныя дывідэнты, што трапна перадаў амерыканскі гісторык Уалдмэн словамі невядомага салдата-акопніка: «Навошта мне зямля і свабода, калі мяне могуць забіць?» [5, с. 249–250]. Усе захады, якія былі зроблены бальшавікамі напярэдадні выбараў, самым непасрэдным і істотным чынам паўплывалі на ход выбараў і іх вынікі.

Аднак на іх вынікі маглі паўплываць і парушэнні працэдуры галасавання. Менавіта аб гэтым (вельмі важным) аспекце выбараў ніхто з папярэдніх даследчыкаў нічога не напісаў. Пазней паспрабуюць падвесці рэзультаты галасавання на аснове знойдзеных адрывачных архіўных даных па выбарчых участках Мінскай і Віленскай губерняў, зараз жа звернемся да гэтых даных. Так, у Старасельскім выбарчым участку Мазырскага павета насельніцтва прагаласавала наступным чынам: за спіс № 12 – 363 чал., за № 1 – 1; № 9 – 8; № 2 – 15, іншыя спісы галасоў не атрымалі. У Глінскім выбарчым участку за кандыдацкі спіс № 2 прагаласавала 18 чалавек, за № 10 – 6, № 9 – 48, № 12 – 339. Па Бярозаўскім выбарчым участку даныя такія: спіс № 6 – 1, № 9 – 2, № 10 – 9, № 11 – 36, № 12 – 259 галасоў. Па Блетаўскім участку галасы выбаршчыкаў размеркаваліся наступным чынам: № 1 – 2, № 2 – 15, № 10 – 1, № 12 – 290. Па Усяжыцкім участку спіс № 2 атрымаў 9 галасоў, спіс № 12 – 284, іншыя спісы галасоў не атрымалі. Па Лахаўскім участку за спіс № 1 прагаласавала 12 чалавек, № 2 – 447, № 3 – 1, № 5 – 80, № 6 – 4, № 8 – 27, № 9 – 2846, № 10 – 1, № 11 – 30, № 12 – 9, № 13 – 1. У Краснавольскім участку ўсе 597 выбаршчыкаў прагаласавалі за спіс № 9. У Пярэнаўскім участку спіс № 9 атрымаў 360 галасоў, а № 12 – 14, іншыя спісы галасоў не атрымалі. У Рыдзігорскім участку за спіс № 9 прагаласавала 423 чалавекі, а за № 12 – 2. І нарэшце, па Чарабасаўскім участку спіс № 9 атрымаў 236 галасоў, № 12 – 31, іншыя спісы зусім не атрымалі галасоў [11, л. 104, 120]. Гэта былі ўсе адрывачныя даныя па Мазырскім павеце, якія нам давялося адшукаць.

У далучаным да Мінскай губерні Дзісненскім павеце Віленскай губерні ва Угальнянскай участковай камісіі ўсяго ўдзельнічала ў галасаванні 296 чалавек, з якіх за спіс № 3 аддалі свае галасы 3 чалавекі, за спіс № 5 – 1, № 6 – 1, № 8 – 4, № 9 – 271, № 12 – 16, астатнія спісы галасоў не атрымалі. У Паўлавіцкай участковай камісіі таго ж павета ўсяго прынялі ўдзел у выбарах 384 выбаршчыкі, з якіх за спіс № 2 аддалі свае галасы сем, за спіс № 6 – 1, № 8 – 12, № 9 – 320, № 11 – 1, № 12 – 41, адзін бюлетэнь быў прызнаны несапраўдным. У Пуцяцінскай участковай камісіі г. Дзісны ўсяго прагаласавала 402 чалавекі. За спіс № 2 – 1, № 5 – 1, № 8 – 2, № 9 – 379, № 12 – 19, а астатнія кандыдацкія спісы галасоў не атрымалі. У Курылавіцкай участковай камісіі Дзісненскага павета ўсяго прагаласавала 689 чалавек. З іх за спіс № 5 – 1, № 8 – 3, № 9 – 666, № 12 – 19. У Краснапольскай участковай камісіі таго ж павета ўсяго прагаласавалі 611 выбаршчыкаў, з якіх за спіс № 5 –1, № 6 – 17, № 8 – 51, № 9 – 531, № 11 – 4, № 12 – 7, а адзін бюлетэнь быў прызнаны несапраўдным. У Друйскай воласці Дзісненскага павета ўсяго прагаласавала 1170 чалавек, з якіх за спіс № 2 – 1, № 3 – 5, № 5 – 1, № 6 – 6, № 8 – 106, № 9 – 995, № 12 – 53 і за спіс № 13 – 3 [11, л. 83–87 зв., 89–102 зв., 204–208 зв., 210–214 зв.].

У чацвёртай участковай камісіі Лунінскай воласці Пінскага павета ўсяго прагаласавала 842 выбаршчыкі, з якіх за спіс № 2 – 7 чалавек, № 6 – 5, № 8 – 19, № 9 – 767, № 12 – 44. У шостай участковай камісіі Дабраслаўскай воласці таго ж павета прагаласавалі 419 чалавек, з якіх за спіс № 2 прагаласаваў 1 чалавек, № 3 – 1, № 8 – 3, № 11 – 2, № 12 – 7, № 9 – 405. У сёмай участковай камісіі той жа воласці Пінскага павета ўсяго прагаласавалі 333 чалавекі, з іх за спіс № 2 прагаласавалі 2 чалавекі, № 6 – 2, № 9 – 304, № 12 – 21. У Кажан-Гарадоцкай воласці Пінскага павета прагаласавалі 439 чалавек, з якіх за спіс № 9 аддалі свае галасы 435 чалавек, за спіс № 2 –

3, за № 12 – 1 чалавек [11, л. 52–58 зв., 189–190, 198–199 зв.]. У Васілеўскай участковай камісіі Бабруйскага павета ў выбарах удзельнічаў 1061 чалавек. З іх за спіс № 3 прагаласаваў 1 чалавек, № 6 – 1, № 9 – 28 і № 12 – 1031. У Свіслацкай участковай камісіі таго ж павета ўсяго прагаласаваў 741 чалавек, але нічога не казалася аб тым, за каго прагаласавалі гэтыя выбаршчыкі [11, л. 64–66, 72–81 зв.]. Такім чынам, поўных даных аб выбарах ва Устаноўчы сход па Мінскай выбарчай акрузе адшукаць не ўдалося. Выключэннем з'яўляюцца прыведзеныя вышэй нязначныя адрывачныя архіўныя звесткі па Мазырскім, Дзісненскім, Пінскім і Бабруйскім паветах. Аднак варта зрабіць яшчэ адно даволі важнае ўдакладненне з улікам таго, на што спасылаўся ў сваёй працы сучасны расійскі гісторык Л.Р. Пратасаў: «У Дзісненскім павеце Мінскай губерні (і ўжо ў гэтым выпадку ён зрабіў памылку, бо не Мінскай, а Віленскай губерні) сяляне атрымалі выбарчыя бюлетэні толькі сіяністаў і эсэраў» [5, с. 184]. І ў дадзеным выпадку расійскі гісторык дапусціў памылку, бо з тых нешматлікіх, адрывачных, звестак аб выбарах у Дзісненскім павеце бачна, што бюлетэні бальшавікоў на яго тэрыторыі былі і іх была дастатковая колькасць. Дык чаму ж расійскі гісторык памыліўся? Адказ на гэта пытанне нам уяўляецца вельмі простым: ён не здолеў адшукаць адрывачных звестак і даверыўся інфармацыі, на якую спасылаліся раней, яшчэ ў савецкі час, і якая ўжо не з'яўлялася дакладнай. Поўнай карціны выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход у Мінскай выбарчай акрузе нельга скласці і на аснове матэрыялаў перыядычнага друку таго часу, што з'яўляецца вельмі дзіўным і падазроным, бо прэса пільна сачыла за выбарамі і не магла абысціся без асвятлення такой важнай падзеі. Відаць, тут не абышлося без захапіўшых уладу бальшавікоў, якія зрабілі ўсё, каб схаваць рэальную карціну выбараў, бо яны былі падтасаваны імі на сваю карысць.

Мінская акруговая выбарчая камісія падвяла вынікі выбараў, за выключэннем трох валасцей Мазырскага павета (Нікалаеўскай, Танежскай і Петрыкаўскай), у якіх колькасць выбаршчыкаў складала 16755 чалавек. Усяго ў Мінскай выбарчай акрузе прагаласавала 917248 выбаршчыкаў. Напярэдадні выбараў (згода з выбарчым заканадаўствам) аб'ядналіся ў блокі спісы № 12 (эсэраў) і № 5 (Бунда і меншавікоў), № 8 (польскага выбарчага камітэта) і № 3 (Усерасійскага саюза зямельных уласнікаў), № 1 (аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі) і № 10 (яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі «Паалей-Цыён»). Блок спісаў № 12 і № 5 атрымаў 197950 галасоў выбаршчыкоў, спіс № 9 – 579087 галасоў, спіс № 2 – 65046, аб'яднаныя спісы № 8 і № 3 – 40347, аб'яднаныя спісы № 1 і № 10 – 11066, спіс № 6 – 10724, № 11 – 10040, № 13 – 2988 галасоў. Такім чынам, аказаліся выбранымі 10 бальшавікоў (першыя ў сваім спісе), 3 эсэры і адзін ад спіса № 2 (Мазэ). Два месцы засталіся вакантнымі, таму што не былі праведзены выбары ў трох валасцях Мазырскага павета. Іх вырашылі падзяліць паміж спісамі № 9 і № 12, бо яны набралі найбольшую колькасць галасоў. Па гэтай прычыне ад Мінскай акругі ва Усерасійскі Устаноўчы сход былі выбраны 11 бальшавікоў, 4 эсэры і адзін прадстаўнік ад яўрэйскага выбарчага спісу. Адзначым, што асобна спіс № 12 атрымаў 181673 галасы, № 5 – 16277, № 3 – 3465, № 8 – 36882, № 1 – 4880, а № 10 – 6186 галасоў [12, л. 67–69, 71]. Галасы выбаршчыкаў у Мінскай выбарчай акрузе размеркаваліся так: спіс № 1 атрымаў 0,5%, № 2 – 7,1%, № 3– 0,4%, № 5 – 1,8%, № 6 – 1,2% № 8 – 4%, № 9 – 63,1%, № 10 – 0,7%, № 11 – 1,1%, № 12 – 19,8%, № 13 – 0,3%. На аснове прыведзенага фактычнага матэрыялу можна зрабіць наступныя высновы:

– перамогу на выбарах ва Усерасійскі Устаноўчы сход у Мінскай выбарчай акрузе атрымалі бальшавікі, а іх галоўныя апаненты (эсэры) занялі другое месца і атрымалі пры гэтым утрая менш галасоў;

– бальшавікі заключылі афіцыйнае блокавае пагадненне з такімі партыямі, як СДКПіЛ, ППС-левіца і Латышская сацыял-дэмакратыя, а неафіцыйнае – з левымі эсэрамі, часткай Бунда («Камбунд») і альтэрнатыўным губернскім Саветам сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў;

– на карысць бальшавікоў вельмі добра спрацавалі і першыя дэкрэты Савецкай улады (аб міры і аб зямлі);

– за бальшавікамі пайшла армія, што дало ім перавагу ў барацьбе са сваімі палітычнымі апанентамі. Даволі красамоўна сведчаць адрывачныя архіўныя звесткі пра тое, што ў шэрагу выбарчых участкаў усё насельніцтва галасавала за бальшавікоў. Гэта з'яўляецца даволі падазроным і, як нам уяўляецца, тут «дапамглі» верныя бальшавікам, якія застаўлялі галасаваць насельніцтва прыфрантавой Мінскай губерні;

– даныя па трох «прапаўшых» валасцях Мазырскага павета, магчыма, прапалі недарэмна, калі дапусціць, што насельніцтва іх аднеслася да бальшавікоў больш негатыўна, чым у іншых валасцях;

– адсутнасць даных аб фальсіфікацыі выбараў і парушэннях працэдуры галасавання (па Віцебскай і Магілёўскай губернях яны ў наяўнасці ёсць) у Мінскай губерні такія ж даныя адсутнічаюць і па Заходнім фронце, можна расцэньваць, як наўмыснае знішчэнне іх бальшавікамі з мэтай скрыць уласныя шматлікія парушэнні працэдуры правядзення выбараў.

*Літаратура і крыніцы*

1. *Спирин, Л.М.* Россия, 1917 год (Из истории борьбы политических партий) / Л.М. Спирин. – М., 1987.
2. *Знаменский, О.Н.* Всероссийское Учредительское собрание. История созыва и политического крушения / О.Н. Знаменский. – Л., 1976.
3. *Сташкевич, Н.С.* Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии / Н.С. Сташкевич. – Минск, 1978.
4. *Урбанович, А.А.* Тактика политических партий в период подготовки и проведения выборов в Учредительное собрание: дис. … канд. ист. наук / А.А. Урбанович. – Минск, 1993.
5. *Протасов, Л.Г.* Всероссийское Учредительное собрание: история созыва и крушения / Л.Г. Протасов. – М., 1997.
6. Кандидатские списки на выборах во Всероссийское Учредительное собрание по Минскому избирательному округу // Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). – Фонд. 1810. – Оп. 1. – Д. 273.
7. Большевистские союзники // Дело народа. – 1917. – 19 окт.
8. Избирательный блок // Буревестник. – 1917. – 16 окт.
9. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. – Минск: Гос. изд-во БССР, ред. полит. лит, 1957. – Т. 2.
10. Материалы Минской окружной по выборам во Всероссийское Учредительное собрание комиссии // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ). – Фонд 60п. – Оп. 2. – Д. 68.
11. Материалы по выборам во Всероссийское Учредительное собрание на территории Минской, Могилевской и Витебской губерний // Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 60п. – Оп. 3. – Д. 737.
12. Выборы во Всероссийское Учредительное собрание по Минскому избирательному округу // Государственный архив Российской Федерации. – Фонд 1810. – Оп. 1. – Д. 272.

*Summary*

*In this article the results of election in the All-Russian Constituent Assembly on the territory of Minsk province are examined. On the basis of scanty, earlier unknown archival records the author has drawn a conclusion that the victory of Bolsheviks on elections in Minsk province was reached to no small degree due to infringements of the elective legislation.*

---

*УДК 930.26«5/12»*

***В.А. Пілецкі,***
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ І ПІСЬМОВЫЯ КРЫНІЦЫ АБ СПЕЦЫФІЦЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў VI–VIII стст. І Ў IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

Відавочнае і галоўнае адрозненне двух азначаных перыядаў было ў рознасці стадый развіцця грамадства на тэрыторыі Беларусі. Калі ў VI–VIII стст. насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёну і Беларусі ў тым ліку знаходзілася на стадыі разлажэння радавых адносін і ўзнікнення класавага (феадальнага) грамадства, то ў IX–сярэдзіне XIII ст. на тэрыторыі Беларусі ўжо існавала раннесярэднявечная эканоміка, прадстаўленая раннефеадальнымі эканамічнымі адносінамі [1, с. 46–74].

Адрозненне сацыяльнага ладу заключалася ў тым, што ў VI–VIII стст. на тэрыторыі Беларусі панавалі радавыя адносіны, але ўжо адбывалася іх інтэнсіўнае разлажэнне. Кіраванне грамадствам ажыццяўлялі познерадавыя патрыярхальныя структуры. Яны ўключалі ў сябе правадыра племені, савет старэйшын і агульны сход дарослых свабодных мужчын, здольных насіць зброю. Працоўная частка насельніцтва складалася з простых сялян-абшчыннікаў, членаў радавых ці родава-суседскіх абшчын, якія займаліся жывёлагадоўляй, земляробствам і падсобнымі промысламі.

Ідэалагічнае забеспячэнне жыцця грамадства (маральна-прававое выхаванне насельніцтва, захаванне традыцый і законаў звычаёвага права, ініцыяцыі падлеткаў і інш.) ва ўмовах панавання язычніцкіх рэлігійных вераванняў (шматбожжа ці політэізму) выконвалі язычніцкія святары (жрацы, валхвы, крывы-крывейты) [2, с. 54–56]. Яны мелі асобныя месцы для адпраўлення культавых дзеянняў *капішчы*, спецыяльных людзей– *вайдэлотаў* (і вайдэлотак) [3, с. 31; 4, с. 450], якія дапамагалі ім ажыццяўляць абрадавыя дзеянні і падтрымлівалі свяшчэнны незгасальны агонь – *зніч*, а таксама стройную сістэму абраднасці, міфалогію і традыцыйнае звычаёвае права.

У VI–VII стст. на тэрыторыі Беларусі ўсталяваўся сацыяльны лад, які, згодна з даследаваннямі амерыканскага этнолага і сацыёлага Люіса Генры Моргана (1818–1881), атрымаў назву «ваенная дэмакратыя» [5, с. 74–87]. Яго характэрнай рысай было павелічэнне колькасці грабежніцкіх войнаў, абумоўленых усведамленнем шырокімі коламі насельніцтва магчымасці і выгаднасці накаплення багаццяў (вынікаў вытворча-гаспадарчай дзейнасці, рабоў, скаціны, зброі і інш.).

Доказам існавання ваеннай дэмакратыі на тэрыторыі Беларусі можна лічыць з'яўленне ўмацаваных *гарадзішчаў* (у адрозненне ад *селішчаў,* што былі вядомы ў папярэднія і больш позніяперыяды). Невялікія па плошчы (каля 45х 85 м$^2$) населеныя пункты, дзе была магчымасць схавацца ад непрыяцеля ва ўмовах частых ваенных сутыкненняў. У Беларусі вядомы дзесяткі такіх гарадзішчаў банцараўскай археалагічнай культуры V–VII стст., што размяшчаліся часцей за ўсё на стромкіх (абрывістых) берагах рэк і былі ўмацаваны валам і рвом, напоўненым вадой [6, с. 74–87].

Грамадска-палітычны лад, які існаваў на тэрыторыі Беларусі ў IX–сярэдзіне XIII ст., характарызаваўся існаваннем раннедзяржаўных утварэнняў (княстваў, зямель): Полацкага, Тураўскага, Смаленскага, дзе мелася сваё дзяржаўнае кіраўніцтва (веча, князь, дружына), дзейнічалі законы звычаёвага права, якія рэгламентавалі найважнейшыя бакі сацыяльных узаемаадносін і быў ажыццёўлены падзел насельніцтва на сацыяльна-класавыя катэгорыі.

Старадаўні збор законаў звычаёвага права «Праўда Руська» і іншыя гістарычныя крыніцы называюць катэгорыі залежных *сялян* (смерды, закупы, радовічы, халопы, ізгоі, удачы). Вядомы і катэгорыі феадальнага насельніцтва, якое пражывала ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў той час (*свецкага*: князі, дружыннікі, баяры, цівуны, пасаднікі і інш.; *духоўнага*: епіскапы, ігумены, прасвітары, дзякі, чытальнікі, пеўчыя, прыходскія святары і інш.).

Грамадская эканоміка і гаспадарчая дзейнасць насельніцтва таксама мелі даволі істотныя адрозненні. У VI–VIII стст. усё насельніцтва тэрыторыі Беларусі было сельскім. Сельская гаспадарка была асновай жыцця тагачаснага грамадства, і таму ў яе паспяховай эвалюцыі было зацікаўлена ўсё грамадства і яго кіруючыя колы.

Археалагічныя даследаванні помнікаў *банцараўскай* культуры (каля в. Равячка Мядзельскага р-на [7, с. 418], в. Дзядзілавічы Барысаўскага [8], в. Гарадзішча Мядзельскага [9, с. 159], в. Старое Сяло Віцебскага раёнаў [9, с. 587] і інш.), а таксама помнікаў *калочынскай* культуры (в. Нікадзімава Горацкага і Вежкі Дубровенскага раёнаў [10, с. 19]), помнікаў культуры *пражскага тыпу* (в. Хатомель, Столінскага р-на [11, с. 22–27]) паказалі, што на паселішчах VI–VIII стст. вядучымі галінамі гаспадаркі былі лядна-агнявое земляробства і жывёлагадоўля.

Акрамя вытворчых відаў дзейнасці шырока выкарыстоўваліся традыцыйныя прысвойваючыя: паляванне, рыбалоўства і бортніцтва. Былі развіты і рамесныя промыслы: чорная і каляровая металургія, ганчарства, апрацоўка скур, дрэваапрацоўка, прадзенне і ткацтва.

Археалагічныя помнікі каля в. Хатомель Столінскага р-на, акрамя іншага, наглядна дэманструюць разлажэнне патрыярхальна-радавога ладу [11, с. 34–50]. У апошні перыяд існавання гэтага паселішча на ім пражывала багатая знаць, якая абапіралася на ўзброеных дружыннікаў (пра гэта сведчаць знаходкі рэчаў: жалезных наканечнікаў дзідаў і стрэл, пласцінкі ад панцыра, бляшка ад партупеі, цуглі, якія былі на той час ва ўжытку прывілеяванага саслоўя – дружыннікаў). Побач з імі пражывала простае насельніцтва – тыя, хто займаўся сельскагаспадарчымі работамі.

Вызначальнымі рысамі ўзроўню гаспадаркі тых часоў можна лічыць падсечна-агнявое земляробства і жывёлагадоўлю, ляпны посуд без выкарыстання ганчарнага кола (з’явілася толькі прыблізна ў канцы IX– пачатку X ст.), а таксама існаванне рамяства, якое знаходзілася на стадыі хатніх промыслаў. У гэты час захоўваўся значны ўплыў радавога ўкладу жыцця, шматукладнасць (адначасовае суіснаванне трох сацыяльных укладаў: першабытнаабшчыннага, рабаўладальніцкага і феадальнага) і інш.

Гаспадарчае жыццё насельніцтва беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст. ужо было на больш высокім узроўні. Яго звычайна вызначаюць у гістарычнай літаратуры як раннефеадальнае, што характарызавалася паступовым перададоленнем шматукладнасці (шляхам выцясненння рэштак першабытнаабшчыннага і рабаўладальніцкага гаспадарчых укладаў), а таксама раздзяленнем сацыяльных функцый паміж пануючымі і падначаленымі коламі грамадства, вызначэннем феадальнай рэнты, замацаваннем феадальных сацыяльных узаемаадносін.

Земляробства і жывёлагадоўля гэтага перыяду ўзняліся на больш высокі ўзровень. Характэрнымі яго рысамі быў пераважна *ворыўны* характар з выкарыстаннем вялікага *драўлянага рала* з жалезным наральнікам. Рала як вупражная, ворыўная і безадвальная прылада існавала на тэрыторыі Усходняй Еўропы з сярэдзіны 1 тыс. н. э., але яе адносна шырокае прымяненне пачалося прыблізна з VII–VIII стст.

Дзесьці да гэтага часу адносіцца найбольш старажытнае рала на тэрыторыі нашай краіны, што было знойдзена ў тарфяніку каля в. Капланаўшчына Клецкага р-на [12]. Больш познія падобныя рэчы (IX–XIII стст.) знойдзены ў Брэсце, Гродне і інш., а таксама выяўлены наральнікі (в. Хатомель Столінскага р-на, на паселішчы VIII–IX стст. н. э.). Нягледзячы на тое што прыблізна з X–XI стст. з’явілася больш прагрэсіўная ворыўная прылада – *саха*, драўлянае рала знаходзіла сваё прымяненне да пачатку XX ст.

Даволі шырока ў гэты час на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвалася практыка інтэнсіфікацыі тэхналогіі земляробства. Насельніцтву ўжо была вядома навука севазваротаў. Шырока выкарыстоўвалася двухполле, а ў асобных выпадках нават трохполле. Культуры для засявання палеткаў падзяляліся на яравыя і азімыя, што таксама спрыяла ўкараненню севазваротаў.

Праца земляробаў была сезонная, сеялі і ўбіралі ўраджай уручную. Малацілі драўлянымі цапамі. Для памолу зерня замест каменных зерняцёрак (вядомых у папярэдні перыяд) шырока распаўсюдзіліся круглыя каменныя жорны з пясчанікавых парод. Захоўвалася зерне ў спецыяльна пабудаваных свірнах. У гэты час ужо быў вядомы спосаб вытворчасці круп. Проса таўклі ў вялікіх драўляных ступах драўлянымі таўкачамі. Пры раскопках у Мінску археолагі знайшлі драўляныя ручныя і складаныя нажныя ступы

(адна з іх у пласце XII ст., другая – XIII ст.). Нажная ступа складалася з масіўнай драўлянай плахі з адтулінай для засыпання зерня з аднаго боку і ўмацаванага рычага з другога, да якога быў прымацаваны драўляны таўкач, які прыводзіўся ў дзеянне націскам нагі [13, с. 54]. Алей выціскалі шляхам прымянення простага прэса.

Даволі значным дадаткам да земляробча-жывёлагадоўчай гаспадаркі служылі паляванне і рыбная лоўля. Паляванне ў гэты час набыло спецыялізаваны характар. Узровень паляўнічых прылад, выкарыстанне лука і стрэлаў, розных сілкоў, пастак і іншых складаных паляўнічых прылад дазволіла здабываць дзічыну ў кірунку харчовага або футравага палявання. Харчовае распаўсюджвалася на аленя, зубра, дзіка, казулю, гуся, лебедзя, цецерука і інш., а пры футравым здабывалі баброў, лісіц, куніц, мядзведзяў, вавёрак.

Сур'ёзнай дадатковай галіной гаспадаркі было бортніцтва. Мёд выкарыстоваўся як салодкая прыправа для прыгатавання ежы, лячэбны сродак, а таксама для вырабу хмельнага напою. Бортніцтва давала нават адзін з экспартных прадуктаў, які вывозіўся ў краіны Заходняй Еўропы,– воск. Назіранне за працавітасцю пчол, як і за павадкамі іншых прадстаўнікоў жывёльнага свету (лебядзіная вернасць, мацярынская любоў вераб'я, вынослівасць мурашак і інш.), выхоўвала і развівала тагачасных людзей.

Адной з асаблівасцей эвалюцыі гаспадаркі гэтага перыяду з'яўляецца ўзнікненне гарадоў як цэнтраў рамяства і гандлю. Першыя летапісныя ўпамінанні гарадоў Беларусі адносяцца да другой паловы IX ст. (Полацк – 862, Тураў – 980, ...) [14, с. 87], але сучасныя вучоныя сцвярджаюць, што ўзнікненне гарадоў можна адносіць да перыяду прыблізна на 100 гадоў ранейшага, чым яны ўпаміналіся ў летапісах. Тым больш, археалагічныя матэрыялы сведчаць, што большасць з гарадскіх паселішчаў Беларусі з'явілася задоўга да таго, як пра іх паведамілі летапісы [13, с. 55].

Факт узнікнення гарадоў, як вядома, гэта паказчык станаўлення рамяства як аднаго з відаў дзейнасці насельніцтва Беларусі. Важнейшай сярод прычын узнікнення гарадоў, па сведчанні даследчыкаў, было аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі. Маецца на ўвазе, што рамеснікі на гэтым этапе (падчас узнікнення гарадскіх паселішчаў) дасягнулі высокага майстэрства і ім не было неабходнасці падтрымліваць (для збыту сваёй прадукцыі) сувязі з насельніцтвам нейкага пэўнага рэгіёну (сваёй вёскі, абшчыны ці інш.). Яны стваралі вырабы такога высокага ўзроўню, якія маглі свабодна прадавацца. Іх высокая якасць, у параўнанні з прымітыўнымі вырабамі хатніх промыслаў, забяспечвала попыт у любым сацыяльным асяроддзі, дзе была значная колькасць людзей.

Майстры-рамеснікі пачалі працаваць на рынак, але яго патрэбна было знайсці. Вось чаму сем'і рамеснікаў пачалі перасяляцца бліжэй да перакрыжаванняў міжнародных і мясцовых гандлёвых шляхоў, да важных водных артэрый краіны, па якіх ішлі значныя гандлёвыя грузапатокі. Сяліліся ў месцах пражывання князя і яго адміністрацыі, дзе абарачалася вялізная колькасць насельніцтва (па розных судовых, адміністрацыйных, падаткавых і іншых справах), а таксама ў іншых людных месцах (буйныя гарадзішчы жалезнага веку), дзе можна было лёгка прапаноўваць сваю прадукцыю пакупніку. Менавіта там і ўзнікалі гарады.

Узнікненне гарадоў, нягледзячы на тое што яны былі цэнтрамі рамяства і гандлю, з'яўлялася не толькі паказчыкам узроўню развіцця выключна рамяства. Абавязковай эканамічнай перадумовай станаўлення рамяства на аснове эвалюцыі хатніх промыслаў быў пэўны ўзровень развіцця земляробства і жывёлагадоўлі, якія дасягнулі такіх параметраў, пры якіх аказалася магчымым пракарміць значную частку насельніцтва (у асобе рамеснікаў), што не ўдзельнічалі ў земляробча-жывёлагадоўчым працэсе.

Такім чынам, аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, што выразілася ў з'яўленні спецыяльных рамесніцка-гандлёвых паселішчаў (гарадоў), сведчыла пра з'яўленне гандлю. Рамеснікі дасягнулі такога высокага ўзроўню дзейнасці, што пачалі працаваць пераважна на рынак, а не на заказ [15]. Гэта карэнным чынам паспрыяла развіццю гандлёвых адносін. Гандаль атрымаў пашырэнне менавіта за кошт продажу і абмену рамеснай прадукцыі, хоць яго значэнне, пры агульнай натуральнасці гаспадаркі, характэрнай феадальнаму ладу, нельга перабольшваць.

Абменна-гандлёвыя аперацыі ажыццяўляліся як унутры краіны (галоўным чынам гэта быў гандаль складанымі рамеснымі вырабамі і прадметамі ўпрыгожання), так і ў экспартна-імпартным выглядзе. Найбольш распаўсюджанымі экспартнымі прадметамі, што вывозіліся з тэрыторыі Беларусі, былі: воск, мёд, лён, зброя, футра і інш. З Блізкага Захаду і Візантыі паступалі прадметы раскошы, тканіны, вострыя прыправы, грэцкія арэхі, шкляны посуд, соль і інш.

Сярод найбольш важных дасягненняў рамесніцкай справы ў азначаны перыяд можна назваць, па-першае, пачатак выкарыстання ганчарнага кола (у канцы IX–X ст.). Вельмі высокага ўзроўню дасягнула жалезаробчая справа, ювелірнае майстэрства, будаўніцтва жылых і асабліва храмавых пабудоў (аб чым сведчыць з'яўленне самабытных школ дойлідства), дрэваапрацоўка, касцярэзная справа, прадзенне, ткацтва, гарбарства (апрацоўка скур і пашыў абутку) і іншыя кірункі рамяства.

Так, у жалезаробчай справе IX–XIII стст. было вядома не менш чым 16 спецыяльнасцей, рамеснікі якіх выконвалі больш за 100 найменняў

прадукцыі. Сярод іх вылучалася стварэнне разнастайных прылад працы (косы, сярпы, сякеры, малаткі і інш.), стварэнне зброі (мячы, кальчугі, наканечнікі дзідаў і стрэл, шлемы і інш.), шмат якія віды якой нават вывозіліся за межы Беларусі. Аб тэхнічным узроўні металургічнай вытворчасці сведчыць прымяненне рамеснікамі такіх прыёмаў арганізацыі працы, як зварка, ліццё, наварка рэжучай часткі інструмента, загартоўка сталі і інш. [16, с.75].

Дасягненнямі ювелірнага майстэрства можна лічыць разнастайныя жаночыя ўпрыгожанні (падвескі, шыйныя грыўны і скроневыя кольцы, пярсцёнкі, бранзалеты і інш.). Найвышэйшым узорам майстэрства ювеліраў было выкананне вядомага крыжа Еўфрасінні Полацкай, зробленага полацкім майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. і інш.. Узнікненне Полацкай і Гродзенскай школ дойлідства, а таксама будаўніцтва мясцовымі майстрамі шматлікіх хрысціянскіх храмаў на тэрыторыі Беларусі – сведчанне таго, што рамеснікі-будаўнікі дасканала засвоілі візантыйскі стыль храмавага будаўніцтва. Яны змаглі ўнесці свае цікавыя дапаўненні, якія паказваюць узровень надзвычай высокага майстэрства.

Што тычыцца прылад працы, з дапамогай якіх выконваўся жывёлагадоўча-земляробчы цыкл гаспадарчай дзейнасці насельніцтва IX–XIII стст., то яны былі таксама важным паказчыкам адрозненняў на шляху сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у параўнанні з папярэднім перыядам. Калі асноўнымі прыладамі працы ў сярэдзіне I тыс. н. э., з-за панавання падсечна-агнявой формы земляробства, былі жалезная сякера, матыка, драўляная барана, то ў IX–XIII стст. галоўную ролю пры ворыўным земляробстве адыгрывала вялікае драўлянае рала з жалезным наральнікам (папярэднік плуга), жалезны серп з навараным стальным лязом і іншыя прылады.

Шырокае распаўсюджванне атрымала выкарыстанне цяглавай сілы (валоў і коней) пры апрацоўцы глебы, што па падліках спецыялістаў павышала прадукцыйнасць сельскагаспадарчай працы ў земляробстве не менш чым у 40–50 разоў. Сярод астэалагічных астанкаў археолагі знаходзяць значна менш костак валоў і коней, якіх у адзначаны перыяд выкарыстоўвалі пераважна як цяглавую сілу, а не ў якасці харчавання.

Эвалюцыя прылад працы ў земляробстве паступова вяла да таго, што апрацоўка ворыва ўжо не патрабавала шматлікіх па колькасці ўдзельнікаў радавых калектываў (як гэта было пры падсечна-агнявой форме для раскарчоўкі ад лесу кавалкаў зямлі). Асноўныя гаспадарчыя работы магла праводзіць адна сялянская сям'я, якая атрымала назву «дым» (або «рала») і заняла месца асноўнай адзінкі падаткаабкладання. Гэта, у сваю чаргу, яшчэ больш паскорыла канчатковае ўсталяванне суседскай абшчыны як важнейшай сацыяльна-тэрытарыяльнай і адміністрацыйнай адзінкі, што прыйшла на змену радавому ладу (і патрыярхальна-радавой абшчыне).

Падводзячы вынік даследвання пра пацвярджэнне археалагічнымі і пісьмовымі крыніцамі адрозненняў у сацыяльна-эканамічным развіцці насельніцтва Беларусі падчас разлажэння радавых адносін і ў раннефеадальным перыядах, можна адзначыць, што яны насілі карэнны характар, аб чым недвухсэнсоўна сведчаць рознапланавыя гістарычныя (перш за ўсё археалагічныя) крыніцы. Вылучаліся як у грамадска-палітычным аспекце, так у эканоміцы, сацыяльнай, культурнай і рэлігійна-ідэалагічнай сферах жыцця грамадства, што выразна пацвярджаецца гістарычнымі крыніцамі. Фактычна, гэта былі дзве стадыі эвалюцыі чалавецтва на тэрыторыі Беларусі, якія наглядна дэманструюць паступальнасць эвалюцыі форм жыцця насельніцтва краіны на працягу азначанага перыяду і (што асабліва важна) пацвярджаюцца мясцовымі, беларускімі матэрыяламі.

*Літаратура і крыніцы*

1. *Алексашына Г.В.* Станаўленне хрысціянскай цывілізацыі ў Еўропе і Беларусі // Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэб. дапам. / В.І. Галубовіч, З.В. Шыбека, Д.М. Чаркасаў і інш; пад рэд. В.І. Галубовіча і Ю.М. Бохана. – Мінск, 2005.
2. *Чаропка, В.К.* Усталяванне хрысціянства і падзенне крэваў / В.К. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 4.
3. *Киркор, А.К.* Белорусское и Литовское Полесье / А.К. Киркор // Живописная Россия. – Мінск, 1990.
4. Вайдэлоты // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 3.
5. *Морган, Л.Г.* Древнее общество. – Л., 1934.
6. *Штыхов, Г.В.* Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Памятники железного века и эпохи феодализма. – Минск, 1971.
7. Археалогія Беларусі. Т. 2. Жалезны век. – Мінск, 1999.
8. *Митрофанов, А.Г.* Железный век Средней Белоруссии VII–VI вв. до н. э. – VIII в. н. э. – Минск, 1978.
9. Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мінск, 1993.
10. *Седин, А.А.* Новые городища Восточной Беларуси // Магілёўшчына. Вып. 3. – Магілёў, 1992.
11. *Кухаренко, Ю.В.* Средневековые памятники Полесья. – М., 1961.
12. *Поболь, Л.Д.* Древнее рало из торфяника у дер.Каплановичи // Acta Baltico-Slavica. – Bialystok, 1967.
13. *Ігнаценка, А. П.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў IX – сярэдзіне XIII ст. // Гісторыя Беларусі / А.Л. Абэцэдарская, П.І. Брыгадзін, Л.А. Жылуновіч і інш; пад рэд. А.Г. Кахаsuccession ноўскага і інш. – Мінск, 1996.
14. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч.1. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш. – Мінск, 1994.
15. *Полянский Ф.Я.* Товарное производство в условиях феодализма. – М., 1969.
16. *Бушчык, Г.П.* Станаўленне раннефеадальнай эканомікі на тэрыторыі Беларусі ў IX–першай палове XIII ст. / Г.П. Бушчык // Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам./ В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч і інш.; пад рэд праф. В.І. Галубовіча. –3-е выд. – Мінск, 1999.

*Summary*

*The difference in social, economic, political and cultural progress of different parts of population of Belarus from the end of primitive period till the beginning of feudalism has been characterized on the base of archaeologic and historical documents. This differences were fundamental and were obvious in all spheres of people's life and were proved by Belarussian historical documents.*

*УДК 940.1 «14/15»*

***А.К. Шымак,***
*аспірант кафедры гісторыі Расіі БДУ*

# УСХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ДЫПЛАМАТЫЯ РЫМСКАЙ КУРЫІ (КАНЕЦ XV – ПАЧАТАК XVI ст.)

У канцы Сярэднявечча ўзнікла новая палітычная сітуацыя ў Еўропе. Паняцце «Еўропа» напоўнілася палітычным зместам. У такім сэнсе яно стала выкарыстоўвацца ў выпадках супрацьпастаўлення культурна-палітычных каштоўнасцей розных цывілізацый. Традыцыйны падзел еўрапейскага кантынента на хрысціянскі і язычніцкі арэалы, што вяло свой пачатак яшчэ з антычнасці (imperium – barbaricum), змяніўся на новае разуменне Еўропы – Заходняя і Усходняя. Апошні рэгіён уваабраў у сябе тэрыторыі Лівонскага ордэна, Вялікага княства Літоўскага, Вялікага княства Маскоўскага.

Пераломным момантам для развіцця краін Усходняй Еўропы сталі 80-я гг. XV ст. Вялікае княства Маскоўскае пазбавілася залежнасці ад Арды і атрымала магчымасць актывізаваць знешнюю палітыку ў заходнім накірунку. Вялікі князь маскоўскі Іван III узяў сабе тытул «государя всея Руси» і распачаў выкананне праграмы па збіранні «исконно русских земель», што непазбежна вяло да сутыкнення з Вялікім княствам Літоўскім.

Яшчэ адным асяродкам наспявання ваеннага канфлікту стала паўночная частка Усходняй Еўропы. Клапоцячыся аб знешнегандлёвых інтарэсах дзяржавы, Іван III, дзякуючы саюзным дамовам, змог нейтралізаваць Швецыю і Ганзу [4]. Адзіным вузлом супярэчнасцей у балтыйскім рэгіёне заставаліся адносіны Вялікага княства Маскоўскага і Лівонскага ордэна. Пскоўска-лівонскія непаразуменні ў 1481 г. сталі падставай для ваеннага паходу Івана III супраць Лівонскага ордэна [9, с. 214]. Нягледзячы на падпісанне ў Ноўгарадзе ў 1482 г. 10-гадовага перамір'я, канчатковага вырашэння ўзаемных прэтэнзій паміж вялікім князем маскоўскім і лівонскім магістрам не адбылося [1, с. 95, 130–132; 6, с.150, 193].

У дадзеных палітычных умовах надзвычай важным падаецца стаўленне Апостальскай Сталіцы, у кампетэнцыі якой знаходзіліся пытанні, звязаныя з вырашэннем міжнародных канфліктаў, падтрыманнем міру, арганізацыяй крыжовых паходаў, да падзей, што разгортваліся ва Усходняй Еўропе. Стрыжнем яе знешняй палітыкі (пасля падзення Канстанцінопаля) стала арганізацыя агульнаеўрапейскага антыасманскага паходу. Спробы святых айцоў, пачынаючы з папы Пія II (1458–1464), прывабіць туркаў на бок хрысціянства былі асуджаны на правал. З прапановай арганізаваць антыасманскую кааліцыю папа Павел II (1464–1471) звяртаўся да еўрапейскіх двароў. Але яны, занятыя рэалізацыяй уласных палітычных мэт і знаходзячыся ва ўзаемнай канфрантацыі, не былі схільнымі падтрымліваць шматлікія заклікі курыі. У полі зроку папскай дыпламатыі аказалася Усходняя Еўропа. Варта адзначыць, што ва ўмовах узрастаючай асманскай небяспекі, імкнучыся захаваць або нават сфарміраваць новае ўсведамленне пачуцця еўрапейскай еднасці, папства звярнулася да ранейшай тэзы: удзел у крыжовых паходах – крытэрый прыналежнасці да Еўропы [13, с.15].

У часы пантыфіката пап Паўла II і Сікста IV (1471–1484) Рым арыентаваўся, у першую чаргу, на венгерскага караля Мацвея Корвіна і аказваў яму ўсебаковую падтрымку ў канфліктах з суседзямі. Разлік рабіўся на Вялікае княства Маскоўскае, якое з 1478 г., з часу падпарадкавання Ноўгарада, стала прэтэндаваць на дамінаванне ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне [25, с. 32, 34;].

Для таго каб прывабіць папства на свой бок і атрымаць з гэтага выгаду ў выглядзе фінансавай дапамогі, змяншэння выплат на патрэбы антыасманскай кааліцыі, а таксама каб заўсёды мець падтрымку з боку курыі пры вырашэнні спрэчных пытанняў на ўзроўні міждзяржаўных адносін, Лівонскі ордэн, ВКЛ і Карона Польская пачалі развіваць тэзіс аб сваёй выключнай ролі ў барацьбе з «няверным», выступалі з заявамі аб сваім імкненні схіліць «маскавіцян» да каталіцтва. Нават дацкі кароль Ян, з якім у 1493 г. Іван III заключыў саюзную дамову, тлумачыў сваё збліжэнне з Масквой нібыта жаданнем прывесці вялікага князя маскоўскага да Рыма [10, с. 153].

Безумоўна, у баку ад гэтага трохкутніка: Масква – Рыга – Вільня, не магла заставацца і Карона Польская, якая, з аднаго боку, была звязаная персанальнай уніяй з ВКЛ, а з другога – занепакоеная кантактамі Вялікага княства Маскоўскага і Рымскай курыі [15, № 113, с. 63–64].

30 лістапада 1484 г. папа Інакенцій VIII (1484–1492) накіраваў да 29 хрысціянскіх дзяржаў лісты, у якіх падкрэсліваў, што над хрысціянскім светам з боку Асманскай імперыі навісла вялікая небяспека, і заклікаў даць ёй знішчальны адпор. Пантыфік прапанаваў выслаць у Рым прадстаўнікоў ад кожнай дзяржавы, каб сумесна вырашыць справу арганізацыі крыжовага паходу. Такі ліст атрымаў і Казімір Ягелончык [15, № 14, с. 64–65]. 5 ліпеня 1486 г. была абвешчана була супраць туркаў і татар [27, № 262–264, с. 234–240]. Казімір Ягелончык павінен быў узначаліць барацьбу. Сын Казіміра Ягелончыка Фрыдэрык быў прызначаны кракаўскім кардыналам.

Іван III не мог не браць пад увагу магчымасць афармлення антымаскоўскага блока ў складзе ВКЛ, Кароны Польскай і Лівоніі і, у сваю чаргу, актывізаваў дыпламатычныя кантакты з папствам. У 1482 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Казімір Ягелончык дамагаўся ад папы Сікста IV даць тлумачэнне чуткам, якія распаўсюджваліся па Еўропе, што Іван III накіраваў паслоў да папы, каб атрымаць каралеўскую карону. Папа нічога не адказаў наконт прысутнасці маскоўскіх паслоў у Рыме, але паабяцаў, што калі такая справа будзе ўздымацца, то, у першую чаргу, ён выслухае паслоў польскага караля, але калі яны своечасова прыбудуць да папскага двара [15, № 13, с. 63–64]. Зразумела, што такая ўмова вызваляла Папу ад усякіх абавязацельстваў, бо, каб дасягнуць «Вечнага Горада», патрэбны даволі працяглы час. Ёсць падставы меркаваць, што курыя звярталася і да вялікага князя маскоўскага з запрашэннем на антытурэцкі кангрэс. У 1485 г. маскоўскае пасольства ўсё ж такі накіравалася ў Рым [4, с. 233]. У актавых матэрыялах і летапісах мэта пасольства не пазначаецца. Гісторык XIX ст. М.М. Бантыш-Каменскі паведамляе, што ў 1486 г. «папа Климент писал о союзе против турок», але з 29 жніўня 1484 г. па 25 ліпеня 1492 г. Апостальскі Прастол займаў папа Інакенцій VIII, і пісаць у Маскву меў магчымасць толькі ён [4, с. 268]. У гэты ж час у Італію з Масквы быў накіраваны Мануіла Ралеў. Час яго знаходжання ў Рыме супадае з перыядам дзейнасці антытурэцкага кангрэсу.

Справа ўзаемаадносін Івана III і Рымскай курыі ўскладнілася тым, што Святы Прастол літаральна стаў закідвацца хадайніцтвамі з боку Лівоніі аб абвяшчэнні крыжовага паходу супраць «маскавіцян». Пачынаючы з 80-х гг. XV ст. для Лівонскага ордэна стала відавочным, што ўзмацненне Вялікага княства Маскоўскага пагражае ваеннымі сутыкненнямі. Магістр Бернгард фон дэр Борх спадзяваўся кансалідаваць архіепіскапства, Рыгу і ганзейскія гарады пад кіраўніцтвам Ордэна і пры падтрымцы Рыма схіліць Вялікае княства Маскоўскае да адзінства з Рымскай Царквой і, такім чынам, пазбавіцца ад небяспекі з усходу [3, с.154]. Але ўнутранае бязладдзе, пастаянныя спрэчкі магістра і архіепіскапа Рыгі не дазволілі аб'яднаць усе сілы Лівоніі. Больш паспяховай у гэтым накірунку была дзейнасць Вальтэра фон Плятэнберга – аднаго з самых выдатных кіраўнікоў Лівонскага ордэна [20]. Жадаючы пабудаваць трывалую абарону, ён распачаў справу па стварэнні шырокай антымаскоўскай кааліцыі, не апошнім удзельнікам якой павінен быў стаць і Папа Рымскі [24, № 405, 411]. З гэтай мэтай вялася пастаянная прапаганда ў адным накірунку: «Масковія» з'яўляецца пагрозай не толькі для Лівоніі, але і для ўсяго каталіцкага Захаду.

Падтрымку Плятэнбергу ў яго пошуках саюзнікаў аказваў вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Ганс Тыфэн. Восенню 1494 г. ён пераслаў у Рым ліст Плятэнберга з просьбай аб дапамозе, а 17 студзеня 1495 г. пісаў пракуратару Ордэна ў Рыме аб сваім намеры падтрымаць Лівонію ўзброенымі сіламі, а таксама выказваў спадзяванні на матэрыяльную дапамогу ад гарадоў Прусіі [24, № 289]. Нягледзячы на шматлікія заклікі з боку Лівоніі і Тэўтонскага ордэна, Папа Рымскі не рабіў ніякіх захадаў, каб змяніць расклад сіл ва Усходняй Еўропе. Толькі пасля таго, як распачалася вайна паміж Вялікім княствам Маскоўскім і Швецыяй і войскі Івана III пачалі атрымоўваць перавагу, летам 1496 г. у Рыме была абвешчана була, якая дазволіла прапаведаваць крыжовы паход супраць «рускіх» у Швецыі і Лівоніі [24, № 56, с. 369]. Але, як лічыць нямецкі даследчык В. Ленц, гэты крок Рымскай курыі не прынёс адчувальнай дапамогі ні аднаму з зацікаўленых у ім бакоў [21, с. 71]. Дзеянні Папы Рымскага абмежаваліся падрыхтоўкай брэвэ да Івана III, дзе ён пераконваў вялікага князя маскоўскага не нападаць на Лівонію. У сувязі з канфліктам Лівонскага ордэна і Масквы папа Аляксандр VI (1492–1503) звяртаўся таксама да дацкага караля, вялікага князя літоўскага, да ганзейскіх гарадоў, просячы дапамагчы Лівоніі і не ўступаць у саюзныя дамовы з Іванам III [24, № 747, 752].

Але Ордэн чакаў іншых дзеянняў. Па-першае, абвяшчэння крыжовага паходу ў шэрагу еўрапейскіх краін, а не толькі ў Швецыі і Лівоніі. Па-другое, дазволу на продаж індульгенцый, каб атрыманыя грошы можна было б выкарыстаць у вайне з Вялікім княствам Маскоўскім. Плятэнберг шукаў падтрымкі Рымскай курыі не толькі з-за аўтарытэту Апостальскага Прастола, яго матэрыяльных магчымасцей, але і з-за таго, што без дазволу курыі Ордэн не мог адмовіцца ад удзелу ў агульнахрысціянскай справе – антыасманскім паходзе, каб захаваць сродкі на барацьбу з Вялікім княствам Маскоўскім [24, № 1077].

Пасля смерці Мацея Корвіна 6 красавіка 1490 г., на якога Рымская курыя разлічвала як на кіраўніка антыасманскай лігі, на першы план выйшлі Ягелоны [14]. Польскі кароль Ян Альб-

рэхт вёў падрыхтоўку да вайны з Асманскай імперыяй. Сучасны польскі даследчык Я. Смалюха лічыць, што перамовы паміж Каронай і Портай аб саюзнай дамове вяліся выключна дзеля забеспячэння мірных адносін з залежнымі ад Асманскай імперыі татарамі [26, с. 78–79]. У снежні 1499 г. на з'ездзе Ягелонаў Ян Альбрэхт падтрымаў пастанову праводзіць перамовы з Рымскай курыяй, Венецыяй і Францыяй у справе ўваходжання Кароны Польскай у антытурэцкую лігу. У канцы XV ст. польскія кіруючыя колы імкнуліся ўмацаваць пазіцыі сваёй дзяржавы ва ўспрыманні курыі, адзначаючы ролю Кароны як абаронцы заходняга хрысціянства. Яны спасылаліся на місіянерскія заслугі Ягайлы, смерць яго сына ў бітве з туркамі пад Варнай, барацьбу з татарамі [22, f.100 r. – 107 r.].

5 кастрычніка 1500 г. папа Аляксандр VI накіраваў свайго легата Пятра Ісвальеза да Ягелонаў, каб схіліць да заключэння перамір'я з суседзямі і распачаць сумесную барацьбу з асманамі [28, с. 57; 14, с. 35–36]. Перашкодай на гэтым шляху сталі варожыя адносіны Вялікага княства Маскоўскага і ВКЛ. Дагавор, падпісаны ў 1494 г. паміж Іванам III і Аляксандрам Ягелончыкам і падмацаваны шлюбным саюзам Аляксандра і Алены Іванаўны, аказаўся нетрывалым. Абодва бакі мелі намер узнавіць ваенныя дзеянні, якія і распачаліся ў 1500 г. 3 сакавіка 1501 г. Лівонскі ордэн падпісаў саюзны дагавор з Аляксандрам Казіміравічам, на якім настойваў таксама і папа Аляксандр VI, і таксама ўступіў у вайну [23, № 126; 19, с. 84]. У студзені 1501 г. і вясной 1502 г. вялікі магістр зноў скіраваў свае просьбы да папы распачаць арганізацыю крыжовага паходу супраць «маскавіцян» [24, № 214–216, 290–292].

Нягледзячы на своеасаблівы падзел прыярытэтаў знешнепалітычнай дзейнасці паміж ВКЛ і Каронай Польскай, Аляксандр Ягелончык, яшчэ як вялікі князь літоўскі, у студзені 1501 г. накіраваў у Рым свайго сакратара Эразма Цёлэка. Адпраўка пасольства тлумачылася прынясеннем урачыстага акта паслушэнства. Дзіўна, што адбылося гэта толькі праз 9 гадоў пасля таго, як Аляксандр стаў вялікім князем літоўскім і ў час вайны з Іванам III. 31 сакавіка 1501 г. Эразм Цёлэк паведаміў пра небяспеку, якая навісла над княствам з боку «няверных» і заклікаў да барацьбы [16, с. 121]. Адной з першых дыпламатычных акцый Аляксандра пасля атрымання польскай кароны стала паведамленне Апостальскай Сталіцы аб яго выбранні. Пры гэтым падкрэслівалася, што вядзенне вайны з Асманскай імперыяй немагчыма з-за небяспекі з боку татараў і Масквы [12, № 48, с. 52–53]. ВКЛ і Карона Польская прытрымліваліся ранейшай тактыкі – імкнуліся атрымаць падтрымку ад Рымскай курыі. У 1500 г. у пісьме польскага караля Яна Альбрэхта да папы Аляксандра VI з'явілася вызначэнне Польшчы як «бастыёну (antemuralia) заходняга свету ў барацьбе з «няверНымі» [12, № 118, 135, 169, 270].

Справа з веравызнаннем жонкі Аляксандра Ягелончыка Алены стала яшчэ адным вузлом непаразуменняў паміж усходнееўрапейскімі дзяржавамі, дзе закулісную ролю іграла Рымская курыя. А пасля таго як вялікі князь літоўскі Аляксандр заняў польскі трон, гэта пытанне набыло вострае палітычнае гучанне. Актыўным удзельнікам перамоваў з Рымскай курыяй выступіў родны брат Аляксандра – польскі прымас, гнезненскі арцыбіскуп і кардынал кракаўскі – Фрыдэрык. Яго задачай было пераканаць Аляксандра прыкласці ўсе сілы, каб схіліць Алену да пераходу ў каталіцтва [19, с. 85]. Папа Аляксандр VI неаднаразова звяртаўся да віленскага біскупа Войцеха, вызваляючы Аляксандра ад дадзеных Івану III абяцанняў, не прымушаць Алену да пераходу ў каталіцтва. Адначасова біскуп павінен быў весці размовы з Аленай, а калі яна не скарыцца, то адлучыць яе ад мужа, выгнаць з хаты і маёмасць канфіскаваць (алеануляваць шлюб папа не дазваляў). Папа пісаў, што Аляксандр можа пакінуць сваю жонку, заражаную «Ruthenorum maculis» (рускім брудам) нібыта праказай [19, с. 85]. Папа дазволіў аб'явіць Алене, што ў выпадку яе ўпартасці да яе будуць ставіцца згодна з нормамі царкоўнага права і яна будзе пакарана [27, с. 303, 310–312].

Сітуацыя з веравызнаннем Алены паказвала, што нягледзячы на прыхільны настрой лістоў ад папы, Апостальскі Прастол у першую чаргу падтрымліваў інтарэсы каталіцкіх дзяржаў. Як адзначыў гісторык Я. Каро, паміж курыяй і польскім дваром існавала ціхае ўзаемаразуменне, нягледзячы на пагрозы пракляцця і інтэрдыкту [17, с. 397].

Папа Аляксандр VI настойваў на жорсткіх мерах для пераводу Алены ў каталіцтва. Пазіцыя курыі змянілася, калі пачаўся пантыфікат папы Юлія II (1503–1513). Беручы пад увагу магутнасць маскоўскага князя і верагоднасць таго, што ён, помсцячы за дачку, можа распачаць вайну супраць ВКЛ, папа дазволіў Аляксандру не адлучаць ад сябе Алену, але пры ўмове, што пасля смерці Івана III, зноў неабходна настойваць на яе пераходзе ў каталіцтва [11, с. 98].

У адказ на шматлікія заклікі папа Аляксандр VI накіраваў у Маскву спецыяльную грамату, дзе заклікаў Івана III, па прыкладзе польскага караля, змагацца з Асманскай імперыяй [1, № 192].

У хуткім часе ў Маскву прыбыў пасол ад венгерскага караля Сігізмунд Сантай [2, с. 446]. Ён прадставіў таксама граматы ад папы і арцыбіскупа епархіі Рэдж'ё (у рускіх летапісах – кардынал Рэгнус). У сваім лісце папа абвясціў аб жаданні весці барацьбу за вызваленне ўсяго «Канстантынопальскага царства» і дзеля гэтага прапанаваў Івану III далучыцца да Венгерскага, Польска-

га, Чэшскага каралеўстваў, да Вялікага княства Літоўскага, Прускіх княстваў, Лівонскага ордэна (фактычна, да тых дзяржаў, з якімі ў Масквы былі складаныя адносіны). У грамаце кардынала Рэгнуса адзначалася, што вайна паміж Іванам III і Аляксандрам Казіміравічам перашкаджае ўтварэнню такога саюза. Пасяховыя ваенныя дзеянні дазволілі вялікаму князю маскоўскаму адказаць, што каралі Уладыслаў і Аляксандр змагаюцца не за свае землі, а за тэрыторыю, якой спрадвеку валодалі продкі Івана III [7, с. 341–361]. Даследчык расійска-ватыканскіх адносін Я.Ф. Шмурло трапна заўважыў: «Надо думать, не без горделивого чувства удовлетворения и собственного достоинства выслушивал московский князь все эти речи: в нем заискивали, с его силой считались! Настаивают на примирении с Александром!» [11, с. 95]. Іван III меў «добрае апраўданне», каб адмовіць у перамір'і – яго дачку прымушаюць здрадзіць сваёй веры [7, с. 407]. Івану III было прапанавана паслаць свайго прадстаўніка да папы альбо даручыць весці гэту справу таму, хто паедзе ў Рым ад імя вялікага князя літоўскага. Зразумела, што вялікі князь маскоўскі ад гэтага адмовіўся [7, с. 408]. Для Івана III было абражлівым вырашаць свае справы ў курыі.

Пасля доўгіх перамоў вялікі князь маскоўскі згадзіўся на шасцігадовае перамір'е на такіх умовах, што мог не адчуваць сябе моцна пакрыўджаным. Землі, якія атрымала Вялікае княства Маскоўскае, на нейкі час «суцешылі бацьку, заклапочанага лёсам сваёй дачкі». 2 красавіка 1503 г. адбылося крыжацалаванне на перамірных граматах паміж Вялікім княствам Маскоўскім і Вялікім княствам Літоўскім. У ліпені 1503 г. у Ноўгарадзе была зацверджана дамова з Лівонскім ордэнам [5, № 347].

Падзеі, якія разгортваліся ва Усходняй Еўропе з 1478 г. па 1503 г., паказалі, што ва ўзаемаадносінах Вялікага княства Маскоўскага, Вялікага княства Літоўскага, Лівонскага ордэна значную, але вельмі часта нябачную ролю адыгрывала Рымская курыя, якая (для арганізацыі антыасманскага саюза) была зацікаўлена ў падтрыманні міру ва Усходняй Еўропе. Прытрымліваючыся гэтай жа мэты, Апостальскі Прастол клапаціўся аб спыненні ваенных дзеянняў паміж Вялікім княствам Маскоўскім і Вялікім княствам Літоўскім.

З 1478 г. па 1503 г. вялікі князь маскоўскі Іван III пасяхова праводзіў знешнюю палітыку ў заходнім накірунку. Дыпламатычныя адносіны з Рымскай курыяй не дазволілі аформіцца антымаскоўскай кааліцыі і прадухілілі крыжовы паход пад кіраўніцтвам папы. Падпарадкаванне Ноўгарада і прызнанне з боку вялікага князя літоўскага тытула «государь всея Руси» заклалі падмурак для дамінавання ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

*Літаратура*


1. Акты исторические, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею: в 5 т. – СПб.: Тип. Московского ун-та, 1846. – Т. I. – 627 с.
2. *Базилевич, К.В.* Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в. / К.В. Базилевич. – М.: Изд. «Территория», 2001. – 542 с.
3. *Балязин, В.Н.* Россия и Тевтонский Орден в 1466–1525 гг.: дис. … канд. ист. наук / В.Н. Балязин. – М., 1963. – 340 с.
4. *Бантыш-Каменский, Н.Н.* Обзор внешних сношений России (по 1800 г.) / Н.Н. Бантыш-Каменский: в 3 ч. Ч. 2. – М.: Тип. Э. Лисснера и Ю. Романа, 1896. – 233 с.
5. Грамоты Великого Новгорода и Пскова / под ред. С.Н. Валка. – М.; Л.: Изд.-во Акад. наук СССР и Лгр, 1949. – 408 с.
6. *Казакова, Н.А.* Русско-ливонские и русско-ганзейские отношения. Конец XIV– начало XVI в. / Н.А. Казакова. – Л.: «Наука», 1975. – 358 с.
7. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским // Сборник Русского исторического общества. – 1882. – Т. 35. – 252 с.
8. *Пирлинг, П.* Россия и папский престол / П. Пирлинг. – М.: Современные проблемы, 1912. – 452 с.
9. Продолжение летописи по Воскресенскому списку // Полное собрание русских летописей; отв. ред. А.Ф. Бычков. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1859. – Т. VIII. – 301 с.
10. *Форстен, Г.* Борьба из-за господства на Балтийском море в XV – XVI ст. / Г. Фортсен. – СПб.: Изд. В. Ф. Демакова, 1884. – 619 с.
11. *Шмурло, Е.Ф.* Рим и Москва. Начало сношений Московского государства с Папским престолом. (1462–1528) / Е.Ф. Шмурло // Записки Русского исторического Общества в Праге. – Прага Чешская-Нарва, 1937. – Кн. 3. – С. 91–136.
12. Akta Aleksandra, krola polskiego, wielkiego ksiecia Litewskiego (1501–1506) / Wyd. Frederyk Papee // Monumenta medii aevi historica res gestas Poloniae illustrantia. – Krakow: Wyd. komisyi historycznej Polskiej Akademii Umiejetnosci, 1927. – T. XIX. – 623 c.
13. *Baczkowski, K.* Ideja jednosci europejskiej w sredniowieczu / K. Baczkowski // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellonskiego. Prace Historyczne. – Z. 118. – 1995. – S. 11 – 23.
14. *Baczkowski, K.* Proby wlaczenia panstw jagiellonskich do koalicji antytureckiej przez papieza Aleksandra VI na przelomie XV i XVI wieku / K. Baczkowski // Nasza Przeszlosc. – 1994. – T. 81.
15. Brevia romanorum pontificum ad Poloniam spectantia ex minutis et registries Pontificis / ed. H.D. Wojtyska CP // Elementa ad fontium editions. – T. 64. – Romae: Institutum Historicum Polonicum Romae, 1986. – 127 p.
16. *Burchard, J.* Diarium / J. Burchard. – Paris: Librare de la Societe Asiatique, 1885. – T. III: 1500 – 1506. – 578 p.
17. *Caro, J.* Geschichte Polens / J. Caro. – Gotha: Hrsg von A.N.Z.Heeren und F.A.Urkert, 1888. – T. 5. – 443 s.
18. Historia dyplomacij Polskiej: W 5 T. / Pod. red. M. Biskupa. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1. – 874 s.
19. Kopiarz Rzymski Erazma Ciolka / oprazowali Stanislaw Kutrzeba I X. Jan Fijalek // Archiwum Komisji Historycznej. – Serja 2. – T. I. – Krakow: Akad. Umiejetnosci, 1923. – S. 66 – 113.
20. Latvia State Historical Archive (Государственный исторический архив Латвии)
Фонд 4038. – Оп. 2. – Д. 6. C. Fr.v. Schoulz, Versuch uber die Geschichte von Livlands. Bruchstuck bis 1577.
21. *Lenz, W.* Die auswartige Politik des livlandischen Ordensmeisters Walter von Plettenberg bis 1510 / W. Lenz. – Riga: «Ernst PlatesDruckerei und verlags-Aktien-Gls», 1928. – 94 s.
22. Libri Legationum 3 // Archiwum Glowne Akt Dawnych. – Ksiegi Poselstw (Libri Legationum) Metryki Koronnej, 1501 – 1761.
23. Lietuvos Metrika-Литовская Метрика. – Kn. 5 (1427–1506): Uzrasymu knyga 5 / Parenge EgidiJus Banionis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju l-kla, 1994. – 402 p.
24. Liv-, Est- und Curlandisches Urkundenbuch / Btgrundet von F.G. v. Bunge, im Auftrage der baltischen Rittenschaften und

Stadte fortgesetzt von Hermann Hildebrand, Phillipp Schwartz und Leonid Arbusow. – Zweite Abteilung, Band 1: 1494, Tnde Mai – 1500 / herausgegeben von Arbusow. – Moskau, 1900. – 888 s.
25. *Podraza, A.* Eupopa Srodkowa jako region historyczny / A. Podraza // Eupopa Srodkowowschodnia od X do XVII wieku – ednosc czy roznorodnosc? / pod red. K. Baczkowskiego, J. Smoluchy. – Krakow: Societas Vistulana, 2005. – S. 24 – 39.
26. *Smolucha, J.* Papiestwo a Polska w latach 1484 – 1526. Kontakty dyplomatyczne na tle zagrozenia tureckiego / J. Smolucha. – Krakow: Societas Vistulana, 1999. – 247 s.
27. Vetera monumenta Poloniae et Lithuaniae gentiumgue finitimarum historiam illustrantia maximam partem nondum edita ex tabulariis vaticanis deprompta, collecta ac serie chronologica deposita ab Augustino Theiner. – T. 1–4. – Romae: Typis vaticanis, 1861. – T. 2. – 782 c.
28. *Wierzbowski, T.* Synopsis legatorum a latere, legatorum natorum, nuntiorum ... in Polonia terrisque adiacentibus 1073–1794 / T. Wierzbowski. – Roma: Typis Elzevirianis, 1880. – 66 p.

*Summary*

*The subject of the research are international relations in Eastern Europe at the end of the XV^th^ and the XVI^th^ century. Analyzing the foreign-policy priorities of East European states the diplomatic struggle unleashed for the protection of Roman Curia.*

*УДК 973.04:2*

***П.Г. Космач,***
*аспірант кафедры новага і навейшага часу БДУ*

# РЭЛІГІЯ І ПРЫНЯЦЦЕ ПЕРШАЙ ПАПРАЎКІ ДА КАНСТЫТУЦЫІ ЗША (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЕРШАГА ФЕДЭРАЛЬНАГА КАНГРЭСА)

Вывучэнне гісторыі асноўнага закона ЗША ўяўляецца актуальным па шэрагу прычын. Па-першае, Канстытуцыя гэтай краіны, ратыфікаваная ў 1788 г., дзейнічае і ў наш час, вызначаючы дзяржаўна-прававы бок функцыяніравання «адзінай звышдзяржавы». Дэбаты наконт яе інтэрпрэтацыі пранізваюць усё грамадска-палітычнае жыццё ЗША, дзе рэлігійны фактар працягвае адыгрываць прыкметную ролю [4, с. 135]. Па-другое, даследаванне генезісу асноўнага закона дадзенай краіны дазваляе глыбей зразумець з гістарычнага пункту гледжання шэраг важнейшых палажэнняў і праблем сучаснага канстытуцыйнага права, у тым ліку прынцып аддзялення царквы ад дзяржавы.

Біль аб правах, а гэта першыя дзесяць паправак да Канстытуцыі, зацверджаныя ў 1791 г., гарантуе асноўныя правы і свабоды грамадзян. У першай папраўцы гаворыцца: «Кангрэс не павінен выдаваць законы, якія ўстанаўліваюць якую-небудзь рэлігію ці забараняюць яе свабоднае веравызнанне, або абмяжоўваюць свабоду слова ці друку, ці права народа мірна збірацца і звяртацца да ўрада з петыцыямі аб задавальненні скаргаў» [2, с. 312]. Яна развівае і дапаўняе трэці пункт шостага артыкула Канстытуцыі ЗША, згодна з якім «ніколі не будзе патрабавацца прыналежнасць да якой-небудзь рэлігіі ў якасці ўмовы для заняцця якой-небудзь пасады ці выканання якога-небудзь грамадскага абавязку ў Злучаных Штатах» [2, с. 311]. Адначасова нядзеля была выключана з ліку рабочых дзён, зацверджана хрысціянскае летазлічэнне [21, p. 161]. Ускосна сам акт прысягі лічыўся рэлігійным актам, бо пасля вымаўлення асноўнага тэксту клятвы, паклаўшы руку на Біблію, як правіла, дабаўляліся словы «Да паможа мне Бог» [10, p. 291]. Дапускалася таксама па сваіх рэлігійных поглядах абмяжоўвацца спецыяльнай урачыстай заявай.

База крыніц для даследаванняў па дадзенай тэме дастаткова стабільная. Асноўная яе частка апублікавана [6; 20]. Праблемным полем застаецца інтэрпрэтацыя гэтага матэрыялу. У межах першага падыходу, адлюстраванага ў працах Л. Леві і Л. Пфефера [16; 18–19], прынцып раздзялення Царквы і дзяржавы ўяўляецца ў якасці абсалютнай «сцяны», умацаванне і пашырэнне якой завешчана айцамі-заснавальнікамі ЗША. У межах другога падыходу, якога прытрымліваюцца такія вучоныя, як Д. Дрэйсбах і Д. Хатсан [8–12; 15], разуменне дадзенага прынцыпу звязваецца з больш шырокім гістарычным кантэкстам, які дэманструе абмежаванасць раздзялення царквы і дзяржавы (толькі на федэральным узроўні) і яго адноснасць (на прыкладзе дзейнасці Т. Джэферсана і Д. Мэдзісана) у эпоху стварэння ЗША. Рускамоўныя даследчыкі, як правіла, схільны прымаць першы падыход.

Мэтай артыкула выступае даследаванне заканадаўчай дзейнасці першага федэральнага Кангрэса па падрыхтоўцы першай папраўкі да Канстытуцыі ЗША ў частцы, якая датычыцца ўстанаўлення свабоды сумлення. У метадалагічным плане дадзены артыкул грунтуецца на такіх прынцыпах навуковага даследавання, як гістарызм, аб’ектыўнасць і сістэмнасць, таксама выкарыстоўваліся гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны метады.

Тое, што ў аснове прынцыпу рэлігійнай цярпімасці і аддзялення царквы ад дзяржавы могуць ляжаць розныя філасофска-светапоглядныя ўстаноўкі, што і ён сам можа інтэрпрэтавацца па-рознаму, добра ўсведамлялі стваральнікі Канстытуцыі ЗША і Біля аб правах. І таму даволі спрошчаным уяўляецца наступны выклад ходу прыняцця Біля аб правах [3, с. 63].

Падчас работы мясцовых канстытуцыйных канвентаў неаднаразова ўзнімалася пытанне аб дапаўненні Канстытуцыі раздзелам, дзе б замацоўваліся асноўныя правы і свабоды грамадзян. Нью-Йорк, Вірджынія, Нью-Гэмпшыр, Паўночная Караліна, Пенсільванія прапанавалі дапоўніць асноўны закон дапаўненнямі, якія гарантуюць свабоду сумлення [20, p. 1167]. У тэксце папраўкі ад штата Нью-Гэмпшыр гаварылася: «Кангрэс не павінен ствараць законы, якія датычацца рэлігіі ці замахваюцца на свабоду сумлення» [Цыт. па: 5, p. 16]. Таму, калі першы федэральны Кангрэс сабраўся ў Нью-Йорку ў сакавіку-красавіку 1789 г., перад ім стаялі дзве асноўныя задачы: арганізацыя новага ўрада і выпрацоўка Біля аб правах.

У пачатку мая было вырашана пачаць разгляд паправак да Канстытуцыі 25 мая 1789 г., які ў хуткім часе быў перанесены на 8 чэрвеня. У той дзень Д. Мэдзісан унёс на разгляд Палаты Прадстаўнікоў шэраг паправак, які ўключаў прапановы, што датычыліся рэлігійнай сферы. У іх адлюстроўваліся тры галоўныя моманты. Па-першае, рэлігійная і палітычная сферы радыкальна раздзяляліся. Па-другое, асобы, чые рэлігійныя перакананні не дазвалялі насіць зброю, вызваляліся ад службы ў арміі. Па-трэцяе, прапаноўвалася распаўсюдзіць прынцып раздзялення царкоўнай і дзяржаўнай сфер на ўзровень штатаў [6, p. 12–13]. Разам з гэтым пачалі разглядацца папраўкі, прапанаваныя ратыфікацыйнымі канвентамі штатаў. 21 ліпеня тэкст паправак быў перададзены ў так званы «камітэт адзінаццаці», які складалі прадстаўнікі ад кожнага штата (Паўночная Караліна і Род-Айленд яшчэ не ратыфікавалі Канстытуцыю) [6, p. 6]. Праз тыдзень камітэт падрыхтаваў першапачатковы варыянт тэксту паправак.

3 жніўня Кангрэс вызначае дату разгляду Біля аб правах – 12 жніўня. Работа над ім у фармаце камітэта ўсёй Палаты Прадстаўнікоў была распачата на наступны дзень пасля вызначанай даты. 15 жніўня была разгледжана папраўка, якая раздзяляла рэлігійную і палітычную сферы. Адпаведныя дэбаты дакладна адлюстроўваюць сэнс, які ўкладвалі айцы-заснавальнікі ЗША ў тэматычны аспект першай папраўкі да Канстытуцыі [6, p. 157–159].

У тэксце Мэдзісана гаварылася: «Ніякая рэлігія не можа быць устаноўлена законам, як і не могуць быць парушаны роўныя правы на свабоду сумлення» [6, p. 157]. У П. Сільвестэра ўзніклі адразу ж характэрныя сумненні: «…прадчуваючы, што яна можа быць выкарыстана ў сэнсе, адрозным ад таго, які меўся на ўвазе камітэтам, ён баяўся, што яе можна зразумець у якасці тэндэнцыі адмяніць таксама і рэлігію» [6, p. 157]. Э. Джэры прапанаваў змяніць фармулёроўку на наступную: «…ніякая рэлігійная дактрына не можа быць устаноўлена законам» [6, p. 157]. А Р. Шэрман наогул прапанаваў зняць гэту папраўку, паколькі Кангрэс не меў дэлегіраваных паўнамоцтваў на прыняцце якіх-небудзь рэлігійных устанаўленняў. У адказ Д. Мэдзісан удакладніў сэнс папраўкі: «…Кангрэс не мае права ўстанаўліваць рэлігію, прадпісвае законны спосаб прытрымлівацца яе, як і не павінен прымушаць людзей пакланяцца Богу любым спосабам, які супярэчыць іх сумленню». Ён таксама адзначыў, што такое патрабаванне абапіраецца на прапановы ратыфікацыйных канвентаў штатаў, пажадаўшых прававога замацавання немагчымасці ўстанаўлення «нацыянальнай рэлігіі» ці прыняцця якіх-небудзь іншых актаў, парушаючых свабоду сумлення. Але і гэта тлумачэнне не задаволіла камітэт Палаты прадстаўнікоў. Б. Ханцінгтон даволі выразна ўбачыў магчымасць антырэлігійнай інтэрпрэтацыі папраўкі («гэтыя словы можна зразумець у сэнсе, надта варожым рэлігіі»), адзначыўшы, што Д. Мэдзісан так іх не ўспрымае. Больш таго, ён дальнабачна гаварыў, што з пункту гледжання дадзенай папраўкі заканадаўства штатаў, асабліва Новай Англіі, утрымлівае нормы, якія пры разглядзе справы ў федэральным судзе могуць быць успрыняты ў якасці забароненага ўстанаўлення рэлігіі. Сваё выступленне Б. Ханцінгтон завяршыў з надзеяй, што «папраўка будзе сфармулявана такім чынам, каб, абараніўшы свабоду сумлення і права на свабоднае выкананне рэлігійных культаў, не падтрымлівала тых, хто не спавядае рэлігіі наогул» [6, p. 158]. У адказ Д. Мэдзісан вырашыў удакладніць сэнс папраўкі наступным чынам: *«калі слова «нацыянальная» будзе ўстаўлена перад словам «рэлігія», то гэта задаволіць розум высакародных джэнтльмэнаў. Ён верыць, што людзі апасаліся атрымання пераважы адной сектай ці аб'яднаннем дзвюх разам, якія ўстановяць рэлігію, прымусіўшы астатніх пагадзіцца з ёй; ён лічыць, што калі слова «нацыянальная» будзе ўстаўлена, яно вызначыць дакладна мэту, якую папраўка была заклікана прадухіліць»* (курсіў. – *П.К.*) [6, p. 158].

Але і гэта не прывяло да кампрамісу. Двухсэнсоўнасць слова «нацыянальны» не задаволіла некаторых прадстаўнікоў штатаў – яшчэ не знікла атмасфера спрэчак федэралістаў і антыфедэралістаў, бо апошнія не жадалі ўзмацнення ўлады федэральнага цэнтра. М. Мэдзісан зняў сваю прапанову, адзначыўшы, што «словы «ніякая нацыянальная рэлігія не можа быць устаноўлена законам» не маюць на ўвазе, што ўрад з'яўляецца нацыянальным». У выніку была прынята папраўка ў фармуліроўцы прадстаўніка Нью-Гэмпшыра С. Лівермора: «Кангрэс не павінен ствараць законы, закранаючыя рэлігію і парушаючыя свабоду сумлення» [6, p. 159].

17 жніўня былі разгледжаны другая і трэцяя прапановы Д. Мэдзісана. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне, папраўка аб вызваленні

ад службы ў арміі па рэлігійных перакананнях была прынята. Трэцяя папраўка, якая датычылася забароны на ўмяшанні ў рэлігійную сферу асобных штатаў, была таксама зацверджана [6, p. 181–184]. З 19 жніўня Палата Прадстаўнікоў на агульным пасяджэнні пачала разглядаць праект Біля аб правах. У складзе семнаццаці папраўвак (пад нумарамі 3, 5, 11) яны 24 жніўня былі накіраваны ў Сенат [20, p. 1122–1123].

Верхняя палата Кангрэса разглядала папраўкі да 10 верасня. Нарады праходзілі за закрытымі дзвярамі, таму падрабязны змест дэбатаў невядомы. Агульная колькасць паправак была скарочана да дванаццаці. Іх галоўным вынікам стала выключэнне, як адзначыў Д. Мэдзісан, «самай важнай папраўкі з усяго спіса» [20, p. 1145–1146] – папраўкі № 11, забараняўшай асобным штатам парушаць свабоду сумлення, слова, прэсы і справядлівага правасуддзя. Дадаткова Сенат значна змяніў і форму папраўкі № 3, аб'яднаўшы абвяшчэнне свабоды спавядання рэлігіі і свабоду слова, прэсы, сходаў і петыцый у адну папраўку. Яна набыла наступную фармуліроўку: «Кангрэс не павінен прымаць законы, якія ўстанаўліваюць артыкулы вераспавядання, ці спосаб богаслужэння, ці забараняюць свабоднае спавяданне рэлігіі, ці абмяжоўваюць свабоду слова, ці прэсы, ці права людзей на мірныя сходы і звароты да ўрада для задавальнення скаргаў» [20, p. 1153]. Як бачым, яна канкрэтызавала больш размытую папраўку Мэдзісана і Лівермора. Лінія Сената знайшла адлюстраванне і ў адхіленні часткі папраўкі № 5, якая гарантавала права асоб, рэлігійныя перакананні якіх не дазвалялі насіць зброю, на вызваленне ад службы ў арміі.

Для ўзгаднення пазіцый абедзве палаты Кангрэса сфарміравалі камітэт у складзе сенатараў Олівера Элсуорта (Канекцікут), Чарльза Кэрала (Мерыленд), Уільяма Петэрсана (Нью-Джэрсі), дэпутатаў Палаты Прадстаўнікоў Роджэра Шэрмана (Канекцікут), Джона Вайнінга (Дэлавэр) і Д. Мэдзісана (Вірджынія). У перыяд з 10 па 23 верасня імі быў падрыхтаваны канчатковы варыянт праекта Біля аб правах. Вынікам стала ўзмацненне гарантый рэлігійнай свабоды ў адпаведнай частцы трэцяй папраўкі, аўтарам якой быў Д. Мэдзісан: «Кангрэс не павінен выдаваць законы, якія датычацца ўстанаўлення якой-небудзь рэлігіі ці забараняюць яе свабоднае спавяданне…» [20, p. 1164]. 24 верасня канчатковы тэкст паправак быў зацверджаны Палатай Прадстаўнікоў, а на наступны дзень і Сенатам.

Практычна адначасова з прыняццем Біля аб правах было вырашана звярнуцца да прэзідэнта ЗША з просьбай прызначыць (у рэкамендацыйным парадку) дзень падзякі і малітвы Богу. Д. Мэдзісан не пярэчыў [15, p. 80]. 3 кастрычніка 1789 г. Д. Вашынгтон выдаў адпаведную дэкларацыю. Таму складана пагадзіцца з даволі аднабаковым заключэннем І. Бранта адносна сэнсу першай папраўкі: «…гэты [варыянт] найбольш дакладна адпавядаў мэце, для якой і быў прызначаны, – абсалютнае раздзяленне царквы і дзяржавы і поўнае выключэнне ўрадавай дапамогі рэлігіі» [20, p. 1159]. Такое разуменне фактычна мае на ўвазе, што ўмовай для заняцця федэральнай дзяржаўнай пасады станавілася спыненне прыналежнасці да пэўнай царквы. Яно не ўзгадняецца ні з тым рэальным сэнсам, які ўкладваў Д. Мэдзісан у папраўку, падкрэсліваючы тое, што ён не носіць антырэлігійнага і антыцаркоўнага характару, ні з рэальнай практыкай работы федэральнага ўрада першых дзесяцігоддзяў яго дзейнасці, у тым ліку падчас прэзідэнцкіх тэрмінаў Т. Джэферсана і Д. Мэдзісана [8–9; 11–13; 17]. Трэба адзначыць, што ў эпоху заснавання ЗША свабода сумлення разумелася, за рэдкім выключэннем, менавіта як свабода рэлігіі [1, с. 34].

З зацверджаных 12 паправак першыя дзве не прайшлі ратыфікацыю штатамі ў перыяд 1790–1791 гг., таму трэцяя папраўка стала першай і г. д. [21, p. 174]. Найбольш вострыя спрэчкі наконт ратыфікацыі паправак разгарнуліся ў Вірджыніі. Тым не менш дадзены штат ратыфікаваў Біль аб правах 15 снежня 1791 г., стаўшы неабходным адзінаццатым, для ўваходжання ў сілу паправак да Канстытуцыі ЗША [5, p. 19].

Такім чынам, сэнс першай папраўкі ў даследуемай частцы, як паказвае яе працэс прыняцця, меў два ўзроўні. Першы ўзровень абвяшчаў строга неканстытуцыйным устанаўленне дзяржаўнай царквы і/ці ўмяшанне дзяржавы ў справы, якія датычыліся выключна ўнутранай сферы дзейнасці якой-небудзь рэлігійнай арганізацыі, напрыклад, зацвярджэнне артыкулаў веравызнання. Другі ўзровень вызначаў зону дапушчальных, але непажаданых мерапрыемстваў федэральнага ўрада, накіраваных на падтрымку рэлігіі ў рэкамендацыйнай, недыскрымінацыйнай форме. За кошт гэтага федэральны ўрад захоўваў пэўную прастору для манеўра. Дзеянне першай папраўкі не закранала ўзровень штатаў, дзе заканадаўства, як правіла, не адпавядала свецкім ідэалам. З прыняццем чатырнаццатай папраўкі (1868) сітуацыя паступова змянілася. Сучасная лінія Вярхоўнага суда ЗША (з 1940-х гг.) накіравана на звужэнне сферы дапушчальнага ўзаемадзеяння дзяржавы і рэлігіі [7; 14, p. 115–116].

*Літаратура*

1. *Егоров, С.* Конституционализм в США: политико-правовые аспекты / С. Егоров. – М.: Наука, 1993. – 198 с.
2. Конституция США // Американские федералисты: Гамильтон, Мэдисон, Джей: избранные статьи. С приложением документов: Декларация независимости, Статьи Конфедерации, Конституция США. – Vermont: Chalidze Publications, 1990. – С. 293–327.
3. Становление Американского государства / отв. ред. акад. А.А. Фурсенко. – СПб.: Наука, 1992. – 318 с.

4. *Хантингтон, С.* Кто мы?: Вызовы американской национальной идентичности / С. Хантингтон; пер. с англ. А. Башкирова. – М.: ООО «Издательство АСТ»; ООО «Транзиткнига», 2004. – 635, [5] с.
5. *Adams, A.* A Nation Dedicated to Religious Liberty: The Constitutional Heritage of the Religious Clauses / A. Adams, C. Emmerich. – Philadelphia: University of Pennsylvania Press, 1990. – 172 p.
6. Creating the Bill of Rights: The Documentary Record from the First Federal Congress / Ed. by Helen E. Veit, Kenneth R. Bowling, Charline Bangs Bickford. – Baltimore and London: The Johns Hopkins University Press, 1991. – 323 p.
7. *Everson v. Board of Education* 330 U.S. I (1947) // James Madison on Religious Liberty / Ed. with introductions and interpretations by Robert S. Alley. – Buffalo, New York: Prometheus Books, 1989. – P. 223–230.
8. *Drakeman, D.* Religion and the Republic: James Madison and the First Amendment / D. Drakeman // James Madison on Religious Liberty / Ed. with introductions and interpretations by Robert S. Alley. – Buffalo, New York: Prometheus Books, 1989. – P. 231–247.
9. *Dreisbach, D.* Thomas Jefferson, a Mammoth Cheese, and the «Wall of Separation Between Church and State» / D. Dreisbach // Religion and the New Republic: Faith in the Founding of America. Ed. by J. Hutson. – Lanbam, Boulder, New York, Oxford: Rowman and Littlefield Publishers, Inc., 2000. – P. 65–114.
10. *Dreisbach, D.* The Constitution's Forgotten Religion Clause: Reflections on the Article VI Religious Test Ban / D. Dreisbach // Journal of Church and State. – 1996. – № 38. – P. 261–295.
11. *Dreisbach, D.* «Sowing Useful Truths and Princeples»: The Danbury Baptists, Thomas Jefferson, and the «Wall of Separation» / D. Dreisbach // Journal of Church and State. – 1997. – № 39. – P. 455–501.
12. *Dreisbach, D.* In Pursuit of Religious Freedom: Thomas Jefferson's Church-State Views Revisited / D. Dreisbach // Religion, Public Life and the American Polity. Ed. by L. Lugo. – Knoxville: The University of Tennessee Press, 1994. – P. 74–111.
13. *Emmerich, C.* The Enigma of James Madison on Church and State / C. Emmerich // Religion, Public Life and the American Polity. Ed. by L. Lugo. – Knoxville: The University of Tennessee Press, 1994. – P. 51–73.
14. *Guliuzza, F.* The Supreme Court, the Establishment Clause, and Incoherence / F. Guliuzza // Religion, Public Life and the American Polity. Ed. by L. Lugo. – Knoxville: The University of Tennessee Press, 1994. – P. 115–144.
15. *Hutson, J.* Religion and the Founding of the American Republic / J. Hutson. – Washington: Library of Congress, 1998. – 136 p.
16. *Levy, L.* Original Intent and the Framers' Constitution / L. Levy. – New York, London: MacMillan Publishing Company, Collier MacMillan Publishers, 1988. – 525 p.
17. *Morris, R.* The Judeo-Christian Foundation of the American Political System / R. Morris // James Madison on Religious Liberty / Ed. with introductions and interpretations by Robert S. Alley. – Buffalo, New York: Prometheus Books, 1989. – P. 109–114.
18. *Pfeffer, L.* Madison's «Detached Memoranda»: Then and Now / L. Pfeffer // The Virginia Statute for Religious Freedom. Its Evolution and Consequences in American History. Ed. by M. Peterson and R. Vaughan. – Cambridge: Cambridge University Press, 1988. – P. 283–312.
19. *Pfeffer, L.* The Unity of First Amendment Religious Clauses / L. Pfeffer // The First Freedom: Religion and the Bill of Rights / Ed. by James E. Wood, Jr. – Waco, Texas: J.M. Dawson Institute of Church-State Studies at Baylor University, 1990. – P. 133–166.
20. *Schwartz, B.* The Bill of Rights: A Documentary History / B. Schwartz. – V. II. – New York, Toronto, London, Sydney: Chelsea House Publishers in association with McGraw Hill Book Company, 1971. – 1234 p.
21. The Constitution of the United States of America, 1787 // An American Primer. Edited by D.J. Boorstin. – Ontario: Meridian Classic Printing, 1985. – P. 101–188.

Summary

*The article is devoted to the process of the adoption of the first amendment to the U.S. Constitution, specifically the part concerning guarantees of the free exercise of religion. This process demonstrated that the first amendment had two meanings. The narrow one banned the establishment of a national religion – a state church such as in England. The broad one marked a zone of permissible, but not recommended measures of the federal government for the support of religion in a voluntary, non-discriminatory form (chaplains, public praying, thanksgiving proclamations etc.).*

*УДК 947.084.8*

***А.П. Салькоў,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры паўднёвых і заходніх славян БДУ*

# СССР І ЮГАСЛАЎСКА-ІТАЛЬЯНСКІЯ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ Ў РАЁНЕ ІСТРЫІ–ТРЫЕСТА (КРАСАВІК 1941 – МАЙ 1945 гг.)

Адным з самых складаных і працяглых быў нацыянальна-тэрытарыяльны канфлікт у Юлійскай Крайне (Венецыі-Джуліі). Гэтая гістарычная вобласць уключала вялікую тэрыторыю паміж італьянска-аўстра-венгерскай мяжой 1918 г. на захадзе і італьянска-югаслаўскай мяжой 1924 г. на ўсходзе. Галоўнымі пунктамі супярэчнасцей былі харвацкі паўвостраў Істрыя з горадам Рыекай і славенскае Прымор'е з горадам Трыестам. Гады Другой сусветнай вайны на Балканах сталі важным, але супярэчлівым перыядам пошуку сродкаў і шляхоў рашэння гэтага старога ўжо канфлікту. Кожны з гэтых рэгіёнаў меў сваю доўгую гісторыю і вылучыўся ў асобную праблему.

Істрыя ў VI–VIII стст. знаходзілася пад уладай Візантыі, а потым заставалася ў складзе германскіх дзяржаў. У 1374 г. Істрыя была падзелена на Заходнюю (венецыянскую) і Унутраную (разам з Рыекай), якая была набыта Габсбургамі паводле спадчыннага права. З падзеннем Венецыянскай рэспублікі (1797) і пасля напалеонаўскіх войнаў уся Істрыя да 1918 гг. знаходзілася пад аўстрыйскай імператарскай уладай. У 1786 г. было створана «Венгерскае Прымор'е» з цэнтрам у Рыецы, якое да 1918 г. належала Венгерскаму кара-

леўству ў складзе Аўстра-Венгерскай імперыі [1, s. 124, 236–237; 2, s. 39, 68, 112].

Усе славенскія землі Юлійскай Крайны з VII ст. уваходзілі ў склад германскіх дзяржаў. У 1278 г. тут усталявалася спадчынная ўлада Габсбургаў, што праіснавала да 1918 г. Асаблівую гісторыю меў горад Трыест (Тырст, Тэрст), які супрацьстаяў жорсткаму націску венецыянцаў. На працягу XIII–XIV стст. прайшлі пяць трыесцка-венецыянскіх войнаў – 1202, 1287–1291, 1368–1369, 1372, 1379 гг., у час якіх горад чатыры разы часова быў захоплены Венецыяй. Гэта прымусіла Трыест у 1382 г. добраахвотна перайсці пад суверэнітэт аўстрыйскага герцага. З таго часу, да 1918 г. (акрамя перыяду Ілірыйскіх правінцый 1809–1813 гг.) горад уваходзіў у склад манархіі Габсбургаў. У XVIII в. славенцы складалі большасць насельніцтва Трыеста, але ў пачатку XIX ст. – толькі 31%. Аднак славянскі характар Трыеста не выклікаў сумненняў [4, л. 34–36].

Самы цяжкі перыяд у «пакутлівай гісторыі Юлійскай Крайны», надыйшоў пасля Першай сусветнай вайны. Да мая 1915 г. Італія была ў саюзе з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй, але 26 красавіка заключыла Лонданскае сакрэтнае пагадненне з Антантай, якая паабяцала Італіі за ўступленне ў вайну на яе баку ўсю Юлійскую Крайну з Істрыяй і амаль усё Далмацінскае ўзбярэжжа (землі т. зв. Italiaizzidenta). На Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 г. Італія запатрабавала перадаць ёй яшчэ і Рыеку (Фіуме). Пярэчанні дэлегацыі ЗША выклікалі ў Італіі шмат абурэнняў, абумовіўшы патрабаванні «аднавіць справядлівасць сілай». Атрад італьянскіх фашыстаў на чале з паэтам Габрыэле д'Анунцыо 12 верасня 1919 г. без бою ўступіў у Рыеку [5, л. 70].

Абяцанні саюзнікаў рэалізаваліся ў рамках рабаўніцкага для Каралеўства СХС Рапальскага пагаднення (12 лістапада 1920 г.). Гэты акт адняў у маладой югаслаўскай дзяржавы ўсю Істрыю з Трыестам, заходнюю частку Кварнерскага заліва (Кварнер) з астравамі Црэс і Лошынь, г. Задар (Зару) у Далмацыі. У Рыецы была ўтворана «вольная дзяржава Фіуме» (пасля чаго фашысты д'Анунцыо сышлі з горада) [6, с. 48–49]. У выніку прыходу Б. Мусаліні да ўлады ў Італіі ў кастрычніку 1922 г. і палітыкі яго ўціхамірвання, якая праводзілася югаслаўскім каралём Аляксандрам I, былі заключаны італа-югаслаўскія «Рымскія пагадненні» (27 студзеня 1924 г.). Яны ўтрымлівалі і дамову пра падзел «вольнай дзяржавы Фіуме». Бялград прызнаў суверэнітэт Італіі над самім горадам Рыекай (Фіуме), а прыгарад Сушак з партовымі збудаваннямі застаўся ў Каралеўства СХС [7, s. 174–176].

Славянскае насельніцтва Юлійскай Крайны стала падвяргацца ў Італіі жорсткаму нацыянальнаму прыгнёту. Былі закрыты ўсе 448 пачатковых і 10 сярэдніх славенскіх і харвацкіх школ, усе друкаваныя органы, родная мова была забаронена нават у царкве, забаранялася спяваць нацыянальныя песні. Усе нязгодныя падвяргаліся рэпрэсіям, у 1926 г. дзеля іх праследу быў створаны спецыяльны суд. Рым імкнуўся надаць усёй вобласці італьянскі характар. Колькасць італьянскіх перасяленцаў склала за міжваенны перыяд 100–150 тыс. чал. Тым не менш пераважная большасць славенцаў Трыеста і харватаў Істрыі захавалі сваю нацыянальную свядомасць і культуру [8, л. 27].

У час «Красавіцкай вайны» – германа-італа-венгерскай агрэсіі супраць Югаславіі (6–17 красавіка 1941 г.), пачалі рэалізоўвацца дамоўленасці А. Гітлера і Б. Мусаліні аб тэрытарыяльным падзеле краіны. На Венскай сустрэчы міністраў замежных спраў Германіі і Італіі І. Рыбентропа і Г. Чыяна (21–22 красавіка) падзел быў падрабязна абмеркаваны, пры гэтым Паўднёвая Славенія, Істрыя і Далмацінскае ўзбярэжжа былі аднесены да італьянскай сферы ўплыву. Ужо 24 красавіка зоны інтарэсаў Германіі і Італіі былі вызначаны ваеннай дэмаркацыйнай лініяй [9, с. 178–180]. Пад італьянскай уладай апынуліся славенскія вобласці на поўдзень ад верхняга цячэння Савы (Доленьска і Отраньска) і Любляна. Тут была ўтворана Люблянская пакраіна (4,5 тыс. кв. км, 336 тыс. чал.), якая мела выхад на Адрыятыку ў раёне Фіуме, з правам пэўнай аўтаноміі. 3 мая 1941 г. яна ў фармальна-прававым сэнсе была ўключана ў склад Італіі [10, с. 55–58]. Першапачатковая «мяккасць» рэжыму (арганізацыя краёвай рады – канзулта, двухмоўе, дзейнасць славенскіх культурных структур) да пачатку 1942 г. змянілася яго ўзмацненнем. Уся Люблянская пакраіна аб'яўлялася ваеннай зонай, акупанты сталі казаць пра «рэальную вайну» (guerra guerregiata). Пачаліся масавыя арышты (усяго ў турмах знаходзілася 13 тыс. чал.), паліцэйскія налёты, дэпартацыі славенцаў [11, s. 5–6].

Незалежная харвацкая дзяржава (НДХ, абвешчаная усташамі 10 красавіка 1941 г.) паводле дамовы з Германіяй ад 13 мая пагадзілася з нямецкай анексіяй Паўночнай Славеніі (на поўнач ад верхняга цячэння Савы), хаця мяжа і праходзіла ўсяго за 20 км ад Заграба. Паводле дамовы НДХ з Італіяй (Рымскае пагадненне) ад 18 мая ўсходняя частка Кварнерскага заліва (Кварнерыч) з астравамі Крк і Раб, большая частка Далмацыі, частка Чарнагорыі (усяго 5,4 тыс. кв. км, 380 тыс. чал.) былі анексіраваны Італіяй [12, s. 48–49]. Хоць Рым яшчэ і лічыў сябе абдзеленым, аднак працэс усталявання межаў часова завяршыўся.

Сваю пазіцыю меў і югаслаўскі каралеўскі ўрад у эміграцыі. Яго прэм'ер-міністр Д. Сімавіч у выступленні па радыё Лондана 27 чэрвеня 1941 г., засноўваючыся на абяцаннях англічан, заявіў, што пасля вайны Югаславія павінна атрымаць Істрыю, Трыест, Славенскае Прымор'е і Славенскую Карынтыю [13, s. 136].

З пачаткам савецка-германскай вайны СССР пачаў выпрацоўваць пазіцыю наконт будучыні Еўропы. На перамовах з кіраўніком Форын Офіс А. Ідэнам 16 снежня 1941 г. І.В. Сталін прапанаваў агульную схему рэарганізацыі межаў пасля вайны. У ёй значылася: Югаславія «павінна быць адноўлена ў сваіх старых межах і крыху пашырана за кошт Італіі (Трыест, Фіуме, астравы ў Адрыятычным моры і г. д.)» [14, с. 502]. У пераліку праблем, якія падлягалі распрацоўцы створанай у верасні 1943 г. Камісіі па пасляваенным уладкаванні пры НКЗС СССР (Камісія Літвінава) у раздзеле «Югаславія» значылася: «Югаслаўска-італьянская мяжа (Далмацыя, Трыест, Фіуме)» [15, с. 245].

У ліпені 1943 г. Італія выйшла з вайны. Германскі вермахт акупіраваў усю былую італьянскую зону ў Югаславіі, а таксама Істрыю і Трыест. Італія падпісала 3 верасня на Сіцыліі «Кароткія ўмовы» капітуляцыі, што выклікала ліхаманкавыя дзеянні ў краіне як фашысцкіх, так і камуністычных сіл. 10 верасня Гітлер стварыў «Аператыўную зону Адрыятычнага ўзбярэжжа», якая ўключала Любляну, Істрыю, Трыест, Рыеку, Горыцу, астравы Кварнера. У той жа дзень са згоды фюрэра паглаўнік НДХ А. Павеліч дэнансаваў Рымскае пагадненне ад 18 мая 1941 г., што азначала вяртанне Далмацыі, але не мела дачынення да лёсу Істрыі і Рыекі. Адначасова Оскар Турына быў прызначаны кіраўніком грамадзянскага ўпраўлення вернутых тэрыторый, прычым у сферу яго адказнасці паглаўнік уключыў і Істрыю, і Рыеку. Ужо 13 верасня Павеліч у тэлеграме Гітлеру выказаў прэтэнзію на гэтыя землі, што, аднак, не прывяло да рэальных вынікаў. Германія не забывалася і пра свайго саюзніка Мусаліні, якому яна дапамагла заснаваць Італьянскую сацыяльную рэспубліку. Дучэ не прызнаў дэнансацыі Рымскага пагаднення 1941 г. і адказаўся накіраваць свайго пасланніка ў Заграб [16, s. 218–219].

З развіццём вызваленчага руху органы ўлады новай Югаславіі сталі падымаць праблему Юлійскай Крайны. Яшчэ да капітуляцыі Італіі – 1 сакавіка і 26 мая 1943 г. Антыфашысцкае веча народнага вызвалення Харватыі (АВНВХ) рабіла заявы адносна будучай югаслаўска-італьянскай мяжы. Акруговыя народна-вызваленчыя камітэты Прыморскай Славеніі (11 верасня) і Істрыі (13 верасня) прынялі рашэнні аб аб'яднанні Прымор'я са Славеніяй, а Істрыі з Харватыяй. АВНВХ заявіла 20 верасня аб далучэнні да Харватыі Істрыі, Рыекі, астравоў Кварнера [13, s. 136]. Аднак славенскі і харвацкі вызваленчыя рухі не ўспрымалі нацыянальных патрэб італьянскага насельніцтва Істрыі, што выявілася ў італьянскіх пагромах восені 1943 г. у прыбрэжных гарадах, стварыўшы сіндром «істрыйскага страху» [17, s. 50].

29 верасня 1943 г. Італія падпісала на Мальце «Вычарпальныя ўмовы» капітуляцыі, узгодненыя з Масквой, і абвясціла вайну Германіі. У сувязі з гэтым СССР, Англія і ЗША прызналі Італію ваюючай з імі разам, што паўплывала пры вырашэнні тэрытарыяльных праблем Славенскага Прымор'я і Трыеста.

На Тэгеранскай канферэнцыі гэтыя праблемы былі замоўчаны. Аднак Ф. Рузвельт 29 лістапада 1943 г. пазнаёміў Сталіна з дакладам амерыканскага прадстаўніка пры штабе І. Броз Ціта [18, с. 101, 163]. Увогуле на працягу 1943 г. увага заходніх саюзнікаў да Еўропы пераакцэнтавалася з Сіцыліі на Істрыю і яе гарады Трыест, Пола, Фіуме. Адразу пасля Тэгерана, у час Каірскай канферэнцыі ў снежні 1943 г., саюзнікі, баючыся, што Чырвоная Армія першай увойдзе ў Аўстрыю, абмяркоўвалі планы прасоўвання туды сваіх войскаў праз Трыест і Любляну [19, p. 29–33].

Да таго часу ў савецкай дыпламатыі выспявала тэрытарыяльная карціна пасляваеннага свету. Прадугледжвалася цэласнасць Італіі, «але за выключэннем усіх яе ранейшых уладанняў на Балканах» [20, с. 28, 31–32].

Да верасня 1944 г. у Камісіі Літвінава завяршылася распрацоўка запіскі «Аб адносінах з Італіяй». На пасяджэнні 4 верасня членамі Камісіі быў зроблены крытычны разбор яе гістарычнай часткі. Я.З. Сурыц заўважыў, што адрыятычная праблема была вырашана ў Рапале насуперак інтарэсам Югаславіі, таму цяпер да яе павінна перайсці ўся Істрыя. Аднак у яго былі «пэўныя сумненні адносна Трыеста» – ці варта яго перадаваць Югаславіі або, выключыўшы з суверэнітэту Італіі, надаць Трыесту «характар нейтральнага і пастаўленага пад міжнародны кантроль порта». Сурыц лічыў «магчымым дапусціць у якасці аднаго з варыянтаў і адход Трыеста да Югаславіі». С.А. Лазоўскі прапаноўваў дзейнічаць так, каб Італія «рэальна, па-сапраўднаму адчула вынікі гэтай вайны, страціўшы калоніі і цэлы шэраг тэрыторый». Таму ён прапаноўваў перадаць Трыест Югаславіі, а не ператвараць яго ў інтэрнацыянальны горад. Я.В. Тарле быў найбольш рашуча настроены супраць Італіі, каб яна «не выйшла сухой з вады». Б.Е. Штэйн меркаваў: на Балканах «неабходна спыніць якую б ні было ролю Італіі» [5, л. 70–79].

Падводзячы высновы, М.М. Літвінаў выказаў шэраг прыкметных думак. Ён не лічыў, што, выганяючы Італію з Балкан, трэба «цалкам выгнаць яе з Істрыйскага паўвострава, заходняе ўзбярэжжа якога ніяк не звязана з Балканамі». У дачыненні да Трыеста Літвінаў разгарнуў сістэму поглядаў. Па-першае, ён сцвярджаў, што Трыест як порт не патрэбны ні Італіі, ні Югаславіі, калі апошняя атрымае Фіуме і Зару. Таму меркаваў «прадаставіць Трыест у карыстанне тым дзяржавам, якія не маюць выхаду да Паўднёвых мораў – Аўстрыі, Чэхаславакіі». Па-другое, ён усяго толькі дапускаў: «Магчыма, што пры пэўных асаблівых нашых адносінах з Югас-

лавіяй, мы захочам перадаць ёй і Трыест», мяркуючы, што Захад будзе супраць. Па-трэцяе, Літвінаў прыхільна выказаўся на карысць інтэрнацыяналізацыі Трыеста [5, л. 80–82].

Такім чынам, у Маскве пакуль не склалася канцэпцыя адносна Істрыі і Трыеста. Аднак ужо былі відавочны завышаныя патрабаванні адносна магчымасцей СССР лабіраваць выгадныя для сябя рашэнні, да таго ж ва ўмовах іх высокай варыябельнасці. Усе гэтыя асаблівасці савецкай пазіцыі знайшлі адлюстраванне ў канчатковым тэксце канцэптуальнай запіскі Камісіі Літвінава «Аб адносінах з Італіяй», датаванай 8 верасня 1944 г. [гл. 21, л. 2–58].

Да канца вайны ў кіраўніцтве КПЮ выспела перакананне пра неабходнасць уключэння ў склад дзяржавы ўсіх славянскіх тэрыторый, што апынуліся за межамі каралеўства па выніках Першай сусветнай вайны. Ключавым пунктам гэтых прэтэнзій была Юлійская Крайна. Разам з тым станавілася відавочнай рашаючая роля савецкага фактару ў рэалізацыі гэтых планаў, што патрабавала іх каардынацыі з Масквой і, між іншым, выявіла іх разыходжанне з палітычнымі інтарэсамі СССР.

Кіраўнік урадавай дэлегацыі Югаславіі А. Хэбранг на сустрэчы са І.В. Сталінам 9 студзеня 1945 г. разгарнуў карціну тэрытарыяльных прэтэнзій да ўсіх суседніх краін. Ён абгрунтаваў і далучэнне Істрыі з партамі Трыест, Пула і Рыека, паказаўшы этнаграфічную карту рэгіёну. Сталін адрэагаваў: «…трэба, каб самі гэтыя вобласці патрабавалі свайго далучэння да Югаславіі», а потым даволі недарэчна прыгадаў неафіцыйную размову з У. Чэрчылем, у якой той прапаноўваў выдзеліць Істрыю ў аўтаномную вобласць, што дазволіла б Аўстрыі атрымаць выхад да Адрыятыкі [22, с. 126–127]. Узрушаны Хэбранг тэлеграфаваў югаслаўскаму лідэру І. Броз Ціта: «Па многіх палітычных пытаннях іх думка адрозніваецца ад нашай… Трэба пазбягаць вялікіх патрабаванняў да суседніх краін…» [23, с. 398].

На Крымскай канферэнцыі праблема італа-югаслаўскай мяжы была ўзнята 8 лютага 1945 г. А. Ідэнам, які ўручыў наркому В.М. Молатаву і дзяржсакратару ЗША Э. Стэтыніусу брытанскія «Заўвагі адносна Венецыі-Джуліі». Яны аднавілі пазіцыю Чэрчыля аб мяжы ў раёне Істрыі–Трыеста, занятую ім яшчэ ў жніўні 1944 г. на сустрэчы з Ціта. Ідэн адзначаў, што «правінцыя Венецыя-Джулія на паўночным усходзе Італіі ўяўляе сабой патэнцыяльны парахавы склеп». Першапачаткова Лондан прапаноўваў устанавіць брытанскую ваенную адміністрацыю ва ўсёй правінцыі ў яе даваенных межах, але сутыкнуўся з яўнай нязгодай Ціта. Таму зараз было прапанавана выпрацаваць часовую дэмаркацыйную лінію. Аднак праблема нават не была разгледжана з-за негатыўнай пазіцыі СССР і была адкладзена на няпэўны тэрмін [24, с. 134, 196, 201–202].

Тэрытарыяльныя прэтэнзіі Югаславіі выклаў міністр замежных спраў адзінага югаслаўскага ўрада І. Шубашыч на сустрэчы з Молатавым 6 красавіка 1945 г. Яны ў асноўным «вычэрпваліся» Істрыяй, пра якую Чэрчыль рэкамендаваў увогуле не згадваць. Аднак Шубашыч меркаваў, што калі «ў ходзе цяперашняй вайны югаслаўскія войскі зоймуць Істрыю, то ў гэтым выпадку для Югаславіі будзе лягчэй разгледзець пытанне аб выпраўленні сваіх межаў з Італіяй» [22, с. 429–430].

Прыкметныя і погляды самога І.В. Сталіна, выкладзеныя ім падчас вячэры на дачы ў Кунцаве пасля падпісання 11 красавіка 1945 г. савецка-югаслаўскай дамовы аб дружбе. Яны датычыліся асаблівага характару бягучай вайны і зводзіліся да наступнага: «Хто акупіруе тэрыторыю, той навязвае ёй сваю ўласную сацыяльную сістэму. Кожны навязвае сваю ўласную сістэму настолькі далёка, наколькі можа прасунуцца яго войска. Па-іншаму і быць не можа» [25, с. 131–132]. Невыпадкова, у апошнія дні вайны ў Еўропе ўзніклі два палітычныя крызісы, звязаныя з югаслаўскай ваеннай прысутнасцю ў аўстрыйскай правінцыі Карынтыя (яе паўднёвыя раёны са славенскім насельніцтвам югаславы называлі Корушкай) і ў Трыесце. Завяршыліся яны ў канцы мая – чэрвені 1945 г. і сталі прадвеснікам «халоднай вайны».

Што да Корушкі, СССР 19 красавіка згадзіўся з удзелам югаславаў у акупацыі аўстрыйскай тэрыторыі ў межах савецкай акупацыйнай зоны. Яны нават прадугледжвалі кандыдатуры камендантаў гарадоў для Карушкі, Істрыі і Трыеста. У сярэдзіне мая югаслаўскія войскі ўвайшлі ў Корушку, але ўжо ў канцы месяца пад ціскам англічан былі адтуль выведзены.

Адносна Трыеста, то ў лютым 1945 г. на перамовах у Бялградзе галоўнакамандуючы заходнімі сіламі на Міжземнамор'і фельдмаршал Г. Аляксандар заключыў пагадненне з Ціта. Трыест, паводле яго, пераходзіў пад заходняе ваеннае кіраванне, але з югаслаўскай грамадзянскай уладай. Ціта быў упэўнены, што саюзныя войскі зоймуць Трыест раней. Аднак у выніку кідка 1–2 мая югаслаўскія часці з блаславення Масквы занялі горад [27, с. 46–59]. 5 мая Ціта рэзка выказаўся пра «нахабны ўчынак» англічан, якія ўвайшлі ў горад пасля яго вызвалення югаславамі [28, с. 280–281]. 40-дзённы «трыестынскі крызіс» паставіў свет на мяжу новай вайны (у рассакрэчаным у 1998 г. дасье Чэрчыля меўся план экстраннай аперацыі «Неверагоднае» па ваенным выцясненні Чырвонай Арміі з Цэнтральнай Еўропы) [29, с. 524–527]. Найгоршае ўражанне на заходніх саюзнікаў зрабілі і жорсткія паводзіны югаслаўскіх войскаў у Трыесце. Паводле шэрага даных, югаславы ўчынілі ў горадзе разню палонных немцаў, італьянскіх паліцэйскіх і нават італьянскіх антыфашыстаў, лічыўшых, што Трыест павінен заставацца

ў складзе Італіі. Колькасць расстраляных вызначаецца рознымі аўтарамі ад 2 да 3,5 тыс. чалавек [30, с. 240; 31, p. 86]. У выніку, пад асабістым напорам Сталіна Ціта быў вымушаны адвесці свае войскі з горада. Спрэчка пра Трыест закранула і адносіны паміж УКП (б) і Італьянскай кампартыяй. Яе лідэр – П. Тальяці ў лютым і красавіку 1945 г. накіраваў у Маскву два звароты наконт Трыеста (лічыў яго італьянскім горадам) [32, с. 241–242, 251].

Канчатковае югаслаўска-італьянскае ўрэгуляванне вакол Трыеста было дасягнута пазней. Паводле мірнай дамовы з Італіяй (10 лютага 1947 г.) амаль уся Юлійская Крайна (уключана Істрыя), была замацавана за Югаславіяй, стваралася Вольная тэрыторыя Трыест (ВТТ). Югаславія падпісала дамову, зрабіўшы унікальную заяву, што захоўвае за сабой права на этнічныя югаслаўскія тэрыторыі, пакінутыя па-за яе межамі. У 1954 г. ВТТ была падзелена з адыходам Трыеста да Італіі. Канчаткова югаслаўска-італьянская мяжа была замацавана ў 1975 г. пагадненнем у італьянскім горадзе Асіма.

Літаратура


1. *Pavlicevic, D.* Povijest Hrvatske / Dragutin Pavlicevic. – 3. dopunjeno izd. – Zagreb: Naklada Pavicic, 2002. – 630 s.
2. *Antoljak, S.* Pregled hrvatske povijesti / Stjepan Antoljak, [suautori Sime Batovic… et al.]. – 2. dopunjeno izd. – Split: Orbis: Laus, 1994. – 248 s.
3. Clovenci skozi cas: Kronika slovenske zgodovine / Janez Marolt [et al.], uredil Jaro Mihelac. – Ljubljana: Mihelac, 1998. – 519 s.
4. Архив внешней политики РФ (АВП РФ). Фонд 432 (Парижская мирная конференция). – Оп. 1. – П. 12. – Д. 29. Комиссия по политическим и территориальным вопросам для Италии. Заседания № 1–43.
5. АВП РФ. Фонд 06 (Секретариат В.М. Молотова). – Оп. 06. – П. 14. – Д. 141. Материалы Комиссии Литвинова.
6. Историја српске државности: в 3 књ. / Ч. Попов (уредник). – Нови Сад: Будућност, 2000–2001 // Димић, љ. Књ. 3. Србија у Југославији / љубодраг Димић. – 2001. – 472 с.
7. Jugoslavija 1918–1988: tematska zbirka dokumenata / priredili Branko Petranovic, Momcilo Zecevic. – Beograd: Rad, 1988. – 1445 s.
8. АВП РФ. Фонд Ф. 0431/I (I сессия СМИД в Лондоне, 1945 г.). – Оп. 1. – П. 1. – Д. 5. Протоколы заседаний, приложения.
9. *Семиряга, М.И.* Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы Второй мировой войны / М.И. Семиряга. – М.: РОССПЭН, 2000. – 863 с.
10. *Габрич, А.* Очерк развития словенской государственности (1941–1991) / Алеш Габрич, Зденко Чепич // Словения. Путь к самостоятельности. Документы / Е.Ю. Гуськова (отв. ред.). – М.: Индрик, 2001. – С. 55–78.
11. *Ferenc, T.* Confinement, police raids and internment in the Ljubljana Province 1941–1943 / Tone Ferenc // Rab – Arbe – Arbissima: confinement, police raids and internment in Ljubljana Province: 1941–1943: documents / complited by Tone Ferenc. Ljubljana: Institute for Contemporary History: Society of the Writers of the Liberation War in Slovenia, 2000. – Str. 5–40.
12. *Zelic-Bucan, B.* Nezavisna Drzava Hrvatska (1941–1945.): u mom sjecanju / Benedikta Zelic-Bucan. – Split: Naklada Boskovic, 2007. – 165 s.
13. *Radelic, Z.* Hrvatska u Jugoslaviji 1945.–1991.: od zajednistva do razlaza / Zdenko Radelic. – Zagreb: Skolska knjiga: Hrvatski institute za povijest, 2006. – 701 s.
14. Документы внешней политики. 22 июня 1941 – 1 января 1942. Т. XXIV / Е.П. Гусаров (предс. ред. колл.) [и др.]. – М.: Междунар. отношения, 2000. – 632 с.
15. СССР и германский вопрос. 1941–1949. Документы из АВП РФ: в 4 т. М.: Междунар. отношения, 1996–2003 / Г.П. Кынин, Й. Лауфер (сост.). – Т. I: 22 июня 1941 – 8 мая 1945. – 1996. – 784 с.
16. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны: в 6 т. М.: Политиздат, 1979–1984 / А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – Т. 2: Тегеранская конференция: сб. док. – 1978. – 175 с.
17. Slovensko-italijanski odnosi 1880–1956, porocilo slovensko-italijanske komisije / uredili Milica Kacin Wohinz, Nevenka Troha. – Ljubljana: Nova revija, 2001. – 163 s.
18. Matkovic, H. Povijest Nezavisne Drzave Hrvatske / Hrvoje Matkovic. – 2. prosireno izd. – Zagreb: Naklada Pavicic, 2002. – 332 s.
19. Valdevit, G. La questine di Trieste 1941–1954: Politica internazionale e contesto locale / Giampaolo Valdevit. – Milano: Franko Angeli, 1886. – 279 p.
20. Советский фактор в Восточной Европе. 1944–1953 гг. Документы: в 2 т. М.: Росспэн, 1999–2002 / Т.В. Волокитина (отв. ред.). – Т. 1: 1944–1948 гг. – 1999. – 687 с.
21. АВП РФ. Фонд 06. – Оп. 06. – П. 17. – Д. 147. Справка Комиссии Литвинова «Об обращении с Италией».
22. Восточная Европа в документах российских архивов. 1944–1953 гг.: в 2 т. М.; Новосибирск: Сибирский хронограф, 1997–1998 / Г.П. Мурашко (отв. ред.) [и др.]. – Т. 1: 1944–1948. – 1998. – 985 с.
23. Отношения СССР (России) с Югославией. 1941–1945. Документы и материалы / И.Б. Бухаркин (предс. ред. кол.) [и др.]. – М.: Терра, 1998. – 656 с.
24. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны: в 6 т. М.: Политиздат, 1979–1984 / А.А. Громыко (гл. ред.) [и др.]. – Т. 4: Крымская конференция: сб. док. – 1979. – 326 с.
25. *Джилас, М.* Беседы со Сталиным / Милован Джилас. – М.: Центрполиграф, 2002. – 221 с.
26. *Сальков, А.П.* Югославско-австрийские территориальные противоречия и СССР (40-е годы XX в.) / А.П. Сальков // Вестник Московского университета. Серия 8. 2004. № 6. – С. 3–20.
27. *Гибианский, Л.Я.* Сталин и триестинское противостояние 1945 г.: за кулисами первого международного кризиса холодной войны / Л.Я. Гибианский // Сталин и холодная война / А.О. Чубарьян (отв. ред.). – М.: Наука, 1997. – С. 44–62.
28. Русский архив: Великая Отечественная. Красная армия в странах Центральной, Северной Европы и на Балканах: 1944–1945. Документы и материалы / В.А. Золотарев (пред. ред. кол.) [и др.]. – Т. 14–3 (2) / А.Д. Ефремов (сост.) [и др.]. – М.: Терра, 2000. –688 с.
29. *Ржешевский, О.А.* Сталин и Черчилль. Встречи. Беседы. Дискуссии: Документы, комментарии, 1941–1945 / О.А. Ржешевский. – М.: Наука, 2004. – 564 с.
30. *Уэст, Р.* Иосип Броз Тито: власть силы / Ричард Уэст. – Смоленск: Русич, 1998. – 512 с.
31. *Wohinz, M.K.* Storia degli sloveni in Italia 1866–1998 / Milica Kacin Wohinz, Joze Pirjevec. – Venezia: Marsilio Editori, 1998. – 151 s.
32. *Димитров, Г.* Дневник. Март 1933 – февруари 1949. Избрано / Георги Димитров. – София: Изток–Запад, 2003. – 509 с.



Summary

*The article analyses the national-territorial conflict in Istria–Trieste region between Yugoslavia and Italy in 1941–1945, apart from the ways and principles of adjustment (planning after-war frontiers, bring troops into controversial territories, bilateral agreements) role and interests of the USSR, Great Britain, the USA, Yugoslavian people's liberation power.*

# ФІЛАСОФІЯ

УДК 140.8

**П.В. Кікель,**
*доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры філасофіі БДПУ;*
**І.В. Абалевіч,**
*аспірантка кафедры філасофіі БДПУ*

## МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ СВЕТАПОГЛЯДУ

Аб'ектыўны і неадназначны характар працэсаў, якія адбываюцца ў адукацыі і выхаванні, абумоўлены імклівым ростам выкарыстання інтэлектуальных тэхналогій, а галоўнае, зменай характару і зместу асноўнага грамадскага прадукту. Калі раней уклад эканомікі і ўтрыманне вытворчых адносін вызначалі выпрацоўваемыя грамадствам матэрыяльныя выгады, то ў новых умовах у якасці галоўнага грамадскага прадукту першаступеннае значэнне набываюць веды, якія вызначаюць спецыфіку і характар усіх тэхналогій.

Сёння з'яўляецца аксіёмай палажэнне аб тым, што рашэнне праблем, якія стаяць перад чалавецтвам, стала немагчыма без фарміравання навуковага светапогляду, заснаванага на крытычным аналізе духоўных каштоўнасцей мінулага, пераасэнсавання новай ролі чалавека, развіцці і выяўленні яго нерэалізаваных і нявыяўленых магчымасцей, раскрыцці інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу.

Калі гаварыць вобразна аб светапоглядзе, то можна сказаць, што гэта «погляд» чалавека «па-за сябе» і «ў сябе» ў адзінстве. У філасофіі XX ст. выразна вылучаліся тры такія «погляды»: міфалагічны, рэлігійны і навуковы, а таксама часовыя прамежкі іх генезісу. Натуральна, што любая класіфікацыя ўмоўная і закліканая лакалізаваць тую праблему, якую вырашае чалавек у дадзены момант. Скарыстаемся дадзенай магчымасцю для лакалізацыі праблемы фарміравання светапогляду толькі ў кантэксце адукацыі студэнцкай моладзі. З гэтай мэтай прапануем свой варыянт тыпаў светапогляду, які заснаваны на логіцы развіцця навукі як цэласнай сістэмы ведаў: аналітычны, сінергетычны і, аб'яднаўшы першыя два ў адзінае цэлае, навуковы.

У артыкуле вылучаюцца два шляхі рашэння праблемы фарміравання светапогляду і яго трансфармацыі. Гэта традыцыйны шлях вывучэння свядомасці, яго структур і матэрыяльнага носьбіта – мозга. Дадзеныя даследаванні ўсё больш удакладняюцца з дапамогай электронных сродкаў. Спецыялісты па камп'ютэрных тэхналогіях, кагніталогіі і кагнітыўнай псіхалогіі, інфарматыцы і кібернетыцы, семіётыцы і сінергетыцы і шматлікіх іншых галінах ведаў спрабуюць мадэліраваць або імітаваць некаторыя функцыі мыслення, выкарыстоўваючы для гэтага сучасны навуковы інструментарый (мікрапрацэсары высокай хуткадзейнасці, камп'ютэрныя тамографы, звышадчувальныя датчыкі, рознае матэматычнае забеспячэнне навуковага пошуку і г. д.). Ствараюцца складаныя мадэлі, з дапамогай якіх спрабуюць пазнаць нешта новае. Для даследчыкаў найбольш цікавыя тыя параметры мадэлі, якія будуць індуцыравацца пры выпрабаванні на камп'ютэры пры колькасці сувязей усярэдзіне яе і хуткасцях іх злучэння большых, чым існуюць у чалавечым мозгу пры здзяйсненні актаў стварэння, якія кіруюцца воляй. Перспектыўнасць і эфектыўнасць дадзенага кірунку не выклікае сумненняў, бо ўжо сёння можна гаварыць аб «расшыфроўцы» свядомасці з дапамогай дадзеных прылад. Але дадзены шлях мае свае абмежаванні, звязаныя з разуменнем адукацыі механізму фарміравання светапогляду і яго трансфармацыі, бо ў падобных даследаваннях «маюць справу» з тым, што «ўжо ёсць», што адбылося. А як гэта «адбылося» і чаму – пытанні, якія па-за кампетэнцыяй дадзеных адмыслоўцаў.

І другі шлях – вельмі складаны і супярэчлівы працэс узаемадзеяння суб'екта і соцыуму. Мы ўжо гаварылі аб адзінстве двух «поглядаў», складальных асновы светапогляду і яго тыпаў. Разгледзім дадзены аспект больш падрабязна.

Першы «погляд» «па-за сябе» – гэта веды суб'екта аб яго «свеце», у якім ён жыве і які ён ператварае на аснове гэтых ведаў. Тут абмовіліся аб сваёй нязгодзе з агульнапрынятым азначэннем сучаснага грамадства як «інфармацыйнае». Справа ў тым, што інфармацыя – адлюстраванне, якое прымаецца, захоўваецца, перапрацоўваецца, узнаўляецца і выкарыстоўваецца ў працэсах кіравання (кіраванне – пераклад сістэмы са стану, які менш задавальняе дадзеным умовам, у стан, што больш задавальняе дадзеным умовам). Гавораць: «Хто валодае інфармацыяй, той кіруе светам». Пераўтварыць свет магчыма толькі на аснове ведаў (веды – інфармацыя, аформленая па законах трох філасофскіх дысцыплін: логікі, семантыкі і прагматыкі). Веды – вынік «засваення» свету чалавекам у працэсе адукацыі. Працэс пераўтварэння свету на аснове ведаў назавём працай. Праца, як

і любая з'ява, уяўляе працэс, у якім можна вылучыць дзве супрацьлегласці: дзейнасць і творчасць. Пад дзейнасцю будзем разумець працэс пераўтварэння чалавекам свету ў паўсядзённым жыцці (як правіла, заснаваны на інфармацыі), а яго вынікам – цывілізацыю. Пад творчасцю будзем разумець працэс пераўтварэння чалавекам свету, заснаваны на ведах, а яго вынікам – культуру.

Як жа адбываецца (або не адбываецца) фарміраванне і трансфармацыя светапогляду ў плоскасці адукацыйнага працэсу? Вышэй мы азначылі тры тыпы светапогляду. Адным з іх з'яўляецца аналітычны. А. Алеша Шварц і П. Рональд Швепе ў папулярным выданні «Уводзіны ў філасофію» пішуць: «На Захадзе пануе мысленне, якое падкрэслівае ўсё дакладнае, аналітычнае, лінейнае» [2, с. 53]. Пачатак такому тыпу мыслення, дыферэнцыяцыі навуковых ведаў паклаў Р. Дэкарт. Да яго навука была сінкрэтычнай, пераняўшы антычны канон. Ужо да сярэдзіны XX ст. стала ясна, што аналітычны метад, які ўяўляе ў навуцы картэзіянскую парадыгму, заснаваны на расшчапленні цэлага на часткі, вычарпаў свой патэнцыял. Яго развіццё да таго ж суправаджалася стратай духоўнасці чалавека ў грамадстве, што не магло не быць па прычыне узурпацыі розумам кагнітыўнай прасторы творчага суб'екта. Аналітычны метад, рассякаючы складанае на простыя складальныя, збядняе жыццё. Межы аналітычнага метаду выяўляюцца сёння практычна ва ўсіх сферах духоўнай вытворчасці. Гэта добра відаць пры разглядзе актуальных філасофскіх праблем, вывучэнні такіх складаных сістэм, як экасістэмы і г. д. Што можна гаварыць у такім разе аб магчымасцях аналітычнага мыслення пры рашэнні праблем чалавека і соцыуму? Вядома ж, аб іх абмежаванасці. Але ці можна на гэтай падставе «забараняць» (як гэта робяць шматлікія філосафы) падобныя тыпы мыслення сёння? Натуральна, што нельга і немагчыма.

Класічная навука развівалася аналітычна, дасягнула росквіту і падышла да новага этапа свайго росту. Іншымі словамі, працэс дыферэнцыяцыі пазнання змяніўся на працэс яго інтэграцыі. Дж. Клір, аўтар адной з вядомых версій агульнай тэорыі сістэм, у сваёй лекцыі ў Маскве, якая адбылася яшчэ ў сярэдзіне 90-х гг. мінулага стагоддзя, адзначыў, што сучасная навука стала двухмернай. Іншымі словамі, сучасная навука, нараўне з традыцыйнымі ведамі, «здабытымі» з дапамогай аналітычнага мыслення, утрымлівае веды трансдысцыплінарныя, агульнанавуковыя, агульнасістэмныя. І гэтыя інтаграцыйныя веды – вынік працэсу інтэграцыі навукі, заснаванага на сінергетычным стылі мыслення. З гэтым нельга не пагадзіцца.

У той жа час можна сцвярджаць і тэарэтычна даказаць, што сінергетычнае мысленне – не панацэя для рашэння сучасных праблем чалавецтва. Аналітычнае мысленне, як і сінергетычнае, абумоўлена развіццём грамадска-гістарычнай практыкі, а не з'яўляецца выдумкай «абмежаваных» (або «неабмежаваных») навукоўцаў. Гэта два бакі, якія ўзаемна дапаўняюць, абумаўліваюць, адмаўляюць і ў адзінстве ўтвараюць навуковае мысленне. Тут можна гаварыць аб двух шляхах развіцця навуковых ведаў: унутраным і знешнім. Іх наяўнасць агульнапрызнана. Калі першы шлях заснаваны на аналітычным мысленні, то другі – на сінергетычным. Варта падкрэсліць іншае, на наш погляд, больш галоўнае, чым вышэйсказанае, тое, што як сучаснае аналітычнае мысленне, так і сінергетычнае, немагчыма без сродкаў і метадаў матэматыкі.

Палажэнне Канта аб тым, што навука дасягае дасканаласці толькі з дапамогай матэматыкі, сёння ўжо стала аксіёмай [3], як і палажэнне аб тым, што матэматызацыя навукі з'яўляецца аб'ектыўнай заканамернасцю яе развіцця. На іх падставе намі не толькі пастуліравана палажэнне – матэматыка з'яўляецца метадалагічнай асновай канстытуявання навуковага даследавання, – але і распачата спроба доказу яго праўдзівасці [4]. Справа ў тым, што рух пазнання ад простага да складанага, ад адзінкавага да агульнага ў выніку пераходу ад колькаснага да якаснага аналізу з'яўляецца аб'ектыўнай заканамернасцю. Таму рана або позна ў сувязі з запытамі практыкі, а таксама навукі, узнікае запатрабаванне ў прыцягненні сродкаў і метадаў матэматыкі для дакладнага колькаснага выразу асноўных характарыстык аб'екта, бо рамкі апісальных метадаў не могуць змясціць нарастальны аб'ём інфармацыі. Гэты пераход азначае, што ў навуцы адбываецца якасны скачок ад эмпірычнага даследавання да тэарэтычнага, які дазваляе на аснове ўжо наяўных даных рабіць абагульненні, правільныя высновы.

Такія навукі, як астраномія, фізіка і шматлікія іншыя, якія дасягнулі высокага тэарэтычнага ўзроўню, шмат у чым абавязаны матэматыцы. Калі на першых этапах іх развіцця матэматыка выконвала дапаможную ролю, гэта значыць ужывалася для апрацоўкі атрыманых даных, то ў выніку іх пераходу на матэматызаваны ўзровень рэалізуецца магчымасць усталявання ісціны з дапамогай сродкаў і метадаў матэматыкі.

Матэматызацыя навукі ёсць гістарычна развіццёвы працэс пранікнення сродкаў і метадаў матэматыкі ў іншыя навукі. Узаемадзеянне пэўных навук з матэматыкай у працэсе матэматызацыі здзяйсняецца ў розных формах, рознымі шляхамі і спосабамі і засноўваецца на тым, што кожная з навук, у тым ліку матэматыка, валодае такой асаблівасцю, якая адсутнічае ў іншых. Матэматыка даследуе формы без аналізу ўтрымання, у то час як іншыя – даследуюць змест, які ў дадзеныя формы ўвасабляецца. Больш та-

го, любая навука заўсёды імкнецца да дакладнасці і строгасці, адназначнасці і пэўнасці паняццяў, уводзімых ёю, лагічнасці разваг і доказнасці высноў.

Пытанне аб развіцці паняційнага апарату сучаснай навукі набывае адмысловую актуальнасць у сувязі з узрастаннем у ёй удзельнай вагі тэарэтычных ведаў. Гэта натуральна, бо развіццё любой навукі ідзе па лініі ўдакладнення старых паняццяў і адукацыі новых; іх руху ад менш абстрактнага да больш абстрактнага і ўсеагульнага. Чым абстрактней паняцці, якія складаюць яе паняційны апарат, тым вышэй узровень яе развіцця і, наадварот, чым вышэй тэарэтычны статус навукі, тым складаней і дасканалей яе паняційны апарат, тым глыбей узровень выкарыстаных ёю абстракцый.

І хоць выключную ролю ў гэтым працэсе іграюць нефармалізаваныя аперацыі, якія складаюць адну з асноўных бакоў навуковай творчасці; развіццё сучаснай навукі; яе паняційнага апарату немагчыма без ужывання агульных і дакладных матэматычных метадаў.

Сучасныя даследчыкі ўсвядомілі факт неабходнасці прыцягнення матэматыкі для рашэння сваіх праблем. Яны ўпэўніліся, што матэматыка, якая была адмысловым відам духоўнай дзейнасці, дазваляе выяўляць пазнавальныя магчымасці чалавека па тэарэтычным засваенні, разуменні і інтэрпрэтацыі рэальнасці. На наш погляд, яны не сумняваюцца, што сучасная матэматыка вызначае лёс роду чалавечага ў плане практычнага пераўтварэння быцця, тэхналагічнай і канструктыўна-матэрыяльнай дзейнасці (у прыватнасці, шляхам стварэння матэматычных тэорый і мадэлей калапсіруючых сістэм, да ліку якіх пры вядомых умовах можна аднесці і грамадства). Сёння практычна не засталося навук, якія ў той або іншай ступені не выкарысталі сродкі і метады матэматыкі ў сваім развіцці.

Да таго ж неабходна дадаць, што паралельна з інтэнсіўнай пабудовай тэарэтычных сістэм з дапамогай сродкаў і метадаў матэматыкі ў сучаснай навуцы паспяхова здзяйсняецца працэс інтэграцыі ведаў, бо развіты паняційны апарат спрыяе пошуку такіх агульных прынцыпаў, якія ляжаць у аснове сінтэзу разрозненых «старых» тэарэтычных сістэм у больш агульную сістэму, дзе яны выступаюць як узаемазлучаныя, узаемазалежныя элементы. Сучасная навука, хоць і ўключае ў сябе мноства розных галін ведаў, лік якіх бесперапынна павялічваецца, тым не менш, яна ўяўляе штосьці адзінае, адзіную цэласную сістэму ведаў, у якой развіццё кожнага элемента дадзенай сістэмы немагчыма без унутранага іх узаемадзеяння, без узаемадзеяння з усёй цэласнай сістэмай.

Становіцца відавочным, што далейшае развіццё навукі як цэласнай і ў той жа час складана дыферэнцыраванай сістэмы немагчыма без ужывання агульных і дакладных матэматычных тэорый. З іх дапамогай сёння адбываецца пошук агульных законаў развіцця сапраўднага свету, даследаванне праблем аб'екта і суб'екта, чалавека і прыроды, прыроды і грамадства, тэорыі і практыкі (традыцыйныя праблемы філасофіі). Такім чынам, матэматыка выступае універсальнай метадалогіяй навуковага пазнання, а працэс матэматызацыі – дзейснай формай сінтэзу навуковых ведаў.

Варта адзначыць, што ў сучаснай адукацыі нараўне з дыхатаміяй «веды дзеля ведаў» і «веды дзеляператварэння» адкрылася лагічная прастора для «матэматызаваных ведаў». Праблема матэматызацыі адукацыі чакае свайго рашэння. Тэарэтычная перадумова – гэта аналіз генезісу і структуры ўзаемадзеяння матэматыкі, педагогікі, псіхалогіі і іншых галін сацыягуманітарных ведаў, праведзены не шляхам падвядзення працэсу пад вядомыя катэгарыяльныя структуры, а заснаваны на фармальных і змястоўна-канструктыўных дасягненнях, якімі багатая сучасная вышэйшая школа. Пры гэтым прыярытэтным павінен быць пошук механізмаў узаемадзеяння адукацыйных і матэматычных гнасеалагічных установак, метадаў, канцэпцый і выяўленых вынікаў станоўчага характару.

Сёння больш за 2000 навук складаюць цэласную сістэму ведаў аб свеце і для ўсіх іх – магістральны шлях развіцця – іх матэматызацыя, вынікам якой выступаюць матэматызаваныя веды. А ў кантэксце адукацыйнага поля сучаснага навучэнца ўсяго толькі некалькі дзесяткаў навучальных дысцыплін, змест якіх аформлены, як правіла, на апісальным узроўні. Тое, што змест сучаснай навукі з неабходнасцю павінен праецыравацца ў змест адукацыйных праграм, з'яўляецца аксіёмай, а зрабіць гэта ў наш час немагчыма. Праецыраванне зместу навукі ў змест адукацыі можна толькі праз стварэнне цэласнай сістэмы навучальных матэматызаваных дысцыплін.

Неабходнасць радыкальных перамен у адукацыі на аснове стварэння цэласнай сістэмы матэматызаваных навучальных дысцыплін диктуецца не толькі тым, што матэматыка, прапаноўваючы рашэнне задачы абмену інфармацыі паміж навучальнымі прадметамі, дазваляе з адзіных пазіцый зірнуць на аб'ектыўную рэальнасць, але, і гэта галоўнае, спрыяе пераходу ад інфармацыйнага ўзроўню адукацыі да ўзроўню засваення ведаў і іх далейшай рэалізацыі ў практычным пераўтварэнні рэчаіснасці.

Таму мяркуем, што ў недалёкай будучыні для ўсіх даследчыкаў аксіёмай стане той факт, што без выкарыстання ў навучальным працэсе сродкаў і метадаў матэматыкі, інтэлектуальных тэхналогій, заснаваных на матэматычных ведах, немагчыма будзе падрыхтаваць ні высокакампетэнтнага спецыяліста, які адказвае сацыу-

му XXI ст., ні духоўна багатую асобу, якая ўмее знайсці сваё месца, вызначыць сваю ролю ў свеце, што дынамічна развіваецца.

Аналізуючы вышэйсказанае, можна зрабіць выснову, што матэматыка – гэта мова навукі; стыль, спосаб мыслення сучаснага даследчыка. З аднаго боку, гэта сапраўды так, але з іншага – матэматыка – гэта навука, метадалагічная і светапоглядная, значнасць якой у сістэме ведаў бесперастанку расце [4].

Па гэтай прычыне і матэматычная адукацыя ў метадалагічным плане з неабходнасцю павінна ўяўляць сабой адзінства творчай дзейнасці матэматыка па рэпрэзентацыі колькаснай акрэсленасці аб'ектыўнай рэальнасці, яе пабудовы ў пэўнай сістэме матэматычных сродкаў і актыўнасці суб'екта, які праз матэматычныя абстракцыі высокага ўзроўню канструюе наяўную на дадзены момант стану аб'ектыўную рэальнасць, але і прагназіруе яе змену і развіццё ў будучыні. Такім чынам, матэматыка выступае метадалагічнай асновай у пошуку прыёмаў і сродкаў не толькі пазнання, але і адукацыі, а творчая дзейнасць матэматыка ўяўляецца як узор, ідэал пазнавальнай актыўнасці суб'екта з мэтай пераўтварэння аб'ектыўнай рэальнасці.

Разгледзім светапогляд як погляд «у сябе». І калі погляд «па-за сябе» звязаны з пазнаннем і адукацыяй, то погляд «у сябе» больш зводзіцца да праблемы разумення чалавекам свайго месца, ролі, адносіны да свету і свету да сабе, да ўсведамлення сэнсу жыцця, свайго прызначэння, разумення духоўных каштоўнасцей. Пагадзіцеся, што гэтыя пытанні вырашае філасофія. Па гэтай прычыне разгледзім філасофію ў якасці метадалагічнай асновы фарміравання і трансфармацыі светапогляду.

Фарміраванне светапогляду асобы не абмяжоўваецца яе асабістым досведам, а працякае ў межах грамадска-гістарычнага працэсу, падпарадкоўваючыся тым жа грамадска-гістарычным заканамернасцям, што і станаўленне культуры ў цэлым. Старажытныя адзначалі, што сэнс жыцця чалавека ў рэалізацыі ім свайго прызначэння. А рэалізацыя прызначэння магчыма толькі ў разумнай дзейнасці нараўне з філасофскай культурай. І сёння філасофская культура з'яўляецца адным са складальных агульнай культуры, звязаная з сацыяльнай прыродай чалавека і з'яўляецца прадуктам яго разнастайных творчых здольнасцей. Філасофская культура разумеецца намі як механізм засваення і адаптацыі да ўмоў соцыуму і як спосаб гарманізацыі ўнутранага свету чалавека падчас сацыяльнага пазнання і дзеяння.

Адсутнасць належнай метадалагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, якія змянілі наш свет на аснове сваіх ведаў, з'явілася адной з прычын таго, што чалавецтва стаіць сёння на ўскрайку прорвы, на грані катастрофы. Але вінаваціць у гэтым толькі філосафаў і філасофію не варта. Мабыць, ніхто не запярэчыць, што філасофія даказала сваё права на існаванне. Ні філасофію, ні філосафаў нельга папракнуць у тым, што іх тэарэтычныя палажэнні апраўдвалі рабаванні і гвалт, подласць і несправядлівасць. Няма патрэбы гаварыць аб ролі філасофіі ў фарміраванні індывідуальнага мыслення. Не так ужо шмат працы спатрэбіцца на навуковае і аргументаванае рашэнне, што «ў чалавеку стольказ чалавечага, колькі ў ім філасофскага».

Філасофію як навуку да нядаўняга часу лічылі ўсеагульным метадам пазнання і пераўтварэння рэчаіснасці. Так яно было, мабыць, аж да так званай «перабудовы». Па меркаванні яе бацькоў, дыялектыцы як навуковаму метаду ўласціва арганічная сувязь у усім папярэднім філасофскім мінулым. І гэта правільна. Але разам з гэтай ідэяй з сярэдзіны 80-х гг. у філасофію «неўзаметку» пранікаюць дагматызм, сафістыка, метафізічнасць і г. д. Услед за гэтым метастазы пасіўнага сузірання рэчаіснасці, заснаванага на метадзе выхавання асобы на негатыўным, «ідэалагічнае» забеспячэнне як навуковых рашэнняў, так і відавочных сацыяльных пражэктаў тыпу – «цяперашняе пакаленне будзе жыць пры сацыялізме», пераўтварылі філасофію ў «партыйную» навуку, з назвай «марксісцка-ленінская». Вядома, даць назву можна ўсяму таму, што аб'ектыўна мае права на гэта: агульная тэорыя рэлятыўнасці А. Эйнштэйна, эвалюцыйная тэорыя Дарвіна, тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі Леніна, камуністычны маніфест Маркса, дыялектыка прыроды Энгельса і г. д. Але ўсё пералічанае – гэта навуковыя тэорыі, якія складаюць змест адпаведных навук. Вядома, кожнаму перыяду развіцця навукі можна даць вызначаную назву: «класічная фізіка Ньютана», «нямецкая класічная філасофія» і г. д. Але ў нашым выпадку назва «марксісцка-ленінская філасофія» сыграла з развіццём філасофіі як навукі вельмі злы жарт.

У першую чаргу, гэта датычыцца самой навукі філасофіі. Шматлікім «філосафам» стала больш падабацца тлумачыць або інтэрпрэтаваць (як вывучаць) ідэі Маркса, Энгельса і Леніна, чым развіваць саму філасофію. Аб'ектам вывучэння для філасофіі стаў не свет, з мэтай вывучэння і прагназіравання яго развіцця, а «абслугоўванне», «апраўданне» «вечна жывога» вучэння і яго практычнага ўвасаблення. Філасофія, пачынаючы з Сакрата, адрознівалася тым, што прапаведавала маральныя нормы вольнага чалавека, заснаваныя на сумленнасці, павазе, годнасці, кіруючы яго да высокага звання Грамадзяніна Бацькаўшчыны. І гэта было да Маркса і Энгельса, якія вызначылі яе статус і значнасць у цэласнай сістэме навук аб свеце [1].

Менавіта ў працах Маркса, Энгельса і Леніна філасофія паўстала як неад'емная частка

духоўнай культуры чалавецтва, як вышэйшая ступень абароны «ўлады нізоў», як навуковы метад сацыяльных ператварэнняў, які актыўна ўздзейнічае на гістарычны працэс і суб'екта, што яго ставарае. Яны ўпершыню вызначылі ролю і месца філасофіі ў сацыяльным жыцці як метадалогіі пазнання і практыкі. Сёння больш гавораць аб тэхналогіях match рознага кшталту дзейнасці. Тэхналогіі пэўнага навуковага даследавання або практычнай дзейнасці больш патрэбныя навукоўцу і практыку ў сваёй працы, чым «нейкія» філасофскія, бо з іх дапамогай яны дамагаюцца выдатных вынікаў. Але, як паказала гісторыя развіцця цывілізацыі, філасофія як метадалогія больш важная і важкая для ўсіх пераўтваральнікаў свету ва ўсе часы. Яе складальная вызначае з неабходнасцю і дастатковасцю поўнае чалавечае асэнсаванне зробленага, малых і вялікіх адкрыццяў, разумення іх ролі і значнасці не для «вузкай» цікавасці, а з пазіцый агульначалавечых каштоўнасцей.

На жаль, сёння «квітнее», дзякуючы маральнай і матэрыяльнай падтрымцы «новых», філасофія, заснаваная на веры, інтуіцыі і метафізіцы. Пры гэтым ад грамадазнаўцаў не патрабуецца ні сістэматызацыі ведаў, ні выкарыстання гістарычныя апрабаваных метадаў і законаў, апраўданне самых неймаверных (але патрэбных) вынікаў. Такога не дапускалі нават у эпоху сярэднявечча. Схаласты, напрыклад, былі абавязаны даказваць ідэю існавання Бога лагічна бездакорна, гэта значыць выконваючы законы фармальнай логікі. Праўда, у чалавечай гісторыі былі часы, калі «ісцінай» станавілася самая жахлівая хлусня. Гэтыя часы вярнуліся ў наш час толькі на невялікую частку планеты, ізаляваную ад большай яе часткі з двух бакоў вялікімі акіянамі, дзе народ жыве ў адведзеных яму рэзервацыях, а «вольны» толькі той, у каго самы большы ў банку рахунак. Імперыя ўлады злосці, хлусні і фальшу існуе ў XXI ст. на жахлівых сацыяльных парадоксах.

На самой справе, К. Тэнеброк сцвярджае, што каля мільёна выпускнікоў амерыканскіх школ не могуць толкам прачытаць атэстат сталасці, а 13% усіх 17-гадовых жыхароў афіцыйна лічацца непісьменнымі. У свой час Вялікі Арыстоцель памыляўся ў тым, што Сонца круціцца вакол Зямлі. Але сёння так лічаць больш за 20% жыхароў самай «дэмакратычнай» краіны свету. Нават дадзенае канстатаванне вышэйпералічаных фактаў зараджае сумненне ў тым, што навуковае рашэнне філасофскіх праблем адбываецца сёння толькі на Захадзе і без спасылкі на гэтых філосафаў, філосафам цябе лічыць не будуць. Гутарка тут не аб тым, каб адмовіцца ад зносін з імі, ад згадвання іх модных «шэдэўраў». Справа ў іншым, што нашы шматлікія «пераймальнікі» падобнай філасофіі пры пасадах, пры рангах, маюць вялікія магчымасці рэалізаваць падобнае «філасафаванне» на практыцы.

Можна пагадзіцца з меркаваннем, што не памыляецца толькі той, хто не працуе. Але трэба прызнаць тады і факт, што «памылка» «памылцы» розніца. Памылка сапёра варта яму жыцця. Памылка вялікага французскага матэматыка А. Пуанкарэ (ён лічыў, што матэматыка не навука, а «сачыніцельства» саміх матэматыкаў) каштавала яму таго, што сусветная слава ствральніка квантавай механікі «дасталася» А. Эйнштэйну, які выкарыстаў для гэтага створаны ім тэнзарны аналіз. Апошнюю «памылку» многія будуць прызнаваць, а іншыя не. Яна не відавочная, мала што і як памяшала Пуанкарэ, і дапамагло Эйнштэйну. А што гаварыць пра філасофскія «памылкі». Мы толькі сёння прызнаём, што вялікі Сакрат стаяў каля вытокаў нашай цывілізацыі, а ў свой час ён быў «дзяржаўным злачынцам», годным смерці.

Сёння ўжо цяжка знайсці «канцы» і «таго», хто вытруціў «душу» навуковага метаду – дыялектыкі. Як вядома, ядром гэтага метаду з'яўляецца закон адзінства і барацьбы супярэчнасцей, які паказвае на крыніцу развіцця свету. Такой крыніцай з'яўляецца ўнутраная, галоўная супярэчнасць, якая мае месца ў любой матэрыяльнай з'яве. У «развітым сацыялізме» яго не стала. Супярэчнасці «развітога сацыялізму» сталі неантаганістычнымі, перасталі быць прычынамі развіцця соцыуму. Любая супярэчнасць у сваім развіцці праходзіць вызначаныя этапы, а вось у «неантаганістычных» галоўным апынуўся этап «роўнасці» супрацьлегласцей. Той сэнс Роўнасці, Братэрства і Справядлівасці, навукова даказаны Марксам, быў неўзаметку падменены. На наш погляд, гэта філасофская фальсіфікацыя і складае галоўную канцэптуальную памылку, якая прывяла да сацыяльнай ганьбы 1991, 1993 гадоў і ўсяго нашага цяперашняга жыцця.

Галоўная філасофская катэгорыя Маркса – Праца, г. зн. спосаб вытворчасці. Праца, як і любая рэальнасць, мае сваю ўнутраную, галоўную супярэчнасць, якая складае крыніцу яе развіцця, яе дасканаласці. Адступім ад агульнапрынятых: «прадукцыйныя сілы» і «вытворчыя адносіны». Пра іх не пісаў толькі гультаяваты. Ніхто не будзе спрачацца, што ў любым аб'екце маецца мноства розных супярэчнасцей і ў розны час адны становяцца «галоўнымі», іншыя – «другараднымі». Тое, што ў любым спосабе вытворчасці можна вылучыць дзве супрацьлегласці – дзейнасць і творчасць, таксама цяжка спрачацца. Можна лагічна і семантычна даказаць, што цывілізацыя – вынік дзейнасці, а культура, як адзін з кампанентаў цывілізацыі, – вынік дзейнасці майстроў, гэта значыць творцаў. Іншымі словамі, можна сцвярджаць, што філасофія і сёння – ядро, аснова, каркас навуковага светапогляду.

Такім чынам, філасофія і матэматыка роўнавялікія па статусе і значнасці ў кантэксце фарміравання і трансфармацыі навуковага светапогляду.

*Літаратура*

1. *Адуло, Т.И.* Философия в системе духовной культуры / Т.И. Адуло. – Минск, 1993.
2. *Алеша А. Шварц, Рональд П.* Швеппе. Введение в философию / Алеша А. Шварц, Рональд П. Швеппе. – М.: Астрель. АСТ, 2005. – с. 53.
3. *Кикель, П.В.* Математизация научного знания / П.В. Кикель. – Минск, 1989.
4. *Кикель, П.В.* Математизация познания и социальный прогресс / П.В. Кикель. – Минск, 2001.

*Summary*

*In the article two ways of decision of the problem of outlook formation and its transformation are considered. It is a traditional way of studying thinking by means of studying structures of his material bearer. Availability, efficiency of the given direction and at the same time its limitation connected with impossibility of many problems decision, laying in a context of consciousness development are shown. The basic attention is concentrated on complex and inconsistent process of interaction of subject and society, which dominate the factor of outlook formation under modern conditions.*

*УДК 140:008*

***І.І. Таркан,***
*аспірант кафедры філасофіі БДПУ*

# КАНЦЭПЦЫІ ДЫЯЛОГА КУЛЬТУР ЯК САЦЫЯЛЬНАГА ІДЭАЛА Ў СУЧАСНАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМЦЫ

Адным з галоўных фактараў, які паўплываў на шырокую папулярнасць тэмы дыялога культур у сучаснай філасофскай і палітычнай думцы, сталі змяненні ў міжнародных адносінах канца ХХ ст. Як вядома, распад Савецкага Саюза азнаменаваў заканчэнне мадэлі, якая ахоплівала і абумоўлівала ўвесь спектр сусветных працэсаў больш за паўстагоддзя. Рэфлексія над змяненнямі, выкліканымі неабходнасцю фарміравання новай парадыгмы міжнародных адносін, прывяла да з’яўлення шэрага адпаведных тэорый і канцэпцый. Спецыфічнай асаблівасцю сусветнай палітыкі канца ХХ ст. стала ўзмацненне фактару культуры, што прывяло да змянення тыпу і статусу міжнародных суб’ектаў.

Новым суб’ектам глабальных працэсаў (пасля заканчэння «халоднай вайны») сталі выступаць не толькі класы, але і этнасы, а таксама цывілізацыі, на лакальным і глабальным узроўнях. Адсюль вынікае, што новая парадыгма міжнародных адносін павінна браць пад увагу, нараўне з сацыяльна-эканамічнымі рэаліямі, таксама фактар культуры. Рэакцыяй на гэтыя змяненні стаў выхад кнігі «Сутыкненне цывілізацый» амерыканскага палітолага Самуэля Ханцінгтана. Канцэпцыя, вылучаная Ханцінгтанам, мела на ўвазе даць фундаментальнае абгрунтаванне сучасных глабальных працэсаў, у ракурсе міжкультурнага ўзаемадзеяння. У гэтай працы аўтар указвае на змену суб’ектаў у міжнародных адносінах – месца класаў занялі этнасы і цывілізацыі. Сучасны свет, паводле Ханцінгтана, уяўляе сабой нешта накшталт калейдаскопа розных цывілізацый. Далей Ханцінгтан адзначае, што гістарычна адносіны паміж цывілізацыямі характарызваліся станам канфлікту і перманентнай барацьбы. Паколькі ў цяпершані час сусветныя цывілізацыі працягваюць кіравацца эгацэнтрычнымі інтарэсамі, галоўная праблема сучаснасці вырысоўваецца ў тым, каб знайсці сродкі і механізмы, якія б дазволілі вырашыць праблему міжцывілізацыйнай канфрантацыі, якая пагражае перарасці ў новы глабальны канфлікт. Хаця Ханцінгтан не робіць прамых указанняў на неабходнасць распаўсюджвання заходняй сацыяльна-эканамічнай сістэмы і культуры і на тое, якой мае быць будучая мадэль узаемадзеяння цывілізацый, тым не менш ідэя гегемоніі Захаду праходзіць лейтматывам праз усю яго канцэпцыю. Асноўным зместам ідэі «сутыкнення цывілізацый» Ханцінгтан робіць акцэнт не пошук механізмаў раўнапраўнага і свабоднага ўзаемадзеяння цывілізацый і культур, на неабходнасць узмацнення Захадам свайго патэнцыялу і стварэння глабальнай кааліцыі, здольнай супрацьстаяць імперыялістычным і мілітарысцкім планам ісламскай і канфуцыянскай цывілізацый [4].

Канцэпцыя Ханцінгтана аб сутыкненні цывілізацый паслужыла перадумовай для шырокай філасофскай дыскусіі па пытаннях глабалізацыі і ўзаемадзеяння цывілізацый. Адным з прынцыповых крытыкаў галоўнага ханцінгтанаўскага тэзісу з’яўляецца аўстрыйскі філосаф і юрыст Х. Кехлер. У сваіх артыкулах ён разгортвае яго імперыялістычны і каланіяльны падтэкст. Кехлер адзначае, што сутнасцю любой імперыялістычнай ідэалогіі з’яўляецца стварэнне і ўвядзенне вобраза «чужога». Гэты вобраз, як правіла, асацыіруецца з чымсці няправільным, ірацыянальным, хаатычным ці нават агрэсіўным. «Чужы» ўяўляе пагрозу свету сапраўдных каштоўнасцей, гармоніі і парадку, што апраўдвае прымяненне прывенціўных захадаў супраць яго, у тым ліку і выкарыстання ваеннай сілы. На гэтай дыхатаміі, у якой супрацьпастаўляюцца свет парадку і свет хаосу, грунтуюцца ўсе імперыялістычныя ідэалогіі, паколькі

наяўнасць нейкага «ворага» дае магчымасць абгрунтаваць неабходнасць экспансіяністцкай палітыкі. Згодна з крытычным аналізам Кехлера, канцэпцыя Ханцінгтана з'яўляецца разгорнутым варыянтам агульнай імперыялістычнай устаноўкі, якая падтрымлівае створаны вобраз ворага, што пагражае цывілізаванаму свету.

Кехлер адзначае, што пасля распаду Савецкага Саюза ідэолагі неакаланіялізму перанеслі вобраз ворага на дзяржавы ісламскай і канфуцыянскай цывілізацый. Наконт гэтага аўстрыйскі філосаф піша, што Самуэль Ханцінгтан, мае на ўвазе арыенталісцкія стэрэатыпы ірацыянальнасці, фанатычнасці і агрэсіўнасці ісламу [5]. У гэтым кантэксце ханцінгтанаўскі тэзіс аб глабалізацыі каштоўнасцей ліберальнай дэмакратыі адпавядае імперыялістычным інтарэсам індустрыяльна развітых дзяржаў. Іх рэалізацыя ажыццяўляецца за кошт пашырэння сфер эканамічнага і геапалітычнага ўплыву найбольш магутных дзяржаў. Аднак такое пашырэнне немагчыма без ідэалагічнага абгрунтавання яго перадумоў, чаму спрыяе канцэпцыя Ханцінгтана аб пагрозе мірапарадку з боку некаторых цывілізацый. Дадзеная канцэпцыя, што выступае ідэалагічнай абалонкай неакаланіялізму, апраўдвае два моманты: па-першае, неабходнасць выкарыстання мілітарысцкіх метадаў для прадухілення знешняй пагрозы, па-другое – распаўсюджванне каштоўнасцей ліберальнай дэмакратыі і рыначнай эканомікі як фундаментальных асноў любога сацыяльнага парадку.

Аднак абгрунтаванне антаганізму паміж культурамі як ідэі, якая апраўдвае ваенна-палітычнае і эканамічнае ўмяшанне, прыводзіць да абвастрэння рэальнага міжкультурнага супрацьстаяння і пагрозы ўзнікнення новых ачагоў. Пагроза сутыкнення цывілізацый характарызуецца тым, што супрацьлеглыя бакі кіруюцца ірацыянальнымі матывамі, заснаванымі на радыкальным супрацьпастаўленні двух аспектаў светаразумення. Логіка культурнага антаганізму зводзіць да мінімуму магчымасць успрымання «другога» як раўнапраўнага партнёра, інтарэсы і перакананні якога маюць не меншае значэнне, чым мае ўласныя. У процівагу гэтаму, светапогляд і практыка «другога» ўяўляюцца як нешта, што пазбаўлена рацыянальнага сэнсу. Гэтым абумоўлена жорсткасць і бескампраміснасць міжкультурных і міжрэлігійных войнаў, якія суправаджаюцца поўным знішчэннем прадстаўнікоў супрацьлеглай рэлігіі ці этнасу. Пры ўключэнні ідэі «сутыкнення цывілізацыі» ў сучасны палітычны дыскурс развітыя дзяржавы пагражаюць значна паглыбіць і пашырыць культурныя перадумовы міжнародных канфліктаў.

Рэакцыяй на канцэпцыю Ханцінгтана стала вылучэнне ідэі дыялога цывілізацый як альтэрнатыўнай магчымасці міжнародных зносін. У другой палове 90-х гг. яна атрымала шырокае абгрунтаванне ў працах аўстрыйскага філосафа Х. Кехлера. Згодна з дыялагічнай філасофскай традыцыяй, агульнай асновай міжкультурных канфліктаў з'яўляецца несупадзенне ва ўяўленнях аб свеце, што можа прыводзіць да зусім розных дзеянняў двух і больш бакоў у дачыненні да вырашэння агульных пытанняў, гэта значыць, неадпаведнасці паміж нашымі чаканнямі ў адносінах да «другога» і вынікамі практыкі. Паколькі неразуменне паміж культурамі з'яўляецца карэннай прычынай іх антаганізму, то неабходна выкарыстанне метадалогіі, якая б дазваляла пераадольваць адчужэнне паміж living рознымі культурамі. З гэтай мэтай Кехлер звяртаецца да герменеўтычнай філасофіі Х.Г. Гадамера.

Канцэпцыя Гадамера, якую можна разглядаць у кантэксце агульнай дыялагічнай традыцыі, зыходзіць з пастулату, што існуе дзве магчымасці ўспрымання быцця. Першая магчымасць прадугледжвае наяўнасць нейкай універсальнай мадэлі, якая цэнтралізуе і ўпарадкоўвае ўсе існуючыя з'явы, другая магчымасць – гэта дачыненне да свету як мноству светаў. У межах праблемы ўзаемадзеяння культур першая ўстаноўка вядзе да экстрапаляцыі каштоўнасцей і ідэалаў якой-небудзь адной культуры на астатнія, палітычным эквівалентам якой з'яўляецца імперыялізм. Другая магчымасць мае на ўвазе ўспрыманне ўласнай культуры як аднаго з варыянтаў быцця, нараўне з якім існуе мноства прынцыпова іншых магчымасцей самастанаўлення і самаразвіцця. Паколькі сучасная этыка ўзаемадзеяння цывілізацый патрабуе пераходу ад парадыгмы перавагі і гегемоніі, да парадыгмы раўнапраўя і ўзаемапавагі, то ідэя разнастайнасці культур найбольш адэкватна адлюстроўвае гэта патрабаванне

Аднак цярпімасць да іншых цывілізацый яшчэ не прыводзіць да рэальнага суіснавання з імі. Ідэя суіснавання прадугледжвае прызнанне нейкага недахопу, абмежаванасці ўласнага існавання. Іншымі словамі, «другі» набывае значнасць толькі ў тым выпадку, калі станаўленне майго ўласнага быцця немагчыма без дапаўнення яго іншым. Такім чынам, анталагічным фундаментам герменеўтычнай філасофіі з'яўляецца тэзіс аб разнастайнасці магчымасцей быцця. Гэты тэзіс, у сваю чаргу, вынікае з ідэі абмежаванасці ўласнага існавання і неабходнасці яго поўнай рэалізацыі праз «другога».

Наступны момант, які трэба зразумець, тычыцца працэсу ўзаемадзеяння з «другім». Прызнанне «другога» як партнёра для дасягнення высокага ўзроўню ўсведамлення, дапушчэнне таго, што ўласнае існаванне залежыць ад «другіх», вылучае пытанне аб існасці міжсуб'ектнага ці міжкультурнага ўзаемадзяння. Герменеўтыку Гадамера адрознівае тое, што дыялог з другім не з'яўляецца статычным, мае на ўвазе дылектычную сувязь паміж уласным разуменнем і разуменнем «другога». Дыялог з культурамі праду-

гледжвае не проста разуменне другіх культур, а прыводзіць да ўзаемнай актуалізацыі культур адна для адной. У працэсе такога дыялога сістэма каштоўнасцей адной культуры ўспрымаецца не толькі як перадумова для адрозніванія культур, але і для іх узаемапранікнення. Каб падкрэсліць дыялектычную спецыфіку дыялога культур, Кехлер, нараўне з паняццем «міжкультурны дыялог», уводзіць яшчэ два паняцці – «транскультурнага» і «кроскультурнага дыялога». У першым паняцці адлюстроўваецца выхад культуры за межы ўласнай сістэмы, які ажыццяўляецца праз другую культуру, у выніку чаго дасягаецца прынцыпова новая пазіцыя ў адносінах да быцця. У сваю чаргу, паняцце «кроскультурнага дыялога» ўказвае на тое, што ён рэалізуецца толькі праз іншую культуру, выражае ўзаемную залежнасць каштоўнасных сістэм камунікатуючых культур [6]. Такім чынам, субстанцыяльнай асновай ідэі культурнай разнастайнасці з'яўляецца абмежаванасць уласнай сістэмы каштоўнасцей, што патрабуе пашырэння гэтай сістэмы праз светаразуменне ў другой культурнай традыцыі.

Далей Кехлер вызначае тыя каштоўнасці, якія павінны скласці аснову будучай сістэмы міжнароднага права культур і цывілізацый. Так, з палажэння аб разнастайнасці культур філосаф выводзіць неабходнасць адказу ад ідэалогіі панавання ці місіянерства і прыняцця каштоўнасцей цярпімасці і культурнай свабоды як асноватворных перадумоў раўнапраўя і развіцця культур. Зыходзячы з ідэі самаразвіцця як дыялектычнага і дыялагічнага працэсу, Кехлер піша аб пераацэнцы тэзісу аб «чуждасці» ці «другасці» іншай культуры ці цывілізацыі. Хаця іншая культура з'яўляецца прынцыпова адрознай ад уласнай, гэта не павінна прыводзіць да антаганізму, іх адчужэння адна ад адной. «Чуждасць» іншых культур – гэта унікальная магчымасць для больш яснага і глыбокага крытычнага ўсведамлення ўласнай сістэмы каштоўнасцей. Такім чынам, паводле канцэпцыі Кехлера, аснову будучых міжцывілізацыйных адсносін павінны складаць разнастайнасць і адзінства культур і цывілізацый. Першае ўключае ў сябе адказ ад устаноўкі на гегемонію і прыняцце ідэі свабоды культур, другая каштоўнасць азначае магчымасць выяўлення універсальных асноў глабальнага суіснавання культур, нягледзячы на іх адрозненне адна ад адной.

З вышэйпрыведзеных патрабаванняў Кехлер звяртае ўвагу на аб'ектыўныя фактары, якія спрыяюць і перашкаджаюць магчымасці транскультурнага дыялога. Па-першае – гэта рэформа сусветнай сістэмы адукацыі, якая павінна быць накіравана на тое, каб зрабіць зразумелымі каштоўнасці і светаразуменне другіх цывілізацый, пры гэтым выключаюць любыя формы культурнай «выключнасці» і «этнацэнтрызму». Адной з галоўных задач для рэалізацыі гэтай мэты з'яўляецца ачышчэнне школьных падручнікаў ад ілжывых стэрэатыпаў аб іншых культурах. Па-другое, трэба прызнаць, што еўрацэнтрысцкія ўстаноўкі з'яўляюцца «галоўнай падкормкай для культурнага шавінізму і, разам з эканамічнымі інтарэсамі, – карэннай прычынай імперыялістычнай агрэсіі на працягу стагоддзяў аж да сучаснай эпохі «новага сусветнага парадку» [6]. Па-трэцяе, патрабуецца аб'ектыўная, нейтральная, пазбаўленая стэрэатыпнага зместу, прэзентацыя каштоўнасцей іншых культур сродкамі СМІ. Па-чацвёртае, для ператварэння ўзаемадзеяння цывілізацый на сучасным этапе іх развіцця ў транскультурны дыялог неабходна змяніць глабальныя эканамічныя працэсы, якія поўнасцю вызначаюцца індустрыяльнымі дзяржавамі Захаду [6]. Эканамічнае ўздзеянне на дзяржавы, якія належаць да незаходняй цывілізацыі, вядзе да парушэння міжкультурнага дыялога. Фактар эканомікі дазваляе абмяжоўваць дыялагічнае поле толькі вузкім колам вызначаных дзяржаў, якія могуць адстойваць і распаўсюджваць каштоўнасці, адпаведныя іх палітычным інтарэсам. Адсюль вынікае патрабаванне стварэння ўмоў глабальнага эканамічнага балансу як асновы раўнапраўнага міжкультурнага дыялога.

Вастрыня праблемы дыялога цывілізацый пацвярджаецца дыскусіямі, якія разгарнуліся на вышэйшым палітычным узроўні. У пачатку XXI ст. каардынуючую ролю па вырашэнні гэтай праблемы ўзяла на сябе ААН. Такім чынам, 1998 і 2001 г. былі аб'яўлены «Годам дыялога паміж цывілізацыямі», штогод прымаліся адпаведныя рэзалюцыі, якія абвяшчалі дыялог паміж цывілізацыямі галоўнай каштоўнаснай устаноўкай фарміруючайся глабальнай прасторы. З гэтага часу ААН рэгулярна праводзіць форумы, прыцягвае вядучых палітыкаў заходніх і ўсходніх дзяржаў для абмеркавання гэтай праблемы.

Каардынатары праграмы «Дыялог паміж цывілізацыямі» ў якасці першачарговай задачы яе рэалізацыі вызначаюць дасягненне ўзаемаразумення паміж культурамі, а ў якасці канчатковай вышэйшай мэты – стварэнне глабальнай цывілізацыі. Наконт гэтага Кофі Анан у сваёй прамове на факультэце міжнародных адносін ва універсітэце Сетан-Хола ў 2001 г. адзначыў, што галоўным вынікам дыялога культур павінны стаць пераадоленне неразумення паміж сусветнымі цывілізацыямі, знаходжанне тых агульных каштоўнасцей, якія могуць стымуляваць аб'яднанне ўсяго чалавецтва ў глабальную цывілізацыю [3]. У гэтай сувязі прадстаўнік Генеральнага сакратара ААН Джандаменіка Піка вылучае наступныя важныя аспекты дыялога: крытычнае пераасэнсаванне паняцця «ворага» і стварэнне палітычнай культуры, у якой будзе адсутнічаць вобраз ворага; зацікаўленасць цывілізацый ва ўзаемазалежным свеце – устаноўка сусветных цывілізацый на цэнтрысцкую (еўропа-, інда-, ісламa-, кітае-) пазіцыю можа прывесці да іх глабальна-

га сутыкнення; саюз цывілізацый будзе заснаваны на пошуку вырашэння агульных праблем, у тым ліку і глабальных, замест саюзаў, заснаваных на ідэалогіі [2].

У якасці адной з галоўных перадумоў для ўзнікнення міжкультурнага ўзаемаразумення і яе функцыяніравання як механізма выступае наяўнасць агульных, глабальных каштоўнасцей, якія б дазволілі выявіць адзінства і несупярэчлівасць сярод універсалій, якія належаць розным культурам. На гэту ідэю падчас сустрэчы вядучых расійскіх вучоных з Д. Піко, арганізаванай С. Капіцай, звярнулі ўвагу В.Г. Хорас і В.С. Мяснікоў. Прафесар Інстытута Далёкага Усходу, В.С. Мяснікоў, адзначыў, што ідэя поліцэнтрычнасці цывілізацый патрабуе выпрацоўкі шкалы агульначалавечых каштоўнасцей, што прадугледжвае наяўнасць нейкага механізма сінтэзу розных культур. Дырэктар Інстытута праблем развіцця мадэрнізацыі пры Інстытуце сусветнай эканомікі і міжнародных адносін В.Г. Хорас у сваім выступленні адзначыў, што сістэма каштоўнасцей заходняй цывілізацыі, якія становяцца глабальнымі, павінна дапаўняцца каштоўнасцямі з іншых цывілізацый [1]. Каштоўнасці, якія выступаюць асновай узаемаразумення, могуць у будучым стварыць умовы для ўзнікнення і падтрымкі міжкультурнай салідарнасці. Супярэчлівасць гэтага пытання заключаецца ў тым, што прыняцце агульначалавечых каштоўнасцей магчыма толькі тады, калі яны будуць адлюстроўваць спецыфічныя інтарэсы і сацыякультурны вопыт кожнай існуючай цівілізацыі, гэта значыць калі агульнае мае на ўвазе магчымасць існавання асабістага. У іншым выпадку будзе адбывацца глабальная экстрапаляцыя каштоўнасцей адной цывілізацыі і ў выніку нівеліраванне каштоўнасцей іншых цывілізацый, што назіраецца у межах сучаснага працэсу глабалізацыі. Адюль вынікае, што будучая мадэль міжнародных адносін павінна гарантаваць кожнай цывілізацыі магчымасць удзелу ў фарміраванні агульначалавечых каштоўнасцей і ідэалаў і іх сінтэзу ў адзіную сістэму універсалій сусветнага грамадства.

Такім чынам, у канцы XX ст. ідэя дыялога культур выходзіць за межы чыста філасофскага кантэксту і набывае шырокі рэзананс у дыскусіях па пытаннях сусветнай палітыкі. Інтарэс да гэтай праблемы з боку палітычных лідэраў, няўрадавых арганізацый, а таксама ААН дазваляе гаварыць аб дыялогу культур як сацыяльным ідэале міжнародных і міжцывілізацыйных адносін. Неабходнасць дасягнення ўзаемаразумення паміж living цывілізацыямі, іх аб'яднання з мэтай вырашэння глабальных і лакальных праблем, распрацоўкі канвенцыі глабальных каштоўнасцей, а таксама фарміравання адзінай, агульначалавечай цывілізацыі – гэтыя пытанні, якія абмяркоўваюцца сусветным грамадствам, актуалізуюць праблему ўзаемнай інтэграцыі культур. У дадзеным выпадку сінтэз культур выступае ў якасці важнай складальнай у механізме бесканфліктнага ўзаемадзеяння і суіснавання сусветных цывілізацый, што дазваляе выявіць агульныя, універсальныя асновы і дасягнуць неабходнага кансэнсусу паміж імі.


*Літаратура*

1. Встреча с Джандоменико Пикко, Личным представителем Генерального секретаря ООН по Году диалога между цивилизациями // http://www.nikitskyclub.ru/articlehp?idpublication=7&idssue=11
2. Год диалога между цивилизациями под эгидой ООН. 2001. Общие сведения // http://www.un.org/russian/dialogue/basic.htm
3. Обращение Генерального секретаря Организации Объединенных Наций Кофи Аннана. В основе идеи «диалога между цивилизациями» лежат основополагающие ценности Организации Объединенных Наций // <http://www.un.org/russian/dialogue/sgstat.htm>
4. *Huntington, Samuel.* The Clash of Civilizations // http://www.bintjbeil.com/articles/en/d_huntington.html
5. *Koechler, Hans.* Muslim-Christian ties in Europe: Past, Present and Future. Second International Seminar on Civilizational Dialogue «Japan, Islam and the West» (Kuala Lumpur, 2–3 September 1996) // http://www.hanskoechler.com/ice.htm
6. *Koechler, Hans.* Philosophical foundations of civilizational dialogue: the Hermeneutics of Cultural Self-Comprehension versus the Paradigm of Civilizational Conflict. Third Inter-Civilizational Dialogue, University of Malaya 1997 «Civilizational Dialogue: Present Realities, Future Possibilities» (Kuala Lumpur, 15–17 September 1997) // <http://www.hanskoechler.com/civ-dial.htm>



*Summary*

*The article is devoted to conceptions of a dialogue of cultures in the contemporary philosophical and political thought. In the article these analyzed conceptions in context of modern global problems. It is noted that actuality of a dialogue of cultures for resolving these problems allows to speak about it as one of social ideals of the contemporary global society.*


*УДК 141.3*


***К.А. Успенскі,***

*старшы выкладчык кафедры народных інструментаў музычна-педагагічнага факультэта БДПУ*


## ЭСТЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФІЛАСОФІІ ХАЗРАТА ІНАЙЯТ ХАНА

У працах індыйскага музыканта і філосафа Хазрата Інайят Хана (1882–1927), прысвечаных шырокаму колу пытанняў, важнае месца займаюць тэмы, якія традыцыйна знахо-

дзяцца ў полі ўвагі эстэтыкі. Яны, аднак, асобна ім не вылучаюцца, што дазваляе эстэтычнай праблематыцы існаваць у яго вучэнні імпліцытна. Паколькі сам ракурс разгляду гэтых праблем уяўляе асаблівы інтарэс як на самім філасофскім узроўні, так і ў кантэксце ўсё больш актывізаванага працэсу дыялога культур, намі была зроблена спроба выучэння эстэтычнага складальніка ў тэкстах Інайят Хана і даследавання яго сутнасці. Трэба адзначыць, што нават само вучэнне індыйскага мысліцеля ў цэлым пакуль не станавілася аб'ектам сур'ёзнага навуковага даследавання. У якасці працы, дзе сістэмна разглядаецца спецыфіка духоўнага шляху Інайят Хана, яго асветніцкая дзейнасць і яе культурнае значэнне, а таксама сцісла выкладаюцца асноўныя погляды філосафа на светабудову і на чалавечае быццё, можна адзначыць кнігу яго паслядоўніка, у мінулым выдатнага нідэрландскага эканаміста Х.Й. Вітэвіна [1]. Але ў ёй эстэтычныя аспекты філасофіі Інайят Хана спецыяльна не аналізуюцца. З адносна блізкіх да прадмета нашага даследавання матэрыялаў, прысвечаных філасофска-эстэтычным уяўленням у суфізме[1], духоўнай традыцыі, якая з'яўлялася адной з важнейшых крыніц вучэння Інайят Хана, можна адзначыць працы А. Курбанмамадава [2] і В. Юнусавай [3], аднак аўтары праходзяць міма гэтай значнай фігуры суфійскай традыцыі ў XX ст.

Даследаванне эстэтычнага дыскурса вучэння Інайят Хана ўяўляецца важным і ў плане стымуляцыі і паглыблення філасофска-эстэтычнай рэфлексіі сучаснай мастацкай свядомасці, «эстэтычная» (нярэдка і антыэстэтычная) энергетыка якой часта накіравана не на сапраўдную экзістэнцыяльную творчасць, а на малазмястоўны несвядомы выплеск у форме так званых арт-практык ці масавай поп-культуры.

У сучаснай эстэтыцы існуе некалькі асноўных падыходаў да самога прадмета дадзенай навукі і, як вынік, да трактоўкі яе галоўнай, базавай, ключавой катэгорыі *эстэтычнага.* Напрыклад, О. Крыўцун фактычна атаясамлівае эстэтычнае з *мастацкім,* разумеемым як *пачуццёва выразнае,* абмяжоўваючы тым самым прадмет эстэтыкі сферай мастацтва [4]. Ю. Борэў адзначае, што ў працэсе развіцця дадзенай навукі прадмет эстэтыкі расшырыўся і ўключыў у сябе «эстетические свойства действительности, процесс эстетического освоения мира человеком, эстетическую рецепцию…» [5, с. 36]. А пад эстэтычным часцей за ўсё разумеецца (такое разуменне ідзе ў многім ад І. Канта) тая сфера суб'ект-аб'ектных адносін, у якой успрыманне аб'екта ці ўяўленне аб ім суправаджаецца бескарыслівым, незацікаўленым задавальненнем. Бадай, самае глыбокае, фактычна вылучаючае эстэтыку на ўзровень *метанавукі* (прынамсі, у сферы гуманітарыстыкі) азначэнне дадзена В. Бычковым, у якім яна абазначаецца як *навука аб гармоніі чалавека з Універсумам,* ці, падрабязней, «о неутилитарном созерцательном или творческом отношении человека к действительности, изучающей специфический опыт ее освоения (глубинного контакта с ней), в процессе (и в результате) которого человек ощущает, чувствует, переживает в состояниях духовно-чувственной эйфории, восторга, неописуемой радости, катарсиса, духовного наслаждения полную гармонию своего Я с Универсумом, свою органическую причастность к Универсуму в единстве его духовно-материальных основ, свою сущностную нераздельность с ним, а часто и конкретнее – с его духовной Первопричиной...» [6, с. 11].

Пры такім разуменні эстэтычны вопыт аказваецца амаль тоесным містычнаму трансперсанальнаму перажыванню духоўнага яднання ці зліцця з Боскім, Абсалютам, Першаасновай быцця, ці, дакладней, гэта містычнае перажыванне можа быць вызначана ў якасці вышэйшай ступені, кульмінацыі эстэтычнага вопыту. Дадзены тэзіс мае далёка ідучыя вынікі.

Паколькі вучэнне Хазрата Інайят Хана ўяўляе сабой творчае індывідуальнае пераасэнсаванне асноўных палажэнняў суфійскай традыцыі (а традыцыя гэта належыць да шэрага эзатэрычна і містычна арыентаваных), то цалкам натуральнай аказваецца канстатацыя сутнаснай *эстэтычнасці* вучэння ў цэлым. Больш таго, паколькі як суфізм, так і сам Інайят Хан не прадугледжваюць выключна рацыянальна-дыскурсіўнае спасціжэнне ключавых ідэй, а падразумяваюць таксама і сур'ёзную духоўную практыку іх экзістэнцыяльнага засваення, то дадзеная практыка можа быць абазначана ў якасці «*Aesthetica interior*»[2], гэта значыць яна мае самае непасрэднае дачыненне да эстэтычнага вопыту, нават у яго чыстым выглядзе. У такой эстэтыцы праяўляецца важнейшая, хоць і не часта фармулюемая, функцыя эстэтычнага ў культуры – *пературальная.* У першую чаргу, гэта пераўтварэнне мае адносіны да ўнутранай духоўнай субстанцыі, хоць не выключае (у наступнай творчай рэалізацыі вонкі) і ўзвышэння, прасвятлення, упрыгожвання навакольнага асяроддзя.

У вучэнні Інайят Хана, так як і ў нарматыўнай эстэтыцы, *прыгожае, прыгажосць* з'яўляецца асноўнай мадыфікацыяй эстэтычнага. «Есть один объект восхваления, и это – Красота, которая поднимает ввысь сердца ее почитателей…», –

[1] Суфізм – старажытная эзатэрычная традыцыя духоўнага ўдасканалення, якая ўзнікла на Сярэднім Усходзе і вырасла ва ўлонні ісламу, не з'яўляючыся, аднак, яму поўнасцю тоеснай. Больш таго, некаторыя яго адэпты сцвярджаюць, што суфізм толькі ў сваіх знешніх формах гістарычна звязаны з дадзенай рэлігіяй, але яго сутнасць ляжыць за межамі нарматыўнага ісламу.

[2] Паняцце ўнутранай эстэтыкі ўведзена В. Бычковым першапачаткова ў дачыненні да манаскіх практык сузіральнага жыцця.

падкрэслівае філосаф, які бачыў яе за ўсёй разнастайнасцю форм і аспектаў рэальнасці [7, с. 21]. Такая пазіцыя адпавядае і суфійскай традыцыі, бо ў суфізме Бог уяўляецца не толькі як абсалютная ісціна, але і як вечная, абсалютная прагажосць *(куль),* якая раскрываецца праз катэгорыю *вахдат аль-вуджуд,* што трактуецца як «пантеизм, но не как растворение бога в материальном мире, а наоборот, как растворение материального мира в боге» [2, с. 9]. З паняцця *куль* выводзіцца некалькі ўзроўняў прыгажосці, якія ў рознай ступені набліжаюцца да абсалютнай і з'яўляюцца канкрэтнымі ўвасабленнямі апошняй: прыгажосць прыроды, чалавека, яго ўнутранага свету і г. д. Прыгожае тут ляжыць у сферы трансцэндэнтальнай праблематыкі, што падкрэслівае метафізічны статус прадмета эстэтыкі ў прынцыпе. У сувязі з гэтым паміж эстэтычным зместам вучэння Інайят Хана і эстэтычнай тэорыяй выяўляецца універсальная і іманентная ідэнтычнасць самога іх прадмета: «Ты [тут – Вышэйшая Істота, Абсалют – *К.У.*] – сама Красота» [8, с. 110]. Ці: «Если бы мы только слышали голос красоты, которая привлекает нас в любых формах, то мы бы обнаружили,.. что за всем проявлением стоит совершенный Дух…» [9, с. 97]. Само эстэтычнае, такім чынам, з'яўляецца і вертыкальным (эйдэтычным), і фармальным разгортваннем *метафізічнага.*

Разуменне глыбіннай блізкасці мастацтва і духоўнай сферы, бачанне сутнасці мастацтва ў выяўленні, прэзентацыі аб'ектыўна існуючага духоўнага свету, канстатацыя рэальнасці кантакта мастака з гэтым светам у працэсе мастацкай творчасці характэрны для філасофіі Інайят Хана. А ўзаемаўплыў розных з'яў і ўзроўняў рэальнасці шляхам свайго вібрацыйнага складальніка з'яўляецца той вузлавой ідэяй, на якой засноўваецца ўяўленне аб уздзеянні мастацтва на чалавека.

Мастацтва, дзякуючы асобаму становішчу ў свеце, валодае даволі значнымі магчымасцямі перадачы энергій і станаў, якія знаходзяцца, па словах Інайят Хана, «как бы в них и за ними» [9, с. 38]. Твор мастацтва, адзначае філосаф, можа быць створаны з вялікім майстэрствам, аднак розум, псіхічная энергія мастака адлюстроўваюцца ў яго творы, і эфект гэтага твора аказваецца залежным не столькі ад знешніх эстэтычных параметраў, колькі ад якасці ўкладзеных у яго душэўных і духоўных сіл. «Лучше бы художник боялся создавать работы, – папярэджвае Інайят Хан, – которые могут вызвать что-либо нежелательное, потому что тогда бы он был более аккуратен; а если бы он пытался узнать эффект, который они вызывают, то научился бы различать» [9, с. 39]. Таму, на яго думку, недастаткова вывучаць толькі знешнія аспекты мастацтва; не менш, а магчыма і больш важным з'яўляецца спасціжэнне тонкіх вымярэнняў мастацтва, законаў і спосабаў яго псіхаэнергетычнага ўплыву на чалавека.

Відавочны для філосафа гаючы псіхатэрапеўтычны эфект высокага мастацтва. Духоўная сіла ці псіхічная энергія, скрытая ў такіх творах, узнімае вібрацыі ў дакрануўшыхся да іх, ачышчае псіхіку чалавека, вызваляе яе ад розных негатыўных эмоцый, адкрывае яго сэрца, абнаўляе свядомасць, пашыраючы перад ім межы эстэтычнага вопыту, у цэлым мяняе модус быцця асобы. Колер, гук, рытм, гармонія, слова валодаюць сакральным значэннем і дабратворна ўздзейнічаюць на душу чалавека, жывяць, лечаць і стымулююць яго.

У канцэпцыі мастацтва Інайят Хана праблеме яго ўспрымання чалавекам надаецца асаблівая ўвага. Сама спецыфіка халістычнага светаразумення не нясе на сабе адбітак жорсткага раздзялення суб'ект-аб'ектных адносін, характэрных для заходняй рацыяналістычнай думкі, таму, успрымаючы твор мастацтва, чалавек выступае не ў якасці аб'екта, які пасіўна ўспрымае ўздзеянне энергій, якімі «зараджаны» шэдэўр, а ў якасці арганічнага элемента, які неабходна ўключаны ў жывы працэс быцця мастацтва і ў значнай ступені вызначае сваім духоўным узроўнем, сваёй ступенню гатоўнасці да ўспрымання якасць адбываючагася сакральнага дзейства, якім з'яўляецца любы від мастацтва, асабліва музыка. Устаноўка слухача не толькі вырашае правільнае з эзатэрычнага пункту гледжання ўспрыманне музыкі, але і ставіць перад ёй функцыянальныя задачы – адаптавацца да ўмоў містычнага спосабу перажыванняў. У суфізме музыка, ўключаная ў працэс набыцця адэптам духоўнага вопыту, надзяляецца найвышэйшым статусам. Паколькі душа слухача знаходзіцца ў пастаянным руху, то музыка з'яўляецца каштоўнай для яго разнастайнасцю перадаваемых ёю псіхаэмацыянальных вобразаў. Пры гэтым яны аказваюцца ізаморфнымі тым містычным станам, якія адчувае ў працэсе свайго духоўнага ўзыходжання суфій. Таму слуханне адной і той жа музыкі будзе тым дасканалей, чым дасканалей духоўна-містычны вопыт слухача.

Сярод усіх відаў мастацтва Інайят Ханам асабліва выдзяляецца менавіта музыка. Ён лічыць яе «самым священным из всех искусств, ибо то, о чем искусство живописи не может говорить ясно, поэзия объясняет словами; но то, что даже поэт находит трудным для выражения в поэзии, выражается в музыке» [9, с. 99]. Прычына гэтага заключаецца ў тым, што душа, якая шукае духоўнае развіццё, знаходзіцца ў пошуках «бясформеннага Бога», а любое мастацтва, якое дзейнічае ўзвышана, утрымлівае ўсё ж пэўныя элементы, якія прадугледжваюць успрымаемую прасторавую ці часавую форму, і толькі музыка, «при всей своей красоте, силе, очаровании, может вознести душу над пределами формы… коснуться бесформенного» [9, с. 100, 125].

Больш таго, узносячы музыку, Інайят Хан прагаворвае тэзіс, які традыцыйнай мусульманскай свядомасцю не можа лічыцца дапушчальным. Гэта, дарэчы, падкрэслівае асобую пазіцыю, займаемую суфізмам у каардынатах нарматыўнага ісламу. У адным са сваіх разважанняў на тэму значнасці музыкі для духоўнага прасвятлення чалавека мысліцель ставіць яе на вышэйшую ступень не толькі ў адносінах да любога іншага мастацтва, але нават і ў адносінах да рэлігіі: «Музыка поднимает душу человека даже выше, чем так называемые внешние формы религии» [9, с. 99]. Праўда, ён тут жа агаворваецца, што дадзенае меркаванне не трэба разумець так, быццам музыка можа заняць месца рэлігіі, бо, з аднаго боку, не ўсякі чалавек настроены на тую «вышыню тону», у адпаведнасці з якой ён можа сапраўды атрымаць духоўную карысць ад музыкі, а з другога боку, далёка не любая музыка настолькі высокая, каб узвысіць чалавека ў той жа ступені, у якой гэта можа здзейсніць рэлігія. Аднак, як бы прымірае абедзве пазіцыі Інайят Хан, «для тех, кто следует по пути внутренней веры, музыка является существенной для духовного развития» [9, с. 100]. Музыка, пераканаиы філасаф, закранае найглыбейшыя ўзроўні чалавечай сутнасці, пранікаючы далей, чым можа пранікнуць любое іншае ўражанне знешняга свету.

Рэканструкцыя эстэтычных уяўленняў Хазрата Інайят Хана дазваляе тыпалагічна катэгарызаваць эстэтыку ў яго вучэнні як імпліцытную, інтэрыёрную, этычна інтанаваную, метафізічную і тэургічную, якая пастуліруе даступнасць для этычнага вопыту духоўна развітага індывідуума трансцэндэнтныя вымярэнні.

Канстытутыўныя катэгорыі яго эстэтыкі, якім у філасофіі Інайят Хана надаецца аб'ектыўнаідэалістычная інтэрпрэтацыя, падкрэсліваюць метафізічны статус яе прадмета. Прыгожае, з'яўляючыся сімвалам боскага ў эстэтычнай парадыгме вучэння, ляжыць у сферы трансцэндэнтальнай праблематыкі. Гармонія паўстае квінтэсенцыяй эстэтычнага вопыту. Узвышанапрыгожы, заснаваны на гармоніі, твор мастацтва прыпадабняецца да малітвы як узнясення і захаплення.

Сапраўдная задача мастацтва, у разуменні Інайят Хана, заключаецца ў тым, каб наблізіць чалавека да ўсведамлення Прыгажосці, тым самым падрыхтаваўшы яго да перажывання містычнага яднання з боскім. Такая канцэпцыя мастацтва, якое не столькі выражае перажыванні асобы (што больш характэрна для заходняй традыцыі), колькі з'яўляецца шляхам, які вядзе душу да раскрыцця яе сапраўднай сутнасці, быцця ў зліцці з цэласнасцю сусвету, пастуліруе новы тып мастацкай асобы ці суб'екта эстэтычнага ўспрымання.

*Літаратура*


1. *Witteveen, H.J.* Universal Sufism / H.J. Witteveen. – London: Vega, 2002. – 178 p.
2. *Курбанмамадов, А.* Эстетическая доктрина суфизма: (Опыт критического анализа) / А. Курбанмамадов. – Душанбе: Дониш, 1987. – 108 с.
3. *Юнусова, В.Н.* Философско-эстетические аспекты суфизма и их отражение в музыке / В.Н. Юнусова // Философия. Эстетика. Культурология: сб. науч. тр. – М.: Изд-во МГУ, 1995. – С. 107–111.
4. *Кривцун, О.А.* Эстетика: учебник / О.А. Кривцун. – 2-е изд., доп. – М.: Аспект Пресс, 2003. – 447 с.
5. *Борев, Ю.Б.* Эстетика: в 2 т. / Ю.Б. Борев. – 5-е изд., доп. – Смоленск: Русич, 1997. – Т. 1. – 576 с.: ил.
6. *Бычков, В.В.* Эстетика: учебник / В.В. Бычков. – М.: Гардарики, 2002. – 556 с.
7. *Инайят Хан, Х.* Путь озарения: сборник / Х. Инайят Хан. – М.: Сфера, 2000. – Серия «Суфийское Послание». – 336 с.
8. *Инайят Хан, Х.* Гайян / Х. Инайят Хан. – М.: Сфера, 2002. – 160 с.
9. *Инайят Хан, Х.* Мистицизм звука: сборник / Х. Инайят Хан. – М.: Сфера, 1997. – Серия «Суфийское Послание». – 336 с.



*Summary*

*In the article aesthetic aspects of the philosophy of Hazrat Inayat Khan are revealed. The essence of the aesthetics, implicitly produced in the Indian thinker's texts and its main traits are investigated. The principal aestheticness of the Inayat Khan's philosophy in whole is stated in the light of a new definition of an aesthetic object. As a result of it a mystic experience of unity with Absolute which is a final goal of teacher practical realization is interpreted as a culmination of aesthetic experience. The peculiarities of philosopher's comprehension of art, as a phenomenon that especially of music, are analyzed. Art, being included into the process of receiving of spiritual experience, is endowed by the highest status.*


---

*УДК 141.7*


***М.А. Кузняцова,***
*аспірант кафедры філасофіі БДПУ*


# КАНЦЭПЦЫЯ «ЗАПАДНІЗМУ» Ў ПРАЦАХ А.А. ЗІНОЎЕВА

Сярод аўтарытэтных даследчыкаў даволі распаўсюджаным з'яўляецца пункт гледжання, які заключаецца ў тым, што менавіта дзеянні Захаду, «халодная вайна» абумовілі распад Савецкага Саюза і крах сацыялізму ў краінах Усходняй Еўропы. Прафесійна і глыбока дадзенай праблемай займаўся выдатны рускі філосаф, сацыёлаг А.А. Зіноўеў. Ён стварыў уласную канцэпцыю «западнізму» – сацыяльнага ладу заходніх краін у цэлым. Ужываючы наву-

ковы падыход, ён экспліцыраваў такія паняцці, як «Захад», «заходняе грамадства», а таксама ўвёў у навуковы ўжытак уласныя тэрміны, якія адпавядаюць яго канцэпцыі «заходнізму».

Тэма заходнізму разглядаецца А.А. Зіноўевым практычна ва ўсіх яго працах, паколькі тэрмін «заходнізм» з'яўляецца адной з важнейшых катэгорый у сацыяльнай канцэпцыі гэтага выдатнага мысліцеля. «Словам "заходнізм" я называю сацыяльны лад сучасных краін заходняга свету, – піша вучоны, – я не называю сацыяльны лад гэтых краін словамі "капіталізм" і "дэмакратыя" таму, што гэтыя словы сталі шматсэнсоўнымі ідэалагічнымі выразамі, а не навуковымі тэрмінамі» [1, с. 330].

Кніга аб «заходнізме» была апублікавана ў 1993 г., аднак у іншых працах дадзеная канцэпцыя была дапоўнена і ўдакладнена. А.А. Зіноўеў меў магчымасць вывучаць заходняе грамадства дасканала, знутры. Аўтар абапіраўся на эўрыстычныя прынцыпы, выпрацаваныя ім у пачатку сваёй дзейнасці. Іх сутнасць заключаецца ў наступным: 1) любая і даволі шырокая сума інфармацыі, якая адносіцца да некаторага сацыяльнага аб'екта, утрымоўвае ў сабе ўсё тое, што неабходна і дастаткова для разумення сутнасці гэтага аб'екта; 2) самыя глыбінныя тайны асноўных сацыяльных з'яў не схаваныя дзесьці ў скляпах грамадскага будынка, за кулісамі палітычнай сцэны і ў сакрэтных установах, а, па сутнасці, ляжаць на паверхні [2, с. 7].

Навуковец сцвярджаў, што даследчыкі часта не звяртаюць увагу на інфармацыю грамадства і аб грамадстве, змешчанай у адкрытым доступе. Атрымаць найболей важкія і каштоўныя звесткі можна, калі быць больш уважлівым, абапірацца на відавочныя факты паўсядзённага жыцця. Аўтар не прэтэндаваў на стварэнне тэорыі заходняга грамадства, а выкладаў прынцыпы і ідэі ўласнага разумення Захаду. Аднак неабходна прызнаць, што канцэпцыя «заходнізму» даволі цэласная і мае закончаны характар.

Як пабочны назіральнік, А.А. Зіноўеў змог заўважыць у заходнім ладзе жыцця тыя аспекты, якія ігнаравалі менавіта заходнія даследчыкі, а таксама даў уласную інтэрпрэтацыю гэтым з'явам. Навуковец сцвярджае, што вызначэнне сацыяльнага ладу заходніх краін як капіталізм па іх эканамічнай аснове і як дэмакратыя па палітычнай сістэме – не адпавядае рэальнасці [2; с. 3].

Пры даследаванні любога сацыяльнага феномена неабходна абапірацца выключна на навуковы падыход – менавіта гэты прынцып з'яўляецца адным з вызначальных элементаў метадалогіі сацыяльнага пазнання А.А. Зіноўева. У прыватнасці, важны прынцып навуковага падыходу складаецца ў эксплікацыі паняццяў – лагічнай працэдуры, мэта якой дасягнуць пэўнасці і адназначнасці тэрміналогіі ў сацыяльным пазнанні [3, с. 50]. Экспліцыраваць паняцце «чалавечае грамадства» можна наступным чынам – гэта аб'яднанне людзей, якое займае і выкарыстоўвае вызначаную тэрыторыю, валодае параўнальнай замкнёнасцю і ўзнаўляецца як цэлае з пакалення ў пакаленне на працягу больш або менш доўгага часу [4, с. 18].

Цэнтральная роля падчас станаўлення сучасных заходніх грамадстваў, натуральна, належыць людзям. А.А. Зіноўеў разглядае іх як асаблівы тып людзей і вызначае сваім неалагізмам – «западоіды». Западоідам як асобам, фарміруючым заходні сацыяльны лад, уласцівы адметныя агульныя рысы, характэрныя ў найбольшай ступені менавіта для прадстаўнікоў заходняй цывілізацыі. Сярод асобасных якасцей прадстаўнікоў заходніх цывілізацый шматлікія аўтары вылучаюць наступныя: індывідуалізм, высокі інтэлектуальны і творчы ўзровень, знаходлівасць, практыцызм, дзелавітасць, ашчаднасць, канкурэнтаздольнасць, высокая ступень самаарганізацыі, пачуццё перавагі над іншымі народамі, імкненне кіраваць іншымі і здольнасць да гэтага [1, с. 331]. Канцэнтрацыя адзначаных уласцівасцей і якасцей больш высокая менавіта ў западоідаў. Яны прысутнічалі ў продкаў сучасных заходніх людзей, даказвалі сваю неабходнасць для асобных людзей і грамадства ў цэлым, паколькі менавіта людзі з вышэйзгаданымі якасцямі аказаліся больш жыццяздольнымі. Сродкі выхавання, культуры і ідэалогіі ўзмацнялі працэс культывацыі гэтых чалавечых якасцей [3, с. 308].

Такім чынам, паводле канцэпцыі А.А. Зіноўева, заходнізм – гэта складаны і цэласны сацыяльны феномен, у якім прысутнічаюць капіталізм і дэмакратыя, аднак як комплексная з'ява ён не зводзіцца толькі да якасцей эканамічнай і палітычнай сістэм заходніх краін. Гэта не проста сукупнасць якасцей, або адно з іншых яго ўласцівасцей, узятых паасобку, а адзінае цэлае, у якім скаардынаваны незлічоныя элементы, прычым скаардынаваны не кароткачасовымі і аднаактавымі распараджэннямі ўлад, а натуральна-гістарычным шляхам, як вынік жыццёвага вопыту мільёнаў людзей у мностве пакаленняў [4, с. 232].

Вызначым элементы, якія складаюць «заходнізм», паводле тэорыі А.А. Зіноўева. У сферы дзяржаўнасці – гэта дэмакратыя. Аднак не ўся дзяржаўнасць, а толькі яе частка. Вучоны наогул сцвярджае, што тэрмін «дэмакратыя» не з'яўляецца тэрмінам у сілу аморфнасці яго сэнсу. Справа ў тым, што існуе мноства азначэнняў дэмакратыі, аднак яны не ахопліваюць сэнсу дадзенага паняцця цалкам, а раскрываюць толькі асобныя яго бакі. Ён адзначае, што неабходна адрозніваць дэмакратыю як элемент дзяржаўнасці (дзяржаўную дэмакратыю) і дэмакратыю як сукупнасць прававых норм (прававую або грамадзянскую дэмакратыю). Дзяржаўная дэмакратыя ўключае спосаб фарміравання ўлады: яе

структуру і функцыяніраванне, выбарнасць органаў улады, падзел улад, афіцыйную апазіцыю, шматпартыйнасць і іншыя з'явы заходняй дзяржаўнасці. Грамадзянскую дэмакратыю складаюць прававыя нормы. Яны дэкларуюць правы і свабоды, сістэму прававых норм, якія забяспечваюць прававую ахову грамадзян і іх аб'яднанняў, а таксама сукупнасць устаноў, што гарантуюць захаванне гэтых норм [3, с. 311]. Аднак сферу дзяржаўнасці «заходнізму» складае не толькі дэмакратыя, але даволі магутная і стабільная частка дзяржаўнасці, якая знаходзіцца па-за дэмакратычнай часткай – адміністрацыйна-бюракратычны апарат, паліцыя, суды, турмы, сакрэтныя службы, іншыя ўстановы і арганізацыі, так або інакш звязаныя з дзяржавай. Па сутнасці, дэмакратычная частка заходнізму ўзнікае і функцыяніруе ў непарыўнай сувязі з недэмакратычнай часткай, і, у прынцыпе, немагчымая без яе [1, с. 333].

Асобнае месца ў канцэпцыі А.А. Зіноўева займае ідэалогія «заходнізму». Ужываючы выраз «заходняя (або заходнісцкая) ідэалогія», вучоны меў на ўвазе агульныя рысы ідэалогіі заходніх грамадстваў. На Захадзе шырока распаўсюджана меркаванне аб тым, што такой ідэалогіі не існуе. Пры гэтым ідэалогія атаясамліваецца ў выглядзе, што існавала ў СССР (з адзіным ідэалагічным вучэннем, якое навязваецца насельніцтву; пласт адзінага цэнтралізаванага апарату, які з'яўляецца часткай дзяржаўнага). Аднак адсутнасць у краіне адзінага дзяржаўнага ідэалагічнага апарату яшчэ не азначае адсутнасці ўсякага ідэалагічнага ўздзеяння на грамадзян той або іншай краіны. «Заходняя ідэалогія складалася стагоддзямі, натуральна-гістарычным шляхам, у агульнам працэсе духоўнага і культурнага развіцця народаў Захаду, а не навязаная кімсьці зверху як нешта гатовае... яна склалася па агульных законах заходнізму і як адэкватнае яму сацыяльнае утварэнне… [3, с. 364]. Ідэалогія заходнізму стваралася намаганнямі мноства філосафаў, сацыёлагаў, эканамістаў, навукоўцаў, сярод іх былі такія выдатныя мысліцелі, як Ф. Бэкан, Дж. Лок, Т. Гобс, Д. Дзідро, І. Кант, Г.В.Ф. Гегель і інш.

Як падчас фарміравання, так і ў сучасным стане ідэалогія заходнізму не з'яўляецца феноменам, аддзеленым ад навукі і культуры. У прынцыпе, яна нават не ўспрымаецца заходнімі людзьмі як ідэалогія, менавіта таму так шырока распаўсюджана меркаванне аб тым, што заходняе грамадства па-за ідэалогіяй. Заходняя ідэалогія арыентуе ўсведамленне людзей на пэўныя жыццёвыя выгады, імкнецца пераканаць іх у тым, што яны жывуць у найлепшых умовах.

Ідэалогія заходнізму не з'яўляецца ідэалогіяй нейкай пэўнай сацыяльнай групы, партыі або пласта. «Гэта ідэалогія пазагрупавая, пазакласавая, усеагульная…Гэта азначае, што ні адзін клас, ні адзін пласт, ні адна партыя, ні адна сацыяльная група не заяўляе аб ёй як аб сваёй ідэалогіі. Яна ўзнікае, захоўваецца і распаўсюджваецца як асаблівы і самастойны элемент грамадскага ладу» [3, с. 368]. У полі зроку ідэалогіі знаходзяцца ўсе члены дадзенага грамадства незалежна ад уласных палітычных і сацыяльных поглядаў і перакананняў, паколькі спажываюць прадукцыю ідэалогіі заходнізму ў СМІ, вучэбных установах. Атрымліваючы ідэалагічную інфармацыю, людзі самі з'яўляюцца носьбітамі ідэалогіі і таму не могуць пазбавіцца ад яе ў прынцыпе [3, с. 369].

Найважнейшымі элементамі катэгарыяльнага апарату А.А. Зіноўева і адпаведна ключавымі ў канцэпцыі «заходнізму» з'яўляюцца такія паняцці, як «человейник», «звышграмадства». Навуковец вылучаў тры ўзроўні арганізацыі «человейника», на якіх адбываецца эвалюцыйны пералом: 1. На ўзроўні заснавання звышграмадства. 2. На ўзроўні аб'яднання заходніх звышграмадстваў у адзіны «человейник» (які з'яўляецца звышцывілізацыяй у дачыненні да заходняй цывілізацыі). 3. На ўзроўні ўтварэння глабальнага чалавейніку з прычыны намаганняў заходняй цывілізацыі і пад яе ўладай [1, с. 440].

Разглядаючы другі ўзровень арганізацыі «человейника», А.А. Зіноўеў сцвярджае, што тэндэнцыя да інтэграцыі заходніх краін у адзіную цывілізацыю заўсёды мела месца. Другая сусветная вайна таксама была значным этапам інтэграцыі, паколькі ішла вайна заходняга свету супраць камуністычнага, вайна ўнутры заходняга свету за дамінаванне ў ім, гэта значыць за аб'яднанне заходнееўрапейскіх краін пад эгідай гітлераўскай Германіі. Тут мае месца наступная сацыяльная заканамернасць. У перыяд Другой сусветнай вайны вядучым «человейником», які ажыццяўляў аб'яднанне і знаходзіўся на шляху да звышграмадства была гітлераўская Германія. СССР, у сваю чаргу, іграў падобную ролю ў камуністычным свеце. Акрамя таго, іерархічнае (вертыкальнае) структураванне аб'яднаных краін мела месца як у Германіі, так і ў Савецкім Саюзе. І, нарэшце, аб'ядноўваючая краіна навязвала свой сацыяльны лад і сваю сацыяльную структуру іншым краінам.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і перамогі над фашысцкай Германіяй тэндэнцыя да інтэграцыі заходняга свету ўзмацнілася. Але гістарычную місію ў гэтым працэсе ўзялі на сябе Злучаныя Штаты Амерыкі. Заходнізм – гэта маладое сацыяльнае ўтварэнне з гістарычнага пункту гледжання, якое пачало фарміравацца пасля Другой сусветнай вайны і знаходзіцца ў стадыі развіцця.

Заходнізм як складаны сацыяльны феномен уключае ў сябе такі неад'емны працэс, як заходнізацыя. Пад ёй А.А. Зіноўеў разумее працэс навязвання нязаходным народам і краінам са-

цыяльнага ладу, эканомікі, палітычнай сістэмы, ідэалогіі, культуры і ладу жыцця, падобных тым, што існуюць у заходніх краінах [1, с. 449]. Мэта западнізацыі – уключэнне ў сферу ўплыву Захаду іншых краін. Аднак залучэнне іншых краін у заходнюю сферу на ўмовах раўнапраўнага партнёрства немагчыма ў выніку аб'ектыўных прычын – эканамічная няроўнасць, адрозны ад Захаду сацыяльны лад і г. д. [4, с. 241].

Такім чынам, усё сацыяльнае і эканамічнае жыццё сучаснага Захаду – гэта вынік працяглага перыяду гістарычнага развіцця. Адпаведна, менталітэт, сацыяльная псіхалогія грамадзян, якія ідэнтыфікуюць сябе са сваёй краінай, значная ступень патрыятызму, культура, эканамічнае жыццё іншых краін адрозніваецца кардынальна ад заходніх. Таму паскоранае развіццё па заходнім узоры не можа даць імгненных вынікаў.

З аднаго боку, незаходнія краіны імкнуцца пераняць асобныя элементы заходняга сацыяльнага ладу, з іншага – гэта заканамерны вынік западнізацыі як актыўнай аперацыі з боку заходніх краін. А.А. Зіноўеў вылучае наступныя меры, якія складаюць тактыку западнізацыі: дыскрэдытацыя асноўных атрыбутаў грамадскага ладу краіны, якую мяркуецца западнізаваць, яе дэстабілізацыя, прапаганда вартасцей заходняга ладу жыцця, стварэнне ілюзіі таго, што заходняе багацце дасягальна для іншых краін у найкарацейшыя тэрміны, калі іх краіна стане на шлях пераўтварэнняў па заходнім узоры і г. д. «Западнізацыя» ёсць асаблівая форма каланізацыі, у выніку якой у краіне прымусова ствараецца сацыяльна-палітычны лад каланіяльнай дэмакратыі. Па шэрагу прыкмет – гэта ёсць працяг ранейшай каланіяльнай стратэгіі заходнееўрапейскіх краін» [1, с. 450].

Такім чынам, знешняя палітыка заходніх краін, у тым ліку і «халодная вайна», – заканамерны вынік імкнення заходняй цывілізацыі да распаўсюджвання свайго ўплыву ў свеце.

«Халодная вайна» – глабальная, геапалітычная, эканамічная і ідэалагічная канфрантацыя паміж ЗША і іх саюзнікамі, з аднаго боку, Савецкім Саюзам і яго саюзнікамі – з іншага, доўжылася з сярэдзіны 1940 – да пачатку 1990-х гадоў.

Хоць Злучаныя Штаты Амерыкі і СССР ніколі не ўступалі ў прамое ваеннае супрацьстаянне, іх саперніцтва за ўплыў часта прыводзіў да ўсплёскаў лакальных узброеных канфліктаў па ўсім свеце. ЗША і Савецкі Саюз стварылі свае сферы ўплыву, замацаваўшы іх ваенна-палітычнымі блокамі, – НАТА пры вядучай ролі ЗША і Варшаўскі дагавор на чале з СССР.

Гэты канфлікт звалі «халодным», паколькі не былі задзейнічаны ўзброеныя сілы і не выкарыстоўваліся непасрэдна сапернікамі адзін супраць аднаго. Звышдзяржавы мелі магчымасць для выкарыстання ядзернай зброі, аднак лідэры гэтых краін разумелі, што ядзерны канфлікт прывядзе да знішчэння ўсёй планеты.

Мяркуючы аб прычынах распаду СССР, А.А. Зіноўеў падзяляў іх на дзве групы – знешнія і ўнутраныя. Асноўнай знешняй прычынай, якая абумовіла распад Савецкага Саюза, на думку навукоўца, была менавіта «халодная вайна». Фактычна гэты канфлікт з'явіўся працягам антысавецкай палітыкі заходніх краін, якая распаўсюджвалася ў культуры, палітыцы, дыпламатыі, эканоміцы і ідэалогіі. Выкарыстоўваліся розныя сродкі ўздзеяння на савецкіх людзей [5, с. 562].

У выніку, з пачаткам крызісу савецкай сістэмы захады па яго пераадоленні зводзіліся менавіта да рэформ і «перабудовы» савецкага грамадства па заходніх узорах. Навуковец сцвярджаў, што ў Савецкім Саюзе ў той момант не былі і не маглі быць у прынцыпе ніякія ўмовы для пераходу да капіталістычных сацыяльных адносін і да адпавядаючых ім палітычных форм, падкрэсліваў ненатуральны характар гэтых пераўтварэнняў [3, с. 456].

Падводзячы вынікі «халоднай вайны», відавочнай становіцца перамога заходняга блока ў гэтым канфлікце, супрацьстаянні дзвюх розных сацыяльных сістэм. СССР распаўся, а заходні свет умацоўвае свае пазіцыі на знешнепалітычнай арэне.

Такім чынам, А.А. Зіноўеў падрабязна, з навуковага пункту гледжання даследаваў розныя сферы заходняга грамадства, а таксама ступень уплыву заходніх краін на сусветнай арэне. Менавіта таму яго канцэпцыя «западнізму» мае ў цяперашні час вялікае значэнне для вызначэння знешнепалітычных стратэгій для краін былога СССР. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны на працягу дзесяцігоддзяў існаваў біпалярны свет, а ў выніку «халоднай войны» і перамогі заходняга блока ў гэтым канфлікце вызначыўся пераход да аднапалярнай мадэлі свету пры відавочным дамінаванні ЗША. Разуменне логікі гэтых знешнепалітычных трансфармацый і прычын паражэння савецкага блока неабходна для фарміравання і вызначэння знешнепалітычных стратэгій як для Расіі, так і для Беларусі. Найбольш аптымальнай з'яўляецца стратэгія, арыентавана на шматпалярны свет, паколькі палітыка ізаляцыянізму і спроба ўвайсці ў аднапалярны глабалізм не дазволіць гэтым краінам развівацца ў поўнай меры. Такі знешнепалітычны курс не адмаўляе аб'ектыўных працэсаў глабалізацыі ў галіне сацыяльна-эканамічнай і культурнай інтэграцыі краін сучаснага свету, а надае ёй іншы вектар – без відавочнага дамінавання ЗША.

Літаратура

1. *Зиновьев, А.А.* Фактор понимания / А.А. Зиновьев. – М.: Алгоритм, Эксмо, 2006. – 528 с.
2. *Зиновьев, А.А.* Запад. Феномен западнизма / А.А. Зиновьев. – М.: Центрполиграф, 1995. – 461 с.
3. *Зиновьев, А.А.* На пути к сверхобществу / А.А. Зиновьев. – М, 2000. – 638 с.
4. Феномен Зиновьева / сост. А.А. Гусейнов, О.М. Зиновьева, К.М. Кантор. – М.: Издательство «Современные тетради». 2002. – 400 с.

5. Зиновьев, А.А. Русская трагедия / А.А. Зиновьев. – М., 2006. – 608 с.

SUMMARY

*The article with reconstruction and analysis of Zinoviev's «zapadnizm»conception. The attention is paid to actual problems of modern social philosophy: such as globalization, the reasons of disintegration of the USSR, western countries' foreign policy in the context of the present day's historical process. The author of the article notes that solution of these problems is necessary for determination of foreign policy strategies of the post-soviet countries.*

*УДК 141.7*

***Н.У. Адаева,***
*аспірант кафедры філасофіі БДПУ*

# САЦЫЯЛЬНА-ФІЛАСОФСКІ АНАЛІЗ КАНЦЭПЦЫІ «НАСТАЎНІК» М.М. МАЙСЕЕВА

У пачатку XXI ст. чалавецтва канчаткова ўсвядоміла крызісны стан сучаснай тэхнагеннай цывілізацыі. Занепакоенасць будучыняй нашай планеты і яе насельнікаў прымушае навукоўцаў займацца пошукам прычын змены і разбурэння біясферы планеты, вывучэннем антрапагеннага ўздзеяння на біясферу Зямлі, якi прыняў глабальны характар, распрацоўваць праекты для выхаду са створанай сітуацыі – стратэгію выжывання чалавецтва. Абапіраючыся на ўжо наяўныя і атрыманыя веды аб законах развіцця прыроды і грамадства, людзі вяртаюцца да ідэі іх адзінства, усведамлення той акалічнасці, што чалавек з'яўляецца неад'емнай часткай светабудовы. Як унікальнае тварэнне прыроды, якое валодае магчымасцю разумна пераутвараць свет, чалавек, па словах У.І. Вярнацкага, ператварыўся ў асноўную геолагаўтваральную сілу планеты і павінен узяць на сябе адказнасць не толькі за свой уласны лёс, але за лёс планеты, яе навакольнага асяроддзя. Развіццё біясферы, кіраванае розумам чалавека Леруа яшчэ ў XIX ст. упершыню назваў наасферай – сферай розуму.

Адным са знакамітых навукоўцаў XX ст., якія займаліся праблемай выжывання і захавання жыцця на планеце, быў вядомы ўсяму свету рускі матэматык, эколаг, педагог – акадэмік Мікіта Мікалаевіч Майсееў. На яго экалагічны светапогляд паўплывалі працы У.І. Вярнацкага, Тэйяр дэ Шардэна, знаёмства з Цімафеевым-Рэсоўскім.

Працэс станаўлення выгляду homo sapiens, шлях антрапагенезу, Майсееў называў шляхам «узыходжанне да Розуму». Розум, як вынік эвалюцыйнага працэсу жывога рэчыва, які праходзіць на працягу шматлікіх мільёнаў гадоў, становіцца неад'емнай часткай планеты. М.М. Майсееў называе эпоху развіцця грамадства эпохай наасферы, калі чалавецтва, як разумнае пачынанне, усвядоміла неабходнасць разумнага ўмяшання ў прыродныя працэсы і іх ператварэнне, зразумела сэнс паняцця «наасфера» і актыўна ўключалася ў пошук шляху яго дасягнення.

«Наасфера», па Вярнацкім, – гэта стан біясферы, у якім чалавецтва бярэ на сябе адказнасць за далейшае развіццё не толькі грамадства, але і біясферы ў цэлым» [1, с. 27].

У канцы 60 – пачатку 70-х гг. Майсееў упершыню пачынае выкарыстоўваць паняцце «каэвалюцыя», якое з'явілася вынікам разважанняў над тэрмінам «наасфера». Каэвалюцыя разглядаецца ім як узгодненасць развіцця чалавецтва з развіццём біясферы, прычым развіццё чалавецтва не павінна садзейнічаць дэградацыі біясферы.

Акрамя гэтага, ён адкрыў, што і ў біялогіі пры вывучэнні папуляцыйнай дынамікі ўжо даўно выкарыстоўваецца тэрмін «sustainability», які азначае, што развіццё папуляцыі, якая ўваходзіць у вызначаны біяцэноз, не павінна парушаць гамеастазу (тэрмін уведзены ў 1929 г. для характарыстыкі станаў і працэсаў, якія забяспечваюць устойлівасць арганізма) – біяцэнозу. Іншымі словамі, гамеастаз той або іншай супольнасці павінен захоўвацца сталым у працэсе развіцця (змены). Гаворка ідзе аб узгодненасці развіцця біялагічнага віду з развіццём экасістэмы ў цэлым, адзінкі як часткі цэлага. Гэта і ёсць прынцып каэвалюцыі ва ўжыванні да пэўнай папуляцыі.

Сярод механізмаў, неабходных для таго, каб перабудаваць асноўныя жыццёвыя ўстаноўкі людзей, захаваць пры гэтым гамеастаз грамадства, ад якога залежыць збалансаванасць яго адносін з Прыродай, Майсееў называе сістэму «Настаўнік» як адзін са шматлікіх механізмаў адаптацыі чалавека да бесперапынна зменлівых умоў жыцця на Зямлі, а таксама і да патоку інфармацыі, якая абрушылася на сучаснага чалавека.

Разнастайная навуковая, грамадская і педагагічная дзейнасць М.М. Майсеева пачалася ў даваенныя гады. Яна прывяла яго да ўсведамлення неабходнасці распрацоўкі праграмы «Настаўнік» як спробы ўнесці свой уклад у найскладанейшую галіну чалавечай цывілізацыі – інстытут выхавання і адукацыі – перадачу і назапашванне працоўных навыкаў і ведаў. Без такой памяці прагрэс грамадскіх форм арганізацыі неантропаў быў бы немагчымы. Гэту памяць рэалізаваў «Настаўнік» – сістэма, узнікшая сотні тысяч гадоў назад.

Супольнасць людзей адрозніваецца ад шматлікіх супольнасцей жывёлін тым, што асноўная дзейнасць чалавека звязаная з працай, а дзе праца, там і навучанне – уладанне інфармацыяй і перадача яе. Вось і з'яўляецца, – піша Майсееў, – «Настаўнік». «…Мы не моцна саграшым супраць ісціны, калі скажам, што статак разбурыў "Настаўнік", што грамадства стварыў "Настаўнік", што панаванне над светам падарыў чалавецтву "Настаўнік". І далей, уся гісторыя чалавецтва ў значнай ступені звязаная з той роляй, тым месцам у грамадстве, якое займае «Настаўнік»» [2, с. 134].

Пад словам «Настаўнік» Майсееў сістэму ўздзеяння на чалавечую свядомасць, яго псіхіку. У гэту сістэму ўздзеяння, сістэму «Настаўнік», уваходзіць сям'я, школа, асяроддзе, у якім праходзіць жыццё, і, вядома, характар працоўнай дзейнасці [3, с. 128]. Такое ўздзеянне ён называе «накіраванае развіццё» (тэрмін, ужыты Майсеевым у 60-х гг. у сваіх лекцыях па тэорыі вялікіх сістэм) – комплекс уздзеянняў, здольных утрымліваць параметры сістэмы ў вызначаных межах.

Ён лічыць, што сёння самай важнай задачай цывілізацыі з'яўляецца ўдасканаленне сістэмы «Настаўнік», яе адпаведнасць сучасным умовам і здольнасць фарміраваць маральныя прынцыпы [4, с. 21]. М.М. Майсееў глыбока перакананы, што экалагічны крызіс немагчыма пераадолець толькі тэхнічнымі сродкамі [4, с. 101].

У сучасным крызісным становішчы першая задача, якая стаіць перад сістэмай «Настаўнік», – давесці веды аб экалагічным імператыве, яго разуменне і прыняцце, абапіраючыся на прынцып каэвалюцыі. Змены, якія адбываюцца на Зямлі, у грамадстве, у прамысловасці і эканоміцы, паставілі перад «Настаўнікам» задачу выхавання правільных і беражлівых адносін да прыроды. Экалагічная адукацыя ў гэтай сістэме становіцца адным з найважнейшых элементаў.

Экалагічны імператыў, уведзены М.М. Майсеевым у 70-х гг., гучыць наступным чынам: «Некаторыя віды чалавечай дзейнасці і, асабліва, ступень уздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе, павінны быць строга абмежаванымі і кантралюемымі» [5, с. 8]. Іншымі словамі, неабходна сістэма абмежаванняў, выкананне якіх важна для працягу развіцця грамадства і захавання самога жыцця.

У першую чаргу экалагічны імператыў павінен абапірацца на прынцып адзінай сям'і: людзі павінны навучыцца адчуваць сябе асобамі адной вялікай сям'і, лёс якой залежыць ад яе ўдзельнікаў. Веданне агульнай небяспекі будзе нараджаць адчуванне чалавечай планетарнай супольнасці, лічыць Майсееў. Усё гэта стварае перадумовы для стварэння міжнароднай асветніцкай праграмы, масавай трансляцыі ведаў – тэлематыкі – сінтэзу тэлебачання, інфарматыкі, касмічнай сувязі (тэлемасты).

Навуковец перакананы ў тым, што падвысіцца роля гуманітарнай адукацыі, якая дазволіць лепш разумець прыродазнаўчыя навукі, іх месца і ролю ў жыцці людзей [3, с. 228]. Сёння ўжо ідзе працэс пераасэнсавання шматлікіх маральных катэгорый у плане «адраджэння маральнасці», якая з'яўляецца вышэйшай ступенню духоўнасці чалавека.

Пераход да новага мыслення прывядзе да змены светапогляду, дакладней, самога падыходу да паняцця «светапогляд». Пад светапоглядам разумеецца вынік духоўнага ўсведамлення светабудовы з пункту гледжання ўзаемаадносін такіх асноўных яго частак, як Прырода і чалавек. Пры гэтым яго прадметам з'яўляюцца ўзаемаадносіны свету Прыроды і свету чалавека (макракосму і мікракосму), іх суадносіны як часткі і цэлага [6, с. 4].

Для вывучэння і ўдасканалення дадзенай сістэмы неабходна стварэнне інстытута «Настаўнік». Пабудова такога інстытута ў кантэксце фарміравання цывілізацыі новага тыпу – наасфернай, інфармацыйнай – з'яўляецца праблемай агульнапланетарнага маштабу [4, с. 89].

Такім чынам, неабходна адмысловая праграма. Тут маюцца на ўвазе даследаванні і ўкараненне найноўшых тэхналогій у пазашкольную, школьную, вышэйшую адукацыю, падрыхтоўка кадраў, эстэтычнае і маральнае выхаванне на ўсіх узроўнях, праблема фінансавання адукацыі і сям'і, а таксама даследаванні творчага выкарыстання чалавекам свайго вольнага часу. Вельмі важна, каб намаганні людзей, аб'яднаных адной ідэяй, былі накіраваныя на дакладна вылучаную мэту. «Вось чаму ў аснове ўсіх праграм павінны ляжаць навуковыя праграмы мэтанакіраваных даследаванняў» [2, с. 125]. М.М. Майсееў адзначае, што ў сітуацыі некантралюемага развіцця адзіным падыходам, адзінай альтэрнатывай з'яўляецца «праграмны метад», які ўяўляе сабой канцэпцыю вызначэння неабходных кіраўнічых уздзеянняў на аснове ўсебаковага сістэмнага аналізу сітуацыі і сінтэзу мэт і сродкаў.

У аснове гэтага метаду павінна ляжаць дактрына, якая ўтрымлівае ўяўленні аб шляхах развіцця грамадства, што забяспечваюць яго гамеастаз, і найбольш рацыянальныя формы яго існавання. Канцэпцыя развіцця чалавека эпохі наасферы павінна прытрымлівацца вельмі значнага патрабавання – яна не павінна быць застылай, бо «змяняецца наша ўяўленне аб свеце, паколькі разам з новымі ведамі мы лепш бачым контуры будучыні, лепш уяўляем нашы магчымасці ўплываць на ўласны лёс» [2, с. 142].

У інфармацыйных працэсах, развіцця навучання, выхавання, мыслення і адаптацыі ёсць вельмі важная асаблівасць – гэта інерцыйнасць.

Гэтыя сферы грамадскага жыцця чалавека з'яўляюцца кансерватыўнымі. Аб гэтым трэба ведаць і ўлічваць, каб не зрабіць неабдуманых паспешлівых высноў і крокаў. У адносінах да чалавека працэс набыцця спадчынных прыкмет ідзе нашмат парадкаў павольней чым працэсы грамадскага развіцця. Таму патрэбны пакаленні, каб праграма «Настаўнік» дала прыкметныя вынікі. Па меркаванні М.М. Майсеева, яна можа быць самай актуальнай з усіх праблем, пастаўленых НТР перад чалавецтвам.

Пры стварэнні любога роду адукацыйных праграм неабходна таксама ўлічваць і той факт, што веды не пераходзяць аўтаматычна ў светапогляд. Для фарміравання светапогляду неабходны веды, але іх недастаткова, неабходны і духоўны кампанент. Часам духоўны свет вылучаецца ў самастойную з'яву, маючы не толькі сваю ўласную гісторыю, але і ўласную логіку. Духоўны свет раптоўна здольны змяніць кірунак развіцця ўсіх працэсаў, якія праходзяць у грамадстве і тым самым змяніць гісторыю [2, с. 122].

Перад сучасным «Настаўнікам» стаіць вельмі цяжкая задача, якую не змаглі вырашыць папярэднія пакаленні настаўнікаў: злучэнне рацыянальнага і ірацыянальнага ў новых адукацыйных тэхналогіях эпохі наасферы. Такога роду адукацыя (этымалогія слова – разьбярства выявы, г. зн. тварэнне, стварэнне індывіда паводле закладзенага ў яго прыроду жыццесцвярджальнага пачатку) і выхаванне (этымалогія слова – насычэнне душы чалавека чысцінёй, святлом, мудрасцю быцця) ёсць адзіная форма развіцця чалавека і захавання яго ў складанай сітуацыі.

Нараўне з ведамі вялікую ролю ў сістэме «Настаўнік» павінна мець мастацтва, здольнае перабудоўваць чалавека, змяняць яго каштоўнасці, якое прымушае чалавека прыняць новы маральны імператыў. Ён запатрабуе і новага мыслення палітыкаў, бо павінны якасна змяніцца адносіны паміж дзяржавамі [3, с. 230].

Роздумы аб духоўным свеце чалавека прывялі М.М. Майсеева і да праблемы вольнага часу. Гэтай праблеме Майсееў прапаноўвае адвесці ў праграме «Настаўнік» больш месца і ўвагі, бо яна злучана з духоўнымі запатрабаваннямі чалавека, якія «не з'яўляюцца проста так, разам з нараджэннем чалавека: гэта прадукт працяглага выхавання, чалавеку павінна быць цікава жыць у гэтыя вольныя дні. І не проста цікава: яго дзейнасць, – я падкрэсліваю, дзейнасць – у гэтыя вольныя дні павінна садзейнічаць развіццю грамадства і ўдасканаленню асобных індывідаў» [2, с. 174].

Сутнасць праблемы заключаецца ў тым, што чалавек усё сваё жыццё дзеліць на часавыя адрэзкі ў выглядзе мінулага, сучаснасці і будучыні. Ён не ўспрымае сваё жыццё як цэласнасць, як адзіны працэс. Яно, жыццё, уключае ў сябе працу і адпачынак як разнавіднасці дзейнасці чалавека, а не – або праца, як актыўнасць, або адпачынак, як пасіўнасць у дзеяннях чалавека. Заканамернасць дзейнасці чалавека – гэта сталае пераключэнне фаз актыўнасці. Любая праца павінна быць адухоўлена. Яна як частка жыцця, напоўненая асэнсаваным дачыненнем да самой працы, дазволіць выйсці з гэтай праблемы.

Асаблівая ўвага надаецца ў праграме М.М. Майсеева падрыхтоўцы педагагічных кадраў. Ён прапаноўвае змяніць дух выкладання ў педагагічных ВНУ. Неабходна шырокая эрудыцыя ў галіне гуманітарных дысцыплін у спалучэнні з зацікаўленасцю вынікамі сваёй дзейнасці. І яшчэ ён дадае любоў да дзяцей, без якой немагчыма сама дзейнасць педагога і настаўніка. Асоба настаўніка ўжо сама па сабе ёсць выхаваўча-адукацыйны элемент у стройнай сістэме перадачы ведаў і фарміраванні ўнутранага свету вучня. Як і каго ён вывучыў становіцца зразумела толькі з гадамі. Вучоны сцвярджаў, што «ні адна сфера чалавечай дзейнасці так не патрабуе таленавітых, свежых розумаў, як школа» [2, с. 169].

Адной з прычын, якія спараджаюць праблемы моладзі, з'яўляецца хуткая змена стандартаў жыцця, якія сутыкаюцца з супярэчнасцямі кансерватыўных выхаваўчых і навучальных традыцый. Сёння вельмі важна прызнанне гэтай праблемы і прыцягненне да яе ўвагі розных сацыяльных інстытутаў. Таму па праграме «Настаўнік» павінны пачацца навуковыя даследаванні, бо «думаць можна і трэба калі заўгодна вольна, ніякія абмежаванні не павінны скоўваць думку» [2, с. 164].

З канстатацыяй цяжкасцей, якія стаяць на шляху ператварэнняў у сферы адукацыі, М.М. Майсееў спрабуе выпрацаваць і рэкамендацыі па рэфармаванні наяўнага. Так, на яго думку, неабходна павышэнне прэстыжу працы настаўніка, забеспячэнне свабоды пошуку, магчымасці творчых памкненняў замест строга рэгламентаванай дзейнасці. Метадычныя ўказанні не павінны скоўваць самастойнага падыходу да навучання і выхавання вучняў. У адваротным выпадку з маладых творчых адмыслоўцаў-педагогаў робяць флегматычных выканаўцаў, якія перастаюць думаць самастойна.

Асноўным крытэрыем паспяховасці працы настаўніка, па яго меркаванні, будуць дзеці, якія хочуць вучыцца ў яго, і бацькі, якія імкнуцца аддаць сваіх дзяцей да яго ў клас. Галоўны сакрэт працы з дзецьмі, «калі жадаеш зрабіць сапраўды справу – не ствараў бар'ераў».

Звяртае ён увагу і на склад школы, дзе працуюць у асноўным жанчыны. Як любая сістэма, якая імкнецца да раўнавагі, школа патрабуе больш мужчын-педагогаў, як у мінулы час, каб «хлапчукі нарэшце зноў пачалі атрымоўваць "мужчынскае" выхаванне ў школе» [2, с. 171].

Адна з умоў выканання гэтага патрабавання – матэрыяльнае забеспячэнне сённяшняга выкладчыка.

Не пакінута без увагі і пазашкольная праца: спорт, кружкі, факультатывы, кнігі. У аснове пазашкольных мерапрыемстваў павінна ляжаць выхаванне самастойнасці, ініцыятывы дзяцей, павага да чалавека, прадпрымальнасць. Атрыманне разнастайных ведаў і навыкаў фарміруюць пытанні аб магчымасцях чалавечай творчасці – адзінай альтэрнатыве спажывецтву.

Неад'емнай часткай пазашкольнай працы з'яўляецца цікавая і карысная праца і не толькі за грошы. Праца, якая жыватворна дзейнічае на фарміраванне ў дзяцей і падлеткаў пачуцця паўнавартаснасці і адказнасці. Умова для рэалізацыі гэтай часткі праграмы – кадры і грошы.

М.М. Майсееў папярэджвае і аб небяспецы, якая стаіць перад «Настаўнікам». Калі ў першабытным грамадстве функцыя «Настаўніка» зводзілася да назапашвання, захавання і перадачы ведаў, то са з'яўленнем класавага грамадства абавязкова, і гэта аб'ектыўны факт, памянялася першапачатковая роля. «Настаўнік» ад простага назапашвання і перадачы ведаў, неабходных для выжывання дадзенай супольнасці, пераходзіць у першую чаргу да вылучэння толькі тых ведаў і фарміравання тых навыкаў, якія неабходны для забеспячэння гамеастазісу кіруючага класа, яго ўстойлівасці і росквіту. Такім чынам, сістэма «Настаўнік» набывае класавы характар, тым самым перастае забяспечваць гамеастазіс папуляцыі ў цэлым. З'яўляецца і класавая мараль, якая стварае асобу і яе паводзіны. І зараз ужо мараль пачынае ўплываць на механізмы, якія праходзяць у сістэме «Настаўнік» – заганны круг, і яго неабходна разарваць для рэалізацыі праектаў па выхадзе з крызісаў грамадства. Вучоны сцвярджае, што адукацыя сёння павінна адлюстроўваць інтарэсы ўсіх пластоў грамадства. Гэта будзе яшчэ адной умовай для паспяховай рэалізацыі праграмы «Настаўнік».

Такім чынам, М.М. Майсееў ахапіў сваёй праграмай «Настаўнік» шматлікія сферы жыццядзейнасці чалавека, аб'яднаўшы яе з задачамі агульнапланетарнага маштабу. Будучыня чакае чалавека з іншымі духоўнымі параметрамі, таму важна і неабходна ўжо сёння накіраваць усе намаганні на развіццё і ўзбагачэнне сутнасных сіл чалавека, павышэнне культуры яго мыслення. Каб дамагчыся гэтай мэты, неабходна адказна паставіцца да рэформ у адукацыі і выхаванні чалавека ў пераходную эпоху, эпоху глабальных перамен. Іншага шляху проста няма.

*Літаратура*

1. *Моисеев, Н.Н.* Еще раз о проблеме коэволюции / Н.Н. Моисеев // Вопросы философии. – 1998. – № 8. – С. 26–32.
2. *Моисеев, Н.Н.* Слово о научно-технической революции / Н.Н. Моисеев. – 2-е изд., доп. – М.: Молодая гвардия, 1985. – 285 с.
3. *Моисеев, Н.Н.* Экология человека глазами математика: (Человек, природа и будущее цивилизации) / Н.Н. Моисеев. – М.: Молодая гвардия, 1988. – 254 с.
4. *Моисеев, Н.Н.* Судьба цивилизации. Путь Разума / Н.Н. Моисеев. – М.: Языки русской культуры, 2000. – 224 с.
5. *Моисеев, Н.Н.* Современный антропогенез и цивилизационные разломы. Эколого-политический анализ / Н.Н. Моисеев. – М.: МНЭПУ. 1994. – 47 с.
6. *Чанышев, А.И.* Курс лекций по древней философии / А.И. Чанышев. – М., 1981.

*Summary*

*Among the mechanisms for a man to adapt to the continuously varying living conditions as well as to the information stream over flown upon the contemporary man, the leading role is played by the “Teacher” system originated hundreds of thousands years ago. It includes the institute of education and upbringing of the new generation. A way out of the crisis of the contemporary anthropogenic civilization is to improve “Teacher” system, the system of influence upon the human consciousness.*

*A socio-philosophical concept of Nikita Moiseev's “Teacher” is an attempt to make his own contribution this most complicated sphere of the human civilization.*

# ПАЛІТАЛОГІЯ

УДК 321(476) + (470+571)

**С.В. Сіткевіч,**
*аспірант кафедры паліталогіі і права БДПУ*

## ФАРМІРАВАННЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ – ТЭНДЭНЦЫІ, ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Даследуемая тэма з'яўляецца на сённяшні дзень адной з самых важных у галіне знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, таму ёй прысвечана даволі шырокае кола рознапланавай літаратуры. Мэта дадзенага артыкула – зрабіць паліталагічны аналіз асноўных этапаў фарміравання Саюзнай дзяржавы, яе асноўных кіраўнічых органаў, вызначыць асноўныя напрамкі дзейнасці ў розных галінах, гістарычны сэнс яе стварэння.

Пры напісанні артыкула быў вывучаны шэраг бібліяграфічных крыніц. Умоўна іх можна падзяліць на дзве часткі. Першая – афіцыйныя і нарматыўныя дакументы, якія дазваляюць дасканала прааналізаваць і вывучыць нарматыўна-прававую базу Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Другая частка – гэта працы беларускіх і расійскіх навукоўцаў, прысвечаныя праблеме яе фарміравання і функцыяніравання. У артыкуле выкарыстаны працы Ю.Ф. Часава, Д.І. Сухапарава, Л.П. Козіка, П.А. Кахно, І.С. Екадумавай і інш.

Аналіз палітычных, эканамічных і сацыяльных аспектаў, звязаных са станаўленнем і развіццём саюзніцкіх адносін нашых краін, паказвае, якім складаным і супярэчлівым з'яўляецца працэс інтэграцыі розных дзяржаў. Гэта сцвярджэнне можна аднесці не толькі да постсавецкіх дзяржаў, але, як паказваюць факты, да ўсіх сучасных аб'яднальных структур на сусветнай арэне, калі кожны яе ўдзельнік імкнецца вырашыць галоўным чынам свае задачы, абараніць свае нацыянальныя інтарэсы. Асабліва востра такія тэндэнцыі сталі выяўляцца ў канцы XX–пачатку XXI стагоддзя. Сапраўды, гэты перыяд у гісторыі чалавецтва стаў не толькі храналагічнай вехай, але і мяжой ва ўсіх сферах дзейнасці сусветных дзяржаў. Адзначанае цалкам датычыцца і расійска-беларускіх адносін, якія залежаць як ад унутрыпалітычных, так і ад геапалітычных фактараў.

Ступень інтэграцыі, да якой з самага пачатку імкнуліся нашы краіны, была па-сапраўднаму нечым якасна новым на постсавецкай прасторы. Такая справа не магла і не павінна была адбыцца на нейкім адным пэўным пасяджэнні, як гэта адбылося ў Віскулях. Справа пабудовы Саюзнай дзяржавы – працэс паступовы, які складаецца з многіх этапаў, кожны з якіх прыносіў якасна новыя пераўтварэнні на інтэграцыйным кірунку. На шлях поўнамаштабнага і цеснага яднання Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя сталі 2 красавіка 1996 г., калі прэзідэнты дзвюх краін – А. Лукашэнка і Б. Ельцын – падпісалі ў Маскве Дагавор аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі. 2 красавіка 1997 г. Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя падпісалі Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі, які даў новы імпульс працэсу інтэграцыі дзвюх дзяржаў. Важным этапам на шляху станаўлення і развіцця адносін Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі з'явілася падпісанне 25 снежня 1998 г. Дэкларацыі аб далейшым яднанні Беларусі і Расіі, Дагавора аб роўных правах грамадзян, Дагавора аб стварэнні роўных умоў суб'ектам гаспадарання і пратакола да яго. У гэтых дакументах прэзідэнты дзвюх краін заявілі аб цвёрдай рашучасці працягнуць паэтапны рух да добраахвотнага аб'яднання ў саюзную дзяржаву пры захаванні нацыянальнага суверэнітэту дзяржаў-удзельніц Саюза. Дагавор аб роўных правах грамадзян, а таксама Дагавор аб стварэнні роўных умоў суб'ектам гаспадарання паставілі перад органамі дзяржаўнага кіравання Беларусі і Расіі, Выканаўчым камітэтам Саюза выразныя задачы і тэрміны рашэння асноўных праблем інтэграцыі, дазволілі сканцэнтраваць іх намаганні на самых галоўных, вырашальных напрамках супрацоўніцтва. Рэалізацыя вызначаных у гэтых дакументах захадаў павінна была стварыць перадумовы для выхаду на новы этап працы – стварэнне Саюзнай дзяржавы. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ўступіў у сілу 26 студзеня 2000 г. [1].

Прыступаючы да аналізу інтэграцыйных працэсаў паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй, патрэбна разгледзець асноўныя суб'ектыўныя і аб'ектыўныя фактары інтэграцыі, перадумовы зацікаўленасці бакоў. Умоўна іх можна падзяліць на некалькі частак – геапалітычныя, эканамічныя, ваенна-стратэгічныя, культурныя фактары. Гэта класіфікацыя дапаможа больш сістэмна і ўсебакова разгледзець працэс інтэграцыі.

*Геапалітычная інтэграцыя* Беларусі і Расіі з'яўляецца перспектыўным і даволі значным фактарам для далейшых аб'яднальных працэ-

саў. Саюз з Рэспублікай Беларусь мае вялікае геапалітычнае значэнне для Расіі. Ён забяспечвае ёй прамы доступ да Калінінградскай вобласці; захоўвае адчыненымі вароты ў Еўропу; эканоміць значныя сродкі, неабходныя для стварэння сістэмы ваенна-стратэгічнага стрымлівання на захадзе, паколькі сістэма супрацьпаветранай абароны Беларусі забяспечвае бяспеку заходніх абласцей Расіі; палітыка кіраўніцтва Беларусі па ўмацаванні Саюза захоўвае «Балтыйска-Чарнаморскі калідор», які звязвае Расію з заходнімі спажыўцамі яе энергетычных рэсурсаў. У геапалітычным сэнсе саюз з буйнейшай ў свеце па тэрыторыі дзяржавай, якае валодае значным ваенным і энергетычным патэнцыялам, з’яўляецца для Беларусі значным геапалітычным поспехам.

Галоўнай сферай інтэграцыі з Расіяй для Беларусі безумоўна з’яўляецца *эканамічная сфера*. Калі палітычныя адносіны паміж Расіяй і Беларуссю перажывалі ў сваім развіцці перыяды спаду і ўздыму, то эканамічныя адносіны дзвюх краін на працягу апошніх гадоў дэманструюць паступальнае развіццё. На працягу апошніх гадоў імкліва рос узаемны тавараразварот, які дасягнуў у 2006 г. узроўню ў 18 млрд дол. ЗША (першае месца ў СНД). На верасень 2007 г. ён склаў каля 20 млрд амерыканскіх доляраў, што на 20% больш, чым за адпаведны перыяд папярэдняга года. Бюджэт Саюзнай дзяржавы на наступны год складзе 5 млрд расійскіх рублёў, што на 10% больш мінулага. Пры гэтым каля 50% беларускага экспарту і 65% беларускага імпарту прыходзіцца на Расію. У структуры беларускага экспарту ў Расію пераважаюць харчовыя прадукты, трактары і аўтамабілі, халадзільнікі і тэлевізары, аўтамабільныя шыны, мэбля і іншыя тавары бытавога прызначэння. Расійскі экспарт у Беларусь уключае ў сябе нафту і нафтапрадукты, прыродны газ і электраэнергію. На двухбаковай аснове фінансуецца каля 15 саюзных праграм у сферы высокіх тэхналогій, космасу, транспарту, падрыхтоўкі кадраў і абароны. Пры гэтым бюджэт Саюзнай дзяржавы на 35% фарміруецца за кошт Міністэрства фінансаў Беларусі і на 65% Мінфінам Расіі [2, с. 301].

Асаблівасць эканомікі Беларусі – гэта значная частка экспартных галін. Доля экспарту ў валавым унутраным прадукце краіны перавышае 60%. Беларусь спецыялізуецца на выпуску навукаёмістай прадукцыі машынабудавання, хімічнай, нафтахімічнай, оптыкамеханічнай, электратэхнічнай, электроннай і іншых галін прамысловасці з выкарыстаннем у асноўным расійскіх мінеральна-сыравінных рэсурсаў, а таксама на вытворчасці харчовых тавараў і тавараў народнага спажывання. Сур’ёзнай дапамогай эканамічнаму супрацоўніцтву Расіі і Беларусі служыць разгалінаваная сістэма шматбаковых сувязей расійскіх рэгіёнаў і беларускіх абласцей, якая фарміруе падмурак эканамічнай інтэграцыі абедзвюх краін. Прававая база расійска-беларускага супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні складаецца з больш за 180 дагавораў. У расійскіх рэгёнах адкрыта 12 прадстаўніцтваў Беларусі [3, с. 94].

Стратэгічна важнае становішча Беларусі на карце Еўропы вызначае характар *ваенна-стратэгічнага ўзаемадзеяння* паміж дзвюма краінамі, а таксама збліжае пазіцыі бакоў у адзнацы верагодных пагроз бяспекі Саюзнай дзяржавы. Ваенна-стратэгічная значнасць Беларусі для Расіі вызначаецца наяўнасцю на яе тэрыторыі важных аб’ектаў абароннай інфраструктуры, уключаючы сістэму СПА СНД. Важная роля ў забеспячэнні абараназдольнасці Саюзнай дзяржавы адводзіцца Аб’яднанай рэгіянальнай групоўцы войскаў Беларусі і Расіі, якая знаходзіцца ў падначаленні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы. У яе склад уваходзяць войскі Маскоўскай вайсковай акругі, частка сіл і сродкаў Балтыйскага флоту, частка злучэнняў Ленінградскай вайсковай акругі, а таксама авіяцыйныя і мотастралковыя злучэнні ўзброеных сіл Рэспублікі Беларусь. У далейшым мяркуецца перадаць пытанні абароннай палітыкі і супрацоўніцтва ўзброеных сіл дзвюх краін наднацыянальным органам Саюзнай дзяржавы, а таксама дабіцца далейшай інтэграцыі іх абаронна-прамысловых комплексаў. Адным з галоўных напрамкаў супрацоўніцтва ў сферы абароны і бяспекі з’яўляецца ахова меж Саюзнай дзяржавы. Яшчэ ў 1995 г. быў падпісаны дагавор аб сумесных дзеяннях па ахове дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якім Расія аказвае дапамогу ва ўладкаванні прыбалтыйскай часткі мяжы Рэспублікі Беларусь.

Гістарычная блізкасць беларускага і расійскага народаў значна аблегчыла *культурную інтэграцыю*. Расія і Беларусь імкнуцца да дасягнення новай якасці ўзаемадзеяння адукацыйных сістэм нашых краін у рамках Саюзнай дзяржавы. Была створана працоўная група па пытаннях інфарматызацыі адукацыі, вывучаецца пытанне аб магчымасці прыцягнення да двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы інфарматызацыі адукацыі Інстытута інфармацыйных тэхналогій у адукацыі (ЮНЕСКА). Першым крокам у гэтым напрамку з’явілася сумесная распрацоўка «Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у Супольнасці Беларусі і Расіі». Працэс фарміравання адзінай адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы ў цяперашні час паступальна развіваецца, ствараецца яго прававое поле [4, с. 44].

Фарміраванне Саюзнай дзяржавы значна паўплывала на развіццё навукі і высокіх тэхналогій у Расіі і Беларусі. Паслядоўна ўзмацнялася расійска-беларуская навуковая інтэграцыя, ахопліваючы ўсе новыя сферы навукова-дас-

ледчай дзейнасці і вытворчасці. Прыкладам працы ў гэтай галіне можа служыць праект міждзяржаўнай праграмы Расіі і Беларусі «Забеспячэнне адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы». Няўхільна пашыраецца і інфармацыйнае супрацоўніцтва. Так, Рэспубліка Беларусь была абвешчана ганаровым госцем расійскай выставы «Прэса – 2006». У рамках форуму адбыўся таксама «Дзень беларускіх і саюзных СМІ», на якім расійскія і беларускія журналісты абмеркавалі далейшыя перспектывы супрацоўніцтва, было праведзена спецыяльнае пасяджэнне прэс-клуба. На сённяшні дзень існуе даволі шмат сродкаў інфармавання народаў аб ступені інтэграцыі: тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, якая забяспечвае падрыхтоўку тэле- і радыёперадач у эфіры Беларусі і Расіі. У рамках саюзных праграм створана і развіваецца радыёстанцыя «Саюз», якая арганізуе выхад у эфір радыёпраграм па саюзнай тэматыцы на частотах радыёстанцый «Маяк», «Юнасць», «Радыё Расіі»; Інфармацыйнае агенцтва «Саюз-Інфа», якое адказвае за своечасовае з'яўленне навін Саюзнай дзяржавы (80–100 паведамленняў у дзень). Органам Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы з'яўляецца штотыднёвы ўкладыш у «Расійскую газету» і «Савецкую Беларусь» – «Саюз. Беларусь – Расія». Органам Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі з'яўляецца газета «Саюзнае веча» – укладыш у «Парламенцкую газету» (РФ), «Народную газету» (РБ) і газету «Звязда» (РБ). Акрамя таго, органамі Саюзнай дзяржавы выпускаюцца інфармацыйны бюлетэнь «Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі» і навукова-аналітычны зборнік «Саюзны веснік» [5, с. 19].

Такім чынам, прааналізаваўшы асноўныя суб'ектыўныя і аб'ектыўныя фактары інтэграцыі, можна зрабіць высновы аб тым, што ва ўсіх сферах існуюць перадумовы для поспеху інтэграцыйных працэсаў. Але мы бачым, што ў фарміраванні Саюзнай дзяржавы існуе шмат нявырашаных пытанняў і праблем.

Пытанне аб ступені інтэграцыі ўнутры Саюзнай дзяржавы з'яўляецца вельмі тонкім і неадназначным. Справа ў тым, што знешнепалітычная канцэпцыя Рэспублікі Беларусь, якая арыентавана на безумоўнае захаванне суверэнітэту і незалежнасці, разглядаецца дзяржаўна-палітычным кіраўніцтвам краіны як вышэйшая каштоўнасць. Асноватворны і нязменны прынцып знешняй палітыкі Беларусі – шматвектарнасць. Нацыянальныя інтарэсы Беларусі не адмаўляюць магчымасці цеснай інтэграцыі з іншымі краінамі, але пры ўмове безумоўнага захавання нацыянальнай незалежнасці і дзяржаўнага суверэнітэту. Інтэграцыя з Расіяй для любой краіны будзе вельмі складанай. Расія, як спадчынніца традыцый СССР і Расійскай імперыі, з'яўляецца буйнай дзяржавай. Таму ў працэсе інтэграцыі цяжка пазбегнуць шавіністычных, панрасійскіх настрояў з боку пэўных пластоў расійскага грамадства. Сутыкненне нацыянальных інтарэсаў Беларусі і Расіі з'яўляецца аб'ектыўным фактарам, які негатыўна ўплывае на працэс больш цеснага аб'яднання.

У свой час у якасці магчымых разглядаліся некалькі варыянтаў саюзнага будаўніцтва: ад валютнай інтэграцыі да мадэлі ЕС і інкарпарацыі Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі. Большасць падобных прапаноў зыходзіла з расійскага боку. Беларускі бок прапаноўваў саюзныя адносіны будаваць на аснове дзеючага Дагавора аб будаўніцтве Саюзнай дзяржавы, які падпісала і кіраўніцтва Расіі. Беларускі бок упэўнены ў магчымасці стварэння агульнай дзяржавы з захаваннем поўнай дзяржаўнай незалежнасці і суверэннага статусу Беларусі, раўнапраўнай ва ўсіх адносінах з Расіяй, у магчымасці гарманічнага спалучэння саюзнага будаўніцтва з працэсам фарміравання самастойнай беларускай нацыі, з яе арыгінальнай культурай і нацыянальнай дзяржаўнасцю. Менавіта з гэтай прычыны выцякае праблема валютнай інтэграцыі, якая, з аднаго боку, з'яўляецца неад'емнай часткай актывізацыі працэсаў эканамічнай інтэграцыі, але, з другога боку, у ёй можна заўважыць пагрозу незалежнасці Беларусі. Увядзенне адзінай грашовай адзінкі (расійскага рубля) на прасторах Саюзнай дзяржавы планавалася яшчэ ў 2005 г., з адзіным эмісійным цэнтрам у Маскве, што выклікала поўнасцю справядлівае незадавальненне з боку беларускага ўрада. Беларускі бок лічыць, што да падпісання гэтага дакумента неабходна забяспечыць роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання і роўныя правы для грамадзян дзвюх краін, беспярэшкоднае перамяшчэнне праз беларуска-расійскую мяжу людзей, тавараў, капіталаў, паслуг. З гэтай прычыны не адбываецца і далейшая інтэнсіфікацыя валютна-фінансавага супрацоўніцтва ў выглядзе уніфікацыі валютнага і фінансавага заканадаўства, пашырэнне выкарыстання нацыянальных валют ва ўзаемным гандлі і правядзенне аперацый з каштоўнымі паперамі [6, с. 109].

Паколькі саюз дзвюх дзяржаў першапачаткова ўтвараўся як наддзяржаўнае аб'яднанне, якое ў многім базіруецца на волі палітычных кіраўнікоў, то ён непазбежна з часам ператварыўся ў поле супрацьстаяння іх інтарэсаў, далёка не заўсёды і не ва ўсім супадаючых з нацыянальнымі інтарэсамі. Саюзныя адносіны спрабавалі развіваць кулуарна, пазбягаючы публічнасці. Гэта асабліва відаць на прыкладзе распрацоўкі праекта Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы. Відавочна, што далейшае развіццё інтэграцыйных адносін у рамках Беларусі і Расіі звязваюць з яго прыняццем. Варта падкрэсліць, што распрацоўка Канстытуцыйнага акта ўяўляе сабой складаны працэс у выніку адрознення па-

дыходаў экспертаў як да трактоўкі артыкулаў гэтага дакумента, так і да яго формы і зместу. Неабходна адзначыць, што праца над стварэннем прававых механізмаў у межах Саюзнай дзяржавы павінна быць працягнута пры ўдзеле навукоўцаў і практыкаў абедзвюх дзяржаў-удзельніц [7, с. 11].

Вяршыняй непаразуменняў паміж краінамі стаў энергетычны крызіс на мяжы 2006–2007 гг., прычынай якога стала рэзкае павелічэнне Расіяй цэн на нафту і прыродны газ для Беларусі. Гэта тым больш незразумела ў сітуацыі, калі Беларусь стала амаль апошнім саюзнікам Расіі на постсавецкай прасторы.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя вывады: стварэнне Саюзнай дзяржавы стала вынікам шматгадовай працы вышэйшых дзяржаўных органаў Беларусі і Расіі, што дазваляе меркаваць аб высокай ступені распрацаванасці канцэптуальных і прававых асноў Саюзнай дзяржавы. Дзякуючы стварэнню і пасляховаму функцыяніраванню сумесных органаў улады, дадзенная інтэграцыйная структура паказала сябе жыццяздольным утварэннем з вялікім патэнцыялам. У цяперашні час у Беларусі, як і ў Расіі, створаны ўмовы эканамічнага росту ў XXI ст.: стабілізаваны макраэканамічныя паказчыкі, спынены спад вытворчасці, адноўлены інтэграцыйныя сувязі. У рамках Саюзнай дзяржавы фарміруецца структура будучай тэхналагічнай эканомікі нашых краін, якая абапіраецца на макраэканамічную збалансаванасць, стварэнне ўмоў для ўстойлівага росту ў выглядзе стымулявання прадпрымальніцтва і дзелавой актыўнасці, развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Так, у перспектыве плануецца стымуляваць прадпрымальніцтва і дзелавую актыўнасць, спрыяць паскарэнню развіцця сучасных тэхналогій і тэхналагічнай вытворчасці.

Прааналізаваўшы асноўныя праблемы ў працэсе фарміравання Саюзнай дзяржавы, можна зрабіць вывад аб існаванні дзвюх тэндэнцый у развіцці адносін Беларусі і Расіі. Першая – прыхільнікі інтэграцыі, да якіх можна аднесці беларускае кіраўніцтва і частку расійскіх палітыкаў. Другая – пэўная частка як расійскіх, так і беларускіх палітыкаў, якая выступае супраць далейшай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы. Гістарычны сэнс стварэння Саюзнай дзяржавы заключаецца ў тым, што Беларусь асноўвае стратэгію развіцця на прынцыпах шматвектарнасці сваёй знешняй палітыкі, справядлівага сусветнага парадку, агульнаеўрапейскай і міжнароднай бяспекі. Будаўніцтва беларуска-расійскай Саюзнай дзяржавы з'яўляецца гарантыяй нацыянальнай бяспекі і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

*Літаратура*


1. Договор о Союзе Беларуси и России (в ред. протокола от 02.04.1997) // Консультант Плюс: Беларусь [Электрон. ресурс] / ООО»ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Республика Беларусь. – Минск, 2005.
2. *Екадумава, І.С.* Структура кіраўнічых органаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі / І.С. Екадумава // Беларуска-расійская інтэграцыя. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 422 с.
3. *Козік, Л.П., Кахно, П.А.* Саюз Беларусі і Расіі: фінансава-эканамічныя праблемы / Л.П. Козік, П.А. Кахно. – Мінск, 1999. – 122 с.
4. *Сухопаров, Д.И.* Союзное государство – повышение эффективности функционирования национальных экономик / Д.И. Сухопаров // Экономический осмотр Союзного государства Беларуси и России. – М., 2001. – 314 с.
5. *Часов, Ю.Ф.* Россия и Беларусь на пути к единению / Ю.Ф. Часов // Вестник Союз-Инфо. – М., 2001. – № 3. – С. 18–22.
6. *Фадеев, А.В.* Между Москвой и Минском / А.В. Фадеев // Международная жизнь. – 2007. – № 3. – С. 105–114.
7. *Александров, О.* Российско-белорусские отношения в контексте строительства Союзного государства / О. Александров // Научно-координационный центр по международным исследованиям МГИМО МИД России. – 2006. – № 5(17) – 22 с.



*Summary*

*The main stages of the formation and development of the union state of Russia and Belarus are considered in the article. The seasons for creation the alliance and realization of measures undertaken by the authorities in political economic and cultural spheres of development of bilateral relationship are deseribed in the article.*


*УДК 32.001*

***Н.У. Скок,***
*кандыдат палітычных навук, загадчык кафедры «Гуманітарныя дысцыпліны» Беларуска-Расійскага універсітэта (г. Магілёў)*

# ЗМЯСТОЎНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ПАЛІТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

У шырокім сэнсе палітычная культура ўяўляе сабой сістэму гістарычна складзеных, адносна ўстойлівых, увасабляючых вопыт папярэдніх пакаленняў, людзей, установак, арыентацый і мадэлей паводзін (функцыяніравання). Яны праяўляюцца ў непасрэднай дзейнасці суб'ектаў палітычнага працэсу, фіксуюць прынцыпы іх адносін да гэтага працэсу ў цэлым, яго асноўных элементаў і тым самым забяспечваюць развіццё і ўзнаўленне палітычнага жыцця грамадства.

Галоўная мэта дадзенага артыкула заключаецца ў тым, каб вызначыць асноўныя змястоўныя адзінкі палітычнай культуры грамадства. Першымі паспрабавалі зрабіць структураванне прадстаўнікі структурна-функцыянальнага пады-

ходу Т. Парсанс, Г. Алманд, С. Верба і Дж. Паўэл. Праблемамі вылучэння сутнасці палітычнай культуры займаліся такія выдатныя замежныя і айчынныя навукоўцы, як У. Розенбаум, Е. Вятр, М. Фарукшын, К. Гаджыеў, Ю. Ірхін і інш.

Як і любой іншай сацыяльнай сістэме, палітычнай культуры ўласціва наяўнасць структурных унутраных адзінак, між якімі існуе ўпарадкаваная дынамічная ўзаемасувязь. Аднак і ўнутры самой структуры палітычнай культуры можна вылучыць дзве падструктуры, якія ўяўляюць сабой дыялектнае адзінства сутнасці самога паняцця палітычнай культуры як складанага феномена, які ўздзейнічае на фарміраванне, развіццё і дзейнасць палітычных інстытутаў, а таксама на масавыя палітычныя паводзіны грамадзян. У структурным аналізе неабходна вылучыць элементы палітычнай свядомасці і палітычных паводзін. Такім чынам, у вузкім сэнсе палітычная культура адлюстроўвае ўзаемасувязь палітычнай свядомасці і палітычных паводзін, раскрывае механізм рэалізацыі феноменаў палітычнай свядомасці ў палітычнай дзейнасці.

Палітычная свядомасць уяўляе сабой усведамленне сферы і поля палітыкі сацыяльнымі суб'ектамі (індывідамі, групамі, класамі, супольнасцямі). Яна ахоплівае сістэму ідэй, поглядаў, перакананняў, пачуццяў і настрояў суб'ектаў палітыкі, якія складваюцца ў працэсе заваявання і здзяйснення, арганізацыі і функцыяніравання ўлады ў рамках пэўнай палітычнай сістэмы. Асяродак палітычнай свядомасці складаюць устаноўкі, арыентацыі, каштоўнасці, стэрэатыпы, якія адносяцца да палітычнай сістэмы, да сістэмы ўлады і ўладавых адносін, дзяржаўнага кіравання, палітычных інстытутаў, да такіх катэгорый, як свабода, справядлівасць, роўнасць, дэмакратычныя прынцыпы, аўтарытарызм, таталітарызм, сацыялізм, правы чалавека і г. д.

Палітычныя пазіцыі – адна з цэнтральных катэгорый, узятых за аснову амерыканскімі паліталагамі (менавіта Г. Алмандам), для параўнальнай характарыстыкі палітычнай культуры розных краін. Зыходны пункт погляду амерыканскіх аўтараў заключаецца ў сцвярджэнні, што розныя палітычныя культуры вызначаюцца праз перавагу некаторых палітычных пазіцый. У грамадскіх навуках паняцце «пазіцыі» традыцыйна вызначаецца праз супрацьпастаўленне паняццю «паводзіны». Паводзіны ёсць знешняе кіраўніцтва, якое прынята індывідам [1, с. 71]. Пазіцыя, наадварот, ёсць унутраная прыхільнасць рэагаваць спецыфічным чынам на дадзеную сітуацыю. Е. Вятр фармулюе паняцце «палітычныя пазіцыі» праз асобасныя характарыстыкі чалавека, якія выражаюцца ў тэндэнцыі да спецыфічных або пастаянных палітычных паводзін [2, с. 173]. Пазіцыя азначае схільнасць ці нават гатоўнасць дзейнічаць так, а не інакш. Пазіцыя ёсць верагоднасць таго, што ў сітуацыі пэўнага тыпу будуць назірацца адпаведныя яму паводзіны. Таму палітычныя пазіцыі азначаюць схільнасць, падспудны нахіл пры сутыкненні з пэўнымі палітычнымі сітуацыямі рэагаваць пэўным чынам. Так, у амерыканскай паліталогіі палітычную культуру разглядаюць галоўным чынам як сукупнасць палітычных пазіцый.

Алмонд і Пауэл падзялілі палітычныя пазіцыі на тры катэгорыі: кагнітыўныя, афектыўныя і ацэначныя. *Кагнітыўны элемент* ёсць веды, атрыманыя індывідам праз палітыку, палітычных дзеячаў і палітычныя інстытуты. Гэтыя веды могуць аказацца і памылковымі, аднак у гэтым выпадку важна, што яны суб'ектыўныя, перажытыя асобай як веды, гэта значыць як сукупнасць аб'ектыўных рэальнасцей, якія існуюць незалежна ад суб'екта і, такім чынам, легітыміруючых пазіцый, якія суб'ект выводзіць з іх. *Афектыўны элемент*, наадварот, звязаны з пачуццямі: сімпатыі або антыпатыі ў адносінах да таго ці іншага палітычнага дзеяча, да той ці іншай палітычнай сітэмы, ідэалогіі і г. д. Ацэначны ці нарматыўны элемент звязаны з вызначэннем каштоўнасцей, інакш кажучы, з абазначэннем палітычных рэалій пад знакам «мінус» або «плюс».

У залежнасці ад таго, які з гэтых кампанентаў дамінуе, палітычная культура будзе ў большай ці меншай ступені «секулярызаванай». Алмонд і Пауэл вызначаюць «культурную секулярызацыю» як «працэс, у выніку якога палітычныя дзеянні індывіда становяцца больш аналітычнымі, рацыянальнымі і эмпірычнымі». Розум бярэ верх над пачуццём і над ідэалогіяй. Рацыянальнае меркаванне прэваліруе.

Культурная секулярызацыя з'яўляецца адным з асноўных параметраў палітычнага развіцця і вызначаецца як працэс, у ходзе якога індывід у выніку палітычнай дзейнасці становіцца больш рацыянальным, здольным да аналізу і ўліку эмпірычнай рэальнасці.

Палітычная культура мадыфікуецца: пры фарміраванні палітычных пазіцый пазнаваўчыя элементы бяруць верх над ацэначнымі і, асабліва, над эмацыянальнымі элементамі. Акрамя гэтага, аналіз палітычных пазіцый дазваляе Алманду і Пауэлу вызначыць тры тыпы палітычных культур, якія яны называюць прыходскай культурай, залежнай культурай і культурай удзелу.

Такім чынам, амерыканская школа паліталогіі разглядае характар і ўзровень палітычных пазіцый як незалежную адпраўную дэтэрмінанту, якая вызначае спосаб функцыяніравання палітычнай культуры ў кожным канкрэтным грамадстве.

Як гаварылася вышэй, адным са структурных кампанентаў палітычных пазіцый з'яўляюцца палітычныя ўяўленні і палітычныя веды. Да іх адносяць разуменне грамадзянамі палітычных інтарэсаў – асабістых, калектыўных, дзяржаўных, грамадскіх, рэгіянальных, глабальных і іншых, веданне канстытуцыі і іншых законаў краі-

ны, праграмных палажэнняў буйных палітычных партый, розных грамадска-палітычных сіл, асноўных палітычных норм і працэдур; форм і спосабаў удзелу грамадзян ў грамадска-палітычным жыцці краіны; разуменне палітычных адносін у краіне, палітычых падзей і з'яў, якія адбываюцца ў краіне і г. д.

Палітычныя ўяўленні могуць мець тэарэтычна сістэматызаваны характар, засноўвацца на дакладных ведах, а могуць бытаваць на ўзроўні абыдзённай свядомасці, чутак, настрояў і г. д. Таму палітычныя ўяўленні як неабходны кампанент палітычнай культуры нельга атаясамліваць з палітычнымі ведамі, якія з'яўляюцца адным з магчымых вытокаў фарміравання адпаведных уяўленняў.

Інтэгратыўным элементам палітычнай культуры можна лічыць палітычны светапогляд, які складае частку агульнага светапогляду пэўнага чалавека або супольнасці.

У працэсе накаплення і развіцця палітычнай культуры ў яе носьбітаў назапашваецца пэўны палітычны вопыт, фарміруюцца стэрэатыпныя (традыцыйныя) спосабы дзеяння і ўспрымання палітычных падзей, праяўляюцца палітычныя пачуцці, эмоцыі, норавы, крышталізуюцца палітычныя ўстаноўкі. Палітычны вопыт – гэта аб'ектыўна функцыяніруючы феномен палітычнага працэсу, які ўяўляе сабой комплекс ведаў, навыкаў, уменняў, рацыянальна асэнсаваных сродкаў арганізацыі, накопленых і апрабаваных у ходзе палітычнай дзейнасці.

Далей, сістэмаўтваральным элементам усякай палітычнай культуры выступае комплекс палітычных каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый. Тут ідзе пошук адказаў на пытанні пра значнасць, прэстыжнасць у вачах чалавека пэўнай сацыяльнай групы, соцыуму, самога сябе. Паняцце «каштоўнасці» ўключае больш ці менш агульнапрызнаныя паводзінныя стандарты, гэта значыць раздзяляемыя грамадствам ці сацыяльнай групай перакананні наконт мэт, якія неабходна дасягнуць, і тых асноўных шляхоў і сродкаў, якія вядуць да гэтых мэт [3, с. 284].

У пэўным сэнсе каштоўнасці – гэта сэнс культуры, яе апорныя канструкцыі, якія забяспечваюць агульную, стратэгічную лінію сістэмы сацыяльнай рэгуляцыі. Сусветная сацыялагічная і палітычная думка даўно прапанавала тут эфектыўныя аналітычныя інструменты. Шырокае распаўсюджванне ў даследчай практыцы атрымаў падыход нямецкага сацыяльнага мысліцеля Ф. Цёніса, які выдаў у канцы XIX ст. працу «Абшчына і грамадства». Вучоны прыводзіць дыхатамію палярных тыпаў грамадскага парадку. У абшчыне, па меркаванні Цёніса, валявыя адносіны (а яны ляжаць у падмурку практыкі ўладарання) носяць арганічны характар, а ў сістэме, якая вызначаецца як грамадства, – механічны.

Гэты падыход прадоўжыў Т. Парсанс. Ён сфармуляваў шэраг бінарных, парных пераменных каштоўнасных арыентацый: 1) *«універсалізм – партыкулярызм»* як арыентацыі на падпарадкаванне адзіным агульным правілам або патрабаванням, якія выцякаюць са спецыфікі асобных сітуацый; 2) *«афектыўнасць – афектыўная нейтральнасць»* як аснова сацыяльна-псіхалагічнай матывацыі; 3) *«арыентацыя на сябе – арыентацыя на групу»* як спосабы выбару мадэлі дзеяння або свядомасці інтарэсаў; 4) *«прадпісанне – дасягненне»* – крытэрыі ацэначнага ўспрыняцця, падыходу да статусных характарыстык людзей, якія асноўваюцца на прадвызначанасці, часам прыроджанай (сацыяльнай, саслоўнай, расавай, этнічнай, племянной, рэлігійнай і г. д.), або зыходзячы з паспяховасці і выніковасці дзеянняў чалавека; 5) *«спецыфічнасць – дыфузнасць»* – вузкія ці шырокія (мнагазначныя) адносіны да аб'екта, абмежаваныя рамкамі дадзенага дзеяння. Да гэтага пераліку тыповых пераменных С. Ліпсет дадае яшчэ адну дыхатамічную пару *«эгалітарнасць – элітызм»*, гэта значыць роўнасць або абранасць [4, с. 57].

Набор парсанаўскіх «тыповых» пераменных дае магчымасць раскрыць каштоўнасны механізм, які пакладзены ў аснову палітычнага статусу асобы ў розных грамадствах, у розных культурна-гістарычных сітуацыях. Без гэтага немагчыма зразумець у якім-небудзь набліжэнні любую палітычную культуру.

Каштоўнасці ляжаць у аснове выпрацоўкі інтарэсаў, палітычных пазіцый і арыентацый людзей, надаюць ім пэўную форму і кірунак. Пад каштоўнаснымі арыентацыямі разумеюцца ўспрынятыя чалавекам каштоўнасці, якія з'яўляюцца мэтамі яго палітычных дзеянняў і асноўных сродкаў іх дасягнення; тым самым яны набываюць функцыю важнейшага рэгулятара індывідуальных палітычных паводзін. Як адлюстраванне фундаментальных інтарэсаў, каштоўнасныя арыентацыі праяўляюць суб'ектыўныя палітычныя пазіцыі людзей, іх разуменне свету палітыкі.

Каштоўнасныя арыентацыі задаюць некаторыя коды мыслення і ўстаноўкі, якія складаюць паводзінны кодэкс, гэта значыць свайго кшталту ідэальны тып палітычнай дзейнасці чалавека. Такая сістэма арыентацый, у сваёй аснове дастаткова строгая і акрэсленая, павінна зберагаць і вядомую гібкасць, якая дазваляе чалавеку прыстасавацца да перамен палітычнай рэальнасці.

Амерыканскі даследчык У. Розенбаум, следам за Г. Алмандам і С. Вярбой, выдзяляе некалькі груп палітычных арыентацый у залежнасці ад аб'екта. У сукупнасці яны складаюць, па яго меркаванні, палітычную культуру:

1. Арыентацыі адносна інстытутаў дзяржаўнага кіраўніцтва. Гэта група ў сваю чаргу складаецца з некалькіх тыпаў: арыентацыі адносна па-

літычнага рэжыму, якія ўключаюць у сябе адзнаку і рэакцыю індывіда на дзяржаўныя інстытуты, афіцыйныя нормы і сімвалы, на афіцыйных асоб; арыентацыі адносна «ўваходаў» і «выхадаў» палітычнай сістэмы, якія ўключаюць ацэнку і рэакцыю на рашэнні дзяржаўных улад, на розныя патрабаванні ў адносінах да іх. Такім чынам, гэты тып укючае ў сябе задаволенасць (або незадаволенасць) палітыкай, уяўленні пра тое, якія патрабаванні чалавек можа выставіць у адносінах да ўлад, наколькі і як, па яго меркаванні, можа быць эфектыўнай дзяржаўная палітыка.

2. Арыентацыі адносна «іншых» у палітычнай сістэме: палітычная ідэнтыфікацыя, гэта значыць усведамленне прыналежнасці да якой-небудзь групы, палітычнай адукацыі (нацыя, горад, дзяржава, раён, палітычная партыя і г. д.); палітычная вера, гэта значыць перакананасць індывіда ў тым, што іншыя актары палітычнага жыцця азначаюць для яго нешта добрае (або дрэннае), гатоўнасць супрацоўнічаць з рознымі групамі ці, наадварот, супрацьстаяць ім; арыентацыі адносна правіл гульні, якія ўключаюць уяўленні пра тое, якіх правілаў гульні трэба прытрымлівацца ў палітычным жыцці, адносіны да правоў і абавязкаў, да палітычных меркаванняў, да дысідэнтаў і г. д.

3. Арыентацыі адносна сваёй асабістай палітычнай дзейнасці: палітычная кампетэнтнасць, гэта значыць арыентацыя на рэгулярны ці нерэгулярны ўдзел у палітычным жыцці (частата ўдзелу ў выбарах і іншых відах палітычнай актыўнасці, веданне пра палітычныя здарэнні, цікавасць да палітыкі); палітычная дзейснасць, гэта значыць уяўленне пра ступень адказнасці ўлады за свае дзеянні, пра важнасць грамадзянскай актыўнасці і ўдзел у палітычным жыцці, пра магчымасць уплываць на палітычныя рашэнні праз удзел.

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый адбываецца пад пастаянным націскам магутных дадатковых фактараў як тых, што склаліся аб'ектыўна, так і тых, што свядома накіраваны. Сярод іх трэба перш за ўсё назваць спецыфіку палітычнай культуры, сталы стыль паводзін палітычных інстытутаў, складзеную прававую практыку, уплыў розных арганізацый і маніпулятарскіх уздзеянняў, якія адлюстроўваюць сацыяльную і палітычную стратэгію інстытутаў улады, у тым ліку псіхалагічны ціск з дапамогай сродкаў масавай камунікацыі [5, с. 21]. Каштоўнасныя арыентацыі дазваляюць чалавеку ўсвядоміць сваю ідэнтычнасць, а значыць і адрозненне ад прадстаўнікоў іншай сістэмы поглядаў.

Структурным элементам палітычнай культуры, які робіць апасродкаванай сувязь паміж ментальнасцю і паводзінамі, з'яўляецца сума палітычных установак. Іх носьбітамі выступаюць або сацыяльныя групы рознай велічыні і ўзроўню, або грамадства ў цэлым. Гэта паказчыкі пэўнай гатоўнасці, схільнасці, імкнення да таго, каб дзейнічаць так або інакш, дзейнічаць тым ці іншым чынам.

Установка на палітычнае дзеянне (ці бяздзейнасць) мае сваю ўнутраную структуру. Сюды ўваходзяць: распазнанне палітычнага аб'екта або якой-небудзь сітуацыі, іх ацэнка, выбар рэагавання на знешні стымул. У сувязі з палітычнай культурай варта меркаваць пра тыповыя, больш або менш устойлівыя ўстаноўкі на ўзаемадзеянні суб'екта (індывіда, групы, грамадства) са з'явамі, працэсамі, падзеямі ў сферы ўладна-кіраўнічых адносін.

Асабліва важна прасачыць сувязь паміж палітычнымі ўстаноўкамі і палітычнымі зменамі. Сукупнасць установак характарызуе здольнасць суб'екта адаптавацца ва ўмовах палітычнага асяроддзя, якое дынамічна змяняецца. Гэтыя ж устаноўкі выконваюць шэраг прыстасаўнічых функцый, суадносяць уяўленні пра належны, пажаданы палітычны парадак, з аднаго боку, з магчымасцямі, патэнцыямі, рэальнымі шляхамі змяненняў – з другога.

Такім чынам, структурны аналіз палітычнай культуры дапамагае лепш зразумець сістэму ўзаемасувязей яе складальных элементаў, іх каштоўнасцей і прынцыпаў палітычнага арыентавання і функцыяніравання. Палітычная культура дае асобнаму чалавеку кіруючыя прынцыпы паводзін, а калектыву – сістэматычную структуру каштоўнасцей, якія забяспечваюць адзінства і ўзаемасувязь функцыяніравання інстытутаў і арганізацый. Яна прадстаўляе палітычныя ідэалы і аператыўныя палітычныя нормы, надае структуру, змест і стыль палітычнай сферы, падобна таму, як культура надае цэласнасць, інтэграванасць і асэнсаванасць грамадскаму жыццю.

*Літаратура*


1. *Дэнкэн, Ж.М.* Палітычная навука / Ж.М Дэнкэн. – М.: Выд-ва МНПЭУ, 1993. – 449 с.
2. *Вятр, Е.* Сацыялогія палітычных адносін / Е. Вятр; пер. з польск. / пад рэд. і з прад. Ф.М. Бурлацкага. – М.: Прагрэс, 1979. – 463 с.
3. *Тадэвасян, Э.В.* Слоўнік-даведнік па сацыялогіі і паліталогіі. – М.: Веды, 1996.– 179 с.
4. Курс лекцый па паліталогіі / навук. рэд. М.Х. Фарукшын. – Казань: Выд-ва Казанскага ун-та. 1994. – 270 с.
5. Абнаўленне і стабільнасць у сучасным грамадстве: параўнальны аналіз. / пад кіраўніцтвам д.г.н., праф. А.А. Галкіна. – М.: Выдавецтва «Увесь свет», 2000. – 368 с.



*Summary*

*The political culture of the society is necessary to be considered as a particular social system. It can be segregated into two main substructures that are dialectical integrity of the conceptual essence itself such as political consciousness and political behavior. Such components of the political culture as political positions, political knowledge and political presentation, the complex of the political values and value orientations as well as the sum of the political adjustments are analyzed in this article. Indeed, these structural elements underline the special significance and importance in the integral political system of the society.*

*УДК 32.008*

***Н.П. Казырэнка,***
*выкладчык кафедры ідэалогіі і палітычных навук Акадэміі кіравання*
*пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь*

# ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА: СУЧАСНЫЯ КАНЦЭПЦЫІ І ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Праблематыка палітычнай культуры з'явілася яшчэ з часоў Платона і Канфуцыя. Мысліцелі розных часоў хацелі зразумець, чаму групы людзей і цэлыя народы, якія дзейнічаюць у рамках аднолькавых палітычных сістэм, але выхаваныя на розных каштоўнасцях і маючых нятоесны гістарычны вопыт, па-рознаму ўспрымаюць адны і тыя ж з'явы паводзяць так або інакш сябе ў адных і тых жа палітычных сітуацыях. Аднак у мысліцеляў старажытнасці і філосафаў новага часу справа не пайшла далей разрозненых заўваг. Пачынаючы з XIX ст., былі спробы распрацаваць тэорыю нацыянальнага характару. Яна была пабудавана на зыбкіх пасылках і абапіралася хутчэй на інтуіцыю, чым на верыфікаваныя даныя. Да гэтага часу сярод замежных і айчынных аўтараў няма адзінай трактоўкі катэгорыі «палітычная культура», яе структуры, зместу, тыпалогіі, функцый, не знойдзена нават адзіная канцэпцыя палітычнай культуры.

Другая палова 50 – пачатак 60-х гг. XX ст. азнаменавалі сабой пачатак актыўнага даследавання грамадскіх з'яў, што належалі адначасова да сфер палітыкі і культуры. Можна дапусціць, што ў 1956 г. упершыню з'явілася канцэпцыя палітычнай культуры. Так, кніга прафесара Х. Файнера «Сістэмы праўлення вялікіх еўрапейскіх дзяржаў» мела падзагаловак: «Параўнальнае даследаванне сістэм праўлення і палітычная культура Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі і Савецкага Саюза». Недахоп гэтай працы ў тым, што ў ёй не было тлумачэння тэрміна «палітычная культура». Больш удалая спроба сфармуляваць канцэпцыю палітычнай культуры была здзейснена ў артыкуле вядомага амерыканскага палітолага Г. Алманда «Параўнальныя палітычныя сістэмы». Гэта праца і да нашага часу лічыцца канцэптуальнай базай вывучэння палітычнай культуры і на яе абапіраюцца другія даследчыкі нягледзячы на тое, што аўтар абмяжоўваў палітычную культуру толькі сферай свядомасці.

У працы «Грамадзянская культура», напісанай сумесна з С. Вербай, Г. Алманд удакладняе і развівае шэраг сваіх тэорый аб палітычнай культуры, дае яе класіфікацыю па тыпах, уводзіць паняцце нацыянальнай палітычнай культуры, але пакідае без вырашэння вельмі важныя пытанні аб границах палітычнай культуры і яе структуры. У сваёй працы аўтары даюць найбольш вядомую класіфікацыю тыпаў палітычнай культуры. Параўноўваючы палітычныя сістэмы Вялікабрытаніі, Італіі, ЗША, ФРГ і Мексікі, яны выдзелілі тры асноўныя тыпы палітычнай культуры: *патрыярхальны* (апалітычная культура), для яго характэрны адсутнасць цікавасці да палітычнага жыцця краіны, што характэрна для слабаразвітых (афрыканскіх), часткі азіяцкіх краін з моцнымі перажыткамі родаплемянных і зямлячаскіх адносін; *падданскі* тып, пры якім людзі маюць агульныя ўяўленні аб палітычнай сістэме і яе інстытутах, але не жадаюць актыўна ўдзельнічаць у палітыцы (часцей сустракаецца ў «пераходных» і перажываючых трансфармацыю грамадствах); *актывісцкі* тып, пры якім грамадзяне, палітычна граматныя і свядомыя, цікавяцца палітыкай і актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці (развітыя дэмакратычныя дзяржавы) [1].

У рэальным палітычным жыцці ўсе пералічаныя тыпы палітычнай культуры існуюць у змешаным выглядзе. Спалучаныя ў пэўнай камбінацыі і прапорцыі, яны фарміруюць грамадзянскую культуру. Для існавання стабільнай і ўстойлівай дэмакратыі неабходна гарманічнае спалучэнне актывісцкага і падданскага тыпаў палітычнай культуры, бо дэмакратыя – гэта не толькі свабода і актыўнасць, але і адказнасць, падпарадкаванне законам, правілам, прынцыпам.

Тэарэтычны фундамент пад асноўныя пастулаты палітычнай культуры падвялі ў сваіх працах С. Хантынгтон, Д. Элазер, А. Браўн, Х. Даменігез. Яны ўдакладнілі, пашырылі асноўныя палажэнні палітычнай культуры. Спробу суаднесці палітычную культуру з агульнай культурай зрабіў Д. Дэвайн у кнізе «Палітычная культура Злучаных Штатаў». Розныя трактоўкі палітычнай культуры і палітычнай сістэмы знайшлі сваё развіццё ў ідэях і канцэпцыях амерыканскіх палітолагаў і сацыёлагаў: Г. Ласуэла, Р. Маркрыдзіса, В. Поймана, Д. Марвіка. Аўтары распрацавалі новы падыход да вывучэння палітычнай культуры, галоўную ўвагу яны надавалі вывучэнню фармальных і нефармальных кампанентаў палітычных сістэм з улікам нацыянальнай палітычнай псіхалогіі, палітычнай ідэалогіі, палітычнай ідэнтычнасці.

Спробы ўдасканалення параметраў палітычнай культуры распачаў Л. Пай. Галоўную ўвагу ў структуры палітычнай культуры ён надае сукупнасці ўстановак, перакананняў і пачуццяў (set of attitudes, believes and sentiments), што задае па-

радак і прыдае значэнне палітычнаму працэсу і ўяўляе сабой асноватворныя правілы (inderlying assumptions and rules), якія кіруюць паводзінамі людзей у палітычнай сістэме, уключаюць як палітычныя ідэалы, так и нормы праўлення (nonns of polity). «Палітычная культура» ёсць, такім чынам, праяўленне ў агрэгатнай форме псіхалагічных і суб'ектыўных вымярэнняў палітыкі [2].

У сучаснай замежнай паліталогіі дамінуюць дзве асноўныя канцэпцыі палітычнай культуры. Адна з суб'ектыўнымі арыентацыямі на палітычную сістэму, другая ўключае ярка выражаныя палітычныя паводзіны як яе частку.

Феномен палітычнай культуры вывучаўся А. Токвілем, А. Шапенгаўэрам, Г. Зімелем, М. Веберам. Іх працы прыводзілі да высновы, што існуе цесная сувязь паміж палітычнымі і культурнымі кампанентамі ў сацыяльным жыцці.

Свая пазіцыя ў трактоўцы дадзенай з'явы была ў англійскіх даследчыкаў Р. Такера, М. Бернстайна. Прызнавалася, што палітычная культура ўключае ў сябе палітычныя ідэі і сацыяльную практыку.

На наш погляд, рэвалюцыйны прарыў у вывучэнні і абагульненні даных аб палітычнай культуры быў зроблены ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. галандскімі вучонымі Хьюнксам і Хікспурсам. Яны ўдасканалілі тыпалогію палітычнай культуры Алманда і Верба, даўшы сваю класіфікацыю палітычных субкультур, дапоўнілі палітычную культуру новымі тыпамі ў суадносінах з сучаснай палітычнай сітуацыяй.

Аўтары выкарысталі даступныя ім імперычныя даныя, якія характарызуюць палітычныя арыентацыі насельніцтва краін заходняга свету у 1960–1990 гг. Гэты тып яны назвалі так: «грамадзянская партысіпанцкая культура», «кліенцісцкая культура», «пратэстанцкая культура», «аўтаномная культура» і «культура назіральнікаў». Хьюнкс і Хікспурс лічылі, што суб'ектыўную палітычную цікавасць (цікавасць індывіда да палітыкі) патрэбна разглядаць у якасці эмпірычнага індыкатара – устаноўкі ў адносінах палітычнай сістэмы ў цэлым; палітычны давер, а дакладней, толькі адзін з яго паказчыкаў – давер дзяржаўным інстытутам і чыноўнікам, як імперычны індыкатар устаноўкі ў адносінах да сістэмы, адзнаку магчымасцей асабістага ўдзелу ў палітычным жыцці і ўздзеяння на палітыку.

Сукупнасць тыпаў дзеліцца на дзве групы – пасіўныя і актыўныя культуры – у суадносінах да ўзроўню арыентацый індывідаў на саміх сябе як актараў, што вымяраецца ў эмпірычных даследаваннях пытаннем аб гатоўнасці прыняць удзел у палітычным жыцці грамадства. Людзі ў першай групе культур не адчуваюць, што яны могуць аказваць уздзеянне на палітыку і не маюць жадання ўдзельнічаць у палітычных акцыях.

У другой группе культур людзі ўпэўнены ў сваёй магчымасці рэальна ўздзейнічаць на палітыку і жадаюць удзельнічаць у акцыях палітычнага характару. Узровень цікавасці да палітыкі і ўзровень палітычнага даверу былі выкарыстаны Хьюнксам и Хікспурсам для выяўлення разнастайных тыпаў унутры гэтых груп. Розніца паміж групамі – гэта розніца паміж грамадствамі, якія дынамічна развіваюцца, і грамадствамі стагніруючымі, застыўшымі.

Актывізм, як дактрына або жыццёвая арыентацыя на прамое дзеянне, дазваляючая дасягнуць пэўных пазітыўных або грамадскіх вынікаў, з'яўляецца, на думку галандскіх вучоных, важнай рысай, якая адрознівае культуры другой групы перш за ўсё ў заходніх грамадствах.

Абгрунтоўваючы сваю пашыраную тыпалогію, Хьюнкс и Хікспурс акцэнтуюць увагу як на факце суіснавання розных тыпаў палітычных культур унутры заходніх грамадстваў у перыяд 1960–1990 гг., так і на працэсах трансфармацыі гэтых грамадстваў, што прывяло за 30 гадоў да змянення працэнтных суадносін розных субкультур, што суіснуюць на Захадзе.

Акрамя вышэйадзначаных, у сучаснай паліталогіі існуюць біхевіаралісцкі і інтэрпрэтатывісцкі падыходы да вывучэння палітычнай культуры. Яны падрабязна прааналізаваны ў працы С. Уэлча «Канцэпцыя палітычнай культуры». Біхевіаралізм прадугледжвае выкарыстанне ў паліталогіі колькасных метадаў, расшырэнне прадмета даследавання ад аналізу інстытутаў да аналізу нефармальных палітычных паводзін. Інтэрпрэтатывісцкі падыход у даследаванні палітычнай культуры складаецца з пошуку, аналізу сэнсаў палітычнага жыцця. Палітычная культура з'яўляецца сэнсавым аспектам палітыкі. Метады даследавання могуць быць рознымі: ад бязмежнага апісання і абагульнення нацыянальнай гісторыі да аналізу ўзораў масавай культуры.

Такім чынам, адны заходнія палітолагі абмяжоўваюць палітычную культуру суб'ектыўнымі арыентацыямі на палітычную сістэму, іншыя ўключаюць палітычныя паводзіны ў палітычную культуру.

У айчыннай палітычнай літаратуры як савецкага, так і постсавецкага перыяду пры аналізе палітычнай культуры можна выдзеліць два падыходы. Прадстаўнікі першага – зводзяць палітычную культуру да грамадскай свядомасці ці ідэалогіі. М.М. Кейзераў разглядае палітычную культуру як спецыфічную форму адлюстравання і спосаб практычнай рэалізацыі карэнных класавых інтарэсаў у іх суадносінах з грамадскімі інтарэсамі [3]. Яго падтрымліваюць В.Э. Байкоў, В.Н. Іваноў, Р.М. Бурлацкі, А.А. Галкін. На іх думку, ядром палітычнай культуры з'яўляецца грамадскі ідэал, які ўвабраў у сябе ўсё лепшае, што ёсць у дадзеным грамадстве.

Другі падыход у В.А. Шчагорцава, Ч. Махашча і інш. Палітычная культура – гэта палітыч-

ная дзейнасць, жывая душа ўсёй духоўнай культуры.

Працэс навуковага асэнсавання такога элемента палітычнага жыцця, як палітычная культура, знаходзіцца ў актыўнай фазе станаўлення, што асабліва характэрна для краін, у якіх праходзяць трансфармацыйныя працэсы.

Мнагазначнасць падыходаў да паняцця палітычнай культуры тлумачыцца шматфактарнасцю ўмоў, у якіх яна існуе і праяўляецца.

Разглядаючы феномен палітычнай культуры, можна вызначыць некалькі падыходаў да трактоўкі гэтага паняцця: 1. А'бектывісцкі падыход (Р. Кар, М. Бернстайн, Р. Такер і інш.). Палітычная культура – гэта культура паводзін у палітыцы. 2. Суб'ектывісцкі падыход (М. Фуко, Ю. Хабермас і інш.). Палітычная культура – гэта навязванне індывіду палітычнага сэнсу і арыентацый, пагадненне па прычыне мэты і сэнсу праводзімай палітыкі. 3. Канструктыўны падыход (Г. Алмонд, С. Верба, С. Ліпсет, С. Вайт, Р. Лэйн, А. Вілдаўскі і інш.). Характарызуецца каштоўнасным бачаннем палітычнай культуры. Палітычныя каштоўнасці матывуюць чалавечую дзейнасць у сферы палітыкі, накіроўваюць сацыяльныя дзеянні сацыяльна-палітычных суб'ектаў. У цэлым усе канцэпцыі даследавання палітычнай культуры будуюцца на аснове культурна-аналітычнага падыходу да палітычнага жыцця. Спецыфіка даследчай праблематыкі не дазваляе нам заставацца ў рамках аднаго метадалагічнага падыходу, таму неабходна звяртацца да розных тэарэтыка-метадалагічных асноў.

### Літаратура


1. *Алмонд, Г.* Гражданская культура. Политические установки и демократии пяти наций / Г. Алмонд // Антология мировой политической мысли. В 5 т. – М.: Мысль, 1997. – С. 592–610.
2. *Pye, L.* Cultural and Political Science / L. Pye // Social science quarterly. – 1972. – Vol. 53, № 2. – P. 34.
3. *Кейзеров, Н.М.* Политическая и правовая культура. Методологические проблемы / Н.М. Кейзеров. – М.: Юридическая литература, 1983. – С. 14.



### Summary

*During the period of crucial changes of different areas of social life in the Republic of Belarus the need for scientific research, explaining theoretical and practical aspects of functioning of democratic political system, increases greatly. Theoretical and methodological aspects of holotical culture research by foreign and domestic. The scientists are analyzed in the article.*


*УДК 32 (560)*

**_М.Б. Канапацкі,_**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі і права БДПУ*

## СІЛАВЫ ФАКТАР У ПАЛІТЫЧНЫМ РАЗВІЦЦІ СУЧАСНАЙ ТУРЦЫІ

Практыка сучаснага палітычнага развіцця прадстаўлена рознымі мадэлямі палітычных рэжымаў. У структуры палітычнага рэжыму можна часам назіраць такія сістэмныя кампаненты, як алігархічныя, групы сілавой структуры, якія выконваюць нетыповыя функцыі, спрабуюць вызначыць вектар палітычнага развіцця той ці іншай дзяржавы. Як правіла, гэта адбываецца ў слабаразвітых краінах з адносна невысокім узроўнем эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Гэтыя дзяржавы адчуваюць уплыў нацыянальных традыцый, кіруючай ідэалогіі, рэлігійных вераванняў з недастаткова высокім узроўнем актыўнасці насельніцтва і структураванасці грамадства.

Нараўне са слабаразвітымі дзяржавамі можна назіраць больш развітыя, якія на працягу доўгага часу знаходзяцца пад пільнай увагай сілавых структур. Да такіх дзяржаў трэба аднесці асобныя краіны Лацінскай і Цэнтральнай Амерыкі, Паўночнай Афрыкі, Сярэдняга Усходу. Уплыў арміі, узброеных сіл абумовіў станаўленне палітычнай сістэмы турэцкага грамадства і яе сістэмных кампанентаў. Месца і роля ваенных у палітычнай сістэме дэтэрмінаваны асаблівасцямі гісторыі і традыцыяй асманскага грамадства. Гэта грамадства складалася з трох саслоўяў. Так, на працягу доўгай гісторыі Асманскай імперыі на палітычнае развіццё краіны значна ўплывалі янычары. У якасці прыкладу можна прывесці ўмяшанне ў часы праўлення Селіма III. Рэформа 1856 г. была спробай змянення сацыяльнага ўкладу грамадства. Яна садзейнічала актывізацыі яго пэўнай часткі.

Перадавыя пазіцыі ў грамадстве пачынаюць займаць так званыя «младатуркі», якія ўяўляюць інтарэс перадавой часткі пануючага класа. Младатуркі садзейнічалі ўстанаўленню рэжыму канстытуцыйнай манархіі, трансфармацыі манархіі ў паўтэакратычны рэжым. У асманскім грамадстве шырокае распаўсюджанне атрымала ідэалогія панцюркізму, якая садзейнічала ваеннаму перавароту і прыняццю новай Канстытуцыі. Ваенны пераварот 1908 г. дазволіў младатуркам актыўна ўплываць на ўнутраную і знешнюю палітыку.

Ідэі панцюркізму, адраджэння былой веліччы Асманскай імперыі спрыялі актывізацыі турэцкай дзяржавы, уцягненню яе ў Першую сусветную вайну. Паражэнне ў вайне азначала крызіс панцюркізму, палітычную і ідэалагічную няслушнасць младатуркаў. Пагроза краху дзяржавы і

грамадства стымулявала вылучэнне новай генерацыі рэфарматараў. Сярод паплечнікаў Камаля Атацюрка не было адзінства думкі па пытанні стварэння новай мадэлі дзяржавы і вызначэння месца і ролі кіраўніка дзяржавы. Некаторыя паплечнікі лічылі, што ваенным павінна належаць вядучая роля ў палітычным развіцці і асобае месца ў палітычнай сістэме. Меркавалі, што ваенныя з'яўляюцца гарантам стварэння і ўмацавання свецкай дзяржавы.

Манапалізацыя і канцэнтрацыя ўлады ў руках заснавальніка дзяржавы выклікалі адмоўную рэакцыю сярод паплечнікаў. Нездаволенасць паплечнікаў армейскіх вярхоў прымусіла кіраўніцтва дзяржавы пайсці на ўступкі. Было аб'яўлена аб стварэнні новай палітычнай партыі, альтэрнатыўнай кіруючай. Апазіцыйна настроеныя генералы змаглі рэальна займацца палітыкай. Слабая дзяржава, не здольная праводзіць незалежную палітыку і палітычны курс, аказалася ў залежнасці ад ваенных.

Першую спробу выйсці з-пад кантролю ваенных зрабіў А. Мелдзерэс. Лідэр Дэмакратычнай партыі і кіраўнік урада імкнуўся максімальна дыферэнцыраваць палітычнае жыццё. Дыферэнцыраванне палітычнага жыцця, яго дэмакратызацыя дазволілі актывізавацца розным палітычным сілам апазіцыйна настроеных у адносінах да ваенных. Палітыка кіруючай партыі прадугледжвала выцясненне ваенных з палітычнага жыцця і асалабленне іх уплыву ва ўладных структурах. Кіруючая партыя імкнулася аслабіць уплыў генералітэту і ўзмацніць уплыў малодшага афіцэрскага саставу. Такая палітыка, праводзімая ўрадам, справакавала выступленне ваенных.

У маі 1960 г. ваенныя захапілі ўладу і ўстанавілі кантроль над сістэмай бяспекі і знешняй палітыкай. Прэзідэнту краіны прапанавалі звольніцца з пасады, а кіраўнік урада быў абвінавачаны ў дзяржаўнай здрадзе і пакараны. Не валодаючы дастатковай сацыяльнай апорай, ваенныя вымушаны былі пайсці на кампраміс з кіруючай элітай. На справе гэта азначала выбранне лідэра путчыстаў кіраўніком дзяржавы і зацвярджэнне кааліцыйнага ўрада з прадстаўнікоў розных партый. У зноў заснаваным вышэйшым заканадаўчым органе (сенаце) большасць месц была зарэзервавана ваеннымі.

У адрозненне ад ваенных пераваротаў у іншых краінах турэцкія ваенныя першапачаткова не імкнуліся застацца каля ўлады. Такой думкі прытрымліваецца французскі даследчык Эдуард Саблье. Дзеянні ваенных можна было параўнаць з зубной пастай, якую, выдавіўшы, немагчыма загнаць унутр [1].

Наступныя ваенныя перавароты паказалі, што армія захавала ўплыў на палітычную ўладу і што кіруючая кемалісцкая ідэалогія не настолькі папулярная. Як вынік, абазначыўся рост карпаратывізму ў армейскім асяроддзі. Ідэалагічнае супрацьстаянне ісламу і кемалізму перарасло ў супрацьстаянне палітычных партый, якія па-рознаму ўспрымалі традыцыйныя каштоўнасці ў партыйнай ідэалогіі. І ў гэтых умовах армія як частка грамадства адчувала ўплыў розных ідэалогій. Тагачасны лідэр Партыі справядлівасці С. Дэмірэль паспрабаваў прааналізаваць дзеянні турэцкіх ваенных, параўнаць іх з ваеннымі пераваротамі ў краінах Лацінскай Амерыкі і Афрыкі. Згодна з яго сцвярджэннем, ваенныя апраўдваюць сваё ўмяшанне ў палітычнае жыццё неабходнасцю абароны дэмакратыі і суверэнітэту народа. Звальненне з пасады кіраўніка ўрада ён тлумачыў імкненнем не дапусціць роспуску парламента і прыходу ваенных да ўлады [2].

Прыход ваенных да ўлады ў верасні 1971 г. выклікаў сур'ёзныя знешнепалітычныя праблемы. Намецілася тэндэнцыя трансфармацыі пасіўнай знешняй палітыкі ў актыўную. Канфлікт на Кіпры і амерыканскі націск на Турцыю ў НАТА прымусілі апошнюю ўмяшацца ў канфлікт і акупіраваць паўночную частку вострава. Упершыню з моманту вайны за незалежнасць турэцкая армія выступіла ў ролі абаронцы знешнепалітычных інтарэсаў дзяржавы. Дыктат ЗША, амерыканскі націск дазволілі на некаторы час аб'яднацца супрацьлеглым, проціборствуючым сілам. Нядоўгая стабілізацыя палітычнага жыцця перарасла ў канфрантацыю ў другой палове 70-х гг. Чарговы ваенны пераварот азнаменаваўся змяненнямі ў Канстытуцыі, легалізацыяй выкладання рэлігійных прадметаў у навучальных установах. Умяшанне ваенных, іх палітычныя ініцыятывы дэзавуіравалі сітуацыю палітычнага супрацьстаяння. Мадэрнізацыйны праект, які меў на мэце стварэнне свецкай дзяржавы з апорай на армію, адбыўся са значнымі змяненнямі і карэкціроўкамі. Як адзначае турэцкі даследчык Фюсун Юсцель, ваенны рэжым, пазбаўлены сапраўднай грамадскай падтрымкі, павінен быў кампенсаваць гэты недахоп, уключаючы рэлігійны фактар у свой ідэалагічны кантэкст [3].

Жаданне ўмацаваць рэжым альянсам нацыяналізму і ісламу на справе адказвала ідэям прыхільнікаў «турэцка-ісламскага сінтэзу». Ваенны рэжым цярпіма адносіўся да ісламскіх рухаў. І ў той жа час ваенны рэжым абмежаваў дзейнасць палітычных партый і прафсаюзных арганізацый. Тагачасны кіраўнік урада Тургут Озал, выкарыстоўваючы ліберальныя метады ў эканоміцы, змог дасягнуць некаторых поспехаў. Поспехі ў эканоміцы кааліцыі «турэцка-ісламскага сінтэзу» дазволілі яе лідэрам перагледзець канцэпцыі свецкай дзяржавы і прызнаць яе ўстарэлай. Новая канцэпцыя садзейнічала актывізацыі ісламскага руху напружанасці ў грамадстве. Незадаволенымі былі розныя грамадскія пласты: інтэлігенцыя, моладзь, нязгодныя з дзеяннямі ваенных і палітыкай урада.

Як адзначае шэраг турэцкіх даследчыкаў, эксплуатацыя рэлігійных пачуццяў па сваёй сур'ёзнасці перавышае пагрозу з боку курдскіх сепаратыстаў і ў наш час з'яўляецца казырнай картай палітычных партый. Нават такі палітык заходняй арыентацыі, як Тэнсу Чылер, які традыцыйна дыстанцыруецца ад ісламу, у сваіх палітычных закліках выкарыстоўвае рэлігійныя ідэі.

Палітычная сітуацыя ў Турцыі вымушае новае пакаленне турэцкіх палітыкаў шукаць выйсце са склаўшагася становішча. Многія мяркуюць, што палітычнае развіццё пойдзе па традыцыйным сцэнарыі, а актывізацыя ісламскіх сіл справакуе ўзброеныя сілы на чарговы ваенны пераварот. Аналіз развіцця турэцкай дзяржавы паказвае, што ўмяшанне ваенных, калі і адбудзецца, то не прывядзе да рашэння праблем, а яшчэ больш паглыбіць палітычную сітуацыю.

Вынікі апошніх парламенцкіх выбараў прадэманстравалі ўстойлівую тэндэнцыю ўкаранення ідэалогіі «турэцка-ісламскага сінтэзу» ў палітычнае развіццё турэцкай дзяржавы. Кіруючая палітычная партыя атрымала большасць дэпутацкіх мандатаў у парламент і вылучыла свайго прадстаўніка на пост кіраўніка дзяржавы. Ідэалогія «турэцка-ісламскага сінтэзу» стала здабыткам большай часткі турэцкага грамадства. Гэта прызнаюць і лідэры Еўрасаюза, павіншаваўшыя Абдулу Гюля ў сувязі з выбраннем на пасаду прэзідэнта Турэцкай Рэспублікі.

Кіруючая партыя фармальна прытрымліваецца памяркоўна ісламісцкіх поглядаў, імкнучыся не правакаваць армію і сваіх палітычных апанентаў. Палітыка паэтапнай, паступовай ісламізацыі, супрацьстаянне старога і новага дазволіла стварыць такую мадэль развіцця, якая станоўча ўспрымаецца большай часткай турэцкага грамадства.

У сувязі з гэтым армія хоць і захоўвае свае пазіцыі ў грамадскім развіцці, але ўсё ж набывае новыя, больш тыповыя, звычайныя для ўзброеных сіл функцыі. Геапалітычная сітуацыя ў рэгіёне патрабавала ад турэцкай дзяржавы актывізацыі знешняй палітыкі. Вайна ў Іраку, уздым курдскіх сепаратыстаў, бясконцыя канфлікты вакол Ізраіля апасродкавалі стварэнне магутнай турэцкай арміі. У сучасных умовах армія выступае як гарант бяспекі краіны і не спрабуе ўплываць на ход палітычнага развіцця. Ва ўмовах адноснай палітычнай стабілізацыі ўмяшанне немагчыма па дзвюх прычынах. Папершае, яно выкліча негатыўную рэакцыю Еўрасаюза, асноватворныя прынцыпы якога не дапускаюць умяшання арміі ў палітычнае жыццё краіны, па-другое, сама армія не была настроена на такое ўмяшанне. Яна хоць і імкнецца абараніць асновы дзяржаўнай палітыкі, тым не менш, сама ідэалогія кемалізму на працягу доўгага часу зведала радыкальныя змяненні. З гэтай прычыны заявы аб магчымым умяшанні арміі, на наш погляд, маюць на мэце дыскрэдытацыю развіцця турэцкай дзяржавы, спробу паставіць знак роўнасці з краінамі эканамічна і палітычна адсталымі.

Сучасныя палітыкі, даследчыкі павінны прызнаць слушнасць турэцкай мадэлі развіцця, якая сфарміравалася ў асобых умовах і пад уплывам спецыфічных фактараў.

*Літаратура*

1. Edonard Sablier La defeuse Paris mars. – 1944. – P. 18.
2. Millet 27 mayis 1990.
3. Fusun Ustel La synthese turco- islamique entre traditionnalisme et modirnisme // dans Thoix Tacques et Kancal. – P. 387–388.

*Summary*

*In this article it is shown that militarians contributed to the statement of the unique model of development of the turkish state. The problems of the past and present are analyzed.*

УДК 316.7

***Т.В. Стаховіч,***
*выкладчык кафедры музычнай педагогікі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва БДАМ*

# САЦЫЯЛЬНА-ДУХОЎНЫ АСПЕКТ ТВОРЧАСЦІ КАМПАЗІТАРА ГАЛІНЫ ГАРЭЛАВАЙ

Мастацтва і духоўнасць у жыцці творчай асобы – з'явы ўзаемна спараджаючыя адна адну. Мастацкі твор узнікае з дзвюх патрэбнасцей: імкнення перайсці на новы ўзровень духоўнасці або рэалізацыі створанага. Ці існуе духоўнасць у такой галіне, як акадэмічная музыка? – пытанне здаецца недарэчным, паколькі факт стварэння прыгожага і альтэрнатыўнага яму непрыгожага рознымі шляхамі прыводзіць да нараджэння сапраўднага, каштоўнага, значыць, духоўнага. Аднак адсутнасць «духу», узнёсласці праяўляе сябе, калі пэўная з'ява не ўтрымлівае сацыяльнай абумоўленасці. Кампазітар належыць гістарычнаму адрэзку часу, грамадству, што выражаецца праз яго мастацкую прыроду. У гэтай сувязі паняцці «кампазітарскае мастацтва», «матывацыя творчасці», «гендэрныя прадпасылкі стварэння», «ідэя твора», «функцыянальнасць кампазітарскай творчасці» разглядаюцца намі як сацыяльна-духоўныя элементы стваральніцкай дзейнасці.

Абгрунтаванне падобнай тэмы актуалізавана дэфіцытам ведаў аб рэфлексіўным баку творчасці кампазітара. Гэты аспект можа падвяргацца навуковаму аналізу з пазіцый гатовага рэзультату, стваральнага працэсу і меркаванняў аўтара музыкі.

Галіна Канстанцінаўна Гарэлава з'яўляецца аўтарам каля 300 твораў. У вакальнай, фартэпіяннай музыцы для дзяцей і дарослых, камерна-інструментальных опусах, канцэртах для саліруючых інструментаў (займаюць цэнтральнае месца ў творчасці) адлюстроўваюцца тыповыя стылявыя асаблівасці кампазітара. Усе творы Г. Гарэлавай заключаюць у сабе сацыяльна-духоўную накіраванасць, што выражаецца ў самабытным спосабе рэалізацыі ідэі, сродкаў увасаблення.

Адносіны Галіны Гарэлавай да мастацтва як формы выражэння філасофскіх, эстэтычных, чалавечых поглядаў засноўваецца на духоўным асэнсаванні таго, што адбываецца. У асобы могуць прэваліраваць высокі ўзровень культуры, інтэлігентнасць, што вызначае паводзінскія граніцы, дазваляе развіваць адсутныя рысы характару. Аднак нярэдка гэтыя якасці з'яўляюцца прыроджанымі і асоба не ўсведамляе іх каштоўнасці ў рэальным жыцці, не імкнецца да культывавання такіх. У той жа час духоўнасць – рухомая мэта чалавека, які бясконца адчувае дэфіцыт вечнага, універсальнага, прыгожага і разам з тым адпавядаючага ўласнаму прызначэнню. Існуючага ўзроўню духоўнасці заўсёды недастаткова для аптымальнага вырашэння сацыяльных праблем. Гэтага ўзроўню недастаткова і для выканання творчых планаў.

Пошук духоўнага пачатку ў творчасці прывёў Г. Гарэлаву да выдзялення сацыяльна-духоўных фактараў як умоў творчасці.

***Фактар спавядальнасці.*** Выступае прэваліруючай умовай творчасці. Кампазітар праводзіць мяжу паміж *споведдзю* і *пропаведдзю* ў мастацтве. Стваральны працэс адштурхоўваецца перш за ўсё ад патаемнага выказвання, значыць, музычны твор разлічаны на эмпатыйную рэакцыю слухача. Кампазітар – прыхільнік споведзі, сілы, канцэнтрацыі зместу выказвання, паколькі (з яе пазіцыі) пераконвае выкрышталізаванае асабістае ў мастака, эстэтычна і філасофскі пераўтворанае ў духоўны змест. Беларускі кампазітар пазбягае павучальнага прапаведніцтва: «У мастацтве дыдактыка – гэта сумна».

У спісе твораў Г. Гарэлавай адсутнічаюць духоўныя творы, спецыяльна прызначаныя для культавых мерапрыемстваў. Кампазітар бачыць на першым плане «падкрэслена-прыкладны характар царкоўнай музыкі, за якім стушоўваецца, нівеліруецца унікальная асоба музыканта». «Але ў служэнні Богу менавіта гэта павінна быць важным, як адкрытае толькі Яму патаемнае імкненне да крыніц духу»,– працягвае аўтар шматлікіх «свецкіх» твораў, тым не менш трактуемых як духоўныя. Меркаванні аб сутнасці духоўнага зместу ў музыцы і штодзённым быцці прывяло Г. Гарэлаву да пэўнага феномена яе духоўнасці: «Звяртанне да высокіх праяўленняў чалавечага духу, здольнасць адчуваць Космас, прыроду, прыгажосць – і ёсць духоўнасць». Такім чынам, духоўна-этычная пазіцыя беларускага кампазітара вельмі ясная: «Сэнс нашага жыцця заключаецца ва ўдасканаленні творчых і чалавечых якасцей. Сумленне – вельмі нязручная рыса характару, але пакуль яна ёсць – ты чалавек. Хочацца быць цярплівым ва ўсім».

Мастак сумяшчае або раздзяляе ў сваёй псіхічнай прасторы жыццё (сацыяльны фрагмент

быцця) і творчасць (духоўны), што адбіваецца на ўзвышаных памкненнях. У свядомасці сталай творцы, цэласнай асобы дзве названыя лініі могуць праходзіць паралельна, перасякацца, зліваццa, але не разыходзіцца. Тут факт нараджэння вызначае дар тварыць. Аднак, па ўдакладненні Г. Гарэлавай, каб стварыць твор мастацтва, няма неабходнасці станавіцца «звышардынарным» чалавекам, намерана заклікаць да высокага і тым самым часам крывадушнічаць: «Калі прыходзіць пачуццё, закаханыя бачаць адзін аднаго такімі, якімі іх задумаў Бог, – удасканаленымі. Так і ў творчасці. У жыцці мастак можа быць розным – грубым, эгаістычным, а сам-насам з музыкай – адухоўленым і чыстым, сапраўдным, і гэта – не маска». Момант ісціны фіксуецца ў надышоўшым і прынятым факце: прадвызначанасці быць сабой.

***Матывацыйны фактар.*** Жаданне тварыць, нягледзячы на выпрабаванні, цяжкасці стваральнага працэсу, можа зыходзячы з неабходнасці ўраўнаважыць сутнасць сацыяльных устоеў і духоўнага абнаўлення, пазнавальнага інтарэсу, патрэбнасці ў асабістым выказванні. Вышэйпералічаныя кампаненты складаюць матывацыйную аснову творчасці Г. Гарэлавай. Вылучаючы дадзены фактар, кампазітар указвае на *ўяўленне*: «Першапрычына творчасці заключаецца ў багатай фантазіі і ў самой прыродзе чалавека. Рэальнага свету недастае, патрэбна яшчэ якая-небудзь форма быцця. Яна нараджаецца ў стваральным працэсе». Аўтар выказваннем цытуе Г. Лорку: «Паэзія – гэта немагчымасць, якая стала магчымай». Так творчаму ўяўленню адводзіцца роля матэрыялізацыі гіпатэтычна існуючага зместу, кампенсацыі недастаючых жыццёвых момантаў, перажыванняў.

Нараўне з уяўленнем творчасць Г. Гарэлавай матывуецца імкненнем да наватарства, змест якога разумеецца дыферэнцыравана: «Ёсць творчасць-нараджэнне, ёсць разбурэнне, а для мяне – гэта пошук раўнавагі». Сутнасць наватарства заключаецца не абавязкова ў перакрэсліванні старога, вынаходніцтве раней неіснуючага. Кампазітар лічыць, што «можна знайсці, выдзеліць новы ракурс на традыцыйнай аснове». З гэтага арганічна выводзяцца тыпы навізны: прыдуманая (сінтэтычна створаная) і непрыдуманая (дэтэрмінаваная традыцыяй). Ва ўмовах непрыдуманай навізны творчасць рухае саму сябе сілай інерцыі, гэта – натуральны сацыяльна-духоўны працэс. Але ў дадзенай сітуацыі «важна вытрымаць выпрабаванне сваёй праваты, паколькі ёй супрацьстаіць струмень моды – вось у чым злабадзённасць сацыяльна-камерцыйнага, часта бездухоўнага боку мастацтва». У гэтай сувязі ў цяперашні час з'явілася еўрапейскае азначэнне «некатэмперальнасць» («несучаснасць») музыкі.

***Гендэрны фактар***. Даследчая этыка не дазваляе нам жорстка раздзяляць творчасць па *гендэрных прадпасылках*, але актуальна ўказаць на іх змястоўную накіраванасць, арыгінальнасць. Жанчына-творца, згодна з законамі прыроды, імкнецца зберагчы любую ідэю, якая нараджаецца, давесці яе да стадыі матэрыялізацыі. У мужчыны-творцы прэваліруюць альтэрнатыўныя адносіны да знойдзенага, ён з лёгкасцю адкідвае недасканалае і працягвае пошук. Мужчынскія творы ствараюцца буйным, адзіным штрыхом, жаночыя – дыскрэтна. У псіхалагічным, генетычным кантэксце гэта тлумачыцца наступным чынам: жынчына – носьбіт кансерватыўных генаў, мужчына – эвалюцыйных [1]. Аднак умовы сучаснасці змяняюць, узаемаабагачаюць мужчынскія і жаночыя пачаткі, асабліва ў творчасці. Парадаксальнасць навуковага мыслення была ўласціва матэматыку С. Кавалеўскай, незвычайны талент і фізічная вынослівасць – спявачцы М. Калас, стройная логіка, магутны афект – кампазітару С. Губайдулінай.

Гендэрныя праяўленні духоўнай спецыфікі ў творчасці мужчыны і жанчыны маюць свае характэрныя асаблівасці. Мужчынскія крытэрыі: глабальнасць, маштабнасць, прычынна-выніковая сувязь з'яў, стваральная разбуральнасць, аб'ектыўнасць і інш. Жаночыя: прыхільнасць сістэме, упарадкаванасць, нараджэнне, суб'ектыўнасць і інш. У кантэксце наватарскіх магчымасцей, закладзеных палавой прыналежнасцю, прапануюцца меркаванні кампазітара, прафесара БДАМ В. Кузняцова: «Распаўсюджанай з'яўляецца думка, што мужчына творыць, жанчына пераймае. Але гэта не абсалютна правільна. У Г. Гарэлавай творчасць зыходзіць са своеасаблівага погляду на прадметы, з'явы, падзеі. Яна іх бачыць, адчувае інакш, чым мужчына,– танчэй, шматгранней, таксама, як адрознівае больш адценняў у колерах вясёлкі».

***Ідэйны змест.*** Дадзены фактар у музыцы Г. Гарэлавай мае ярка выражаную сацыяльную аснову. Цэнтральным тэматычным момантам творчасці кампазітара выступае чалавек з індывідуальным лёсам, радасцямі і пакутамі. Духоўная раз'яднанасць людзей, разлад на глебе ўмоўнасцей, застарэлых жыццёвых супярэчнасцей збядняюць соцыум, лічыць творца. Згодна з дадзенай пазіцыяй, мэта мастацтва – інтэграцыя, прымірэнне чалавечых інтарэсаў. Выражэнне музычна-эстэтычнымі сродкамі калізій, маральных пошукаў павінна садзейнічаць усведамленню глыбіні і значнасці перажывання, што прыводзіць асобу да вызвалення, далейшага руху, удасканалення. Адкрыць шлях да ідэалу азначае праявіць любоў ва ўсяленскім і стваральным разуменні яго сэнсу. «Часта жыццё жорсткае, суровае і непрытульнае, але нешта трымае на пэўнай вышыні. Для мяне – гэта лю-

боў, аснова служэння. Служыць не ў цяжар, а ў радасць, служыць дарагому чалавеку, жыццю і мастацтву»,– падкрэслівае галоўную ідэю сваёй творчасці кампазітар.

Сістэмны погляд на мастацтва дазваляе вызначыць яго як з'яву самаразвіццёвую, гэта значыць самадастатковую і, як вынік, прычынна-выніковых падзей грамадскага характару. Рэгуляцыя гэтых бакоў ажыццяўляецца сацыяльнымі функцыямі мастацтва. У сваіх прафесійных уяўленнях беларускі аўтар актуалізуе ролю эстэтычнай, пазнавальнай, выхаваўчай і філасофска-псіхалагічнай функцый.

***Эстэтычная функцыя*** ў творчасці Г. Гарэлавай прадугледжвае некалькі генеральных ліній – каштоўнасную, прагрэсіўна-рамесніцкую і змястоўную. У сістэме каштоўнасцей кампазітара вышэйшай прызнаецца эстэтыка вечнага, дзе духоўнасць спараджаецца выпрацоўкай этычных крытэрыяў і творчых адносін да рэчаіснасці. «Канцэрт для альта, струнных і званоў» (2003) – найбольш яркі прыклад такой эстэтычнай накіраванасці.

З прагрэсіўна-рамесніцкай лініяй суадносяцца пошук і ўдасканаленне прыёмаў кампазітарскага майстэрства (наватарства) на аснове атрыманай школы (традыцыя). Для паўнацэннай мастацкай перадачы задуманага неабходна авалоданне адначасова двума ўзроўнямі. Найбольш эфектыўны падыход Г. Гарэлавай – вобразны: шматгранная сузіральнасць музыкі, паглыбленне ў яе прыродныя ўласцівасці дапамагаюць знайсці баланс рамяства і адкрыцця («Харал» (ч. III) з «Канцэрта для гітары з аркестрам» адлюстроўвае гэту думку).

У змесце твораў Г. Гарэлавай акцэнтуюцца эмоцыі, перажыванні, што выносяцца на сацыяльны агляд як вынік псіхалагічнай ацэнкі рэчаіснасці, псіхічнага самапераадолення. Заканамерна, што каштоўным у творчасці становіцца яе носьбіт: «Палюбі блізкага, як самога сябе»,– цытуе біблейскую запаведзь кампазітар, каб больш пераканаўча данесці сутнасць творчасці «аб сабе». Эстэтыка музыкі пачынаецца з унутранага свету яе стваральніка, спасціжэння індывідуальнасці і толькі тады прыносіцца ў дар слухачу як мастацтва, зразумелае соцыуму. На гэты конт кампазітар прапануе ўспомніць словы Дз. Пакроўскага: «Спяваць для сябе – і ёсць самае галоўнае ў жыцці», гэта азначае спяваць ад свайго імя для іншых. Прыклад найбольш асабістага твора – «Jngemisco» для альта і струннага аркестра (2007), дзе музыка першага радка («Виновный, вздыхаю и каюсь…») верша аб'ядноўвае аўтара твора, выканаўцу і слухача ў адным духоўным парыве.

***Пазнавальная функцыя*** забяспечвае працэс атрымання новага матэрыялу, неабмежаваны ў часе і аб'ёме. У творчай асобы назіраецца абвострany дэфіцыт інфармацыі, жаданне пастаянна пераадольваць граніцы вядомага і невядомага. Менавіта таму: «Вучыцца можна заўсёды і паўсюдна, на добрым і дрэнным і практычна ва ўсіх, хто ставіць жыццёвыя задачы або застаўляе задумацца», – сцвярджае неабходнасць *агульнага пазнання* Г. Гарэлава. У ліку кампазітараў, якія ёй непасрэдна перадалі майстэрства, вопыт, – К. Цесакоў, Дз. Смольскі, А. Багатыроў, Ю. Фартунатаў, С. Картэс і інш.; чалавечыя і асобасныя якасці – Л. Мухарынская, Э. Тырманд, Л. Гарэлік. У выніку ўсе намаганні, арганічна пераплаўленыя ў творах, сталі сацыяльна-духоўным кампанентам не толькі культуры аўтара, але і слухача.

*Накіравальнае пазнанне* бярэ пачатак у суб'ектыўных патрэбнасцях, прыхільнасцях творчай асобы. Г. Гарэлава знаходзіла сябе ў духоўным змесце паэзіі старажытнага Егіпта, сярэдневяковага Кітая, «сярэбранага веку», прозе У. Набокава. Усплёскі музычнага натхнення ў кампазітара адбываюцца пры сустрэчы з маляўнічымі палотнамі рускіх мастакоў XIX ст. А. Мацiса, Р. Гутуза. На творчы тонус уплываюць згушчаныя інтэлектуальныя моманты ў барока, Баху, своеасаблівая эмацыянальная палітра ў клавесінным мастацтве, свабода – у джазе. Падкрэсліваючы ў творчасці ролю падсвядомасці, кампазітар прадстаўляе багаж атрыманых уяўленняў як нешта растворанае ў мностве гукаў, прыёмаў, сродкаў сачынення. Такім жа, падсвядомым чынам гэта ўспрымае выканаўца твора і публіка ва ўмовах канцэрта, грамзапісу.

***Выхаваўчая функцыя*** не распаўсюджваецца, з пазіцый Г. Гарэлавай, на цэлы соцыум. Кампазітар бачыць яе геданістычнае прызначэнне. Але ў педагагічным працэсе, які разумеецца ў пэўным сэнсе як сацыяльны, яна вяршэнствуе. Функцыя дзейнічае ў двух кірунках: *стымуляцыя працэсу выхавання (самавыхавання)* і *прывіццё прафесійных навыкаў педагогам*, гэта значыць абучэнне. Карані выхавання прафесар бачыць у эрудыцыі. Валодаючы высокім адукацыйным цэнзам, навыкамі хуткага і якаснага засваення інфармацыі, Г. Гарэлава свабодна праводзіць асацыяцыі, паралелі ў ведах, што ўражвае вучня, фарміруе яго пазнавальную матывацыю. Але навучыцца «засяваць» інтэлектуальнае поле, здабываць ідэі павінен будучы кампазітар самастойна. «На жаль, жадаючых рухацца па гэтым шляху – адзінкі, але дзеля іх нялёгкая праца апраўдвае сябе»,– гаворыць настаўнік. На яе ўроках прыводзімым прыкладам стала дарога да майстэрства Я.А. Глебава: «Гэта чалавек, які зрабіў сябе сам. Яўгеній Аляксандравіч прыйшоў у кансерваторыю з гітарай за плячамі, а ў выніку стварыў той дэмакратычна-дэкаратыўны стыль, які столькі дзесяцігоддзяў здзіўляе ўзроўнем партытурнай работы!».

Падкрэслім, што ў класе Г. Гарэлавай часта і да месца гучаць афарызмы калег аб тайнах кампазітарскага мастацтва. Каштоўнай стала цытата кампазітара, прафесара БДАМ, В. Войціка: «Творыць не толькі кампазітар, які стварае музыку. Музыка, якая пішацца, нанова нараджае, мяняе свайго аўтара, творыць яго». Менавіта такімі з'яўляюцца духоўныя адносіны да прафесійнага майстэрства.

Да пытанняў самавыхавання Г. Гарэлава адносіць дысцыпліну, фарміраванне дамінанты творчай дзейнасці. Аднак нечаканым патрабаваннем стала культываванне эўрыстычнага пачуцця сумнення: «Талент – гэта няўпэўненасць у знойдзеным. Увесь час шукаеш і перарабляеш, але ад сумнення пазбаўляешся толькі на кароткі час, што застаўляе тварыць бясконца».

Беларуская кампазітарская школа базіруе абучэнне на працэсе спасціжэння формы музычнага матэрыялу. «Губляем самародкаў, – скардзіцца на гэта прафесар, – паколькі асоба з закладзеным арыгінальным зместам ужо часткова гатова да рэалізацыі таленту, а рамкі праграмы супярэчаць яе грунтоўнасці». Разам з тым форма – сацыяльны феномен. Напрыклад, санатна-сімфанічны цыкл фарміраваўся, відазмяняўся стагоддзямі. Менавіта таму М. Араноўскі трактуе гэту пабудову як канцэпцыю чалавека [2].

Форма, падкрэслівае Г. Гарэлава, «ахоплівае ўсё – ад задумы да тэхналогіі, усе ўзроўні, што ўкладваюцца ў агульную эстэтычную карціну». Гэта важна ў выхаванні мастака. Аб гэтым выказалася на адкрытым уроку спявачка Галіна Вішнеўская: «Мала авалодаць тэхналогіяй, трэба напоўніць душу прыгажосцю». Па-мастацку зробленая форма структуруе ўнутраны змест, раскрывае індывідуальныя якасці будучага кампазітара, увасабляе сабой дыялектычны пачатак, суразмернасць, гарманічнасць – значыць, духоўнасць.

***Філасофска-псіхалагічная функцыя*** адыгрывае ролю духоўнай дэтэрмінанты. На першы погляд, філасофія кампазітара простая, зведзена да мудрасці: жыць, тварыць, быць Чалавекам. Аднак у прастаце заключаецца жыццёвы рацыяналізм – зберагчы вялікую колькасць часу і сіл для інтэнсіўнасці творчага працэсу: «Нястрымна хочацца працаваць. Засталося мала часу. Нават калі гэта больш, чым чакаеш, усё роўна яго катастрафічна не хапае – назапасілася мноства задум і інерцыя творчасці проста лавінападобная…». Усведамленне творчага прадвызначэння, засцярога стваральнага працэсу ад перашкод – стойкая псіхалагічная накіраванасць аўтара выказвання.

Асаблівай часткай філасофіі Г. Гарэлавай стаў пошук тонкіх матэрый творчасці, якая звязана ва ўяўленнях кампазітара з энергіяй любові, у некаторым сэнсе ахвярнасцю, пакорлівасцю. «Любіць, знаходзячыся ў стане самаадрачэння, можна толькі сваё дзіця, маці…». Але паўнагучная, часам балючая прыгажосць музыкі кампазітара падказвае, што такім жа пачуццём можна ахапіць і творчасць, адчуваючы яго ломкасць, безабароненасць у стыхіі жыцця.

Markdown не трэба тут; Рознабаковасць творчасці Г. Гарэлавай дазваляе зрабіць вывады аб сутнасці наступных сацыяльна-духоўных фактараў:

- *спавядальны* – набліжае кампазітара да ўсведамлення духоўных элементаў ва ўласным псіхалагічным змесце і іх суадносін з сацыяльным;
- *матывацыйны* – складаецца са спробы ўраўнаважання сацыяльных і духоўных элементаў, імкнення да пазнання і патрэбнасці ў асабістым выказванні;
- *гендэрны* – садзейнічае тонкасці ўспрымання і вобразнага адлюстравання, альтэрнатыўнасці музычна-выразных сродкаў;
- *ідэйны* – стварае паняційна-духоўнае перажыванне: пачуццё любові, што рэалізуецца як служэнне сацыяльна-каштоўным здзяйсненням.

Накіраванасць сацыяльна-духоўных функцый, выведзеных непасрэдна са зместу творчасці Г. Гарэлавай, зыходзіць з мэтавай асновы:

- *эстэтычная* – з увасаблення і перадачы каштоўнасцей, прагрэсіўна-рамесніцкай і змястоўнай ліній стварэння музычнага твора;
- *пазнавальная* – трансляцыі соцыуму творча адаптаваных ідэй агульнага і накіравальнага характару;
- *выхаваўчая* – падрыхтоўкі часткі соцыуму, якая фарміруецца ў творчых умовах да духоўна-стваральнай дзейнасці;
- *філасофска-псіхалагічная* – дэтэрмінавання творчасці праз прадпасылкі духоўнасці: усведамленне творчага прадвызначэння і пошук «тонкіх вышэйшых матэрый».

Сапраўдны мастацкі творчы працэс – сацыялізацыя ўнутранага, індывідуальнага зместу і перанос яго на новы ўзровень духоўнасці. У стваральнай практыцы кампазітара Галіны Гарэлавай прэваліруюць крытэрыі ацэнкі дасягнутага менавіта ў абазначаных сферах інтарэсу: колькі зроблена для слухача і на якую вышыню адбыўся рух духу.

*Літаратура*

1. *Дружинин, В.Н.* Психология общих способностей / В.Н. Дружинин. – СПб.; «Питер», 2000. – С. 123.
2. *Арановский, М.Г.* Симфонические искания / М.Г. Арановский. – Л.: «Советский композ.», Ленингр. отд. – 1979.– 288 с.

*Summary*

*The social and spirifual elements of creative works by G. K. Garelova are discussed in the article. The idea of actualization of social and spiritual functios and factors is underlined. The contents and some aspecty of composer's viem are discussed as well.*

УДК 334.001

**Л.М. Давыдзенка,**
*доктар эканамічных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай тэорыі і эканамічнага выхавання БДПУ,*
**Т.Дз. Давыдзенка,**
*старшы выкладчык кафедры інфармацыйных тэхналогій Мінскага інстытута кіравання*

# ФАРМІРАВАННЕ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА КАПІТАЛУ Ў АРГАНІЗАЦЫЯХ БУДУЧЫНІ

Асноўны рэсурс сучаснага прадпрыемства, накіраванага ў будучыню, – у развіцці інфармацыйнага грамадства, якое абапіраецца на высокаадукаваных спецыялістаў. Прадпрыемству, якое выкарыстоўвае ў якасці асновы веды, характэрны наступныя прыкметы:

1) выпуск прадукцыі, у якой 50% кошту – гэта веды або аказаныя паслугі, якія абапіраюцца на выкарыстанне ведаў;

2) выкарыстанне высакакласных спецыялістаў, якія выпрацоўваюць веды і сталі асновай персаналу;

3) рыначную каштоўнасць такіх прадпрыемстваў у большай ступені вызначае капітал інтэлектуальны.

Гэтыя прадпрыемствы, акрамя сістэмы кіравання ведамі, характарызуюцца эластычнасцю і адчувальнасцю на змяненне акружэння. У сучасным прадпрыемстве ключавыя ролі адыгрываюць асобы. Аб гэтым эфекце прадпрыемства сведчыць гатоўнасць яго да атрымання новых кваліфікацый, валодання ўменнем і інфармаванасцю.

У новай сістэме гаспадарання на поспех прадпрыемства кожны раз уплывае інтэлектуальны капітал, неабходны для скачка, які дазваляе здабыць перавагу ў канкурэнцыі. Таму ўменне кіраваць інтэлектуальным капіталам стане звычайным для кожнай фірмы, якая жадае існаваць і эфектыўна канкурыраваць з іншымі.

Фарміраванне інтэлектуальнага капіталу адбываецца рознымі шляхамі. Сярод спецыялістаў і вучоных няма адназначнага яго азначэння. Аўтары прыводзяць розныя варыянты. Сярод іх:

1. Інтэлектуальны капітал – сума ведаў, якімі валодаюць творчыя людзі. Уласнасць прадпрыемства, практычнае выкарыстанне тых ведаў, якія складаюць яго каштоўнасць.

Інтэлектуальны капітал дзеліцца на 2 часткі: першая з іх уяўляе небывалыя рэсурсы адначасовага працэсу стварэння капіталу арганізацыйнага і капіталу грамадскага, другая – веды людзей і чалавечы капітал (рысунак 1).

2. Інтэлектуальны капітал – форма нематэрыяльных каштоўнасцей, якія дзякуючы ведам ствараюць значныя багацці.

У яго ўваходзяць тры асноўныя элементы:

а) *чалавечы капітал* (індывідуальна-асобасныя здольнасці і працоўныя аб’яднанні для выканання патрэб кліента, кампетэнтнасць, мысліцельная мадэль);

б) *капітал кліента* (сувязь з кліентам);

в) *капітал арганізацый* (арганізатарскія здольнасці, лакалізаваныя ў базах даных, тэхнічнай інфраструктуры, культуры, каштоўнасцях).

3. Інтэлектуальны капітал – каштоўнасць эканамічных сродкаў, капіталізаваных у рэсурсах рэчавых і людскіх.

4. Інтэлектуальны капітал – веды, вопыт, тэхналогіі, узаемадзеянне з кліентамі, прафесіяналізм, канкурэнтаздольнасць на рынку.

Іншымі словамі, гэта веды, якія можна замяніць на каштоўнасці. Паміж элементамі інтэлектуальнага капіталу ўзнікае ўзаемадзеянне, у выніку якога расце каштоўнасць. Элементы інтэлектуальнага капіталу маюць каштоўнасць або могуць быць сродкам мінулай каштоўнасці.

5. Інтэлектуальнасць арганізацыі не ёсць сума інтэлектуальнасці працаўнікоў. Інтэлектуальнасць фірмы складаецца з розных элементаў: інфармацыйная інтэграцыя, тэхналагічнасць, інавацыі, фінансы, маркетынг, арганізацыя, экалогія, сумеснае супрацоўніцтва.

6. Інтэлектуальны капітал – гэта цэлае багацце, спароджанае ведамі, якімі валодаюць фірмы. Могуць быць атрыманы як вынік працэсу трансфармацыі ведаў; таксама веды, якія з’яўляюцца інтэлектуальнай уласнасцю або інтэлектуальным актывам фірмы.

7. Інтэлектуальны капітал праяўляецца праз веды менеджэраў, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе вытворчасці дадатковага кошту.

Інтэлектуальны капітал ахоплівае рэсурсы людскія, якія генерыруюць дадатковы кошт інтэлектуальнага актыву, што становіцца сродкам інавацыі і ўяўляе нематэрыяльную каштоўнасць фірмы.




**Рысунак 1 – Структура інтэлектуальнага капіталу прадпрыемства**

8. Інтэлектуальны капітал – гэта веды, інфармацыя, інтэлектуальная ўласнасць і вопыт, які можа быць выкарыстаны для стварэння багацця. Тое, што нельга адчуць, але што можа зрабіць багатым.

Такім чынам, інтэлектуальны капітал – гэта капітал ведаў, або капітал з ведаў, інтэлектуальнасць фірмы або форма матэрыяльнай каштоўнасці. Вось чаму сутнасць інтэлектуальнага капіталу даволі значная. Не ўсе веды можна аднесці да інтэлектуальнага капіталу, а толькі тыя, што выкарыстоўваюцца фірмай.

Інтэлектуальны капітал мае складаную структуру, якую можна прадставіць наступным чынам.

***Чалавечы капітал*** – глыбокія веды, уменне, інавацыі ў арганізацыі, іх магчымасць хуткага вырашэння сваіх праблем і праблем паміж людзьмі, якія абапіраюцца на давер і ўзаемаразуменне.

***Арганізацыйны капітал*** – арганізацыйная структура, культура, інавацыі. Гэта інвестыцыі ў сістэму, філасофія новых ведаў у арганізацыі, як унутры яе, так і веды пастаўшчыкоў, каналаў пастаўкі. Гэты канал ахоплівае: структуру капіталу (веды, укаранёныя ў структуру і культуру фірмы, – патэнты, гандлёвыя знакі); капітал працэсаў прадпрыемства (працэсаў працы, тэхнікі, праграм развіцця і ўзмацнення эфектыўнасці вытворчасці або пастаўкі паслуг); капітал інавацыйны (прынясце новага, прадуманы рост інтэлектуальнага капіталу, захаванне інтэлектуальнай уласнасці).

***Рыначны капітал*** – адносіны са звязанымі арганізацыямі, са знешнім акружэннем, а таксама павага да кліентаў, канкурэнтаздольнасць. Інтэлектуальны капітал ахоплівае аднолькава веды арганізацыі і яе супрацоўнікаў, дасведчанасць, уменне, здольнасць і інавацыйнасць супрацоўнікаў для выканання патрабуемых ад іх

заданняў; таксама ўсё тое, што падтрымлівае эфектыўнасць працы ў арганізацыі, гэта значыць камп'ютэрнае абсталяванне, базы даных, арганізацыйную структуру, патэнты, ліцэнзіі, а таксама метады арганізацыі праз культуру работы з кліентамі, супрацоўнікамі, пастаўшчыкамі і канкурэнтамі.

Падрабязныя асаблівасці і апісанне структуры інтэлектуальнага капіталу дазваляюць больш паспяхова заключаць дагаворы, а таксама менеджэрам асэнсаваць важнасць кіравання інтэлектуальным капіталам. Прадпрыемствы, якія гэта разумеюць, канкурэнтаздольныя на рынку.

У сучасных канцэпцыях кіравання прадпрыемствамі (фірмамі) падкрэсліваецца неабходнасць звяртаць увагу на скрыты патэнцыял, або нематэрыяльныя актывы, якія выступаюць магутным козырам у стварэнні іх канкурэнтных пераваг і прызнаюцца асноўнымі крыніцамі стварэння кошту прадпрыемстваў. З'яўленне новага паказчыка, што адлюстроўвае рыначны кошт прадпрыемства, якім з'яўляецца інтэлектуальны капітал, патрабуе яго вымярэння. Такое вымярэнне дазволіць ідэнтыфікаваць ступень развіцця асаблівых элементаў нематэрыяльных актываў, а таксама вызначыць іх бягучы кошт. Вышэйадзначанае з'яўляецца асновай ацэнкі прадпрыемстваў, арыентаваных на нематэрыяльныя актывы.

Агульным інтэлектуальным капіталам арганізацыі (фірмы) можна назваць яе веды, якія раскрываюць канкурэнтныя перавагі на рынку. Ён сканцэнтраваны ў патэнтах, працэсах, арганізацыі, тэхналогіях, кіраўніцкіх навыках, у рабоце з кліентамі, атрыманні новых ведаў. Многія аўтары прапаноўваюць вызначыць сумарны кошт інтэлектуальнага капіталу як розніцу паміж рыначным коштам прадпрыемства і яго бухгалтарскім коштам і запісаць у наступным матэматычным выглядзе:

$$К_{ін.} = С_{рп} – С_{бп},$$

дзе $К_{ін.}$ – капітал інтэлектуальны ў грашовым выражэнні;

$С_{рп}$ – рыначны кошт прадпрыемства;

$С_{бп}$ – бухгалтарскі кошт прадпрыемства.

У практыцы прадпрыемстваў гэта вымярэнне з'яўляецца самай складанай часткай комплекснага працэсу кіравання інтэлектуальным капіталам. Яна вынікае з таго, што інтэлектуальны капітал датычыцца, галоўным чынам, якасці актываў, а не іх якасці. Па сваёй прыродзе ён мае нематэрыяльны характар, а яго вымярэнне канцэнтруецца на аналізе будучага прадпрыемства.

Нягледзячы на наяўнасць шматлікіх прац па метадах вымярэння нематэрыяльных актываў, да гэтага часу не распрацаваны абавязковы для ўсіх стандарт вымярэння інтэлектуальнага капіталу. На практыцы распрацаваны шэраг метадаў яго вымярэння, якія можна падзяліць на дзве асноўныя групы. У першай групе нематэрыяльныя актывы вымяраюцца пры дапамозе нефінансавых паказчыкаў, а вынікі прадстаўляюцца ў выглядзе карт рэзультатаў. Да другой групы адносяцца метады, якія ацэньваюць інтэлектуальны капітал у фінансавых катэгорыях.

У сувязі з узрастаючай зацікаўленасцю праблематыкай інтэлектуальнага капіталу прадпрыемства (фірмы) з'яўляюцца новыя прапановы, якія датычацца метадаў і сістэм яго вымярэння. На сучасны перыяд частка з іх знайшла сваё практычнае прымяненне, у той жа час астатнія ўсё яшчэ знаходзяцца ў сферы пастановачных канцэпцый ці з'яўляюцца толькі прыстасаваннем, выкарыстоўваемым толькі яе стваральнікамі.

Сярод распрацаваных сістэм вымярэння інтэлектуальнага капіталу трэба выдзеліць наступныя: Навігатар Скандыі, манітор нематэрыяльных актываў, ураўнаважаная карта вынікаў, мадэль VCS, мадэль IC-Rating, мадэль IVM, мадэль TVC, мадэль HVA. Асобныя сістэмы абапіраюцца на розныя метады і ў рознай ступені выкарыстоўваюць фінансавыя і нефінансавыя вымяральнікі.

Змены, узнікшыя ў сучасным свеце, вызначаюць шырокі спектр магчымасцей кіравання прадпрыемствам. Развіццё ведаў, спецыялізацыя, глабалізацыя, акружэнне канкурэнтаў вызначаюць напрамкі новых метадаў кіравання, да якіх адносіцца аўтсорсынг.

Пад аўтсорсынгам разумеецца кіраўніцкі ход, пабудаваны на прынцыпе пакінуць сабе толькі тое, што магу зрабіць лепш за іншых. Знешняму выканаўцу перадаю тое, што ён зробіць лепш. На практыцы такі метад, як правіла, апраўдвае сябе. Таму пры мадэліраванні аўтаматызаваных сістэм кіравання (АСК) трэба выкарыстоўваць метады аўтсорсынгу (рысунак 2).

Неабходна звярнуць увагу на тое, што ўзаемадзеянне АСК і аўтсорсынгу з'яўляецца інфармацыйнай стратэгіяй для дапаможнай сістэмы кіравання прадпрыемствам.

Адсюль вынікае, што мадэліраванне інфармацыйнага аўтсорсынгу павінна разглядацца як сувязь двух пагадненняў: АСК і метадаў аўтсорсынгу.

Мадэлі АСУ можна класіфікаваць наступным чынам:

- мадэль тэхнічная – тэхнічныя сродкі, сродкі сувязі;
- мадэль аб'ектыўная – правядзенне рэінжынірынгу; вызначэнне структуры АСК, сувязей, апрацоўка ўваходных даных;
- мадэль цыкла жыцця сістэмы – вызначэнне фаз рэалізацыі, варыянтаў эксплуатацыі;
- мадэль развіцця інфармацыйных тэхналогій на прадпрыемстве – спосабы развіцця ў кантэксце развіцця бізнесу;
- мадэль стратэгіі інфарматызацыі – развіццё бізнесу, павелічэнне прыбытку;




**Рысунак 2 – Аўтсорсынг як метад узаемадзеяння інавацыйных тэхналогій**[1]

- мадэль эканамічная – ацэнка варыянтаў па цане, рацыянальным укладанні інвестыцый у сістэмы інфарматызацыі.

Мадэлі і метады аўтсорсынгу ацэньваюцца па наступных крытэрыях: ахоп усіх рэсурсаў прадпрыемства; кошт; наяўнасць ці адсутнасць канкурэнтных сістэм; аналіз працягласці вытворчага цыкла; вызначэнне новых паслуг аўтсорсынгу; ацэнка вынікаў ад арганізацыі аўтсорсынгу; аналіз цаны і прыбытку.

Значны эфект для прыняцця рашэнняў дазваляюць атрымаць камп’ютэрныя сеткі. Для эфектыўнасці вынікаў аўтсорсынгу пры стварэнні АСК мэтазгодна разглядаць паняцці «контураў», а таксама «модуляў». Гэта значыць стварэння мадэлей пластоў аўтсорсынгу з пункту гледжання патрэб у адпаведных АСК, тэхнічных магчымасцях, эканамічнай эфектыўнасці.

Аналізуючы сучасныя тэндэнцыі кіравання прадпрыемствамі, трэба адзначыць, што ў свеце існуюць наступныя:

- канцэпцыя MRP – кіраванне ўсімі матэрыяльнымі рэсурсамі прадпрыемства;
- канцэпцыя ERP – кіраванне ўсімі рэсурсамі прадпрыемства з адзінай базай даных;
- канцэпцыя SCM – кіраванне знешнімі ў адносінах да прадпрыемства элементамі бізнес-ланцужка;
- канцэпцыя ERP для малых і сярэдніх прадпрыемстваў (табліца 1).

---

[1] Распрацоўка аўтараў на аснове [Edvinsson L.; Malone, 2001, с. 33], [Bratnicki M., Struzyna, 2001]; Steward T. (2001).

**Табліца 1 – Выбраныя сістэмы ERP на заходнім рынку для малых і сярэдніх прадпрыемстваў**

| Фірма | Сістэма | Модулі |
|---|---|---|
| IFS | IFS Apps | Фінансы, прадукцыя, дыстрыб’юцыя |
| Intentia | Movex | Фінасы, лагістыка |
| MS Business Solution | XAL | Усе рэсурсы прадпрыемства |
| SAP | SAP Business One | Фінансы, прадукцыя, магазіны |

**Табліца 2 – Выбраныя сістэмы на рынку краін СНД**

| Галактыка | Галактыка | Лагістыка, бухгалтэрыя |
|---|---|---|
| Электронныя офісныя сістэмы | Справа – прадпрыемства | Электронны дакументаабарот |

Патрэба ў канкурэнтных спецыялістах абумовіла неабходнасць улічваць у вучэбным працэсе вышэйшай школы наступнае: сучасныя еўрапраграмы «Еўрапейскі менеджэр» і «Маркетынгавы менеджмент»; сучасныя праграмы бізнес-інтэлекту ў краінах Балтыі; сучасныя праграмы бізнес-інтэлекту холдзінгаў нафтаперапрацоўкі Лукойл, Беларускага металургічнага завода, бытавой тэхнікі «Атлант-М» і інш. у Рэспубліцы Беларусь.

Працэс кіравання інтэлектуальным капіталам ахоплівае:

1. Развіццё палітыкі інтэлектуальнага капіталу, якая аказвае дапамогу ў дасягненні мэт усёй фірмы.

2. Захаванне ў базе даных інфармацыі аб інтэлектуальным капітале.

3. Павелічэнне і развіццё інтэлектуальнага капіталу (развіццё культуры фірмы, якая цэніць веды).

4. Ахова інтэлектуальнага капіталу (прававая, сродкаў матывацыі).

5. Маніторынг капіталу інтэлектуальнага (аналіз і ацэнка інтэлектуальнага капіталу).

Кіраванне інтэлектуальным капіталам – гэта доўгі працэс, які адрозніваецца паказчыкамі, памерамі, выкарыстаннем велічыні і развіццём скрытага патэнцыялу прадпрыемства. Ён залежыць не толькі ад спецыфікі прадпрыемства, але і колькасці і якасці інтэлектуальнага капіталу.

Для прадпрыемстваў будучыні павінны быць укладзены інвестыцыі ў развіццё інтэлектуальнага капіталу. Інтэлектуальны капітал павышае канкурэнтаздольнасць прадпрыемства. Галоўная яго мэта – вырасціць чалавечы капітал. З адыходам спецыяліста прадпрыемства губляе веды, уменне, дасведчанасць, уменне працаваць з кліентамі, пастаўшчыкамі і іншымі супрацоўнікамі.

Чалавечы капітал – важнейшы для прадпрыемстваў і арганізацый, накіраваных у будучыню. Ён займае вядучае месца ў структуры інтэлектуальнага капіталу, бо забяспечвае дынаміку арганізацыі, каштоўнасць яе інавацый, канкурэнтаздольны поспех.

### Літаратура


1. *Давыденко, Л.Н., Давыденко, Т.Д.* Интеллектуализация учебного процесса по управлению знаниями / Л.Н. Давыденко, Т.Д. Давыденко // Образование для устойчивого развития на пути к обществу знания: материалы Междунар. форума ЮНЕСКО. – Минск, 2005.
2. *Bukowitz, W.R., Williams, R.L.* The Knowledge Management Fieldbook. Financial Time / W.R. Bukowitz, R.L. Williams. – London: Prentice Hall, 2000.
3. *Stewart, T.A.* The Wealth of Knowledge, intellectual Capital and the Twenty-First Century Organization / T.A. Stewart. – London, 2001.
4. *Edvinsson, L., Malone, M.* Kapital intelektualny / L. Edvinsson, M. Malone. – Warsrawa, 2001.



### Summary

*The article describes the essence and structure of intellectual capital as well as the capital of management process taking place in a modern organiciechien. Humam Capital the jes results concerning factors of intellectual capital in fluencing the market value are preseted in the study.*


*УДК 334.7*

***Л.М. Кравец,***
*кандыдат эканамічных навук, дацэнт, загадчык кафедры фінансаў і крэдыту ГомДУ*

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АЦЭНКІ МЭТАЗГОДНАСЦІ СТВАРЭННЯ ІНТЭГРАВАНЫХ СТРУКТУР

***Уводзіны.*** Як сведчыць статыстыка, пераважную долю вытворчасці ВУП у развітых краінах, а значыць і канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі, забяспечваюць інтэграваныя прамысловыя структуры. Так, у маштабах сусветнай эканомкі дробныя і сярэднія прадпрыемствы складаюць 80% ад колькасці ўсіх прадпрыемстваў, на іх долю прыходзіцца 12% усяго дзелавога абароту. У той жа час 20 % буйных карпарацый здзяйсняюць 88% сусветнага дзелавога абароту. Прычым 500 буйнейшых карпарацый вырабляюць і рэалізуюць каля 40% сусветнага валавога ўнутранага прадукту [9]. Таму, безумоўна, будучае аблічча эканомікі нашай краіны залежыць у значнай ступені ад здольнасці прамысловых прадпрыемстваў

хутка перабудаваць свой бізнес, выкарыстоўваючы назапашаны сусветны вопыт, стварыць эфектыўныя інтэграваныя прамысловыя структуры. Мэта дадзенага артыкула – вывучэнне ролі інтэграваных прамысловых структур у эканоміцы дзяржавы і распрацоўка сістэмы паказчыкаў для ацэнкі эканамічнай мэтазгоднасці іх фарміравання.

***Асноўная частка.*** Інтэграваныя структуры ўяўляюць сабой аб'яднанні юрыдычна ці гаспадарча самастойных прадпрыемстваў (арганізацый), створаных на аснове кансалідацыі актываў ці рэалізацыі дагаворных адносін для здзяйснення сумеснай дзейнасці і дасягнення агульных мэт. Да іх адносяцца холдзінгі, канцэрны, карпарацыі, фінансава-прамысловыя групы, асацыяцыі і іншыя формы аб'яднання прадпрыемстваў.

Сярод асноўных пераваг інтэграваных прамысловых структур у параўнанні з індывідуальнымі прадпрыемствамі можна назваць перш за ўсё наступныя: аптымізацыю вытворча-тэхналагічных ланцужкоў і кааперацыйных сувязей, якія дазваляюць замкнуць у рамках адной структуры ўвесь тэхналагічны цыкл вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі; скарачэнне аб'ёму абаротных сродкаў за кошт увядзення кансалідаванага ўліку і паскарэння іх абарачальнасці, выкарыстання магчымасцей увядзення ўнутраных цэн у рамках карпарацый і здзяйснення кантролю за фінансавымі патокамі; павышэнне эфектыўнасці кіравання прадпрыемствамі-ўдзельнікамі інтэграваных структур; павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці карпарацыі, аблягчэнне доступу на рынак пазыковых фінансавых рэсурсаў; павышэнне інавацыйнага патэнцыялу кааперараваных прадпрыемстваў; павелічэнне аб'ёмаў прыбытку, рэінвесціруемага ў вытворчасць.

Паказальны ў сувязі з гэтым вопыт Расіі, эканоміка якой дэманструе ўстойлівыя тэмпы росту на працягу 7 гадоў. За невялікі перыяд кардынальным чынам палепшыліся ўсе асноўныя эканамічныя паказчыкі: ВУП рос у сярэднім за год больш чым на 6%, інфляцыя скарацілася да 10%, выраслі даходы насельніцтва і прадпрыемстваў, значнымі тэмпамі павялічваюцца інвестыцыі [10]. Гэта дасягнута ў немалой ступені з дапамогай працуючага механізму стварэння інтэграваных прамысловых структур. Расійская эканоміка сёння ў значнай ступені эканоміка буйных гаспадарчых суб'ектаў. Дробны бізнес у краіне не развіты і займае слабыя пазіцыі нават у тых галінах, у якіх ва ўсім свеце традыцыйна дамінуюць дробныя прадпрымальнікі (у цэлым па краіне доля дробнага бізнесу не перавышае 2% ВУП). Сярэднія прадпрыемствы ў Расіі ў наш час уяўляюць сабой няўстойлівыя ў арганізацыйным і інстытуцыянальным плане структуры. Яны выступаюць галоўнымі аб'ектамі для паглынання з боку буйных шматпрофільных холдзінгаў, аснову якіх складаюць арыентаваныя на сыравінны сектар прадпрыемствы (нафта- і газаздабываючыя, прадпрыемствы каляровай і чорнай металургіі і г. д.). Напрыклад, сярод расійскіх вытворцаў цэменту 66 % прадукцыі прыходзіцца на долю холдзінгаў, самых моцных і ў вытворчых і ў фінансавых адносінах інтэграваных бізнес-структур. Шэсць энергакампаній Расіі («Лукойл», «Раснафта», «Газпрам», «Сургутнафтагаз», «Газпрамнафта», «Татнафта») трапілі ў сотню лепшых у вядомым сусветным рэйтынгу Platts Top 2500 Global Energy па такіх паказчыках, як рост актываў, выручкі, прыбытку і вяртанне інвесціруемага капіталу. Па выніках 2006 г. буйнейшыя нафтагазавыя кампаніі Расіі ўмацавалі свае пазіцыі самых эфектыўных энергетычных прадпрыемстваў у свеце [7].

Рэспубліка Беларусь, абвясціўшы інавацыйны шлях развіцця, не застаецца ў баку ад сусветных тэндэнцый. У адпаведнасці з важнейшымі напрамкамі навукова-тэхнічнай дзейнасці на 2006–2010 гг., зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2005 г. № 315 [1], распрацаваны пералік дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм на 2006–2010 гг. [4]. Для рэалізацыі маштабных праектаў у галіне распрацоўкі і асваення новай тэхнікі, вымяральных прыбораў, лекавых прэпаратаў, медыцынскіх тэхналогій, нанатэхналогій у краіне створаны неабходныя перадумовы: устойлівыя тэмпы росту эканомікі, дастаткова магутны навукова-тэхнічны патэнцыял. Фарміруецца эканоміка новага тыпу, інавацыйная эканоміка, якая прад'яўляе павышаныя патрабаванні да развіцця інавацыйнай культуры грамадства, фарміравання крэатыўнага складу мыслення.

Важнейшым крокам у напрамку фарміравання інавацыйнай эканомікі з'яўляецца працэс стварэння інтэграваных структур. Так, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 60 ад 28 студзеня 2006 г. створана вытворчае аб'яднанне «Беларускі металургічны завод» з уключэннем у яго склад РУП «Беларускі металургічны завод», ААТ «Рэчыцкі завод вырабаў з металу» і ААТ «Завод швейных машын» (г. Орша) [2]. Згодна з Указам, галаўной арганізацыяй вытворчага аб'яднання з'яўляецца Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Беларускі металургічны завод». Асноўнымі задачамі ПА «Беларускі металургічны завод» з'яўляюцца: распрацоўка і асваенне новых відаў канкурэнтаздольнай прадукцыі, у тым ліку шляхам аб'яднання інтэлектуальных, фінансавых і іншых рэсурсаў арганізацый, уваходзячых у яго склад; развіццё навукова-тэхнічнага і вытворчага патэнцыялаў; удасканаленне сістэмы рэалізацыі прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках.

З мэтай стварэння адзінай сістэмы нафтапрадуктазабеспячэння, рэалізацыі поўнамаш-

табнай рэканструкцыі і мадэрнізацыі вытворчых магутнасцей, павелічэння экспартных паставак прадукцыі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 576 ад 14 верасня 2006 г. узбуйнена дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта», у склад якога ўвайшлі: Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта», восем Рэспубліканскіх даччыных унітарных прадпрыемстваў па забеспячэнні нафтапрадуктамі, Рэспубліканскае даччынае сельскагаспадарчае унітарнае прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна», а таксама тры Адкрытыя акцыянерныя таварыствы: «Лідаанафтапрадукт», «Пухавічынафтапрадукт» і «Сейсматэхніка» [3].

Тут, безумоўна, улічваецца сусветны вопыт, які сведчыць, што вызначэнне мэт карпаратыўнай інтэграцыі павінна здзяйсняцца з улікам прыярытэтных напрамкаў рэструктурызацыі прамысловасці і галіновых комплексаў, а таксама стратэгічных і камерцыйных інтарэсаў удзельнікаў. Працэсы паглыбленай кааперацыі дазваляюць узмацніць інавацыйны складальнік эканомікі краіны. Так, РУП «БМЗ» як галаўная арганізацыя ВА «Беларускі металургічны завод» з'яўляецца лідэрам у краіне па інвесціраванні ў інавацыі. Сумарны аб'ём інвестыцый у тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыю завода за перыяд з 1997 па 2005 гг. склаў 380 млн дол., а ў 2006–2007 гг. агульны аб'ём укладзеных сродкаў перавышае ўжо 440 млн дол. У кароткія тэрміны ў аб'яднанні ўведзены ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці бясшвовых труб, мадэрнізаваны драцяны стан.

Для стварэння буйных прамысловых структур могуць выкарыстоўвацца розныя механізмы інтэграцыі: зліццё, паглынанне, далучэнне, кансалідацыя, выдзяленне, а таксама рэалізацыя дагаворных адносін. У асобных выпадках могуць адначасова выкарыстоўвацца некалькі механізмаў інтэграцыі, заснаваных як на рэалізацыі правоў акцыянернай уласнасці, так і на дагаворных пачатках. Пры гэтым важнейшай умовай забеспячэння кіруемасці і празрыстасці ўзаемаадносін паміж удзельнікамі інтэграванай структуры з'яўляецца аптымальнае спалучэнне маёмасных і немаёмасных форм рэгулявання сумеснай дзейнасці.

Асноўнымі фактарамі, якія забяспечваюць эфектыўнасць інтэграванай структуры, на наш погляд, з'яўляюцца: дыверсіфікаванасць дзейнасці ўдзельнікаў, што дазваляе павысіць фінансавую ўстойлівасць кампаніі за кошт асваення новых і звязаных рынкаў збыту; высокая ступень звязанасці актываў удзельнікаў, што фарміруе доўгатэрміновыя і ўстойлівыя кааперацыйныя сувязі; забеспячэнне поўнага тэхналагічнага цыкла вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі – ад маркетынгу і распрацоўкі да серыйнай вытворчасці, збыту і абслугоўвання прамысловай прадукцыі; магчымасць дасягнення аптымальнага ўзроўню загрузкі вытворчых магутнасцей; захаванне і развіццё навукова-тэхналагічнага патэнцыялу; магчымасць інфраструктурнай забяспечанасці дзейнасці ўдзельнікаў: развітая сістэма маркетынгу, гандлёва-забеспячэнскія і фінансава-крэдытныя структуры.

Як паказвае сусветны вопыт, прыняцце рашэння аб стварэнні аб'яднання неабходна здзяйсняць на аснове комплекснай і ўсебаковай ацэнкі магчымых варыянтаў інтэграцыі. Вывучэнне розных падыходаў да ацэнкі мэтазгоднасці інтэграцыі дазволіла нам выдзеліць тры асноўныя групы крытэрыяў, па якіх можна ацаніць, ці з'яўляецца арганізацыйны праект стварэння карпарацыі абгрунтаваным, а інтэграцыя мэтазгоднай: 1) эканамічная выгада ад аб'яднання ўдзельнікаў; 2) аптымальнасць складу ўдзельнікаў; 3) эфектыўнасць унутрыкарпаратыўнага кіравання.

Адным з важнейшых напрамкаў абгрунтавання мэтазгоднасці стварэння карпаратыўных структур з'яўляецца ацэнка эканамічнага эфекту, абумоўленага фактарам інтэграцыі, так званага сінергетычнага эфекту.

Патэнцыяльныя складальнікі сінергіі ўключаюць: а) эканомію за кошт узбуйнення маштабаў вытворчасці; б) эканомію на трансакцыйных выдатках; в) эканомію ў сувязі з расшырэннем кантралюемых рынкаў, што дае магчымасць мінімізаваць выдаткі на рыначнае прасоўванне новых тавараў; г) эканомію ў выніку тыражавання вынікаў НДВКР і інвестыцыйных праектаў значнай сукупнасцю прадпрыемстваў-партнёраў; д) рост аб'ёмаў кантрактаў (заказаў) і іх лепшую рэалізуемасць пры аб'яднанні актываў; е) нарошчванне інвестыцыйнага патэнцыялу на аснове атрымання дадатковых пазыковых сродкаў, пошукі спосабаў дадатковай акумуляцыі часова свабодных грашовых рэсурсаў асобных удзельнікаў; ж) аперацыйную эканомію, звязаную з прадухіленнем дубліравання кіраўніцкіх функцый і іх цэнтралізацыяй, скарачэннем выдаткаў на рэалізацыю прадукцыі.

Колькасная ацэнка ўплыву фактару інтэграцыі можа быць атрымана на аснове параўнання дадатковай эканоміі ў выніку рэалізацыі пераваг аб'яднання і выдаткаў, звязаных са стварэннем інтэграванай структуры. Даследчыкамі даказана, што ў доўгатэрміновай перспектыве эфект ад канцэнтрацыі вытворчасці аслабляецца і яго пажадана дапаўняць эфектам ад дыверсіфікацыі дзейнасці [5].

Да асноўных паказчыкаў ацэнкі аптымальнасці складу ўдзельнікаў інтэграванай структуры, на нашу думку, можна аднесці:

1. Паказчыкі дыверсіфікацыі, вызначаемыя як адносіны колькасці асноўных напрамкаў дзейнасці прамысловых удзельнікаў да колькасці напрамкаў галіновай спецыялізацыі ўдзельнікаў.

2. Паказчыкі, што характарызуюць навукова-прамысловую інтэграцыю ў галіне канструявання і серыйнай вытворчасці – удзельная вага НДВКР, выконваемая навукова-даследчымі ўстановамі ўдзельнікаў карпарацый у агульным аб'ёме НДВКР; удзельная вага аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі на аснове ўласных НДВКР у агульным аб'ёме вытворчасці карпарацыі; удзельная вага продажу па выніках укаранення ўласных НДВКР у агульным аб'ёме абароту карпарацыі.

3. Паказчыкі, якія адлюстроўваюць развіццё кааперацыйных сувязей, – удзельная вага ўнутраных паставак па кааперацыі ў агульным аб'ёме паставак па кааперацыі; удзельная вага прамысловых прадпрыемстваў, якія спажываюць прадукцыю іншых удзельнікаў (сыравіна, матэрыялы, камплектуючыя) у агульнай колькасці прамысловых прадпрыемстваў; удзельная вага вытворчых магутнасцей удзельнікаў карпарацыі, якія задзейнічаны для забеспячэння ўнутраных паставак, у сумарнай вытворчай магутнасці прадпрыемстваў.

4. Паказчыкі фінансава-прамысловай інтэграцыі – удзельная вага нефінансавых арганізацый карпарацыі, што карыстаюцца паслугамі банка, у агульнай колькасці нефінансавых арганізацый структуры; доля юрыдычных асоб-удзельнікаў карпарацыі, якія з'яўляюцца акцыянерамі банка, у агульнай колькасці акцыянераў банка; доля нефінансавых арганізацый карпарацыі, якія знаходзяцца пад акцыянерным кантролем банка, у агульнай колькасці нефінансавых арганізацый.

5. Паказчыкі забяспечанасці гандлёва-збытавай інфраструктурай – адносіны сумарнага аб'ёму продажу прадпрыемстваў карпарацыі, забяспечанага самастойнымі гандлёвымі арганізацыямі-ўдзельнікамі, да сумарнага аб'ёму продажу прадпрыемстваў; адносіны сумарнага аб'ёму прамога продажу прадпрыемстваў карпарацыі (без удзелу пасрэднікаў) да сумарнага аб'ёму продажу.

Эфектыўнасць унутрыкарпаратыўнага кіравання залежыць ад выканання наступных умоў: наяўнасці абгрунтаванай і скаардынаванай стратэгіі здзяйснення фінансавага кіравання і кантролю за дзейнасцю інтэграванай структуры, аптымальнага ўзроўню кансалідацыі актываў у рамках галаўной кампаніі, адпрацаванасці фінасавых схем рэалізацыі кантрактных адносін паміж удзельнікамі; здольнасці галаўной кампаніі да рэалізацыі адзінай крэдытнай палітыкі; наяўнасці кваліфікаванай каманды менеджэраў у галіне фінансавага кіравання і стратэгічнага планавання; празрыстасці фінансавай і бухгалтарскай справаздачнасці і фінансавых патокаў.

Да паказчыкаў, якія дазваляюць ацаніць унутрыкарпаратыўнае кіраванне, можна аднесці: 1) адносіны памеру ўстаўнога капіталу галаўной кампаніі да сумы ўстаўных капіталаў удзельнікаў; 2) долю галаўной кампаніі ва ўласнасці ўдзельнікаў; 3) долю грашовых сродкаў галаўной кампаніі ва ўстаўным капітале інтэграванай структуры; 4) суадносіны памеру ўстаўнога капіталу галаўной кампаніі і аб'ёму інвестыцыйнай праграмы; 5) удзельную вагу прадпрыемстваў, якія ўдзельнічаюць у капітале іншых яе прадпрыемстваў; 6) удзельную вагу прадпрыемстваў інтэграванай структуры, якія ўдзельнічаюць у капітале адно аднаго.

Пры падвядзенні вынікаў праведзенага даследавання варта адзначыць, што рашэнне аб стварэнні інтэграванай структуры павінна прымацца на аснове дакладнага і ўсебаковага аналізу, які дазволіць вызначыць тып інтэграванага аб'яднання, ступень інтэграцыі, узаемаадносіны паміж удзельнікамі аб'яднання.

Сёння развітыя дзяржавы разгарнулі барацьбу на рынку інавацый: навукаёмістасць валавога ўнутранага прадукту, вызначаемая як суадносіны расходаў на навуковыя даследаваннні і велічыні ВУП, за перыяд 1981–2001 гг. вырасла ў ЗША з 2,31 да 2,79%, а ў Японіі – з 2,28 да 3,3% [6]. Такія тэмпы прасоўвання інавацый прывядуць да таго, што к 2008 г. недахоп кваліфікаваных спецыялістаў у сферы высокіх тэхналогій у краінах Еўропы дасягне каля 500 тыс. Па прагнозных разліках, у Германіі дэфіцыт кваліфікаваных спецыялістаў складзе 88 тыс. чалавек, у Вялікабрытаніі і Францыі – па 40 тыс., у Расіі – 60 тыс. [8]. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі важна правільна выбраць навукова-даследчыя прыярытэты, сканцэнтраваць сродкі ў найбольш актуальных напрамках, не дапускаць іх малаэфектыўнага расходавання. Гэта – першаступенная задача нацыянальнай інавацыйнай сістэмы любой дзяржавы. Асабліва складана пабудаваць уласную інавацыйную сістэму такой невялікай і абмежаванай па многіх параметрах канкурэнтаздольнасці (маштабы, прыродныя і працоўныя рэсурсы) краіне, як Рэспубліка Беларусь. Сусветны вопыт сведчыць, што павышэнню канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі і стварэнню эфектыўнай інавацыйнай сістэмы дзяржавы садзейнічае фарміраванне і функцыяніраванне інтэграваных структур. Таму важнейшай задачай сёння з'яўляецца ліквідацыя перашкод на шляху ўзбуйнення бізнесу, вывучэнне і выкарыстанне сусветнага вопыту стварэння і функцыяніравання рознага кшталту інтэграваных утварэнняў.

*Літаратура*


1. Об утверждении приоритетных направлений научно-технической деятельности в Республике Беларусь на 2006–2010 годы. Указ Президента Республики Беларусь от 6 июля 2005 г. № 315.
2. О создании производственного объединения «Белорусский металлургический завод». Указ Президента Республики Беларусь от 28 января 2006 г. № 60.

3. О создании государственного производственного объединения «Белоруснефть». Указ Президента Республики Беларусь от 14 сентября 2006 г. № 576.
4. Об утверждении перечня государственных научно-технических программ на 2006–2010 годы. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 января 2006 г. № 5.
5. *Гальперин, С.Б., Дороднева, М.В. и др.* Экономическое обоснование и оценка эффективности проектов создания корпоративных структур / С.Б. Гальперин, М.В. Дороднева и др. – М.: Издательский дом «Новый век», Институт микроэкономики, 2001. – 56 с.
6. *Комарова, Ж.* Новое знание – фактор прогресса / Ж. Комарова // Наука и инновации. – 2006. – № 1. – С. 61–62.
7. Повестка дня // Эксперт. – 2007. – № 34. – С. 4.
8. Повестка дня // Эксперт. – 2005. – № 43. – С. 6.
9. *Пороховский, А.* Вектор экономического развития. – М.: ТЕИС, 2002. – 305 с.
10. Российская промышленность на перепутье: что мешает нашим фирмам стать конкурентоспособными (коллектив авторов) // Вопросы экономики. – 2007. – № 3. – С. 4–34.

Summary

*In this article questions of essence and a role of the integrated structures in economy of the state have been considered. The experience of the Russian Federation on creation of such structures has been shown and questions of their formation in Belarus have been considered. The system of parameters for an estimation of expediency of creation of such integrated structures is give.*

*УДК 339.5(476)*

***М.У. Бароўка,***
*аспірант кафедры міжнародных эканамічных адносін БДУ*

# МЕТАДАЛОГІЯ АЦЭНКІ ДЫВЕРСІФІКАЦЫІ ЭКСПАРТНЫХ ПАТОКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У КРАІНЫ ЕЎРАСАЮЗА

Экспарт рэсурсаёмістых і нізкатэхналагічных тавараў з’яўляецца асноўным артыкулам валютных паступленняў у краінах з транзітыўнай эканомікай. Аднак сусветныя цэны на такія тавары хістаюцца, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да нестабільнасці валютных паступленняў і ўяўляе пагрозу для эканамічнай бяспекі краіны.

Так, адным з магчымых спосабаў памяншэння надзвычайнай залежнасці ад экспарту сыравіны з’яўляецца дыверсіфікацыя экспартнага партфеля і геаграфіі знешнегандлёвых патокаў краіны. Галоўная мэта дыверсіфікацыі – разнастаіць і расшырыць экспартны партфель краіны не за кошт сыравіны, а за кошт гатовай прадукцыі, а таксама павялічыць колькасць гандлёвых партнёраў.

У дадзеным артыкуле абмяркоўваецца пытанне адносна таго, якім чынам дыверсіфікаваны экспарт тавараў Рэспублікі Беларусь у Еўрасаюз – вертыкальна і/ці гарызантальна, высветліць, за кошт якіх тавараў адбываецца расшырэнне экспартнага партфеля.

Высветлім, што маецца на ўвазе пад гарызантальнай і вертыкальнай дыверсіфікацыяй. У працах зарубежных эканамістаў Айнал Хасана (M. Aynul Hasan), Хірахіто Тода (Hirohito Toda) даецца наступнае тлумачэнне: *гарызантальная дыверсіфікацыя* прыводзіць да змяненняў у экспарце сыравіны шляхам уключэння ў экспартны партфель абсалютна новых тавараў, раней не экспартуемых краінай. Варта адзначыць, што яна можа засноўвацца як на наяўных параўнальных перавагах краіны, так і на выяўленых новых перавагах. Прыкладам з’яўляецца вытворчасць віна, ласося і далікатэсаў у Чылі. *Вертыкальная дыверсіфікацыя* падразумявае мадыфікацыю ўжо вядомых тавараў і матэрыялаў з мэтай стварэння на іх аснове новых відаў прадукцыі з дабаўленай вартасцю. У дадзеным выпадку маецца на ўвазе выкарыстанне новых тэхналогій, дапаможных магутнасцей, галіновай кааперацыі і прыцягненні служб маркетынгу, збыту, лагістыкі і г. д.

Лічыцца, што гарызантальная і вертыкальная дыверсіфікацыі ў роўнай ступені могуць з’яўляцца патэнцыялам прагрэсу ў краіне. Аднак сам працэс прымянення (выкарыстання) кожнага з відаў адрозніваецца па тэхналагічных, кіраўніцкіх і маркетынгавых патрабаваннях. Напрыклад, пры здзяйсненні вертыкальнай дыверсіфікацыі будуць выкарыстоўвацца больш прасунутыя тэхналогіі, высокакваліфікаваная праца і большыя першапачатковыя інвестыцыі, чым пры гарызантальнай. Акрамя таго, пры вертыкальнай дыверсіфікацыі патрабаванне больш кваліфікаванага падыходу можа прывесці да большых знешніх дынамічных эфектаў.

Важна вызначыцца, якому менавіта віду дыверсіфікацыі падвергнуць экспартны партфель краіны з мэтай расшырэння колькасці экспартуемых тавараў, гэта значыць прадукцыю якіх галін трэба развіваць пры наяўнай структуры экспарту.

*Методыка ацэнкі дыверсіфікацыі экспарту.* Яе распрацоўкамі займаюцца ў асноўным зарубежныя эканамісты. У дадзеным даследаванні даецца ацэнка дыверсіфікацыі экспартных патокаў Рэспублікі Беларусь на аснове метадалогіі Айнал Хасана (M. Aynul Hasan) і Хірахіта Тода (Hirohito Toda). Яна была прапанавана імі для больш дэталёвага вывучэння працэсаў дыверсіфікацыі і яе ўплыву на эканамічны рост у найменш развітых краінах, такіх, як Непал, Малайзія, М’янма, Бангладэш. На думку аўтараў,

базай для вывучэння дыверсіфікацыі і структурных змяненняў у экспарце служаць наступныя паказчыкі: 1) кумулятыўная функцыя экспарту тавару; 2) індэкс традыцыйнасці тавару; 3) хістанні індэкса традыцыйнасці; 4) паказчык канцэнтрацыі даходаў ад экспарту; 5) індэкс агрэгатаванай спецыялізацыі.

1. Агульным крытэрыем ацэнкі дыверсіфікацыі і структурных змяненняў у экспарце пэўнай галіны прамысловасці з'яўляецца *кумулятыўная функцыя экспарту.* Калі прыняць $X_{it}$ за рэальную вартасць экспарту і-га тавару ў годзе t, то функцыя кумулятыўнага экспарту дадзенага тавару будзе мець наступны выгляд:

$$CSCEF_{it} = \frac{\sum_{t=t_0}^{t_e} X_{it}}{\sum_{t=t_0}^{t_T} X_{it}} , \qquad (1)$$

дзе $t_0$, $t_e$ і $t_T$ адпавядаюць першапачатковаму, бягучаму і канчатковаму перыяду часу даследавання. Калі пабудаваць графікі функцый двух і больш тавараў на адной плоскасці, то графік тавару, чый экспарт быў сфакусіраваны ў першапачатковым перыядзе (традыцыйны тавар), будзе моцна адрознівацца ад графіка, чый экспарт быў сканцэнтраваны ў больш познім перыядзе (нетрадыцыйны тавар). Іншымі словамі, графік функцыі «традыцыйнага тавару» будзе ссунуты ўлева ці выцягнуты ў лінію, у той час як графік функцыі «нетрадыцыйнага» тавару будзе адхіляцца ўправа.

Параўнанне графікаў функцый розных тавараў можа праліць святло на дыверсіфікацыю экспартных галін прамысловасці. Напрыклад, тавар, у якога графік функцыі больш ссунуты ўправа, не проста адносіцца да «нетрадыцыйнага» экспарту, але яшчэ лічыцца, што ён дыверсіфікаваны вертыкальна.

2. Існуе альтэрнатыўны спосаб ранжыравання экспарту па атрыбуце «традыцыйнасці». Для гэтага неабходна разлічыць індэкс «традыцыйнасці» кожнага і-га тавару за ўвесь перыяд даследавання па формуле:

$$CSTI_i = \frac{\sum_{t=t_0}^{T} CSCEF_{it}}{t_T - t_0 + 1} . \qquad (2)$$

Больш высокія значэнні індэкса будуць азначаць больш традыцыйныя экспартныя тавары. Выкарыстоўваючы формулы 1 і 2, можна вызначыць размах і прыроду дыверсіфікацыі экспартнага партфеля краіны.

Існуе некалькі варыянтаў развіцця сітуацыі. Па-першае, адбываецца шырокамаштабная вертыкальная і гарызантальная дыверсіфікацыя экспарту адначасова, калі для большай колькасці экспартуемых адзінак графікі функцыі 1) ссунуты ўправа, а значэнні функцыі 2) невялікія. Для астатняй колькасці экспартуемых адзінак графікі функцыі 1) будуць ссоўвацца ўправа ў меншай ступені, а значэнні функцыі 2) таксама будуць невялікія.

Магчымы і другі варыянт. Гарызантальная дыверсіфікацыя выкарыстоўваецца мала ці наогул не выкарыстоўваецца, але мае месца вертыкальная дыверсіфікацыя абмежаванай колькасці спецыялізаванай экспартнай прадукцыі. У дадзеным выпадку графікі функцыі 1) большасці экспартных тавараў будуць выцягнуты ў лінію (ці нават ссунуты ўлева). Ім будуць адпавядаць высокія значэнні функцыі 2). Для астатніх некалькіх экспартных адзінак графікі функцыі 1) будуць ссунуты ўправа, а паказчыкі функцыі 2) будуць невялікімі.

Пры трэцім варыянце ў краіне не праводзіцца ні гарызантальная, ні вертыкальная дыверсіфікацыя, калі графікі функцыі 1) для экспартуемых тавараў у большасці будуць уяўляць сабой лінію і ім будуць адпавядаць высокія значэнні функцыі 2).

3. Для праверкі надзейнасці індэкса 2) можна разлічыць велічыню яго адхілення за перыяд даследавання, выкарыстоўваючы наступную формулу:

$$VCSTI_i = \frac{\sum_{t=t_0}^{T_e} (CSCEF_{it} - \overline{CSCEF_i})^2}{t_T - t_0 + 1} , \qquad (3)$$

дзе $\overline{CSCEF_i}$ сярэдняе ад CSTI. Нізкія паказчыкі функцыі 3 будуць азначаць, што спалучэнне «традыцыйнасці» сярод пэўных экспартуемых тавараў краіны было нязменным на працягу ўсяго перыяду даследавання.

4. Простая вертыкальная дыверсіфікацыя азначае, што ў экспарце краіны сталі пераважаць тавары, якія ўтрымліваюць кампаненты з высокай дабаўленай вартасцю. Наадварот, узровень дыверсіфікацыі можа адлюстроўваць як колькасць тавараў у экспартным партфелі краіны, так і размеркаванне іх асобных прапорцый. У дадзеным кантэксце, разлічыўшы паказчык канцэнтрацыі (4) экспартных даходаў, можна атрымаць даныя пра ўзровень дыверсіфікацыі. У цэлым лічыцца, што маленькія значэнні індэкса 4 (дыверсіфікаваны ці разнастайны экспарт) могуць перавышаць значную стабільнасць ці рост у экспартных даходах.

Разлічыць індэкс 4 можна некалькімі спосабамі, напрыклад, з дапамогай індэкса Огіва (Ogive), энтрапіі і індэкса Гіні-Хіршмана (Gini-Hirshman). У дадзенай працы быў выкарыстаны індэкс Огіва, які вымярае адхіленні ад раўнамернага размеркавання долей экспарту сярод тавараў. Гэты індэкс можа быць выражаны як:

$$CR = \sum_{i=1}^{N} \frac{(SX_i - 1/N)^2}{1/N} , \qquad (4)$$

дзе N – агульная колькасць тавараў у партфелі экспарту краіны, $SX_i$ –фактычная (рэальная до-

ля) і-га тавару ва ўсім экспарце і I/N мяркуецца як «ідэальная» доля экспартных даходаў для кожнага тавару. Дыверсіфікаваны партфель павінен мець нізкія паказчыкі індэкса 4. У выпадку «надзвычайнай» дыверсіфікацыі, якая падразумявае раўнамернае размеркаванне долей экспарту паміж таварамі (дзе $SX_i$ роўна I/N), значэнне індэкса 4 можа быць роўным нулю. Наадварот, пры нераўнамерным размеркаванні долей экспарту ці адносна менш дыверсіфікаваным партфелі паказчыкі індэкса 4 будуць высокімі.

5. Наступнай адзінкай вымярэння доўгатэрміновых структурных змяненняў у экспарце тавараў з'яўляецца індэкс агрэгатаванай спецыялізацыі (5). Ён разлічваецца як:

$$ASI_t = \sum_{i=1}^{N} \frac{X_{it}}{\sum_{i=1}^{N} X_{it}} \cdot \qquad (5)$$

Гэты статыстычны паказчык спецыялізацыі аналагічны індэксу Герфіндаля-Хіршмана (Herfindahl-Hirschman) часта выкарыстоўваецца пры разліку канцэнтрацыі вытворчасці. Як і ў выпадку з індэксам 4, лікавае значэнне 5, набліжаючыся да адзінкі, можа адлюстроўваць высокі ўзровень спецыялізацыі ці гаварыць аб тым, што ў сваім экспарце краіна істотна спадзяецца толькі на адзін від прадукцыі. Наадварот, значэнне 5, блізкае да нуля, можа азначаць высокую дыверсіфікацыю экспартнага партфеля краіны. Неабходна заўважыць, што ў працівагу індэксу 4 індэкс 5 можа быць падлічаны для кожнага года, што з'яўляецца абавязковым для атрымання доўгатэрміновай перспектывы змяненняў у наборы экспартуемых тавараў.

***Вынікі выкарыстання методыкі замежных аўтараў пры ацэнцы экспартнага партфеля Рэспублікі Беларусь.*** Ацэнім ступень дыверсіфікацыі экспартнага партфеля Рэспублікі Беларусь. За аснову возьмем не ўсе экспартуемыя тавары, а толькі тыя, экспарт якіх у краіны Еўрасаюза прыносіў рэальны высокі даход у валюце. Намі адабраны тыя таварныя пазіцыі, валютныя паступленні ад экспарту якіх за перыяд з 2000–2005 гг. склалі больш за 50 млн дол. ЗША (табліца).

У табліцы змешчана 19 найбольш прыбытковых тавараў, якія складаюць аснову валютных паступленняў у Рэспубліку Беларусь з Еўрасаюза. Для кожнага з гэтых тавараў былі разлічаны паказчыкі кумулятыўнай функцыі экспарту за перыяд з 2000–2005 гг. і пабудаваны графікі, якія змешчаны на рысунку.

**Табліца – Асноўныя паказчыкі ацэнкі дыверсіфікацыі экспартнага партфеля Рэспублікі Беларусь з краінамі Еўрасаюза[1]**

| № | ТН ВЭД | Назва тавару | Усяго экспарт за 6 гадоў, млн дол. ЗША | CSTI Індэкс Традыцыйнасці | VCSTI Хістанні Індэкса Традыцыйнасці | Ссоўванне графіка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 6110 | світэры | 50 | 0,5185 | 0,09363 | тэндэнцыя ўлева |
| 2 | 7019 | шкловалакно | 68,12 | 0,5037 | 0,0815 | тэндэнцыя ўправа |
| 3 | 7306 | трубы | 73,03 | 0,3598 | 0,12174 | управа |
| 4 | 4104 | скура | 78,89 | 0,38606 | 0,13507 | управа |
| 5 | 4415 | тара з драўніны | 80,32 | 0,4838 | 0,09971 | тэндэнцыя ўлева |
| 6 | 6212 | гарсэтныя вырабы | 86,87 | 0,5743 | 0,08228 | дакладна ўлева |
| 7 | 6204 | адзенне жаночае тэкстыльнае | 119,6 | 0,5212 | 0,08797 | тэндэнцыя ўправа |
| 8 | 5402 | ніткі сінтэтычныя | 131,1 | 0,50586 | 0,09218 | тэндэнцыя ўправа |
| 9 | 7217 | дрот | 133,7 | 0,43509 | 0,10077 | управа |
| 10 | 7207 | паўфабрыкаты з вугляродзістай сталі | 149,95 | 0,4256 | 0,1115 | управа |
| 11 | 3501 | казеін | 151,1 | 0,3662 | 0,116104 | управа |
| 12 | 9403 | мэбля | 154,6 | 0,50109 | 0,09785 | тэндэнцыя ўправа |
| 13 | 9018 | прыборы для медыцыны | 184,1 | 0,50669 | 0,0962 | тэндэнцыя ўправа |
| 14 | 7214 | пруткі | 202,8 | 0,41256 | 0,1196 | управа |
| 15 | 8701 | трактары | 238,7 | 0,50637 | 0,09631 | тэндэнцыя ўправа |
| 16 | 3102 | азотныя ўгнаенні | 244,9 | 0,69716 | 0,10015 | улева |
| 17 | 3104 | калійныя ўгнаенні | 522,7 | 0,48093 | 0,09112 | управа |
| 18 | 4407 | лесаматэрыялы | 842,73 | 0,4756 | 0,1129 | тэндэнцыя ўлева |
| 19 | 2710 | нафтапрадукты | 12060,7 | 0,41178 | 0,10348 | управа |

[1] Разлічана аўтарам на аснове статыстычных даных [5–9].




**Рысунак – Размяшчэнне графікаў функцыі кумулятыўнага экспарту ключавых тавараў: выбарка з экспартнага партфеля Рэспублікі Беларусь[1]**

Большасць графікаў мае ссоўванне ўправа. Графікі некалькіх тавараў уяўляюць сабой слаба сагнутую ўправа лінію. Графік аднаго тавару дакладна ссунуты ўлева. Графікі трох тавараў паступова ссоўваюцца ўлева.

Такім чынам, абапіраючыся на метадалогію ацэнкі зарубежных эканамістаў, мы робім *першы вывад:* паколькі графікі большасці тавараў маюць тэндэнцыю да ссоўвання ўправа, то мае месца вертыкальная дыверсіфікацыя экспартнага партфеля найбольш прыбытковых тавараў краіны. Заўважым, што графікі не маюць ярка выражанага ссоўвання ўправа, яны толькі крыху адхіляюцца ўправа.

Цяпер пяройдзем да наступнага этапа аналізу і звернемся да індэкса традыцыйнасці тавараў. Гэта неабходна зрабіць, каб ацаніць размах дыверсіфікацыі і вызначыцца, за кошт якіх тавараў (традыцыйнага/нетрадыцыйнага) экспарту яна адбываецца.

Так, вылучым тыя тавары, графікі якіх былі ссунуты ці мелі тэндэнцыю да ссоўвання ўправа. Гэта тавары ў табліцы пад нумарамі 2–4, 7–15, 17 і 19. Індэксы традыцыйнасці дадзеных тавараў вар'іруюць ад 0,36 да 0,51. На дадзеным этапе даследавання ўзнікае пытанне, як ацэньваць дадзеныя паказчыкі. Індэкс традыцыйнасці мяняецца ад 0 да 1. Лічыцца, што ў тавараў нетрадыцыйнага экспарту найменшыя значэнні дадзенага індэкса. Таму ў нашым выпадку можна зрабіць *другі вывад:* тавары дадзеных галін можна з цяжкасцю аднесці да нетрадыцыйных, бо іх паказчыкі дастаткова высокія.

Калі параўноўваць індэксы традыцыйнасці тавараў з экспартнага партфеля Рэспублікі Беларусь і Малайзіі, то не ўзнікае ніякага сумнення, што яны вельмі высокія. Напрыклад, індэкс традыцыйнасці такой таваранай пазіцыі, як нафтапрадукты, у Малайзіі роўны 0,2947, а ў Беларусі – 0,41178.

Далей ацэнім адхіленні індэкса традыцыйнасці (табліца) для таго, каб пераканацца ў правільнасці вынікаў. Паколькі індэксы хістання традыцыйнасці для кожнага з тавараў невысокія, робім *трэці вывад:* экспартны партфель краіны быў традыцыйным і не падвяргаўся ніякім значным змяненням на працягу ўсяго перыяду даследавання, хоць у параўнанні з індэксамі хістанняў Непала, Бангладэш і Малайзіі паказчыкі Беларусі высокія.

Такім чынам, мы прыйшлі да наступнай высновы. Дыверсіфікацыя ў Рэспубліцы Беларусь адпавядае другому варыянту, апісанаму Хасанам і Тодам. Гарызантальная дыверсіфікацыя выкарыстоўвалася мала ці наогул не выкарыстоўваецца, але мела месца вертыкальная дыверсіфікацыя абмежаванай колькасці спецыялізаванай экспартнай прадукцыі.

[1] Разлічана аўтарам на аснове крыніц [5–9].

*Літаратура*

1. Export diversification and economic growth: The experience of Selected Least Developed Countries / M. Aynal Hasan, Hirihito Toda // UNESC for Asia and the Pacific, development paper #24. Mode of access: www.unescap.org/publications/ <http://www.unescap.org/publications/>
2. Agricultural Diversification for the Poor/Shawki Bargouti, Samuel Kane and oth. // Mode of access:http://www.worldbank.org
3. Export diversification and intra-industry trade in south Africa / Lennart Petersson // South African Journal of Economics Vol. 73:4 December 2005.
4. Economic developments in the UNECE region: Main conclusions of the first issue of the Economic Survey of Europe, 2005 // United Nations Economic Commission for Europe [Electronic resource]. – Sixtieth session, 22–25 February 2005. – Mode of

access: <http://www.unece.org/commission/2005/CRP_1_ECONOMIC_SURVEY.pdf>. – Date of access: 18.08.2006.
5. Внешняя торговля Республики Беларусь 1995–2000 гг. // Статистический сборник / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. – Минск, 2001. – 374 с.
6. Внешняя торговля Республики Беларусь // Статистический сборник /. Министерство статистики и анализа РБ. – Минск, 2003. – 374 с.
7. Внешняя торговля Республики Беларусь 2004 // Статистический сборник / Министерство статистики и анализа РБ. – Минск, 2004. – 376 с.
8. Внешняя торговля Республики Беларусь 2005 // Статистический сборник / Министерство статистики и анализа РБ. – Минск, 2005. – 280 с.
9. Внешняя торговля Республики Беларусь 2006 // Статистический сборник / Министерство статистики и анализа РБ. – Минск, 2006. – 367 с.

*Summary*

*Developing a successful modern economy based on natural resource exports is possible, as we can see the examples of such developed countries as Canada, Australia and some Scandinavian countries. However, there is risk associated with being highly developed on a limited number of resource-based sectors. Therefore a more diversified economic structure is something desirable. It's very important not to lose sight of what diversification policies can and cannot achieve.*

---

*УДК 33(476)+(470+571)*

***В.А. Перапёлкін,***
*кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканомікі Самарскага дзяржаўнага універсітэта*

# ЗМЯНЕННІ СУКУПНАГА ПОПЫТУ ЯК ПРЫЧЫНА СТРУКТУРНЫХ ЗРУХАЎ У ЭКАНОМІКАХ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Змест структурных зрухаў у эканоміцы прынята трактаваць як пераразмеркаванне эканамічных рэсурсаў паміж яе сектарамі і галінамі. Пры гэтым звязваюць структурныя зрухі з назіраннем і даследаваннем параметраў эканамічнага росту далёка за межамі сярэднетэрміновага цыкла. У савецкай, а затым і ў расійскай навуковай літаратуры такую пазіцыю адстойвалі Т.В. Ваейкава [1], Н.В. Волкаў [2], С.Ю. Глазьеў [3], А.Ф. Пенкін [4], Р.І. Цвылёў [7]. Аднак калі кароткатэрміновыя скачкі кан'юнктуры даюць штуршок істотным і ўстойлівым зменам у эканамічным патэнцыяле грамадства, то іх таксама трэба ўводзіць у кола аналізу змяненняў структуры эканомікі. Дадзенае палажэнне ўтрымліваецца ў працах вядомага беларускага вучонага Л.М. Пятроўскай [5–6], яго ж можна сустрэць у працах прадстаўнікоў нямецкай школы аналізу структуры эканомікі, такіх, як Э. Гундлах [9], Х. Клодт [10], В. Майснер [11], К.Х. Опенлендзер [12], Х.Р. Петэрс [13], Х. Зіберт [14]. Асабага згадвання заслугоўваюць структурныя даклады пяці вядучых эканамічных інстытутаў Германіі (Берлін – Кіль – Гамбург – Мюнхен – Эсен) [8], якія ў пэўнай меры заклалі тэарэтыка-метадалагічныя асновы структурных даследаванняў сучаснай эканомікі.

У рыначнай сістэме гаспадарання непасрэдныя прычыны структурных зрухаў караняцца ў змяненнях прапановы і попыту. У структуры прапановы яны базіруюцца на прадуктовых, тэхналагічных і арганізацыйных новаўвядзеннях, рэалізацыя якіх звязана са значнай рызыкай. Разам з тым кожны новы прадукт выцясняе старыя прадукты, кожная новая тэхналогія робіць да гэтага часу выкарыстоўваемыя тэхналогіі непатрэбнымі, гэта значыць назіраецца працэс творчага разбурэння.

Глыбіннай прычынай шырокага прымянення радыкальных новаўвядзенняў у вытворчасці станавілася вычарпанне магчымасцей эканамічнага росту «ўшырыню», на аснове ранейшых тэхналогій і іх прадуктаў, што суправаджалася з'яўленнем залішняга капіталу, неапраўданым павелічэннем эканамічных выдаткаў, стагнацыяй узроўню жыцця насельніцтва. Згортванне ўстарэлых вытворчасцей і масавае пераразмеркаванне рэсурсаў у новыя тэхналагічныя ланцугі ўяўляюць сабой абавязковую ўмову далейшага эканамічнага росту, аднак даволі кволую пры наяўнасці вялікага аб'ёму ўстарэлых вытворчых магутнасцей і пры супраціўленні сацыяльна-эканамічных інстытутаў.

Зрухі ў структуры попыту з'яўляюцца вынікам (з ростам даходаў) прыярытэтаў у спажыванні і рэакцый на змяненні адносных цэн. Абедзве прычыны выклікаюць як зрухі паміж прыватным спажываннем, у аснове якога ляжыць спажыванне хатніх гаспадарак, інвестыцыямі, расходамі на дзяржаўнае кіраванне, сальда экспарту і імпарту, так і зрухі ўнутры гэтых агрэгатаў (табліца 1).

Змяненні ў структуры выкарыстання ВУП у Беларусі і ў Расіі да 2000 г. сведчылі аб памяншэнні попыту на інвестыцыйныя тавары, які суправаджаўся, зразумела, спадам у выпускаючых іх галінах. Прычым, калі шырока прадстаўленая ў расійскай эканоміцы здабываючая прамысловасць была ў стане кампенсаваць скарачэнне ўнутранага попыту, калі пераключылася на знешні рынак, то ў займаючай істотна больш важнае месца ў беларускай эканоміцы перапрацоўчай прамысловасці, і перш за ўсё машынабудавання, такіх магчымасцей было менш. Разам з гэтым скарачэнне рэальных даходаў

**Табліца 1 – Структура выкарыстання ВУП у Беларусі (1) і ў Расійскай Федэрацыі (2), у працэнтах да выніку**

| Гады | Прыватнае спажыванне (1) (2) | Дзяржаўнае спажыванне (1) (2) | Інвестыцыі (1) (2) | Чысты экспарт (1) (2) |
|---|---|---|---|---|
| 1991 | 46,4 45,7 | 21,0 16,9 | 29,2 37,1 | 3,4 0,2 |
| 1992 | 51,1 35,5 | 15,4 14,3 | 32,0 27,9 | 1,5 0,3 |
| 1993 | 58,0 46,2 | 17,8 17,9 | 41,0 27,9 | –16,8 8,0 |
| 1994 | 60,2 47,1 | 20,1 22,6 | 32,9 25,7 | –13,2 ,6 |
| 1995 | 59,1 51,7 | 22,6 19,5 | 24,8 25,3 | –4,4 3,5 |
| 1996 | 60,0 50,3 | 20,6 20,6 | 23,5 23,7 | –4,1 21,1 |
| 1997 | 57,9 53,5 | 20,7 21,3 | 27,3 22,3 | –5,9 2,9 |
| 1998 | 58,1 57,9 | 20,0 18,7 | 26,8 16,2 | –4,9 7,2 |
| 1999 | 59,0 53,6 | 19,6 14,6 | 23,8 14,7 | –2,4 17,1 |
| 2000 | 57,9 46,6 | 19,8 14,7 | 25,8 18,6 | –3,5 20,1 |
| 2001 | 58,5 50,8 | 21,9 14,3 | 24,1 22,0 | –4,5 12,9 |
| 2002 | 60,0 50,8 | 21,2 16,9 | 22,3 21,1 | –3,5 10,8 |
| 2003 | 56,4 51,4 | 21,1 17,0 | 26,3 21,3 | –3,8 10,1 |
| 2004 | 54,6 49,0 | 20,9 16,0 | 31,0 21,0 | –6,5 14,0 |

*Крыніца:* матэрыялы Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь і Дзяржкамстата Расійскай Федэрацыі.

насельніцтва ў 90-х гг. прывяло да павелічэння долі харчовай прамысловасці ў структуры беларускай і расійскай эканомікі, паколькі змяненні ў спажывецкім попыце павольнымі тэмпамі адбываліся па таварах, якія валодалі нізкай эластычнасцю попыту, у тым ліку па прадуктах харчавання. У 1996 г. у Беларусі пачаўся эканамічны рост, які прынёс прырост ВУП на 77,4% ці ў сярэднім 6,6% у год, а ў 2004 г. – 11%, прыкметна ажывіў інвестыцыйную актыўнасць прадпрыемстваў, вымушаных адпаведным чынам рэагаваць на больш жорсткія патрабаванні да якасці тавараў і паслуг з боку хатніх гаспадарак, якія ў 2000-я гг. узмацнілі сваю плацежаздольнасць.

Аднак адрыў ад аб'ектыўна склаўшыхся інвестыцыйных патрэб нацыянальнай эканомікі, змяншэнне ці павелічэнне ўдзельнай вагі інвестыцый у структуры выкарыстання ВУП яшчэ не прычына для адназначна негатыўных ці пазітыўных ацэнак. Паслядоўнае зніжэнне долі інвестыцый у ВУП ФРГ, склаўшае за апошнія 30 гадоў 7,34 %, зусім не аслабіла пазіцыі краіны ў сусветнай эканоміцы, хоць, трэба адзначыць, выклікала ажыўленыя дыскусіі сярод эканамістаў адносна доўгатэрміновых наступстваў гэтага працэсу. У ФРГ назапашаны вялікі вопыт абнаўлення асноўнага капіталу за кошт рэканструкцыі існуючых вытворчых магутнасцей. Разумнасць пераносу акцэнту ў фінансаванні капітальных укладанняў на сродкі амартызацыйнага фонду ва ўмовах узнікнення фінансавых складанасцей зразумелая і, як правіла, эканамічна апраўданая.

Альтэрнатыўная палітыка расшырэння магутнасцей і будаўніцтва новых прадпрыемстваў больш капіталаёмкая, мацней залежыць ад агульнаэканамічнай сітуацыі і больш складаная ў выкананні. Да таго ж экспансію, здзяйсняемую шляхам павелічэння памераў чыстага накаплення за кошт скарачэння кампенсавання выбыцця, суправаджае працэс старэння вытворчага апарату. Існуюць і іншыя прычыны, якія прыводзяць да ўзрастання значэння рэканструкцыі ва ўзнаўленні асноўнага капіталу.

Дзякуючы НТП, новыя машыны і абсталяванне, маючы больш высокія ўзроўні прадукцыйнасці, эканамічнасці, рэсурсу працоўнага часу, у стане замяняць старыя, даючы істотны прырост вытворчай магутнасці без павелічэння колькасці адзінак тэхнікі. Пры абмежаванасці фінансавых рэсурсаў спакуса ператварыць чыстыя накапленні ў артыкул эканоміі на выдатках вялікая, асабліва, калі кан'юнктура на рынку схіляе да гэтага, паколькі попыт на выпускаемую прадукцыю не расце ці нават змяншаецца. Сумесны ўплыў комплексу прыведзеных прычын абумовіў тое, што ў традыцыйных галінах эканомікі сёння асноўную частку інвестыцый прынята напраўляць на абнаўленне наяўнага вытворчага апарату.

Іншыя суадносіны чыстага накаплення і кампенсавання выбыцця назіраюцца ў галінах, якія працуюць на рынку інавацыйных прадуктаў. Дынамічнае, якое хутка змяняецца, асяроддзе гэтых рынкаў, што характарызуецца хуткім і ў цэлым устойлівым ростам попыту, прадвызначае рэгулярнае абнаўленне вытворчай праграмы, павелічэнне аб'ёму прапановы пастаўшчыкам. Аптымальным варыянтам для фірм, якія дзейнічаюць у перадавых галінах, лічыцца збалансаванае спалучэнне інтэнсіўна ідучага кампенсавання выбыцця з высокімі тэмпамі накаплення, калі не на шкоду замене ўстарэлай тэхнікі забяспечваецца значнае расшырэнне вытворчых магутнасцей. Магчымасці, якія адкрываюцца ў выпадку паспяховага правядзення такой інвестыцыйнай палітыкі, вялікія, аднак складаныя.

Маштаб затрат прадугледжвае адпаведную аддачу ад зробленых укладанняў, якая заключаецца, перш за ўсё, у істотным павышэнні тэхніка-тэхналагічнага ўзроўню і эфектыўнасці функцыяніравання вытворчых магутнасцей, у скарачэнні тэрмінаў іх абнаўлення, у вывядзенні на рынак новых інавацыйных прадуктаў. Зразумела, такія гаспадарчыя паводзіны спалучаны з павышанай рызыкай, але яны дазваляюць дасягнуць новай якасці ў эканамічным развіцці. Такім чынам, перавага, аддадзеная ўкладанням у рэканструкцыю або ў расшырэнне вытворчых магутнасцей і будаўніцтва новых прадпрыемстваў, здольна ў далейшым сур'ёзна паўплываць на галіновую структуру эканомікі. І наадварот, апераджальнае развіццё перадавых навукаёмістых

або традыцыйных галін нацыянальнай эканомікі ў пэўнай ступені прадвызначае парушэнне ўсталяваўшагася балансу паміж кампенсаваннем выбыцця і чыстым накапленнем.

Прысутнасць апісанай узаемасувязі паміж структурай капітальных укладанняў і міжгаліновымі зрухамі даволі значная на сучасным этапе развіцця беларускай і расійскай эканомікі з прычыны чакаемых у бліжэйшыя гады вялікіх аб'ёмаў выбыцця асноўнага вытворчага капіталу з-за фізічнага і маральнага зносу. Забеспячэнне нават простага яго ўзнаўлення патрабуе самага сур'ёзнага павелічэння аб'ёмаў інвестыцый. Напэўна, у сітуацыі нястачы інвестыцыйных рэсурсаў будзе дамінаваць лінія на кампенсаванне выбыцця дзеючых магутнасцей.

Разам з тым, калі кіравацца задачай стварэння фундаментальных асноў устойлівага росту эканомік Беларусі і Расіі на доўгую перспектыву, мала проста замяніць адпрацаваўшую свой тэрмін тэхніку, неабходна якасна абнавіць вытворчы апарат краіны. Паўнацэнная мадэрнізацыя эканомікі немагчыма без яе пераструктуравання на аснове выдзялення вытворчасцей і галін, здольных узбагаціць валавы прадукт краіны новымі прадуктамі высокай ступені перапрацоўкі, канкурэнтаздольнымі аднолькава на ўнутраным і на зарубежных рынках. Фарміраванне такіх галін не абыдзецца без значных інвестыцый у стварэнне і расшырэнне іх тэхніка-тэхналагічнай базы, для чаго прыйдзецца павялічыць долю чыстага накаплення ў агульным аб'ёме капітальных укладанняў. У далейшым удзельная вага кампенсавання выбыцця зноў павысіцца, але толькі пасля завяршэння перыяду першапачатковага накаплення (табліца 2).

Пры параўнанні даных табліц 1–2 звяртае на сябе ўвагу шматразовае перавышэнне долі чыстага экспарту ў расійскім ВУП у адносінах да значэнняў аналагічнага паказчыка ў ФРГ і адмоўныя значэнні сальда беларускага экспарту і імпарту. Так, калі ў структуры выкарыстання ВУП у Германіі за апошняе разглядаемае дзесяцігоддзе сярэднегадавое значэнне ўдзельнай вагі чыстага экспарту складала +1,3%, то ў Расіі было +10,4%, а ў Беларусі складала –4,35%. Такое істотнае адрозненне часткова тлумачаць меншыя сярэднегадавыя велічыні ўдзельнай вагі прыватнага і дзяржаўнага спажывання ў расійскім ВУП, чым у ВУП Германіі (на 5,13 і 2,32% адпаведна). А вось сярэднегадавая доля інвестыцый у Беларусі аказалася на 5,19% вышэй, чым Расіі, і на 3,5% вышэй, чым у Германіі. У цэлым дынаміка ўдзельнай вагі па ўсіх прадстаўленых у табліцах 1–2 частках ВУП у Беларусі і асабліва ў Расіі адрознівалася значна меншай стабільнасцю нават у дачыненні да напрамку руху. Долі прыватнага і дзяржаўнага спажывання ў Германіі павольна, але ўпэўнена ўзрасталі (з 1971 г. на 3,9 і 1,55% адпаведна), доля інвестыцый, наадварот, дастаткова хутка памяншалася (на 7,34% за той жа перыяд часу).

Адназначнай тэндэнцыі не прадэманстравала толькі доля чыстага экспарту, што, урэшце, назіралася і па ВУП Беларусі і Расіі. Доля прыватнага спажывання ў расійскім ВУП мела тэндэнцыю росту да 1998 г., пасля чаго пачалося яе зніжэнне, у Беларусі памяншэнне долі прыватнага спажывання як тэндэнцыя пакуль сябе не праявіла. Тое ж самае ў Расіі мела месца ў дынаміцы долі дзяржаўнага спажывання, толькі годам пераломy стаў 1997 г. Падобнага ў Бела-

**Табліца 2 – Выкарыстанне ВУП у ФРГ, у мільярдах еўра і ў працэнтах да выніку (у цэнах 1995 г.)**

| Гады | Прыватнае спажыванне | | Дзяржаўнае спажыванне | | Інвестыцыі | | Чысты экспарт | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Млрд еўра | Доля ў ВУП (у %) | Млрд еўра | Доля ў ВУП (у %) | Млрд еўра | Доля ў ВУП (у %) | Млрд еўра | Доля ў ВУП (у %) |
| 1971 | 487,8 | 52,63 | 166,2 | 17,93 | 258,4 | 27,88 | 14,39 | 1,56 |
| 1981 | 640,9 | 54,31 | 235,3 | 19,94 | 251,7 | 21,33 | 52,14 | 4,42 |
| 1991 | 829,8 | 53,36 | 270,2 | 17,37 | 344,8 | 22,18 | 110,3 | 7,09 |
| 1991 | 966,1 | 56,47 | 326,4 | 19,08 | 399,7 | 23,36 | 18,53 | 1,09 |
| 1992 | 992,5 | 56,74 | 342,8 | 19,60 | 404,6 | 23,13 | 9,21 | 0,53 |
| 1993 | 993,6 | 57,43 | 343,2 | 19,84 | 384,5 | 22,22 | 8,86 | 0,51 |
| 1994 | 1004 | 56,71 | 351,4 | 19,85 | 404,7 | 22,86 | 10,44 | 0,58 |
| 1995 | 1043 | 56,89 | 356,8 | 19,81 | 408,1 | 22,65 | 11,62 | 0,65 |
| 1996 | 1035 | 57,02 | 363,3 | 20,01 | 396,0 | 21,82 | 20,78 | 1,15 |
| 1997 | 1041 | 56,58 | 364,5 | 19,81 | 398,5 | 21,65 | 36,19 | 1,96 |
| 1998 | 1060 | 56,47 | 368,8 | 19,65 | 419,3 | 22,34 | 28,82 | 1,54 |
| 1999 | 1092 | 57,16 | 372,7 | 19,61 | 428,4 | 22,42 | 15,59 | 0,81 |
| 2000 | 1108 | 56,30 | 379,3 | 19,27 | 445,2 | 22,62 | 35,77 | 1,81 |
| 2001 | 1120 | 56,62 | 385,6 | 19,48 | 406,7 | 20,54 | 66,43 | 3,36 |

*Крыніца:* матэрыялы Федэральнай службы статыстыкі ФРГ, разлікі аўтара.

русі не назіралася. Доля інвестыцый паслядоўна памяншалася аж да 2000 г., калі напрамак руху змяніўся на супрацьлеглы. Беларусь і тут праявіла большую стабільнасць.

Рэкорды па амплітудзе хістанняў у ВУП Расіі пабіла доля чыстага экспарту (да 70 разоў), затым ішлі доля інвестыцый (да 2,4 раза), доля прыватнага і дзяржаўнага спажывання (да 1,6 раза). Для параўнання, максімальная амплітуда хістанняў у ВУП Германіі мела месца ў долі чыстага экспарту (да 14 разоў), ды і долі інвестыцый, дзяржаўнага і прыватнага спажывання дэманстравалі значна меншы дыяпазон змяненняў (1,35; 1,2; 1,1 адпаведна).

Дзесяць гадоў бесперапыннага эканамічнага росту, з аднаго боку, паказваюць адносна высокую ступень устойлівасці беларускай эканомікі, з другога – для прадаўжэнння такой пазітыўнай дынамікі ў эканоміцы трэба правесці сур'ёзныя структурныя пераўтварэнні, якія маюць на мэце павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў і паслуг на сусветных рынках. Адносна Расіі застаецца спадзявацца, што пасля канчатковага завяршэння праходжання трансфармацыйнага перыяду расійская эканоміка, здолеўшы аслабіць сваю залежнасць ад кан'юнктуры на зарубежных рынках сыравіны, пяройдзе да такой мадэлі развіцця, якая адрозніваецца меншай нестабільнасцю і абапіраецца на ўнутраны попыт, вызначальным складальнікам якога выступае попыт хатніх гаспадарак, чаму і павінны паслужыць прагрэсіўныя сектаральна-галіновыя структурныя зрухі.

### Літаратура


1. *Воейкова, Т.В.* Межотраслевые структурные сдвиги, интенсификация и эффективность общественного производства / Т.В. Воейкова. – М.: Наука, 1985. – 135 с.
2. *Волков, Н.В.* Структурные сдвиги в экономике США в 70–80-х годах / Н.В. Волков. – М.: Наука, 1989. – 200 с.
3. *Глазьев, С.Ю.* Теория долгосрочного технико-экономического развития / С. Ю. Глазьев. – М.: ВлаДар, 1993. – 310 с.
4. *Пенкин, А.Ф.* Структурные сдвиги в экономике: объективные закономерности и экономическая политика (на примере ФРГ) / А.Ф. Пенкин. – М.: Институт общественных наук при ЦК КПСС, 1991. – 237 с.
5. *Петровская, Л.М.* Конъюнктура открытой экономики / Л.М. Петровская. – Минск: РИВШ, 2006. – 120 с.
6. *Петровская, Л.М.* Конъюнктура: теоретический и практический аспекты / Л. М. Петровская. – Минск: Армита-Маркетинг, Менеджмент, 1998. – 120 с.
7. *Цвылев, Р.И.* Постиндустриальное развитие. Уроки для России / Р. И. Цвылев. – М.: Наука, 1996. – 206 с.
8. *Gundlach, E.* Die Dienstleistungsnachfrage als Determinante des wirtschaftlichen Strukturwandels / E. Gundlach. – Tubingen: Mohr, 1993. – 201 s.
9. Fortschritte beim Aufbau Ost. Forschungsbericht die wirtschaftlicher Forschungsinstitute uber die wirtschaftliche Entwicklung in Ostdeutschland. Kieler Diskussionsbeitrage. 391. Institut fur Weltwirtschaft. – Kiel, 2002. – 53 s.
10. *Klodt, H.* Structural Change towards Services: The German Experience. Discussion Papers in German Studies. University of Birmingham, July 2000 / H. Klodt. – 35 p.
11. *Mei ner, W.* Wirtschaftsstruktur und Strukturpolitik / W. Mei ner. – Munchen: Vahlen, 1989. – 222 s.
12. *Oppenlander, K.H.* Wachstumstheorie und Wachstumspolitik: die Strukturdynamik als Ansatzpunkt fur eine innovationsbezogene Wachstumspolitik / K. H. Oppenlander. – Munchen: Vahlen, 1988. – 319 s.
13. *Peters, H.R.* Grundlagen der Mesookonomie und Strukturpolitik / H.R. Peters. – Bern-Stuttgart: Haupt, 1981. – 443 s.
14. *Siebert, H.* Weltwirtschaft / H. Siebert. – Stuttgart: Lucius und Lucius, 1997. – 251 s.



### Summary

*The comparative analysis of gross output employment in the Republic of Belarus, Russian Federation and Germany is made. The revealed instability can e greatly lonerad by substituting the model of growing economy based on expert of saw materials for the model of development based on the internal experience of farming.*

## ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СУЧАСНЫМ АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ*


*УДК 008:316.614–053.6*



***К.У. Антановіч,***
*магістрант кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*


## КАНЦЭПЦЫЯ СВАБОДЫ І АДКАЗНАСЦІ У ПРАЦЭСЕ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ

Сёння ў цэнтры вучэбна-выхаваўчага працэсу ў нашай краіне стаіць ідэалогія, скіраваная на развіццё актыўнай грамадзянскай пазіцыі моладзі, яе ініцыятыўнасці, папулярызацыі сярод юнакоў і дзяўчат нацыянальных каштоўнасцей. Але пры гэтым ў соцыуме захоўваюцца і негатыўныя тэндэнцыі ўцёкаў ад свабоды (даследаваў Э. Фром), а на справе гэта можа разглядацца як уцёкі ад адказнасці за стан рэчаў у свеце. У прыватнасці, сёння можна назіраць за сітуацыяй, калі пэўная частка грамадства спрабуе ўхіліцца ад маральнай адказнасці, а разам з ёй і свабоды. І несумненна, такія паводзіны адмоўна ўплываюць на дзяцей і падлеткаў.

Творы сусветнай і айчыннай культуры прасякнуты скразнымі матывамі свабоды, сумлення, маральнага выбару, адказнасці і валодаюць вялікім патэнцыялам у гарманічным развіцці чалавека. М. Бахцін падкрэсліў, што асоба мастака павінна заўсёды быць адказнай. Калі ўлічыць, што мастацтва і жыццё мусяць быць у творцы знітаваныя ў адзінстве яго віны і адказнасці [1, с. 17], то гэта найлепшы ўзор этычных арыенціраў для моладзі.

Аднак варта засяродзіць увагу на тэндэнцыю да заняпаду духоўнага свету юнага грамадзяніна, бо сёння настаўнік, у першую чаргу, інфармуе вучня, але не дае магчымасці спазнаць сутнасць той ці іншай з'явы, далучыцца да культуры. Адмоўныя вынікі такой працы адлюстроўваюцца ў грамадскай пазіцыі, светапоглядзе і ўчынках сучаснай моладзі.

Але ці магчыма пры вывучэнні школьнай праграмы прасачыць за markdown рознымі тыпамі адказнасці, зацікавіць школьнікаў гэтай праблематыкай?

Калі закрануць вучэбныя дысцыпліны, то найбольш мэтазгодна развіваць пачуццё адказнасці на ўроках беларускай і рускай літаратур, сусветнай і айчыннай культуры, а таксама гісторыі. Але пры гэтым нельга выключаць з працэсу выхавання і іншыя прадметы.

Спынімся на канкрэтных прыкладах. Так, у школе звычайна настаўнікі прапаноўваюць вучням вывучыць на памяць урывак з прадмовы Ф. Скарыны да кнігі Бібліі «Юдзіф». Але ці адзначаецца на ўроку сцвярджэнне асветніка, што адказнасць за свой край з'яўляецца першасным інстынктам самазахавання? Супаставіўшы паводзіны розных жывых істот, мысліцель заўважыў, што родны кут – ёсць першааснова ўсяго, усяго існавання на Зямлі, бо не на сваім месцы, у адзіноце ні рыба, ні пчала, ні, тым больш, чалавек не могуць на роўных канкурыраваць з тымі, хто жыве на сваёй зямлі і ў сваёй сям'і – на Радзіме. Толькі калі адбываецца кансалідацыя грамадства, чалавек можа на нешта прэтэндаваць у жыцці – «бараніць вуллі свае» [2, с. 60]. Варта адзначыць, што для лепшага ўспрымання канцэпцыі беларускага першадрукара, разумення кантэксту прадмовы неабходна пазнаёміцца і са зместам самой кнігі Бібліі.

Асветніцкая дзейнасць нашага мысліцеля скіравана на ўдасканаленне як асобных індывідаў, так і ўсяго грамадства бо, як ужо зазначалася, чалавек суцэльна звязаны з Радзімай, «дзе народжаны і выгадаваны – да таго месца вялікую ласку мае» [2, с. 60].

У сусветнай літаратуры можна знайсці цікавыя прыклады мастацкага супастаўлення адказнасці і абавязку. Так, у «Антыгоне» Сафокла адлюстраваны выбар паміж адданасцю сям'і і Радзіме, вернасцю і здрадай. Аўтар прымушае чытача задумацца над пытаннем, што з'яўляецца першаснай адказнасцю, прыроджанай, а што другаснай – штучнай.

Пры адлюстраванні паняцця адказнасці ў мастацкай літаратуры, варта закрануць і першыя помнікі беларускага пісьменства і вуснай народнай творчасці. Так, чытаючы народныя казкі, нельга не здзівіцца духоўнай стойкасці народа, агульнай адказнасці за лёс роднага краю. Яскравым прыкладам таму будзе казка «Удовін сын», дзе ў вялікай бядзе на дапамогу сялянскаму хлопцу ідуць яго равеснікі – купецкі і царскі сыны. Пра адказнасць Царквы перад народам

* Заканчэнне.

апавядаў яшчэ асветнік Кірыла Тураўскі. У прытчы «Пра душу і цела» па-майстэрску выкрываюцца заганы, характэрныя, у першую чаргу, тагачаснаму духавенству, якое ў ідэале павінна на сваім прыкладзе паказваць народу ўзор высокай маральнасці. У творы адлюстравана безадказнасць, за якой ідзе немінучая і справядлівая расплата.

Заслугоўвае ўвагі і класічная літаратура, у якой былі адлюстраваны розныя тыпы адказнасці, што сведчыць пра гуманізм і духоўнае багацце як нашай, так і сусветнай культуры ў цэлым. Варта толькі прыгадаць цэнтральнага персанажа рамана М. Лермантава «Герой нашага часу», у якім адлюстроўваецца спроба ўцёкаў ад адказнасці. Падобную сітуацыю можна назіраць і ў рамане Э. Ажэшка «Над Нёманам».

У курсах многіх школьных гуманітарных дысцыплін варта было б звярнуць увагу да філасофіі экзістэнцыялізму, што сфарміравалася ў пачатку XX ст. і заснаваная на ўсведамленні асобай сваёй адказнасці за прынятыя і здзейсненыя ўчынкі. Калі гаворка ідзе пра беларускі экзістэнцыялізм, то звычайна абмяжоўваюцца асобай В. Быкава, што, безумоўна, неаспрэчна, аднак менавіта экзістэнтнае светаўспрыманне з'яўляецца характэрнай асаблівасцю беларускай адраджэнскай літаратуры XX ст. наогул. В. Быкаў неаднаразова сцвярджаў у мастацкіх творах і публіцыстычных эсэ, што літаратура – сігнал трывогі, знак бяды на жыццёвай дарозе сучаснага чалавецтва.

Гэтыя ідэі яскрава бачныя і ў творах М. Танка, П. Панчанкі, А. Разанава, А. Куляшова, С. Алексіевіч і інш., дзе з асаблівай вастрынёй паказана аднаразовая каштоўнасць жыцця. Асноўным жа лейтматывам усёй беларускай культуры з'яўляецца вобраз чалавецтва на мяжы жыцця і смерці. Пра гэта сведчаць вобразы цунамі, вогненнай вёскі, воўчай ямы. Экспрэсіяй прасякнуты і агульнавядомыя «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага, чырвона-чорная каларыстыка чарнобыльскай тэмы ў беларускім мастацтве. Не менш пераканаўча ўздзейнічаюць на свядомасць моладзі і алегарычныя вобразы з жывапісу Я. Драздовіча.

У курсе беларускай гісторыі адным з лепшых узораў, прыкладаў для падлеткаў будзе разгляд старадаўняга веча, дзе кожны меў як голас, так і адпаведную калектыўную адказнасць.

У любы час важнай з'яўляецца праблема суадносін культуры і адказнасці, паколькі вялікая роля ў фарміраванні светапогляду грамадства заўсёды належала творчым людзям. Менавіта таму кожны творца, як зрэшты і настаўнік, нясе першасную адказнасць за зробленае, што, безумоўна, залежыць ад яго досведу і свабоды, бо скаванасць, знешнія і ўнутраныя абмежаванні вядуць да адыходу ад цвярозага асэнсавання рэчаіснасці.

*Літаратура*


1. *Бахтин, М.М.* Искусство и ответственность / М.М. Бахтин // День поэзии. – Невель, 1919.
2. *Скарына, Ф.* Прадмовы і пасляслоўі / Ф. Скарына. – Мінск, 1969.



*Summary*

*The article deals with acute problem of understanding the concepts of freedom and responsibility by Belarusian pupils. Some aspects of these social and philosophical categories in classical literature, the history of Belarus, native culture are examined. The methodological instructions for teachers are given. Besides the problem of relation ship between culture and responsibility in the process of socialization of youth is analysed.*


---

*УДК 008*


***Я.Ф. Рудніцкая,***
*аспірант кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*


## «АДКРЫЦЦЁ НАРОДА» Ў ТЭОРЫІ КУЛЬТУРЫ

З часоў узнікнення народнай культуры мінула не адно тысячагоддзе, а яе грунтоўнае вывучэнне і асэнсаванне ў еўрапейскай тэарэтычнай думцы пачалося параўнальна нядаўна – у 2-й палове XVIII – пачатку XIX ст. Англійскі даследчык П. Бэрк у працы «Народная культура Еўропы ранняга Новага часу» называе гэты перыяд часам «адкрыцця народа» [1, с. 29], бо менавіта тады культура рамеснікаў і сялян стала аб'ектам пільнай увагі з боку грамадства. Адзін за адным ва ўжытак пачалі ўваходзіць новыя тэрміны, асабліва ў Германіі: *Volkslied* («народная песня»), *Volksmarchen* і *Volkssage* («народныя казкі»), *Volkskunde* («фальклор») і інш. Відавочна, што іх узнікненне было выклікана імкненнем акрэсліць тыя з'явы ў культуры, якія былі асэнсаваныя ўпершыню і па сутнасці сваёй выразна адрозніваліся ад субкультуры вышэйшых слаёў грамадства – эліты.

Лагічна паўстае пытанне: «Што прывяло да абуджэння незвычайнай цікавасці да ўсяго народнага ў азначаны перыяд еўрапейскай гісторыі?» П. Бэрк вылучае шэраг эстэтычных, інтэлектуальных і палітычных прычын, якія ў комплексе паслужылі шляхам да такога істотнага адкрыцця ў культуры. На думку даследчыка, выразная прыхільнасць да народнага («простага», «натуральнага») з'яўлялася своеасаблівым

бунтам супраць нарматыўнасці класіцызму і рацыяналізму Асветніцтва. Палітычнай прычынай адкрыцця народнай культуры П. Бэрк лічыць уздым нацыяналізму і рух многіх народаў да самавызначэння. Гэта меркаванне выглядае цалкам абгрунтаваным, бо станаўленне культуры нацыянальна-дэмакратычнага тыпу патрабуе пераплаўкі ў адно цэлае ўсяго культурнага вопыту пэўнай нацыі, а народная культура займае ў ім не апошняе месца.

Адкрыццё народнай культуры ў канец XVIII – XIX ст. паспрыяла таму, што ў еўрапейскай тэарэтычнай думцы (найперш у эстэтыцы) паўстала праблема ўзаемадзеяння народнай творчасці і мастацкай культуры ў цэлым, суадносін культурных традыцый розных слаёў грамадства. У цэнтры ўвагі даследчыкаў і творцаў апынулася катэгорыя ***народнасці***, якая першапачаткова выкарыстоўвалася выключна для характарыстыкі мастацтва як катэгорыя эстэтычная. Варта падкрэсліць, што на сучасным этапе ўзнікае неабходнасць раскрыць новыя значэнні народнай культуры і разглядаць народнасць як з'яву аксіялагічную.

Народнасць мастацтва як усвядомленая канцэпцыя ўзнікла раней названага перыяду (у працах Дж. Віко і Ж. Ж. Русо), аднак грунтоўна і шматбакова яна распрацоўвалася менавіта ў канцы XVIII–XIX ст. у рэчышчы рамантызму. Праблема народнасці мастацтва ўздымалася, напрыклад, у перапісцы нямецкіх пісьменнікаў А. Арніма, К. Брэнтана і Я. Грыма – прадстаўнікоў гейдэльбергскага гуртка (пачатак XIX ст.). Спрэчка, якая вялася паміж імі, была выкліканая рознымі поглядамі творцаў на суадносіны і шляхі развіцця паэзіі «натуральнай» і «штучнай», уласна «мастацкай» (карыстаючыся сучаснай тэрміналогіяй – народнай і індывідуальнай). Паэт А. Арнім адмаўляў такое рэзкае супрацьпастаўленне паэзіі, сцвярджаў, што абедзве плыні з'яўляюцца праявай адзінага чалавечага творчага духу. Адпаведна, ён лічыў цалкам правамернай апрацоўку народных тэкстаў, бо гэта дазваляла наблізіць іх да сучаснасці. Я. Грым, у сваю чаргу, быў прыхільнікам больш уважлівага і беражлівага стаўлення да фальклорных твораў, выступаў за іх захаванне ў арыгінальным выглядзе.

Такім чынам, рух «адкрыцця народа» даў магчымасць адукаванаму грамадству асэнсаваць значэнне народнай культуры, якая надзіва доўгі час заставалася па-за яго ўвагай. А гэта праблема актуальная і сёння, асабліва ў межах адукацыйнага працэсу ў школе. Лёгка заўважыць, што ў праграмах школьных курсаў «Сусветная мастацкая культура» і «Айчынная і сусветная мастацкая культура» народная культура, якая не вывучаецца ў межах іншых вучэбных дысцыплін, прадстаўлена даволі фрагментарна, а характар узаемадзеяння паміж сацыяльнымі субкультурамі не адлюстраваны. Змест праграм скіроўвае настаўнікаў і вучняў на вывучэнне пераважна высокага, «элітарнага» мастацтва, у значнасці якога няма сумнення. Выклікае пярэчанне іншае: застаецца пакінутым па-за ўвагай магутны пласт духоўнай культуры чалавецтва. Варта падкрэсліць, што ў вучняў з гэтай прычыны складваецца даволі аднабаковае ўяўленне пра гісторыка-культурны працэс, а гэта недапушчальна.

У такой сітуацыі выразна бачыцца неабходнасць скарэкціраваць існуючыя ўстаноўкі. Вывучэнне народнай культуры і, што больш важна, асэнсаванне той ролі, якую яна адыграла ў станаўленні гуманістычных традыцый у гісторыка-культурным працэсе, можа значна пашырыць магчымасці настаўнікаў у выхаванні паўнавартаснай асобы, здольнай супрацьстаяць татальнаму засіллю масавай культуры. Менавіта таму падаецца цалкам мэтазгодным пры распрацоўцы вучэбных праграм і выкладанні курса сусветнай мастацкай культуры надаваць большую ўвагу вывучэнню народнай культуры, а таксама праблеме ўзаемадзеяння народнай творчасці і мастацкай культуры ў цэлым. Такі накірунак раскрывае як перад вучнямі, так і перад настаўнікамі новыя магчымасці і далягляды.

*Літаратура*

1. *Бэрк, П.* Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / П. Бэрк; пер. з англ. І. Ганецкай; пад рэд. А. Ліса. – Мінск: Тэхналогія, 1999.
2. Зарубежная литература XIX века: Романтизм: Хрестоматия историко-литературных материалов: учеб. пособие / сост. А. С. Дмитриев и др. – Минск, 1990.

*Summary*

*The author of this article considers assence, reasons and sgnificance of the process of folk culture "discovery" in the European humanities in XVIII–XIX$^{th}$ centuries and emphasizes the importance of this problem for modern educational process at school.*

*УДК 008(476)*

***Н.І. Здановіч,***
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*

## ГАРАДСКОЕ СВЯТА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Чалавек вёскі – у многім дзіця прыроды, «натуральны» чалавек. Горад – у многім штучнае ўтварэнне на зямлі, і гараджанін нясе на сабе адбіткі гэтай штучнасці. Святы і адносі-

ны да іх цудоўна адлюстроўваюць адрозненні вяскоўца і гараджаніна.

У вёсцы святочны каляндар фарміруецца пад уплывам прыродных цыклаў, земляробчага календара, пачынаючы ад эпохі бронзы (больш 4 тыс. г. таму). Чалавек там падпарадкоўваецца прыродзе і звычцы, робіць так, як яго прашчуры і суседзі.

Жыццё гараджаніна, у параўнанні з вяскоўцам, больш камфортнае (ён абаронены сценамі ад ворага, узброены не толькі касой ці сярпом), але ён плаціць за абароненасць існаваннем у сціснутай прасторы, прывучаецца жыць «у рамках», у межах, вызначаных яму абставінамі, уладамі. Яго жыццёвыя цыклы вызначаюцца не толькі і нават не столькі прыроднымі з'явамі, колькі прафесіяй, уладамі і рэлігіяй.

Вясковыя святы звязаны з каляндарным ці земляробчым цыкламі. Па характары яны рэлігійныя (царкоўныя) ці сінкрэтычныя (каляндарныя): каляды, масленіца, купалле, багач. Усе мерапрыемствы свят скіраваны на дабрабыт чалавека і ўраджай, пладавітасць усяго, ахову чалавека, жывёлы.

Нават у рэлігійных святах у вёсцы вялікую ролю адыгрываюць традыцыйныя застоллі. Можна сказаць, што месца правядзення большасці свят – храм і дом. У храме падчас набажэнстваў у значную колькасць святаў асвячаюцца менавіта плады зямлі: зёлкі, хлеб, яйкі, мёд, яблыкі і г. д. Потым асвячонае займае пачэснае месца ў хаце ці непасрэдна на стале. Нават царкоўныя святы ў вёсцы маюць прыкметы на ўраджай: з-пад абруса на калядным стале выцягваюць травінкі як падаўжэй, каб, напрыклад, лён доўгі рос.

Калі вясковае свята выходзіць за межы дома, найбольш прывабнае ў ім – найперш нязмушанасць правядзення, вялікая доля ці магчымасці імправізацыі, а значыць – разняволенасць. Такога кшталту святы – гэта, кажучы мовай сучаснага чалавека, масавае касцюмнае тэатральнае дзеянне, у якім фактычна губляецца розніца паміж удзельнікамі і гледачамі. У святочных карагодах знаходзіцца месца кожнаму, хто захоча, незалежна ад узросту. І падчас свята адбываецца нязмушанае перайманне абраду, традыцыі.

Падрыхтоўка да свят ўключае розныя мерапрыемствы, у залежнасці ад пары года і традыцыі. Але нязменна да свята рыхтуюць хату. Нават самая лянівая гаспадыня двойчы на год – перад Калядамі і Вялікаднем – бяліла хату, мяняла выцінанкі на вокнах, над дзвярыма і на палічках-гратках, рыхтавала абрадавыя стравы.

Агульнавядомы выраз: «Гарадское паветра робіць чалавека вольным». Аднак у дачыненні свят, здаецца, наадварот – вёска больш разняволеная. Горад – больш паднявольны, жыхары яго знаходзяцца «пад пільным наглядам» улад (праз розныя гарадскія структуры, найперш праз рамесніцкія і купецкія цэхі).

Абавязковым пунктам любога Устава цэха з'яўляецца ўдзел у святочных шэсцях у гонар рэлігійных свят. Акрамя таго, абавязковым быў удзел у святочных набажэнствах (пад пагрозай штрафаў). Так, Віленскаму цэху карэтнікаў, ігольнікаў і ганчароў, прыпісанаму да касцёла Св. Тройцы, Уставам прадпісвалася не толькі свечкі пастаўляць, але абавязкова быць на святой імшы падчас шэрага свят: на Грамніцы, Звеставанне, Непарочнага зачацця Дзевы Марыі, на Тройцу, на Яна і г. д. І так кожны цэх, па прыкладзе сталічнай Вільні, апекаваўся нейкім храмам, меў свой алтар у храме ці абавязаны быў даваць воск на свечкі. «...ва ўрачыстыя святы Ражаства Хрыстова і на Вялікдзень даваць па 3 фунты воску ў гарадскую кангрэгацыю... пры касцёле айцоў езуітаў, заказваць абедню і ўсе, як рымскага, так і рускага веравызнання абавязаныя прысутнічаць пры набажэнстве..; таксама на рускія святы Нараджэння Хрыстова і Вялікдзень даваць па 3 фунты воску ў царкву Святой Сафіі.., заказваць набажэнства... і прысутнічаць на іх» [1].

Там жа чытаем: «На свята Божага цела абавязаныя па прыкладзе ...г. Вільні ўдзельнічаць у шэсці па старым цэхавым звычаі, з харугваю, на якой павінна знаходзіцца выява Св. апостала Паўла, апекуна кушнерскага цэха; у шэсці ўдзельнічаць з барабанам і лепшай зброяю» [2].

Лагічным, у сувязі з гэтым, падаецца, што свята Пятра і Паўла – самае важнае для прафесіі кушняроў. Акрамя таго, кожны цэх апекаваўся, як мы бачым, над нейкім храмам (ці храмамі, паколькі ў цэху былі людзі рознага веравызнання). Натуральна, што прастольнае свята гэтага храма было найбольш важным для членаў цэха. Вось так нараджалася традыцыя таго, што мы зараз ведаем пад назвай «прафесійнае свята».

Вясковыя і гарадскія святы нібы «судакранаюцца» праз рэлігійныя святы. Але пры адным і тым жа характары свята яны адрозніваюцца па сваім сцэнарыі. Па-першае, у горадзе гэта не столькі свята, колькі мерапрыемства, прымеркаванае да пэўнай даты. Яно мае вызначаны сцэнарый, да ўдзелу ў ім прыцягваюцца гарадскія арганізацыі (найперш цэхі). Па-другое, гарадское свята найперш публічнае. Месца яго правядзення – храм і плошча перад ратушай ці кірмашовая плошча, адказны – магістрат (калі горад мае магдэбургскае права).

Паколькі мерапрыемства – афіцыйнае, на яго арганізацыю і ажыццяўленне выдаткоўваюцца сродкі. Кніга Магілёўскага магістрата за 1706 г. падрабязна апісвае, што ра-

білі да чарговага свята і ў што гэта абышлося гораду.

«Дня 23 было шмат расходаў на Божае цела… Цеслярам, што рабілі алтар каля ратушы, 2 зл.10 гр.; тым, што шчыты з царквы прывезлі, маю купілі воза 2, травы воз 1, далі 1 зл. 26 гр.; цвікоў дэкаратыўных коп 4, гонтавых коп 4, цвічкоў малых коп 6, шпілек 4 аркушы, далі 5 зл. 26 гр.; 7 паўфунтавых свечак да алтара; вянкоў…і кветак розных за 1 зл. 8 гр.; спевакам брацкім за спяванне пры алтары розных канцэртаў 5 зл.; панамару брацкаму, Суліму, што прыслужваў, сцярог і начаваў пры алтары, далі 1 зл.15 гр.; 7-мі пушкарам, што ў фары і каля ратушы стралялі, далі 2 зл.; за паперу на загортванне пораху і на піва пушкарам і чэлядзі далі 1 зл. 6 гр.; Северыновічу, што пазычыў абіўку да алтара, далі 1 зл.» [3]. Такім чынам, і «салютаваць» у гонар свята пачалі ў горадзе яшчэ ў пачатку XVIII ст.

Ад вясковых традыцый у горад прыйшоў звычай прыбірацца да свята. Прыкладам, магістрат Магілёва ў красавіку, «на свята Рымскае», наняў 14 чалавек чысціць вуліцы, даў пораху «на свята наша да цэркві брацкай», асобна – пораху «на пабудак». Не забыліся ўлады і пра ўзнагароды да свята, каб было за што апрануцца ў новае адзенне (па добрай старой традыцыі). Так, у тым жа Магілёве да святаў «слугам мескім» выдавалі, кажучы звыклымі нам словамі, «прэмію» – у залежнасці ад важнасці асобы – каму залатоўку, каму (прыкладам, дзясятніку) – на асьмак больш. Людзям магістрацкім выдавалі грошы на новае адзенне, ці нават само адзенне: каму кунтуш, каму жупан, а Мелешку-пушкару – сярмягу.

Калі гаварыць пра святочнае застолле, якое ў вёсках было амаль абавязковым элементам свята, дык горад таксама надаў яму адценне афіцыёзу: гэта былі «банкеты» для запрошаных, якія ладзіліся гарадскімі ўладамі для афіцыйных асоб. Так, «на святога Мікалая, у дом пана войта на банкет, купілі крышталёвага шкла, фляшу квартавую размаляваную, тынфы два...» [4]. Як бачым, усё аплачвалася з гарадскога бюджэту.

Горад мае патрэбу ў свецкіх святах і клапоціцца пра іх забеспячэнне. Прыкладам, адзін з артыкулаў Устава магілёўскіх купцоў пачатку XVII ст. абавязвае іх, каб у выпадку параду ці сустрэчы пры прыездзе ў горад караля або высокай урадавай асобы ў выпадку неабходнасці па патрабаванні магістрата ўсе купцы павінны выступіць конна, па-гусарску, са сцягам і барабанам, пад пагрозаю штрафа. Бо купецтва – абаронцы і ўпрыгожванне горада.

Свецкія святы – гэта і дні нараджэння каралёў і вялікіх князёў – як бы рухомыя святы. Залежала гэта ад імя ўладара і прыпадала на дзень яго святога-цёзкі. Пра гэта ўскосна сведчыць выпадак, калі хітрыя магілёўцы падчас вайны са шведамі зладзілі свята з салютамі і банкетамі на свята Пятра і Паўла, калі саюзнік Рэчы Паспалітай Пётр I стаяў пад Магілёвам. У прыходна-расходнай кнізе магістрата запісалі выдаткі: «Дня 29 жніўня, на імяніны Цара..., то есць на фэст свсв. Пятра і Паўла, казалі з гармат страляць, на тое пораху выдалі фунтаў сто пяцьдзесят. Пушкарам далі 1зл. 15 гр.» [5].

Што ж датычыцца рэгіянальных свят – яны ўтвараліся дзякуючы каралеўскім прывілеям населеным пунктам (у тым ліку і гарадам) на кірмашы. Прымяркоўваліся выключна да рэлігійных свят. Калі ў горадзе быў храм у гонар свята, то, як і ў весцы, кірмаш зліваўся з фэстам.

Такім чынам, параўноўваючы традыцыі свят у сельскай мясцовасці і ў горадзе, можна вылучыць агульнае і адметнае ў іх.

*Агульнае:* 1) чысціня, 2) храм як адно з асноўных месц, эпіцэнтр свята.

*Адметнасць гарадскіх свят:* 1) афіцыёзнасць (святы ладзяцца на аснове хрысціянскага календара і палітычнай кан'юнктуры); 2) публічнасць (месцы правядзення часта выносяцца за межы храмаў – імі становяцца вуліцы і плошчы горада, ратушная плошча ці будынак ратушы); 3) рэгламентаванасць і прымусовасць (уставамі цэхаў вызначаны парадак удзелу і пакаранні ў выпадку парушэння); 4) заангажыраванасць (Свята Пятра і Паўла ў Магілёве падчас Паўночнай вайны – «на імяніны цара іх міласці»); 5) расходы на святы бяруць на сябе ўлады («прэміі» афіцыйным асобам, салюты, застоллі для афіцыйных асоб, у прысутных месцах).

Аднак гэты афіцыёз не закранае адвечнага – традыцыйнага рытуальнага застолля ў доме. Нават у горадзе сям'я па-ранейшаму застаецца асяродкам захавання і перадачы культурных традыцый.

### *Літаратура*


1. Белоруссия в эпоху феодализма. У 2 т. Т. 2. Минск, 1960. – С. 298–299.
2. Там сама. – С. 299.
3. Прыходна-расходная кніга магілёўскага магістрата за 1706 г. ИЮМ. – Вып. 15. – С. 52–53.
4. Там сама. – С. 135.
5. Там сама. – С. 79.



### *Summary*

*The celebration traditions of countryside and town are analysed in this article. The author compares the process of preparation and holding holiday and religious feast. The role of a family as a main custodian of cultural traditions is pointed out.*

*УДК 008:811.161.3*

***С.Я. Аўсянская,***
*настаўніца СШ № 139, г. Мінск*

# РОЛЯ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦКАГА СЛОВА Ў ФАРМІРАВАННІ КУЛЬТУРЫ МІЖАСОБАСНЫХ ЗНОСІН

У праграме па беларускай літаратуры 2007 года чытаем: «Курс беларускай літаратуры …забяспечвае пераемнасць бесперапыннасць працэсу літаратурнай адукацыі», «Зместавую частку праграм у першую чаргу складаюць высокамастацкія творы нацыянальнай класікі і вядомых майстроў слова. Гэтыя творы маюць выключнае значэнне ў гісторыі літаратуры, вызначаюцца багатым пазнавальным і выхаваўчым патэнцыялам..», «Развіццё вуснага маўлення – важная ўмова прадуктыўнага літаратурнага навучання».

І тут узнікае шмат пытанняў: як можна за 1 гадзіну на тыдзень навучыць, сфарміраваць, выхаваць, развіць?

Заўсёды хочацца, каб вучні выраслі гуманнымі, чулымі, умелі супастаўляць, аналізаваць, прымаць правільныя рашэнні. Таму ў апошні час усё больш і больш прыцягвае ўвагу тэхналогія крытычнага мыслення.

Прыкмет таго, хто крытычна думае, шмат: адкрыты розум; фармуліроўка свайго пункту гледжання; уменне вылучаць альтэрнатыву; уменне збіраць інфармацыю з розных крыніц; уменне аналізаваць якасць інфармацыі; выразна бачыць праблему, яе рашэнне.

Сістэматычнае ўключэнне крытычнага мыслення ў навучальны працэс павінна весці не толькі да глыбокага і разнастайнага разумення вывучаемага матэрыялу, але і выводзіць яго за межы падбору ўменняў і навыкаў у асабістую сферу.

## ТВОРЧЫ ПРАКТЫКУМ
## «Тайна дома на вуліцы Паэтычнай»

Урок літаратуры ў 5-м класе

*Мэта.*

• Дапамагчы ўбачыць паэтычны малюнак зімовага вечара, створаны паэтам з дапамогай вобразна-выяўленчых сродкаў мовы.

• Развіваць уменне адчуваць паэтычнае слова, фарміраваць навыкі выразнага чытання паэтычных твораў.

*Тэма*. Максім Багдановіч. Верш «Зімой»

• Выхоўваць любоў да роднай прыроды.

*Ход урока:*

1. Выразнае чытанне верша настаўнікам.
2. Работа з тэкстам.

**Іспыт першы**

а) Перачытай верш.

б) Пры чытанні першым пастарайся ўслухацца ў гукі, якія вымаўляеш.

| Верш | Свабодная частка аркуша (на працягу ўрока запаўняецца вучнямі) |
|---|---|

Здароў, марозны, звонкі вечар!
здароў, скрыпучы мяккі снег!
мяцель не вее, сціхнуў вецер,
і волен лёгкіх санак бег.

1. Запішыце, якіх гукаў больш. (с, р, ц)
2. Як называецца такі прыём гульні з гукамі? (алітэрацыя)

Гукавы фон дапамагае вызначыць эмацыянальны фон верша.

**Іспыт другі**

а) Прачытай верш яшчэ раз, лёгка прыстукваючы нагой або рукой.

б) Расстаў у ім націскі.

в) Вызначы рытм і паэтычны памер.

Верш напісаны ямбам

___ __/_ ___ _/__ ___ _/__ ___ __/_ ___
___ __/_ ___ _/__ ___ __/_ ___ __/_

**Іспыт трэці**

*На дошцы:* Ударение, попавшее не на своё место, искажает смысл, калечит фразу, тогда как оно, напротив, должно помогать творить её (К. Станиславский).

1. Уважліва перачытай падказку на дошцы.
2. Расстаў націскі.

**Іспыт чацвёрты**

Перачытайце, што такое троп (словы, фразы і выразы ў пераносным, адваротным сэнсе называюць тропамі).

*Падказка*

Якія тропы вы ведаеце? (Метафары, эпітэты, гіпербалы, сімвалы).

Знайдзіце тропы ў вершы, запішыце. (Эпітэты – *звонкі вечар*, *волен санак бег*, *вільготны месяц*, *рыза срэбная*, *вясёлыя бомы*).

*Як мары, белыя бярозы* – параўнанне. Што значыць «рызай срэбнаю раздолле снягоў сінеючых пакрыў»?

Рыза – святочнае ўбранне святара, яна ўся пераліваецца, блішчыць і г. д.

**Іспыт пяты**

Расстаўце паўзы ў вершы

*Падказка*

Самую доўгую паўзу трымае «...» – шматкроп'е. Самую кароткую – канец паэтычнага радка без знакаў прыпынку.

**Іспыт шосты**

Выпішыце словы, якія дапамагаюць адказаць на пытанні:

• Што я бачу ў вершы?

• Што я чую ў ім?

• Што я адчуваю, чытаючы верш?

Адкажыце вусна:

• Які фон верша?

• Прасачы, як вырастае рух у вершы?

• Які момант з жыцця чалавека адлюстраваны ў вершы «Зімой»?

• Якой стала зямля?

**Бачу:** (Звяртаецца ўвага на якасць абноўленага свету па колерах – сініх, срэбных, празрыстых)

**Чую:** Вечар – звонкі. Снег – скрыпучы, весела пад дугой звіняць медныя званочкі.

Снег мяккі.

• Чаму пасля буры месяц здаецца вільготным?

• Чаму «волен лёгкіх санак бег»?

• Якія жаданні абуджае ў чалавеку язда на санках у полі пад сінявой начной?

• Чым нагадвае начны прастор Космас?

(У вершы выказана радаснае пачуццё чалавека, які імчыцца пад сінявой начной наперад, насустрач барам, гоням і новым яшчэ нязведаным далям).

**Іспыт сёмы**

Пройдзены доўгі і цяжкі шлях па вуліцы Паэтычнай. Усё, што зроблена табой, уся інфармацыя, якую ты атрымаў, дапаможа табе раскрыць тайну.

Паглядзі яшчэ раз на знаёмы тэкст.

Пра што гэты верш?

Паэт прадчуваў новыя формы руху чалавека ў сіняве Сусвету (прырода застаецца нерухомай, а сані імкліва імкнуцца наперад, нібы ляцяць над сінявой начной) пасля ачышчальнай завірухі. Перад вачамі чалавека паўстае Сусвет, хоць і халодны, але прывабны, празрысты, яго краса хвалюючая і невычэрпная.

**Іспыт восьмы**

• Паспрабуйце прачытаць на памяць радкі, якія запомнілі з урока.

*Дамашняе заданне*

1. Вывучыць верш на памяць.
2. Намаляваць ілюстрацыю да верша (па жаданні).
3. Напісаць невялікі верш пра прыроду (па жаданні).

На наступным уроку важна абмеркаваць малюнкі, адзначыць тыя, якія блізка перадаюць змест верша, паслухаць вершы, якія дзеці напісалі самастойна.

Настаўнікі беларускай мовы і літаратуры сцвярджаюць, што на вывучэнне аб'ёмнага матэрыялу даецца абмежаваная колькасць гадзін.

Такім чынам, праграму па літаратуры пажадана пераглядзець.

*Summary*

*The problem of discrepancy of syllabus and real practice is analysed in this article. The author turns to the techniques of critical mind development. The concrete methodological instructions aimed at the improvement of humaneness, creativity and critical mind of pupils are given in the article.*

*УДК 008(07)*

***Ю.І. Малашчанка,***
*аспірант кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*

## СЕМАНТЫКА ВОГНЕННАЙ СІМВОЛІКІ Ў ШКОЛЬНЫМ КУРСЕ «АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА»

Спрадвеку агонь – гэта святло, цяпло, а таксама стыхія ўшанавання. Вогненная сімволіка цесна звязана з салярнай. Сімвалы цяпла і святла існуюць паралельна і чаргуюцца ў культуры і мастацтве. Асабліва моцна гэта праяўляецца ў пейзажах, іканапісе і жывапісе XIX ст.

У старажытных цывілізацыях агонь трактуецца як пачатак усіх пачаткаў, ад якога пайшло жыццё. Старажытныя грэкі ў сваёй міфалогіі праводзяць паралель паміж сімвалам і алегорыяй. Агонь, які выкраў для людзей Праметэй з Алімпу, падобны на забаронены плод Адама і Евы, які сімвалізуе волю і поўную радасць быцця, магчымасць вольнага выбару. У Сярэднявеччы сімвал агню набывае іншае адценне: ён стаіць побач з дыдактычным алегарызмам. У містэрыях агонь пабуджае і накіроўвае вялікія эмоцыі: любоў, нянавісць, жах.

У XIX ст. сімвалісты бачаць у сімвале нешта неспасцігнутае, бясконцае, абсалютнае, сувязь эмпірычнага з метафізічным. Семантычны рад вогненнай сімволікі пашыраецца. Экспрэсіўная сутнасць жывапісу, напрыклад, Міхаіла Філіповіча раскрываецца ў звароце да вогненнай сімволікі ў тэме народных свят, асабліва Купалля, якое мае надзвычай багатую вогненную сімволіку. Асноўнай функцыяй купальскага вогнішча з'яўляецца ачышчэнне, пазбаўленне ад негатыву, назапашванне станоўчай энергетыкі. У Філіповіча вогненная сімволіка раскрываецца праз экспрэсію рухаў і колеру.

Э. Касірэр (1874–1945) сцвярджае, што «сімвал» зрабіў дастаткова шырокім паняцце чалавечага свету: чалавек ёсць «жывёліна сімвалічная»; мова, міф, рэлігія, мастацтва і навука – сутнасць «сімвалічнай формы», дзякуючы якой чалавек упарадкоўвае навакольны хаос. У ХХ ст. вогненная сімволіка шырока выкарыстоўваецца ў мадэрнізме, назіраецца імкненне да сінтэзу, паліфаніі сэнсаў, форм, сродкаў. Дадзеныя тэндэнцыі з'яўляюцца характэрнымі ў аднолькавай ступені як для літаратуры, так і для жывапісу.

Вывучэнне і ўдасканаленне святлоценявой канцэпцыі пачалося ў эпоху Адраджэння. Гэты матыў заставаўся актуальным на працягу наступных стагоддзяў, што праявілася ў стылі барока, які пабудаваны на ўзаемадзеянні святла і дынамікі, у рамантызме і ў далейшых мадэрнісцкіх накірунках.

Уплыў агню і святла даволі велізарны на псіхічны стан чалавека: сузіранне агню з'яўляецца вялікім энергетычным рэсурсам для чалавека. Агонь валодае надзвычай прыцягальнай сілай, і, відаць, у гэтым прычына яго сэнсавай паліфаніі ў культуры. У жывапісе агонь выконвае экспрэсіўную функцыю, у мастацкай літаратуры раскрываецца псіхалагічнае напаўненне вогненнага комплексу.

Імпрэсіяністы звярнуліся да святла і яскравага колеру як да асновы стварэння карціны. Галоўныя элементы – святло і паветра, адмова ад чорных тонаў. Агонь (святло) змяняе сутнасць прадметаў у залежнасці ад яго інтэнсіўнасці. Чысціня і гучнасць колераў была прынята постімпрэсіяністамі. Вінсэнт Ван Гог, Поль Гаген актыўна выкарыстоўвалі сонечную палітру, надаючы сваім творам нейкую фантастычнасць, ірэальнасць, прысутнасць шчасця. Таму творы Ван Гога і Гагена глыбока псіхалагічныя.

У мастацкай літаратуры раскрываецца псіхалагічнае напаўненне вогненнага комплексу (М. Булгакаў «Майстар і Маргарыта», Борхес «Кругі руінаў», М. Багдановіч, А. Куляшоў і інш.). Чалавек авалодаў агнём, але агонь у ХХ ст. вырваўся з-пад улады чалавека. Сусветныя войны, стыхійныя бедствы, пажарышчы, аварыя на ЧАЭС – гэта вогненная рэальнасць уздзейнічае на псіхіку, духоўны стан чалавека.

Беларуская культура не адразу звярнулася да вогненнай стыхіі. Вогненная рэчаіснасць у жывапісе і літаратуры асабліва актыўна раскрылася ў апошняй трэці ХХ ст. (проза, паэзія, выяўленчае мастацтва): В. Быкаў «Аблава», «Я з вогненнай вёскі», К. Чорны «Буры» і інш.

Выяўленчае мастацтва патрабуе, каб сімволіка была раскрыта, аднак у праграме школьнай праграмы «Айчынная і сусветная мастацкая культура» сімвалу адводзіцца толькі невялікая частка ўводнага ўрока. Тым не менш, сімволіка мае вялікае значэнне ва ўсім мастацтве, асабліва вогненная сімволіка як адна з першых у гісторыі чалавечага існавання. Да агню ці да яго праяўленняў звярталіся мастакі, пісьменнікі і кампазітары. На ўроках неабходна звяртаць увагу на канцэптуальныя функцыі святлоценявых эфектаў, тлумачыць амбівалентны характар агню ў мастацтве.

Айчынную і сусветную мастацкую культуру неабходна вывучаць паралельна з беларускай літаратурай, каб як мага лепш вылучыць, падкрэсліць і адчуць раскрыццё вогненнай сімволікі ў мастацтве, неабходна ўмацоўваць міжпрадметныя сувязі.

Сімвал-топас агню характэрны для сучаснай літаратуры і сучаснага жывапісу. Даследаванне топікі адкрывае новыя рэсурсы спасціжэння культурных сэнсаў на ўроках па ўсіх гуманітарных дысцыплінах у сучаснай школе.

### Літаратура


1. *Евсюков, В.В.* Мифы о вселенной / В.В. Евсюков. – Новосибирское изд-во: «Наука», Сибирское отд., 1998.
2. Импрессионизм. Мастера, предшественники, последователи: энциклопедия. – М.: «Эксмо», – 2003.
3. Отечественная и мировая художественная культура. 8 класс: прогр. для учреждений, обеспеч. получение общего среднего образования с 12-летним сроком обучения. Минск: Национальный институт образования, 2004.
4. Словарь символов / Н.А. Истомина. – М.: АСТ-Астрель, 2003.



### Summary

*Fire symbolics is very significant for literature and art. In painting it means first of all impressionism and post-imressionism. Fire executes here the function of expression. The psychological filling of fire complex is shown in literature.*

*Symbolics plays a very important role in art. Though the great attention isn't payed to symbolics while teaching «Native and world artistic culture» at school. But research of this concept could open new resources of understanding cultural senses at the lessons of all humanities.*


---

*УДК 008*

***Г.М. Курыленка,***
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*

## СПАВЯДАЛЬНАЯ РЭФЛЕКСІЯ Ў КУЛЬТУРЫ

Сёння, на пачатку трэцяга тысячагоддзя, калі штодзённа набірае абароты ўсеабдымны працэс глабалізацыі, калі ўвесь цывілізаваны свет уступіў у неаб'яўленую вайну з ісламскім фундаменталізмам, грамадства ўсё часцей звяртаецца да вечных набыткаў, выпрацаваных вякамі чалавецтвам, – да мастацкай культуры. Вядома, што адной з асноўных функцый мас-

тацтва з'яўляецца далучэнне да духоўнай культуры як да спосабу перадачы ад пакалення да пакалення агульначалавечых каштоўнасцей, пры ўспрыманні і ўзнаўленні якіх адбываецца творчае і маральнае самаразвіццё чалавека, захаванне цэласнасці яго ўнутранага свету. На думку Ф. Дастаеўскага, менавіта мастацтва дапамагае людзям «адкрыць у сабе чалавека». Акрамя таго, мастацтва абуджае імкненне да сцверджання прыгажосці чалавечых адносін у паўсядзённым жыцці і ў працоўнай дзейнасці. Яно выклікае ў канкрэтнага індывіда і ў грамадства ў цэлым нецярпімасць да праяўлення жахлівага, жудаснага і пачварнага.

Адметным з'яўляецца тое, што многія віды мастацкай культуры (літаратура, музыка, выяўленчае мастацтва) маюць вельмі выразна акрэсленую спавядальную форму. Невыпадкова Б. Брэхт сцвярджаў, што «мастацтва есць размова з душой».

Характэрна, што традыцыі інтраспектыўнага самааналізу і мастацкай споведзі добра развіты ў еўрапейскай культуры і даўно адыгрываюць істотную ролю ў метадалогіі яе даследавання. Дакументальная факталогія аб споведзі паходзіць у асноўным з XVI–XVIII стст., і ўжо тады адбываецца спроба знайсці адказ на адно з асноўных пытанняў: ці прыносіць споведзь суцяшэнне, бо вядома, што яно з'яўляецца адной з важных яе функцый. І яшчэ адно пытанне цікавіла аўтараў спавядальных твораў: звязана ці не і як моцна пачуццё суцяшэння і пачуццё бяспекі, бо яны цалкам узаемазвязаны і ўзаемазалежаць адзін ад аднаго. Напрыклад, Рымска-Каталіцкі Касцёл і Праваслаўная Царква хацелі суцешыць вернікаў, забяспечыць ім Боскае прабачэнне, дараванне грахоў. Але ўзамен на гэта хацелі атрымаць ад вернікаў выразнае прызнанне, пакаянне, споведзь у грахах – гэта значыць хацелі цалкам завалодаць душой народа і кіраваць усімі яе памкненнямі. Тым не менш ніводная іншая рэлігія не надавала такога значэння спавядальнасці, як Рымска-Каталіцкі Касцёл. Такое несупыннае заахвочванне да спавядальнасці, да прызнання ў віне з'яўляецца незвычайным спосабам паглыблення ведаў аб самім сабе. Дзякуючы захаваным і дайшоўшым да нас матэрыялам, мы сёння маем выразнае ўяўленне аб экзістэнцыяльным статусе таго, хто спавядаўся. І статус гэты – выключны, адзіны ў сваім родзе.

Такім чынам, самапазнанне асобы і спавядальнасць моцна звязаны паміж сабой. Паказальна, што пранізлівы позірк на самога сябе з'яўляецца пазітыўным элементам, адзнакай псіхічнага здароўя асобы. А сама магчымасць бачыць самога сябе – асноўны сродак выратавання для душы. Паміж Сакратаўскім і Фрэйдаўскім «пазнай самога сябе» існуе тое, што аб'ядноўвае і ўзбагачае дадзены тэзіс, – гэта споведзь. Яе ўклад у метадалогію даследавання агромістых, што сведчыць аб гістарычным значэнні мастацкай споведзі.

У далейшым, адначасова з царкоўным разуменнем спавядальнасці, адбываецца накапленне рэлігійна-філасофскай рэфлексіі над праблемамі споведзі, спавядальнага выратавання, спавядальнай самасвядомасці ў аскетычна-манаскай і містычнай літаратуры. Без аскетычнай спавядальнай рэфлексіі была б немагчымай такая з'ява, як псіхалагізм Новага часу.

Паступова ў мастацкай культуры назіраецца зрух да свецкай спавядальнай рэфлексіі. Пазней значны ўклад у разуменне месца споведзі ў жыцці чалавека ўнеслі Б. Спіноза, І. Кант, І. Фіхтэ. Роздум над месцам споведзі ў культуры знаходзіць адлюстраванне ў працах Г. Гегеля. Ва ўмовах крызісу культуры свайго часу разнастайныя варыянты выхаду з яго на аснове спавядальнасці прапаноўвалі Л. Фейербах, С. К'еркегор, А. Шапенгаўэр. Шпенглер падвёў вынік разуменню спавядальнай рэфлексіі і яе ролі ў культры да XX ст.

Праблема споведзі выкарыстоўвалася і ў медыцынскіх мэтах шляхам інспірыравання протаспавядальнай справаздачы, што праяўляецца ў псіхааналізе. Класікамі псіхааналізу лічацца З. Фрэйд, Э. Фром., К. Юнг. Менавіта яны адводзяць значнае месца роздумам над споведдзю ў сваіх працах. Так, З. Фрэйд у споведзі «Тлумачэнне снабачанняў», «Псіхапаталогія звычайнага жыцця» з празмернай шчырасцю прызнае перад усім светам большую частку сваіх памылак. Ён выстаўляе сябе адзіным нягоднікам сярод кола выключна бязгрэшных, узорных людзей. Звычайна многія, часам нават празмерна старанна, утойваюць свае слабасці не толькі ад іншых, але і ад саміх сябе: воўк апранае шкуру авечкі, прагныя да славы прыкідваюцца сціплымі, а нядобразычліўцы – самаахвярнымі. Фрэйд жа прааналізаваў самога сябе, і вынік гэтага аналізу паднёс свету ў выглядзе дзвюх прац спавядальнага характару.

У «Тлумачэнні снобачанняў» З. Фрэйда заключаецца яго самае значнае адкрыццё. Адчуваецца, што тут аўтар стрыманы сваім імкненнем да споведзі, якое часткова выяўляецца, часткова замоўчваецца. У якасці прыкладаў ён прыводзіць уласныя снабачанні. Дзякуючы гэтаму, мы пазнаём так шмат з яго жыцця, што гэту кнігу можна лічыць арыгінальнай аўтабіяграфіяй. Аднак уласныя снабачанні не могуць быць цалкам усенародна расшыфраваны. Погляд даследчыка нярэдка знаходзіў больш, чым яму хацелася б знайсці. Дзякуючы гэтаму, паведамленні ўсюды завуаліраваны таямнічасцю, што надае кнізе своеасаблівы адбітак. Сёння можна было б знайсці некаторым снабачанням Фрэйда, адносна якіх аўтарам былі выказаны толькі намёкі, тлумачэнне да канца больш дакладнае. Але гэта стала б грубым умяшальніцтвам ва ўнутраны

свет асобы, якая і без таго зайшла занадта далёка на шляху самавыкрыцця.

Сапраўдная мэта кнігі, раскрыццё сімволікі снабачанняў ажыццяўляецца нібы «паралельна», спакваля. У выніку змешвання ўласнага самавыкрыцця з адкрыццём сусветна-гістарычнага значэння, аўтару не ўдалося знайсці падыходу да непрадузятага чытача.

Не так проста пераканацца ў справядлівасці новага, таго, што прапаноўваў Фрэйд, тым больш, што яно ішло насуперак традыцыйным поглядам людзей. Адметна, што за падаваемым зместам гучыць інтымная, спавядальная нотка прыкладна наступнага зместу: у мяне шмат недахопаў, але мне не даводзіцца іх саромецца, таму што я зрабіў, нарэшце, сваё вялікае адкрыццё.

У пазнейшых выданнях кнігі асабістая, прыватна-спавядальная нотка гучыць ужо слабей. Гэтым тлумачыцца той факт, што цяпер з тлумачэннем снобачанняў лягчэй пазнаёміцца не па арыгінале, а з іншых сачыненняў. Фрэйд праяўляецца ў сваіх працах спавядальнага характару яшчэ як і таленавіты пісьменнік. Суровая лапідарнасць яго стылю нагадвае антычныя ўзоры; праўда, часам, адпаведна гэтым узорам ён становіцца «цёмным», непранікальным. У сваім «Тлумачэнні снобачанняў» Фрэйд змешвае дзве несумяшчальныя субстанцыі. Таму ён аказваўся не на вышыні па адносінах да самога сябе там, дзе не дасягае вяршынь сваіх навуковых пошукаў.

Такім чынам, споведзь цесна звязана не толькі з мастацтвам, а і з псіхіятрыяй і псіхааналітыкай таксама. Больш таго, споведзь размяшчаецца на памежжы пачуццяў: страху, бяспекі і пачуцця віны. А гэта ёсць памежжа трох значных тэм, якія спрадвечна былі штодзённым хлебам для тых, хто заўсёды ўслухоўваўся ў людскія пакуты – для мастакоў.

Акрамя філасофскіх тэкстаў выклікаюць цікавасць творы мастацкай літаратуры спавядальнага жанру, якія зафіксавалі істотныя змены ў спавядальнай самасвядомасці канкрэтнай эпохі і якія ўяўляюць сабой тэксты культуры як прадмет філасофскай рэфлексіі. Наяўнасць у аўтара пачуцця рэфлексіі – важны састаўны кампанент творчасці. Паняцце рэфлексіі шматаспектнае. Азначэнні яго не супярэчаць адзін аднаму, але ў кожным з іх падкрэсліваюцца толькі асобныя бакі паняцця. Рэфлексія літаральна азначае адлюстраванне, зварот. І якія б бакі не вылучаліся, яны перш за ўсё датычацца асэнсавання чалавекам зместу ўласнай свядомасці, сваіх дзеянняў і іх законаў, пазнання свайго «Я». Сюды адносяцца такія з’явы, як самаўсведамленне, самааналіз, пераасэнсаванне і пераправерка сваёй думкі аб сабе, аб іншых людзях і аб тым, што думаюць пра дадзеную асобу тыя, хто яе акружае, як яны ацэньваюць яе і як да яе адносяцца. Зразумела, што без рэфлексіі немагчыма ўстанаўленне правільных узаемаадносін творчай асобы і творчасці. Найбольш паказальнай з’яўляецца рэфлексія, якая суправаджае ўласную індывідуальную дзейнасць чалавека па вырашэнні нестандартных творчых задач. Без рэфлексіі творчасць немагчыма. Тым, хто займаецца творчасцю, неабходна сачыць за сабой, правяраць правільнасць сваіх дзеянняў, карэкціраваць іх у сувязі з мэтамі і задачамі творчасці.

Звычайна прадметам рэфлексіі, якая праяўляецца ў працэсе творчасці, з’яўляюцца асобасныя ўласцівасці творцы. Тут рэфлексія заключаецца ў «расшыфроўцы» сапраўдных мэт і паводзін творцы, пераадоленні стэрэатыпаў сацыяльнай перцэпцыі, пазнання, разумення розных негатыўных установак і г. д. Найбольш часта рэфлексуюцца, г. зн. выступаюць прадметам пераасэнсавання, такія асобасныя ўласцівасці, як каштоўнасныя арыентацыі, матывы і характар творчасці. Варта вылучыць камунікатыўную рэфлексію, якая ўяўляе сабой усведамленне чалавекам таго, як яго ўспрымаюць, ацэньваюць, адносяцца да яго іншыя: «Я – вачыма іншых».

Увогуле, метадалогія даследавання творчага працэсу мала распрацавана нават у той галіне, дзе такое даследаванне мае даўнюю традыцыю – у літаратуразнаўстве. Матэрыялу інтраспекцыі ўласціва вядомая доля суб’ектывізму і не хапае сістэматызацыі. Тым не менш каштоўнасць самааналізу відавочная, асабліва калі расказ аўтара аб гісторыі творчай задумы і яе рэалізацыі сумяшчаецца з імкненнем асэнсаваць агульныя заканамернасці мастацкага твора. Ісціна – паняцце агульначалавечае. І для яе дасягнення мастак увасабляе ў творчасці вопыт уласнага «Я». Увогуле, сфера мастацтва цалкам заглыблена ў індывідуальнае. У мастацтве заўсёды адчуваецца прысутнасць аўтара-творцы. «Усё ў ва мне і я ва ўсім» – так вызначыў Цютчаў момант зліцця асобы паэта з тым, што ён перажывае і што аддае чытачу. У адрозненне ад навукі, у мастацкай творчасці не толькі сам працэс, але і яго вынік заснаваны на індывідуальным, асабістым. Перш за ўсё, гэта вызначаецца асноўнай задачай мастацтва – адлюстроўваюць не проста акаляючы свет, але свет, якім ён уяўляецца мастаку. Калі ў творы не адчуваецца індывідуальны почырк яго стваральніка, уласцівыя толькі яму лад думак і характар вобразаў, можна лічыць, што мастацтва не адбылося. Шлях да мастацкасці праходзіць праз сцвярджэнне і ўвасабленне «Я». Безумоўна, права на ўвасабленне «Я» адноснае, бо адпаведна ўзнікае іншая праблема: ці можа мастак стварыць ад свайго імя штосьці агульназначнае, што ўяўляла б сацыяльны інтарэс, і ці ёсць у яго для гэтага вопыт? Прапрацоўваючы знешні матэрыял, прапускаючы яго праз унутраны свет, ён узнаў-

ляе перажываемае ў мастацкіх формах. Таму ў мастацтве сцвердзілася свайго кшталту норма: «Што не для цябе, то нікому не патрэбна».

Відаць, больш выразна, больш даступна гэта праяўляецца ў літаратуры. Л. Талстой падкрэсліваў, што «толькі ў глыбінях сваёй душы мастак можа адшукаць цікавае для людзей». У творах спавядальнай формы аўтарская прысутнасць адчуваецца ва ўсім. Не толькі ў змесце, але і ў кампазіцыі, у выбары формы апавядання, у стылі. Асоба аўтара ў такіх творах – свайго роду аўтацэнтрызм, дзе ўсё размяшчаецца вакол асобы мастака. Такім чынам, мастацтва трымаецца на індывідуальным, асабістасным.

Важна адзначыць яшчэ адну рысу твора мастацтва – гэта яго аўтабіяграфічнасць. Любы твор мастацтва захоўвае сляды перажытага яго аўтарам. Таму назіраецца ўзаемная залежнасць. Каб зразумець увасобленыя мастаком ідэі, эстэтычныя і светапоглядныя ўстаноўкі, неабходна звярнуцца да біяграфіі. З другога боку, веданне яе дае ключ да разумення творчасці ў цэлым. У сілу біяграфічнасці, у спавядальных творах аўтар адлюстроўвае найперш тое, што перажыў сам. Таму ў аснове спавядальных твораў пакладзены жыццёва важныя падзеі.

У творах спавядальнай формы ўтрымліваецца аб’ектывіраваны чалавечы боль, які ўвасоблены ў тое, што можна назіраць збоку і што даступна ўспрыяццю іншых. Слёзы, скаргі, якімі напоўнена наша існаванне, – гэта таксама аб’ектывіраваныя чалавечыя перажыванні. Мастак жа нібы адкрывае часткі пражытага ім жыцця, надзяляючы іх уласным існаваннем. Г. Флаберу належаць словы: «Гаспажа Бавары – гэта я!» Пісьменнік перанёс разам са сваей гераіняй усе яе пакуты. Вядома, што падчас абдумвання сцэны атручвання Бавары, з ім самім здараліся сударагі, і ён мусіў звярнуцца да ўрача.

У вядомага беларускага мастака А. Марачкіна ёсць карціна «Сведкі мінуўшчыны» (1977 г.), якую можна лічыць спавядальным апафеозам ўсёй яго творчасці. Моцныя, спрэс з вузлоў ды сукоў, пакручаныя ветрамі і гадамі ў вецці, але непахісныя ў камлях, дрэвы на карціне непарушна трымаюцца за камяністы дол. Здаецца, анішто не зможа зрушыць іх з выспы-кургана, бо дрэвы зрасліся не толькі каранямі, але шчыльна сышліся над долам, кронамі падтрымліваюць адно аднаго. Гэта быў 1977-ы год. Хмары, што акутваюць трывогаю вячыстых сведкаў мінуўшчыны на карціне мастака, і былі вобразам таго духоўнага беспрасвецця, якое паглынала саму ідэю беларусчыны. Безумоўна, можна было і ў тагачасным жыцці знайсці шмат светлага і прыемнага. Калі глядзіш на некаторыя карціны таго часу, то і не адразу разумееш, што нешта магло тады творцу прыгнятаць, не давала свабодна дыхаць. Але сапраўдны мастак – той, хто можа сказаць пра невыказнае, адлюстраваць пачуццё ці ідэю раней, чым абрысы гэтага змогуць разгледзець іншыя. А. Марачкін прызнаецца ў тым, што ўжо сам «акт творчасці – гэта як споведзь перад самім сабою, перад Богам. Ва ўсіх нас ёсць часцінка Боскага». [4; 36].

Дадзены прыклад яшчэ раз падкрэслівае выхаваўчую функцыю мастацтва, звязаную перш за ўсе з сілай уздзеяння, духоўнага ачышчэння асобы.

### Літаратура


1. *Жураўлёў, В.П.* Структара твора / В.П. Жураўлёў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 312 с.
2. *Мейлах, Б.С.* Процесс творчества / Б.С. Мейлах. – М.: Искусство, 1985. – 318 с.
3. Роднае слова. – 1992. – № 3.
4. *Стральцова, В.М.* Шлях да сябе / В.М. Стральцова. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 112 с.



### Summary

*The genesis and evolution of confessionary reflection in culture are analysed in the article. Confessionary forms are transformed in various spheres of culture: philosophy, literature, painting, music, psychiatry, psychoanalysis (Z. Freud, E. Fromm, K. Jung). The process of creation will be impossible without reflection.*


*УДК 008:39*


***Ю.В. Чарняўская,***

*кандыдат культуралогіі, дактарант кафедры культуралогіі БДУКМ*


## ПРЫРОДА І СУТНАСЦЬ ЭТНІЧНАСЦІ: ДА ПАДЫХОДУ МЯККАГА КАНСТРУКТЫВІЗМУ

***Уводзіны.*** У наш час ў сусветным маштабе адначасова адбываюцца два працэсы. Першы з іх – працэс узбуйнення этнакультурных «арганізмаў» (часта з такімі вынікамі, як асіміляцыя і акультурацыя). Другі – супрацьлеглы працэс развіцця этнічнай самасвядомасці, які часам даходзіць да сепаратызму і міжэтнічных канфліктаў. У якасці неадкладнай мэты навукоўца паўстае ўсведамленне таго, чым з’яўляецца этнічнасць. Сёння відавочна, што недаацэнка гэтага фактару, які на працягу савецкага перыяду лічыўся ў навуцы другасным, насамрэч мае трагічныя вынікі. Але зразумець, якія стратэгіі пазбягання асіміляцыі ці сепаратызму найбольш дзейсныя, калі канцэпт этнічнасці не распрацаваны, немагчыма. Менавіта спроба яго фармалізацыі,

а таксама аналіз сутнасці і прыроды этнічнасці як культуралагічнага феномена і ёсць мэты артыкула.

***Асноўная частка.*** Як сцвярджалі яшчэ ў 70-я гг. XX ст. Глэзер і Мойніхан [3, с. 18], тэрмін «этнічнасць» – нядаўняга паходжання. Тое ж суадносіцца з нашай сучаснай рэчаіснасцю: тэрмін «этнічнасць» прыйшоў у постсавецкі навуковы дыскурс толькі ў 90-х гг. XX ст. Да гэтага часу яго замяняў тэрмін «этнічная самасвядомаць», які належаў стваральнікам савецкай тэорыі этнасу. Але сёння распаўсюджана і спалучэнне «этнічная ідэнтычнасць», якое часта ўжываецца ў тым жа сэнсе. У 70-я гг. XX ст. А. Грылі і У. Макрэдзі адзначалі, што колькасць вызначэнняў этнічнасці раўняецца колькасці аўтараў [5, с. 73]. З мэтай удакладнення паняцця этнічнасці прапануем нашу тыпалогію яе дэфініцый (а таксама канцэптаў этнічнай самасвядомасці і этнічнай ідэнтычнасці, калі яны выкарыстаны сінанімічна), якую мы зрабілі на аснову аналізу больш за 60 вызначэнняў гэтага культурнага феномена.

1. *Дэфініцыі этнічнасці як групавога параўнання, г. зн. апазіцыі «мы – яны»*. З гэтага пункту гледжання этнічнасць ёсць устойлівая сістэма ўсвядомленых уяўленняў і этнадыферэнцыруючых і этнаінтэгрыруючых ацэнак жыццядзейнасці этнасу [15, с. 68] у сэнсе аддзялення індывіда ад адных культурных пластоў і ідэнтыфікацыі яго з іншымі [8, с. 10–11]. Э. Хабсбаум дадае, што этнічнасць ідэалагічна прадумоўлена [6, с. 4], а Э. Фрэнсіс – што яна абавязкова грунтуецца на фактары веры ў агульнае паходжанне [4, с. 80].

2. *Дэфініцыі этнічнасці як псіхасацыяльнай належнасці да этнасу*.

Напрыклад, Т. Парсанс разумее этнічнасць як ідэнтычнасць, якая арганізуе вялікую колькасць людзей, і звязаныя з гэтым пачуцці салідарнасці і прызнання сябе прадстаўніком этнасу [7, с. 53]. Гэта шматпланавы феномен, куды ўваходзяць розныя ідэнтычнасці (тэрытарыяльная, моўная і г. д.) [11, с. 15].

3. *Дэфініцыі з пункту гледжання «нацыянальнага характару»* як «сукупнасці характарыстык (комплексу фізічных і маральных якасцей), якія адрозніваюць адну нацыю ад іншай» [9, с. 52]. Абавязковыя якасці этнічнасці – «нацыянальнае пачуццё» (О. Бауэр, Н. Джандзільдзін, В. Бабакоў, В. Сямёнаў) і «нацыянальны тэмперамент» (Н. Джандзільдзін, Я. Часноў і інш.)

4. *Дэфініцыі з пункту гледжання культурнай памяці і традыцыйнага зместу культуры* (В. Вундт, Дж. Дэ-Вос, С. Энлоу, У. Альтермат і інш.), калі этнас разумеецца як «сукупнасць людзей, якія ўсведамляюць сябе носьбітамі шэрага агульных традыцый, не характэрных для іншых людзей, у кантакце з якімі яны знаходзяцца» [12, с. 233] (народныя вераванні, мова, наяўнасць гістарычнай радзімы і г. д.).

5. *Дэфініцыі з погляду працэсаў этнічнай мабілізацыі*. З гэтага пункту гледжання, этнічнасць вызначаецца як сродак мабілізацыі калектываў на дасягненне канкрэтных палітычных мэт [3, с. 18]. Адсюль сыходзіць думка аб этнічнасці як якасці, уласцівай меншасцям, і канфліктнай па сутнасці. Але падаецца правамоцным удакладненне А. Коэна: этнічнасць – увогуле форма інтэракцый (не абавякова канфліктных) у поліэтнічнай прасторы [2, с. 374].

6. *Дэфініцыі з пункту гледжання сімвалічнага характару этнічнасці*, напрыклад меркаванне У. Соларса, што ўсе этнічныя маркеры з неабходнасцю сімвалічныя [8, с. 12]. Але больш карэктным падаецца погляд на этнічнасць як на ўвогуле сімвалічную (эмблематычную, па Л. Раманусі-Рос) катэгорыю, якую выкарыстоўваюць ў мэтах дыферэнцыяцыі (К. Гірц, Л. Раманусі-Рос).

7. *Дэфініцыі з пункту гледжання этнічных межаў*. Так, Ф. Барт прапанаваў інтэрпрэтацыю этнічнасці як мяжы, якая ахоплівае відавочныя і латэнтныя культурныя сэнсы: «Культурныя рысы, якія вызначаюць гэтую мяжу, здольныя да змен, характарыстыкі членаў груп трансфармуюцца, можа змяніцца і структура групы. Сталай з'яўляецца толькі дыхатамія «мы» і «яны» [1, с. 14]. Тым самым Барт настойвае на дынамізме ўнутранага зместу культуры, калі канстанта – не канкрэтныя рысы этнічнасці, а межы самавызначэння этнафораў (групавы перазапіс, па М. Завалоні, ці самапрыпісванне, па Дж. Дэ-Восу і Л. Раманусі-Рос), прылічэнне да яе (а таксама выключэнне з яе) сябе і іншых. Адзначым, што ў аспекце «мы – яны», гэта вызначэнне суадносіцца з першай групай дэфініцый, апрача таго, пры такім разуменні павялічваецца роля сімвалічнага кампанента, і тым самым дэфініцыя Барта сыходзіцца з шостай групай. Тое ж датычыцца і вызначэнняў трэцяй і чацвёртай груп. Такім чынам, яна з'яўляецца найбольш універсальнай. Вартасць гэтай дэфініцыі ў тым, што яна настойвае на дынамізме этнічнасці, якая разумеецца як рэсурс сімвалічнай камунікацыі і тым самым сродкам мабілізацыі і сродкам «абмену» з іншымі этнасамі. Змест абмену – тыя рысы культуры этнасу, якія выступаюць у якасці этнакультурных маркераў (яе этнас, знакава-сімвалічныя сістэмы, механізмы матывацыі, культурная памяць і інш.). Іх змест не канстантны, ён змяняецца ў сувязі з цягам часу, з дрэйфам сацыякультурнай сітуацыі і г. д., але сама наяўнасць этнічнай мяжы не дае культуры страціць унікальнасць і фарміруе этнічнасць. Мы лічым, што менавіта такое разуменне этнічнасці найбольш функцыянальна з той прычыны, што падае этнас як зменлівую, але заўсёды канстантную ў аспекце самасвядомаці супольнасць. Але для фармаліза-

цыі гэтага канцэпту неабходны яшчэ адзін крок, а менавіта, размежаванне этнічнасці і этнічнай ідэнтычнасці. З нашага пункту гледжання, яно ў тым, што этнічная ідэнтычнасць (калі прытрымлівацца ідэй стваральнікаў канцэпту ідэнтычнасці З. Фрэйда, Э. Эрыксана і інш.) – катэгорыя, галоўным чынам, індывідуальна-асобасная. На наш погляд, яна нараджаецца ў рамках індывідуальнай ідэнтычнасці, у экзістэнцыяльнай актыўнасці суб'екта, але выходзіць на іншы, надасобасны ўзровень. Механізм тут – апрадмечванне індывідуальных этнахарактарыстык, этнічных *Self* у тэкстах культуры (наратывах, прататыпах ідэнтычнасці, практыках паводзінаў і г. д.). Адгэтуль можна дэфініраваць ***этнічнасць як сукупнасць этнічнага зместу культуры супольнасці, якая мае індывідуальнае пераламленне ў свядомасці яе прадстаўнікоў***. Мы мяркуем, што ўжо на раннім этапе фарміравання яна ўключае тры аспекты: 1) корпус тэкстаў культуры, якія ствараюць яе адметны «твар» (мы разумеем тэрмін «тэкст» у сучаснай інтэрпрэтацыі); 2) эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны этнафора да гэтых тэкстаў; 3) ідэнтыфікацыю сябе як прадстаўніка менавіта гэтай культуры на падставе валодання пэўным узроўнем этнакультурнай кампетэнтнасці, якія дазваляюць разумець гэтыя тэксты і падзяляць выказаны ў іх этас. Такім чынам, найбольш значны крытэрый этнічнасці – належнасць сэнсаваму полю культуры, якое выражана ў гэтых тэкстах.

Сучасны дыскурс этнічнасці пераважна разгортваецца ў двух кірунках: прымардыялізм і канструктывізм. Прадстаўнікі першага (Э. Сміт, П. ван дэн Берге, савецкая і постсавецкая тэорыя этнасу і інш.) лічаць, што этнічнасць – вынік спрадвечнай (у крайнім выпадку – кроўнароднаснай) сувязі этнафораў, а другога – што гэта сканструяваная элітамі катэгорыя (Э. Хабсбаум, Э. Гелнэр, Б. Андэрсан, В. Цішкоў і інш.). Мы не згодны ні з тымі, ні з другімі: першыя ігнаруюць фактары міксацыі і метысацыі, а таксама тое, што ні адна з аб'ектыўных адзнак этнасу не з'яўляецца абавязковай; другія – факты ўзнікнення этнасу і яго згуртаванасці без уздзеяння паліттэхналогій. Паводле нашага меркавання, этнічнасць ёсць прадукт канструявання, але не з боку эліт, а ў выніку «жывой творчасці мас» (І. Абдзіраловіч), у аснове якога – «адказ» на «выклік» асяроддзя. Таму калі спробы канструявання з боку дзяржаў і эліт не адпавядаюць надзённаму пласту, які быў сканструяваны масамі, не суадносяцца з этнічным «габітусам» (П. Бурдзё), гэтыя спробы застаюцца безвыніковымі. Менавіта гэты сэнс укладзены намі ў канцэпт «мяккага канструктывізму».

З гэтай пазіцыі этнічнасць, перш за ўсё, інфармацыйна-камунікатыўны рэсурс, які кампенсуе адсутнасць прыродных падстаў для згуртаванага быту людзей. Аднак размова павінна ісці не толькі ў тэрмінах адаптыўна-дзейснага падыходу [14], г. зн. не толькі аб адаптацыі да прыроднага асяроддзя, але і, галоўным чынам, аб аспектах адаптацыі этнічнай культуры да іншых культур і адаптацыі этнафораў адзін да аднаго. Апошні аспект прадугледжвае барацьбу «супрацьтаго ў дзейнасці розуму, што можа прыгнятаць індывіда і разбэшчваць супольнасць» [10, с. 221]. Захавальнік нарматыўна-каштоўнасных зместаў культуры, якія спыняюць такога кшталту дзейнасць, – корпус прэцэдэнтных тэкстаў (міф, рытуал, абраднасць, творы фальклору, прафесійнай культуры, сімвалы ў разуменні Тартуска-Маскоўскай школы семіётыкі, г. зн., як найбольш значныя тэксты ў згорнутай форме, мадэлі паводзін і г. д.). Аднак інфармацыйна-камунікатыўны рэсурс – толькі сігніфікант этнічнасці, а сігніфікатам з'яўляецца шэраг факальных каштоўнасцей, якія ўзнікаюць на аснове ўсёй культуры як сукупнасці дасягненняў этнічнага духоўнага вопыту, а таксама базісных псіха- і сацыякультурных патрэб чалавека. Асноўныя з іх: 1) патрэба ў афіліяцыі, якую забяспечвае супольнасць (Мы-патрэба); 2) патрэба ў сацыякультурным статусе як асаблівым месцазнаходжанні ў групе (Статус-патрэба); 3) патрэба ў самавызначэнні ў кантэксце належнасці «я» да унікальнай чалавечай супольнасці (Self-патрэба). Гэтыя структуры ў развітым выглядзе ахопліваюць тры «сектары» («прасторы») этнічнасці – асабовы (этнічная ідэнтычнасць), групавы (этнічныя ролі і статусы) і агульна-этнічны (інтэграцыя і дыферэнцыяцыя на аснове этнічных маркераў).

Мы лічым, што гэтыя «сектары» ў іх адаптыўнай функцыі «прадугледжаны» ў структуры этнічнай карціны свету, якая абслугоўвае светапоглядныя патрэбы прадстаўнікоў этнічнай культуры як спецыфічнай духоўнай цэласнасці. У кантэксце карціны свету яны рэалізуюцца ў асаблівых духоўных праламленнях: у якасці ўяўленняў (рэпрэзентатыўны ўзровень карціны свету) і сімвалічна выяўленых каштоўнасцей (каштоўнасна-сімвалічны ўзровень), прычым узнікненне этнічнасці мажліва толькі пры наяўнасці ўсіх трох патрэб і суадносна – трох планаў ідэнтычнасці. Таму можна згадзіцца з тэзісам, агульным для Ю. Брамлея, С. Аруцюнава, Э. Хабсаума і інш., што этнічнасць – не эсэнцыяльная якасць супольнасці: калі першая патрэба ўласціва не толькі чалавечым, але і жывёльным калектывам, дык дзве апошнія ўказваюць выключна на культурны тып арганізацыі. У такім разуменні этнічнасць – дынамічны феномен, бо па сутнасці з'яўляецца дыялектычным працэсам паўсядзённага суаднясення не толькі паміж «Мы» і «Яны», але і этнафорам і этнасам (у гэтым прычына «размеркаванай» этнічнасці, нераўнамерна ўласцівай людзям і групам). Адсюль вынікае і кагнітыўна-эмацыянальны характар этнічнасці, дзе кагніцыі забяспечваюцца ў другой «прасто-

ры», а эмацыянальнасць – у першай і трэцяй (Мы і Self), прычым калі самавызначэнне «Мы» дыфузнае, першапачатковае, дык «Self» мае перадумовай пачуццё сваёй унікальнасці, чаму садзейнічае пачуццё унікальнасці этнасу. Статус-патрэба і каштоўнасці, якія ўзнікаюць на яе выснове, прыводзяць да сацыяльных роляў, статусаў, экспектацый, якія фарміруюць групавы ўзровень этнічнасці і ўвогуле яе рэгулятыўны аспект. Такім чынам, наш погляд на этнічнасць мае на ўвазе яе структурна-функцыянальнае напаўненне (тры сектары, якія мы адзначалі раней, – яе абавязковыя кампаненты). Аднак нават сфарміраваная этнічнасць не статуарная і не цэласная: яна разыходзіцца на больш дэталёвыя ідэнтычнасці (шэраг Мы суаднос – на шэрагу Яны) і, апрача таго, нарошчвае на гэту антытэзу мноства характарыстык, якія ўзнікаюць у тэкстах культуры і ствараюць яе кантэкст. Тым самым этнічнасць паўстае не як сума статычных адзнак, а як вынік пераменлівых адносін у сістэме ўзаемадзеяння Мы (асобаснае Self – групавое Self – агульнаэтнічнае Self) і Яны (з таго ж сістэмастваральнага прынцыпу). Асноўнае яе выяўленне – тэксты культуры, а змест – культурны кантэкст. Таму магчыма канкрэтызаваць наша вызначэнне ў новым ракурсе: ***этнічнасць – дынамічная, тэкстуальна прадстаўленая канцэпцыя месца этнасу ў коле іншых супольнасцей – і ў той жа час – канцэпцыя месца чалавека ў этнасе, якая ўзнікае на падставе шэрага асабовых і групавых ідэнтыфікацый***.

***Заключэнне.*** Разуменне этнічнасці, якое мы абгрунтавалі ў артыкуле, стварае кансэнсус паміж прымардзіялізмам і канструктывізмам. З аднаго боку, этнічнасць паўстае не як лінейная, закрытая, монапалярная (як яна бачыцца прымардыялістам), а як адкрытая зменам і міжкультурным кантактам сістэма. Але нельга не згадзіцца з П. ван дэн Берге і Э. Смітам ў тым, што этнічнасць нельга адвольна вынайсці («вынайдзеная традыцыя» Э. Хабсбаума) ці ўявіць («уяўленая супольнасць» Б. Андэрсана). Ёй магчыма маніпуліраваць, выкарыстоўваць як інструмент адрознення, аднак яна заўсёды ўзнікае на аснове соцыуму, аб'яднанага агульнай культурай. У гэтым сэнсе варта пагадзіцца з І. Зарынавым у тым, што такая канструкцыя заўсёды з'яўляецца рэканструкцыяй, таму што сацыяфоры (у нашым выпадку этнафоры) здольныя канструяваць толькі «гістарычна складзеныя, але ў сілу розных прычын страчаныя культурныя характарыстыкі і стандарты» [13, с. 3–16]. Толькі ў адзінстве трох сектараў ідэнтыфікацыі (уяўленняў і каштоўнасцей, якія афармляюць гэтыя сектары, сімвалам, якія выказваюць гэтыя ўяўленні і каштоўнасці) магчыма збудаваць сучасны дыскурс этнічнасці.

### Літаратура


1. *Barth, F.* Introduction / F. Barth // Ethnic Groups and Boundaries. The Social Organization of Culture Difference. – Bugex-Oslo: University Foriaget Press; London: George Allex and Com., 1969. – P. 9–22.
2. *Cohen, A.* The Lesson of Ethnicity // A. Cohen //Urban Ethnicity. – London etc: Tavistock Publications, 1974. – C. 371–380.
3. Ethnicity: Theory and Experience / Ed. N. Glazer and D. P Moynihan. – Cambrige, Mass.: Harvard University Press, 1976. – 531 p.
4. Francis, E. Interethnic Relations: An Essay in Sociological Theory/ E. Francis. – New York-Oxford-Amsterdam: Elsevier, 1976. – 382 p.
5. *Greeley, A.M., McCready, W.C.* Does Ethnicity Matter/ A.M. Greeley, W.C. McCready // Ethnicity.– 1974. –Vol. 1. № 3.– P. 64–91.
6. *Hobsbawm, E.J.* Ethnicity and Nationalism in Europe Today / E.J. Hobsbawm // Anthropology Today. – 1992.– Vol. 8, № 1.– P. 4–13.
7. *Parsons, T.* Some Theoretical Considerations on the Nature and Trends of Change of Ethnicity / T. Parsons In: Ethnicity. Theory and Experience.– Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1975. – P. 53–83.
8. *Sollors, Werner.* Theories of American Ethnicity Foreword / Werner Sollors // Theories of Ethnicity: a Classical reader. – N.Y.: NYU Press, 1996. – P. 10–35.
9. *Бауэр, О.* Национальный вопрос и социал-демократия / О. Бауэр // Нации и национализм / Б. Андерсон, О. Бауэр, М. Хрох и др. – М.: Праксис, 2002. – С. 52–120.
10. *Бергсон, А.* Два источника морали и религии. История философии в памятниках / А. Бергсон. – М.: Канон, 1994. – 384 с.
11. *Бромлей, Ю.В.* Современные проблемы этнографии. Очерки теории и истории / Ю.В. Бромлей.– М.: Наука, 1981. – 390 с.
12. *Де-Вос, Дж.* Этнический плюрализм: конфликт и адаптация // Дж. Де-Вос // Личность, культура, этнос: современная психологическая антропология / под общ. ред. А.А. Белика. – М.: Смысл, 2001. – С. 229–276.
13. *Заринов, И.Ю.* Время искать общий язык (проблема интеграции различных этнических теорий и концепций) / И.Ю. Заринов // Этнографическое обозрение. – 2000. – № 2. – С. 3–16.
14. Маркарян, Э.С. Теория культуры и современная наука (логико-методологический анализ) / Э.С. Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.
15. Хотинец, В.Ю. Этническое самосознание / В.Ю. Хотинец. – СПб.: Алетейя. – 240 с.



### Summary

*The article is devoted to a phenomenon ethnicity, its nature and essence. The author offers the new approach (soft constructivism) on the basis of modern researches analysis.*

# РЭФЕРАТЫ

**УДК [947.6:001] «1991/2000»**

***Крывічаніна К.А.*** **Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у сферы міжнародных навуковых зносін (1991–2000 гг.): станаўленне і развіццё // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 3–6.**

Робіцца спроба асвятліць працэс фарміравання нарматыўна-прававой базы міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Беларусі, што праходзіў у 90-я гг. ХХ ст. Канцэнтруецца ўвага на заканадаўчых актах, што сталі фундаментальнымі ў навуковай сферы і заклалі галоўныя прынцыпы развіцця ўзаемавыгадных сувязей Рэспублікі Беларусь з сусветным навуковым супольніцтвам. Аналізуецца заканатворчая дзейнасць, якая разгарнулася ў навуковай сферы. Мяркуецца, што ў новых умовах важным было стварэнне сучаснага заканадаўства, якое б садзейнічала вырашэнню шматлікіх праблем, з якімі на пачатку 1990-х гг. сутыкнулася айчынная навука. Нацыянальнае заканадаўства ў галіне дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі садзейнічала з'яўленню міжнародных дагавораў і пагадненняў, што былі заключаны як беларускім урадам, так і асобнымі ведамствамі і ўстановамі рэспублікі з замежнымі і міжнароднымі навуковымі арганізацыямі і спрыяла развіццю навуковай кааперацыі.

Бібліягр. – 24 назвы.

**УДК 931:37 (091)(476)**

***Цыбулька К.М.*** **Вывучэнне гісторыі антычнасці ў сістэме асветы і адукацыі Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку ХХ ст. // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 6–9.**

Разглядаюцца праблемы развіцця гісторыі антычных цывілізацый у агульнай сістэме гуманітарных ведаў на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку ХХ ст. Даказваецца, што гісторыя антычнасці ў адукацыйных установах гуманітарнага профілю вывучалася на досыць глыбокім і ўсебаковым узроўні. Адзначаецца наяўнасць навуковай літаратуры па адзначанай праблеме, высокаадукаваных выкладчыкаў, колькасць гадзін, якія адводзілася на адзначаныя прадметы. Паказваецца, што ў гімназіях і прагімназіях гісторыя антычнасці, нараўне са старажытнымі мовамі, служыла асноўным індыкатарам, які дазваляў прадаўжаць навучанне.

Бібліягр. – 14 назваў.

**УДК 930 «1991/2005»**

***Будзянкова Т.С.*** **Метадалагічныя аспекты айчынных гістарыяграфічных даследаванняў (1991–2005 гг.) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 10–12.**

Праведзены аналіз метадалагічных асноў дысертацыйных прац гістарыяграфічнай праблематыкі, абароненых у Рэспубліцы Беларусь з 1991 па 2005 г. па спецыяльнасці 07.00.09 (гістарыяграфія, крыніцы і метады гістарычнага даследавання). Прымяненне гісторыка-параўнальнага метаду дазволіла правесці іх тыпалогію паводле прадмета даследавання.

Зроблены вывад аб неабходнасці распрацоўкі тэарэтыка-метадалагічных асноў гістарыяграфіі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны. Гэта датычыцца як удакладнення тэрміналогіі, так і знаёмства з вопытам замежных даследчыкаў.

Бібліягр. – 15 назваў.

**УДК 37(091) «19»:023**

***Сарока А.Г.*** **Падрыхтоўка бібліятэчных работнікаў у Савецкай Беларусі ў 20-х гг. ХХ ст. // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 12–15.**

Даследуецца праблема падрыхтоўкі кваліфікаваных бібліятэчных работнікаў у Савецкай Беларусі ў 20-х гг. ХХ ст. і далейшага павышэння іх прафесійнага ўзроўню. Раскрываюцца намаганні дзяржаўных і мясцовых савецкіх органаў па пошуку форм работы з бібліятэчнымі кадрамі. Асвятляюцца пытанні, вывучэнню якіх надавалася ўвага на курсах, бібліятэчных аб'яднаннях, семінарах і г. д. Высвятляюцца складанасці, супярэчнасці, бессістэмнасць у станаўленні работы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы бібліятэчных кадраў.

Бібліягр. – 18 назваў.

**УДК 271.2 «1921/1939»:947.6**

***Цымбал А.Г.*** **Юрыдычна-арганізацыйныя ўмовы дзейнасці Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 15–19.**

Даследуюцца юрыдычна-арганізацыйныя умовы дзейнасці Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Разглядаюцца пытанні абвяшчэння аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, фарміравання заканадаўчых асноў царкоўна-дзяржаўных узаемаадносін і афармлення тэрытарыяльна-арганізацыйнай структуры царквы. Адзначаецца, што ўсталяванне аўтакефаліі Царквы адбылося пад ціскам улад, а яе юрыдычнае становішча заканадаўча не было вызначана да 1938 г. З устанаўленнем дзяржаўных межаў Польшчы адбылася рэарганізацыя тэрытарыяльнай структуры Праваслаўнай Царквы, якая была дапасавана да адміністрацыйнага падзелу дзяржавы.

Бібліягр. – 18 назваў.

**УДК 943.086**

***Белановіч А.М.*** **Катэгорыя «остарбайтар» – «усходні рабочы» у нацысцкай іерархіі замежных рабочых у германскім рэйху (1941–1945) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 20–23.**

Аналізуецца нацысцкая катэгорыя «остарбайтар» у дачыненні да беларускага насельніцтва, выгнанага на прымусовыя работы ў Германскі рэйх падчас Другой сусветнай вайны. Характарызуюцца ўмовы ўтрымання, вольнага часу остарбайтараў згодна з нацысцкімі прадпісаннямі па знаходжанні замежных рабочых у рэйху. На падставе інтэрв'ю з былымі остарбайтарамі разглядаюцца праявы салідарнасці і дапамогі паміж работнікамі розных нацыянальнасцей. Даследуецца нацысцкая палітыка ў дачыненні да цяжарных жанчын-остарбайтараў і беларускіх немаўлят, народжаных у рэйху.

Бібліягр. – 16 назваў.

**УДК 947.6**

***Вараб'ёў А.А.*** **Выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход у Мінскай губерні // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 23–26.**

Разглядаецца працэс выбараў ва Усерасійскі Устаноўчы сход на тэрыторыі Мінскай губерні. Даецца характарыстыка прац гісторыкаў, якія з'яўляюцца асноўнымі даследчыкамі гэтай праблемы на сённяшні дзень. Асноўная частка артыкула прысвечана тым аспектам разглядаемай праблемы, якія былі вывучаны папярэднікамі недастаткова або зусім не разглядаліся. Да іх неабходна аднесці заключэнне кандыдацкімі выбарчымі спісамі блокавых пагадненняў як паміж сабой, так і з тымі палітычнымі партыямі і рухамі, якія не былі прадстаўлены на выбарах.

Аўтарам унесены значны асабісты ўклад у вывучэнне вышэйназванай праблемы за кошт выкарыстання ў артыкуле адрывачных, раней нікім з папярэднікаў не адзначаных, звестак аб правапарушэннях, якія былі дапушчаны у час правядзення выбараў.

Бібліягр. – 12 назваў.

**УДК 930.26«5/12»**

*Пілецкі В.А.* **Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы аб спецыфіцы сацыяльна-эканамічнага становішча насельніцтва Беларусі ў VI–VIII стст. і ў IX – сярэдзіне XIII ст. // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 26–30.**

Паказаны адрозненні ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурна-рэлігійным развіцці насельніцтва тэрыторыі Беларусі падчас разлажэння радавых адносін і ў раннефеадальным перыядах. Адзначана, што адрозненні гэтыя насілі характар карэнных, выяўляліся ва ўсіх сферах жыцця грамадства і пацвярджаюцца ўласнабеларускімі гістарычнымі крыніцамі.

Бібліягр – 16 назваў.

**УДК 940.1 «14/15»**

*Шымак А.К.* **Усходняя Еўропа і дыпламатыя Рымскай курыі (канец XV – пачатак XVI ст.) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 30–34.**

Асвятляюцца міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў канцы XV – пачатку XVI ст. Аналізуюцца знешнепалітычныя прыярытэты Вялікага княства Маскоўскага, Вялікага княства Літоўскага, Кароны Польскай і Лівонскага ордэна. Разглядаецца дыпламатычная барацьба, якая разгарнулася за заступніцтва Рымскай курыі. Надаецца ўвага знешнепалітычным акцыям вялікага князя маскоўскага Івана III, накіраваным на прадухіленне антымаскоўскай кааліцыі пад кіраўніцтвам Папы Рымскага.

Бібліягр. – 28 назваў.

**УДК 973.04:2**

*Космач П.Г.* **Рэлігія і прыняцце першай папраўкі да Канстытуцыі ЗША (па матэрыялах першага федэральнага Кангрэса) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 34–37.**

Разглядаецца працэс прыняцця першай папраўкі да Канстытуцыі ЗША ў частцы, якая гарантуе свабоду сумлення. Аналіз яе генезісу, выпрацоўкі, прыняцця і першапачатковай правапрымяняльнай практыкі паказвае наяўнасць двух сэнсаў. У вузкім разуменні яна забараняла ўвядзенне дзяржаўнай царквы ці дзяржаўнае ўмяшальніцтва ў справы, якія адносяцца толькі да ўнутранага жыцця рэлігійных арганізацый. У другім, больш шырокім, сэнсе яна вызначала сферу нерэкамендаваных, але дапушчальных дзеянняў па аказанні падтрымкі рэлігіі ў недыскрымінацыйнай форме, пад якой дэ-факта разумелася хрысціянства як рэлігія абсалютнай большасці. Дзеянне першай папраўкі не закранала ўзровень штатаў, дзе заканадаўства, як правіла, не адпавядала свецкім ідэалам. З прыняццем чатырнаццатай папраўкі (1868) сітуацыя паступова змянілася. Сучасная лінія Вярхоўнага суда ЗША (з 1940-х гг.) накіравана на звужэнне сферы дапушчальнага ўзаемадзеяння дзяржавы і рэлігіі.

Бібліягр. – 21 назва.

**УДК 947.084.8**

*Салькоў А.П.* **СССР і югаслаўска-італьянскія тэрытарыяльныя супярэчнасці ў раёне Істрыі–Трыеста (красавік 1941 – май 1945 гг.) // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 37–41.**

Аналізуюцца югаслаўска-італьянскі тэрытарыяльны канфлікт (Юлійская Крайна, Істрыя, Трыест), які ўзнік у выніку Першай сусветнай вайны. Гэтыя землі з'явіліся адным з істотных пунктаў тых схем пасляваеннай тэрытарыяльнай перабудовы, якія распрацоўваліся ў Антыгітлераўскай кааліцыі. Савецкае кіраўніцтва першапачаткова зыходзіла з жорсткай пазіцыі ў адносінах да Італіі, але не мела дастаткова вызначанай пазіцыі ў пытанні далучэння ўсіх гэтых зямель да Югаславіі. Югаслаўскі народна-вызваленчы рух, наадварот, лічыў неабходным далучыць усе тэрыторыі, адышоўшыя да Італіі па Рапальскай дамове 1920 г. Такі падыход, з аднаго боку, катэгарычна разыходзіўся з англа-амерыканскімі геапалітычнымі ўяўленнямі аб будучых абрысах паўночнаадрыятычнага рэгіёну, з другога – часткова супярэчыў дзяржаўным інтарэсам СССР на заключным этапе вайны. Гэтыя калізіі прывялі да двух палітычных крызісаў красавіка–мая 1945 г. – у Трыесце і вакол Славенскай Карынтыі, якія атрымалі сваё ўрэгуляванне ўжо ў наступны перыяд і не на карысць інтарэсам Югаславіі.

Бібліягр. – 32 назвы.

**УДК 140.8**

*Кікель П.В., Абалевіч І.В.* **Метадалагічныя праблемы фарміравання светапогляду // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 42–47.**

Аналізуюцца два шляхі рашэння праблемы фарміравання светапогляду і яго трансфармацыі. Гэта традыцыйны шлях вывучэння мыслення праз вывучэнне структур яго матэрыяльнага носьбіта. Паказваецца перспектыўнасць, эфектыўнасць дадзенага кірунку і ў той жа час яго абмежаванасць, звязаная з немагчымасцю рашэння шматлікіх праблем, якія ляжаць у кантэксце развіцця свядомасці. Асноўная ўвага канцэнтруецца на складаным і супярэчлівым працэсе ўзаемадзеяння суб'екта і соцыуму, які з'яўляецца дамінуючым фактарам фарміравання светапогляду ў сучасных умовах.

Бібліягр. – 4 назвы.

**УДК 140:008**

*Таркан І.І.* **Канцэпцыі дыялога культур як сацыяльнага ідэала ў сучаснай філасофскай думцы // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 47–50.**

Разглядаюцца канцэпцыі ў кантэксце сучасных глабальных праблем. Адзначаецца, што актуальнасць дыялога культур для іх вырашэння дазваляе гаварыць не проста як аб філасофскай ідэі, але як аб адным з сацыяльных ідэалаў глабальнага грамадства, якое фарміруецца.

У міжнародных адносінах дыялог культур, заснаваны на герменэўтычнай метадалогіі ўзаемаразумення, прадстае як сродак ці механізм бесканфліктнага ўзаемадзеяння сусветных цывілізацый. У гэтым выпадку асаблівая ўвага надаецца ідэям аўстрыйскага філосафа Х. Кехлера, а таксама канцэпцыям сучаснай ліберальнай думкі, якая фарміруецца ў рамках ААН. Указваецца, што рэалізацыі дыялога культур, як ідэала міжнароднай палітыкі, перашкаджае ідэя С. Ханцінгтана аб «сутыкненні цывілізацый». У святле крытычнага аналізу, адзінай магчымасцю прадухілення глабальнага сутыкнення цывілізацый з'яўляецца іх раўнапраўны і свабодны дыялог, ажыццяўляемы на ўзроўні міжкультурнага ўзаемаразумення.

Бібліягр. – 6 назваў.

**УДК 141.3**

*Успенскі К.А.* **Эстэтычныя аспекты філасофіі Хазрата Інайят Хана // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 50–53.**

Выяўляюцца эстэтычныя аспекты філасофіі Хазрата Інайят Хана. Даследуецца сутнасць эстэтыкі, якая імпліцытна прадстаўлена ў тэкстах індыйскага мысліцеля, і яе асноўныя рысы. Канстатуецца прынцыповая эстэтычнасць філасофіі Інайят Хана ў цэлым, у выніку чаго містычнае перажыванне яднання з Абсалютам, якое з'яўляецца канчатковай мэтай практычнай рэалізацыі

вучэння, трактуецца ў якасці кульмінацыі эстэтычнага вопыту. Аналізуюцца асаблівасці разумення філосафам феномена мастацтва (асабліва музыкі), якое, з'яўляючыся ўключаным у працэс набыцця духоўнага вопыту, надзяляецца найвышэйшым статусам.

Бібліягр. – 9 назваў.

**УДК 141.7**

***Кузняцова М.А.*** **Канцэпцыя «заходнізму» ў працах А.А. Зіноўева // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 53–57.**

Артыкул прысвечаны рэканструкцыі і аналізу канцэпцыі «заходнізму» выдатнага філосафа А.А. Зіноўева. Звяртаецца ўвага на такія актуальныя праблемы сучаснай сацыяльнай філасофіі, як глабалізацыя, прычыны распаду Савецкага Саюза, знешнепалітычны курс заходніх краін у кантэксце сучаснага гістарычнага працэсу. Адзначаецца, што вырашэнне гэтых пытанняў неабходна для вызначэння знешнепалітычных стратэгій краін былога СССР.

Бібліягр. – 5 назваў.

**УДК 141.7**

***Адаева Н.У.*** **Сацыяльна-філасофскі аналіз канцэпцыі «настаўнік» М.М. Майсеева // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 57–60.**

Сярод механізмаў, неабходных для адаптацыі чалавека да ўмоў жыцця, якія бесперапынна змяняюцца, а таксама да патоку інфармацыі, захлынуўшай сучаснага чалавека, вядучае месца займае сістэма «Настаўнік», якая ўзнікла сотні тысяч гадоў назад. Яна ўключае ў сябе інстытут адукацыі і выхавання новага пакалення. Выхад з крызіснага стану сучаснай тэхнагеннай цывілізацыі – гэта ўдасканаленне сістэмы «Настаўнік» – сістэмы ўздзеяння на чалавечую свядомасць.

Сацыяльна-філасофская канцэпцыя «Настаўнік» Мікіты Майсеева – спроба ўнесці свой уклад у гэтую найскладанейшую галіну чалавечай цывілізацыі.

Бібліягр. – 6 назваў.

**УДК 321(476) + (470+571)**

***Сіткевіч С.В.*** **Фарміраванне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі – тэндэнцыі, праблемы, перспектывы // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 61–64.**

Раскрываецца аб'ектыўная неабходнасць далейшых інтэграцыйных працэсаў у межах былога Савецкага Саюза. Разгледжаны і прааналізаваны асноўныя этапы стварэння Саюзнай дзяржавы. Прааналізаваны важнейшыя дакументы, якія стварылі прававую базу інтэграцыйнай структуры. Характарызуюцца асноўныя кіраўнічыя органы Саюзнай дзяржавы. Паказаны асноўныя мерапрыемствы, якія праводзяць кіраўнічыя органы ў палітычнай, эканамічнай, культурнай галінах у рамках Саюзнай дзяржавы.

Бібліягр. – 7 назваў.

**УДК 32.001**

***Скок Н.У.*** **Змястоўныя элементы палітычнай культуры // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 64–67.**

Палітычную культуру грамадства трэба вызначаць як асобную сацыяльную сістэму, у якой спалучаюцца дзве падструктуры, што ўяўляюць сабой дыялектнае адзінства сутнасці самога паняцця палітычнай культуры – палітычнай свядомасці і палітычных паводзін. Аналізуюцца такія кампаненты палітычнай культуры: палітычныя пазіцыі, палітычныя веды і ўяўленні, комплекс палітычных каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый, а таксама сума палітычных установак. Менавіта гэтыя адзінкі палітычнай культуры прыдаюць ёй асаблівую важкасць і значнасць у палітычнай сістэме грамадства.

Бібліягр. – 5 назваў.

**УДК 32.008**

***Казырэнка Н.П.*** **Палітычная культура: сучасныя канцэпцыі і праблемы даследавання // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 68–70.**

Аналізуюцца тэарэтыка-метадалагічныя аспекты даследавання палітычнай культуры як айчынных, так і замежных аўтараў. Шматлікія пытанні ў адносінах палітычнай культуры яшчэ не вырашаны, не выпрацавана адзінае паняцце палітычнай культуры, якое б адлюстроўвала якасную значнасць яе каштоўнага феномена. Кожная з існуючых канцэпцый палітычнай культуры ахоплівае пэўны комплекс праблем. Канцэпцыі даследавання палітычнай культуры будуюцца на аснове культурна-аналітычнага падыходу да палітычнага жыцця. Спецыфіка даследчай праблематыкі не дазваляе нам заставацца ў рамках аднаго метадалагічнага падыходу, таму неабходна звяртацца да розных тэарэтыка-метадалагічных асноў.

Бібліягр. – 3 назвы.

**УДК 32 (560)**

***Канапацкі М.Б.*** **Сілавы фактар у палітычным развіцці сучаснай Турцыі // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 70–72.**

Аналізуецца ўплыў ваенных, узброеных сіл на станаўленне і развіццё палітычнай сістэмы. Аўтар артыкула выкарыстоўвае вопыт развіцця турэцкай дзяржавы, якая пры непасрэдным удзеле ваенных змагла ўсталяваць унікальную мадэль палітычнай сістэмы. Апошняя спалучае элементы нацыянальнай традыцыі і заходняй дэмакратыі.

Бібліягр. – 3 назвы.

**УДК 316.7**

***Стаховіч Т.В.*** **Сацыяльна-духоўны аспект творчасці кампазітара Галіны Гарэлавай // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 73–76.**

Разглядаюцца сацыяльна-духоўныя элементы стваральніцкай дзейнасці кампазітара Г.К. Гарэлавай. Актуалізуецца значэнне сацыяльна-духоўных фактараў (спавядальны, матывацыйны, гендэрны, ідэйны) і функцый (эстэтычная, пазнавальная, выхаваўчая, філасофска-псіхалагічная) у яе творчасці. Даследуецца іх змест, раскрываюцца пэўныя аспекты назірання ў кампазітарскай практыцы.

Бібліягр. – 2 назвы.

**УДК 334.001**

***Давыдзенка Л.М., Давыдзенка Т.Дз.*** **Фарміраванне інтэлектуальнага капіталу ў арганізацыях будучыні // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 77–81.**

Даследуюцца канцэпцыі інтэлектуальнага капіталу ў форме чалавечага, арганізацыйнага і рыначнага. Прапаноўваецца арыгінальная структура інтэлектуальнага капіталу прадпрыемства, якая ўключае капітал ведаў, уменняў, развіцця, адносін, кліентаў тэхнічнага працэсу, інавацый.

Рыс. – 2. Табл. – 2. Бібліягр. – 4 назвы.

**УДК 334.7**

***Кравец Л.М.*** **Метадалагічныя падыходы да ацэнкі мэтазгоднасці стварэння інтэграваных структур // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 81–85.**

Разглядаюцца пытанні сутнасці і ролі інтэграваных структур у эканоміцы дзяржавы. Паказаны вопыт Расійскай Федэрацыі па іх стварэнні. Абмяркоўваюцца пытанні фарміравання інтэграваных структур ў Рэспубліцы Беларусь. Прыведзена сістэма паказчыкаў для ацэнкі мэтазгоднасці іх стварэння.

Бібліягр. – 10 назваў.

УДК 339.5(476)

***Бароўка М.У.*** **Метадалогія ацэнкі дыверсіфікацыі экспартных патокаў Рэспублікі Беларусь у краіны Еўрасаюза // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 85–89.**

Аналізуецца метад дыверсіфікацыі знешняга гандлю, які заключаецца ў пераходзе ад экспарту сыравіны і матэрыялаў да экспарту гатовай прадукцыі ў развіваючыхся і найменш развітых краінах, што неабходна зрабіць для нівеліравання рызык, звязаных з хістаннямі сусветных цэн на сыравіну. Метад дыверсіфікацыі заклікaны стымуляваць развіццё новых і ўжо маючыхся вытворчасцей з мэтай прадухілення так званай «галандскай хваробы»; мадыфікаваць вытворчасць з мэтай выпуску высокатэхналагічных вырабаў, а не матэрыялаў; расшырыць геаграфію знешнегандлёвых патокаў і партнёраў. Мяркуецца, што прымяненне метаду знешнегандлёвай дыверсіфікацыі актуальна і ў выпадку з Рэспублікай Беларусь, што дазволіць якасна расшырыць экспартны партфель і павялічыць колькасць гандлёвых партнёраў.

Рыс. – 1. Табл. – 1. Бібліягр. – 9 назваў.

УДК 33(476)+(470+571)

***Перапёлкін В.А.*** **Змяненні сукупнага попыту як прычына структурных зрухаў у эканоміках Беларусі і Расіі // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 89–92.**

Разглядаецца ўплыў з боку попыту на структурныя зрухі ў эканоміцы. Праведзены аўтарам параўнальны аналіз выкарыстання валавага ўнутранага прадукту Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама Федэратыўнай Рэспублікі Германія паказаў істотныя адрозненні ў дадзеным пытанні паміж гэтымі краінамі. Дынаміка ўдзельнай вагі па ўсіх прадстаўленых у табліцах частках у ВУП Расіі адрознівалася значна меншай стабільнасцю, чым у ВУП Беларусі і Германіі. Адзначаецца, што выяўленая нестабільнасць можа быць істотна зніжана, калі на змену мадэлі росту эканомікі, якая базіруецца на экспарце сыравіны, прыйдзе мадэль развіцця з апорай на ўнутраны попыт, вызначальным складальнікам якога выступае попыт хатніх гаспадарак, як гэта мае месца ў ФРГ і часткова ў Рэспубліцы Беларусь.

Бібліягр. – 14 назваў.

УДК 008:316.614–053.6

***Антановіч К.У.*** **Канцэпцыя свабоды і адказнасці у працэсе сацыялізацыі моладзі // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 93–94.**

Актуалізуецца праблема спасціжэння вучнямі беларускай школы паняццяў свабоды і адказнасці. Разглядаюцца пэйныя аспекты адлюстравання канцэпцыі ў сацыяльна-філасофскіх катэгорый ў мастацкай літаратуры, гісторыі Беларусі і айчыннай культуры. Падаюцца пэўныя метадычныя парады для настаўнікаў. Аналізуюцца пытанні суадносін культуры і адказнасці ў працэсе сацыялізацыі моладзі.

Бібліягр. – 2 назвы.

УДК 008

***Рудніцкая Я.Ф.*** **«Адкрыццё народа» ў тэорыі культуры // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 94–95.**

Разглядаецца сутнасць, прычыны і значэнне працэсу «адкрыцця» народнай культуры ў еўрапейскіх гуманітарных навуках XVIII–XIX стст. Падкрэсліваецца актуальнасць дадзенай праблемы для сучаснага адукацыйнага працэсу ў школе.

Бібліягр. – 2 назвы.

УДК 008(476)

***Здановіч Н.І.*** **Гарадское свята ў традыцыйнай культуры Беларусі // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 95–97.**

Аналізуюцца традыцыі свят у сельскай мясцовасці і горадзе. Даецца параўнальная характарыстыка асаблівасцей фарміравання святочнага календара, працэсаў падрыхтоўкі і правядзення рэлігійных і свецкіх свят. Засяроджваецца ўвага на ролі сям'і ў захаванні культурных традыцый.

УДК 008:811.161.3

***Аўсянская С.Я.*** **Роля беларускага мастацкага слова ў фарміраванні культуры міжасобасных зносін // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 98–99.**

Аналізуецца пытанне несуаднесенасці праграмных патрабаванняў і рэальнай практыкі навучання ва ўмовах недастатковай колькасці гадзін. Звяртаецца ўвага на тэхналогію развіцця крытычнага мыслення вучняў як да эфектыўнага шляху пераадолення адзначанай праблемы. Прыводзяцца канкрэтныя метадычныя распрацоўкі, скіраваныя на развіццё гуманнасці, творчасці і крытычнага мыслення вучняў сродкамі беларускага мастацкага слова.

УДК 008(07)

***Малашчанка Ю.І.*** **Семантыка вогненнай сімволікі ў школьным курсе «Айчынная і сусветная мастацкая культура» // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 99–100.**

Адзначаецца роля і месца вогненнай сімволікі ў літаратуры і выяўленчым мастацтве. У жывапісе – гэта імпрэсіянізм і постімпрэсіянізм (Ван Гог, Поль Гаген, Міхаіл Філіповіч і г. д.), дзе агонь выконвае экспрэсіўную функцыю. Раскрываецца псіхалагічнае напаўненне вогненнага комплексу ў мастацкай літаратуры (М. Булгакаў «Майстар і Маргарыта», Борхес «Кругі руін», М. Багдановіч, А. Куляшоў і інш.).

У выяўленчым мастацтве значнае месца належыць сімволіцы, аднак у курсе «Айчынная і сусветная мастацкая культура» ёй не надаецца належнай увагі. Даследаванне топікі адкрывае новыя рэсурсы пасціжэння культурных сэнсаў на ўроках па ўсіх гуманітарных дысцыплінах.

Бібліягр. – 4 назвы.

УДК 008

***Курыленка Г.М.*** **Спавядальная рэфлексія ў культуры // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 100–103.**

Аналізуецца генезіс і дынаміка спавядальнай рэфлексіі ў культуры. Споведзь ужо даўно выйшла за межы канфесіянальнай прыналежнасці, а спавядальныя формы трансфармуюцца ў самых разнастайных сферах культуры: у філасофіі, літаратуры, жывапісе, музыцы, псіхіятрыі, псіхааналітыцы (З. Фрэйд, Э. Фромм, К. Юнг). Разам з тым без спавядальнай рэфлексіі, якая суправаджае ўласную індывідуальную дзейнасць чалавека, працэс творчасці ўвогуле быў бы немагчымым.

Бібліягр. – 4 назвы.

УДК 008:39

***Чарняўская Ю.В.*** **Прырода і сутнасць этнічнасці: да падыходу мяккага канструктывізму // Весці БДПУ. 2008. № 2. Серыя 2. С. 103–106.**

Артыкул прысвечаны прыродзе і сутнасці этнічнасці. Грунтуючыся на аналізе сучасных даследванняў, аўтар прапануе новы падыход (мяккі канструктывізм) да феномену этнічнасці.

Бібліягр. – 15 назваў.